ARCHE Зьмест № 5’2000 АДАМ ГЛОБУС

1. Зьмест / Уводзіны
2. Чаму я зрабіў аўтапартрэт у форме часопіса? Адам Глобус у ARCHE 5(10)-2000. Adam Hlobus.
3. Прыручэнне дэманаў. Ян Максімюк у ARCHE 5(10)-2000. Adam Hlobus.
4. Ці можа Старшыня Рады Беларускай Народнай Рэспублікі Івонка Сурвілла стаць прэзыдэнтам Рэспублікі Беларусі? Апытаньне ў ARCHE 5(10)-2000. Adam Hlobus.
5. Гульні з народам. Гутаркі з Адамам Глобусам, запісаныя Аляксандрай Андрыеўскай, у ARCHE 5(10)-2000. Adam Hlobus.
6. Настаўнікі. Адам Глобус у ARCHE 5(10)-2000. Adam Hlobus.
7. Фатальная лічба „3“. Адам Глобус у ARCHE 5(10)-2000. Adam Hlobus.
8. Браслаўская стыгмата. Адам Глобус у ARCHE 5(10)-2000. Adam Hlobus.
9. Дамавікамерон найноўшы. Адам Глобус у ARCHE 5(10)-2000. Adam Hlobus.
10. Камэнтар. Адам Глобус у ARCHE 5(10)-2000. Adam Hlobus.
11. Хоку пра снег. Адам Глобус у ARCHE 5(10)-2000. Adam Hlobus.
12. Пяць філялягемаў пра Адама Глёбуса. Пятро Васючэнка ў ARCHE 5(10)-2000. Adam Hlobus.
13. Пашпартызацыя бесаў, або Койданаўскі Глобус. Андрэй Савіцкі ў ARCHE 5(10)-2000. Adam Hlobus.
14. Беларускі дзэн, альбо „Дзевяць аповесьцяў“ Адама Глёбуса. Надзя Садзікава ў ARCHE 5(10)-2000. Adam Hlobus.
15. Адам Глёбус. Баляда. Сяргей Харэўскі ў ARCHE 5(10)-2000. Adam Hlobus.
16. Здані і пачвары Беларусі. Францішак Хлус (Уладзіслаў Ахроменка), Марцін Юр (Максім Клімковіч) у ARCHE 5(10)-2000. Adam Hlobus.
17. Прывід у Гайцюнішках. Міраслаў Адамчык, Максім

Клімковіч у ARCHE 5(10)-2000. Adam Hlobus.
18. Альбомная лірыка. Уладзімер Караткевіч у ARCHE 5(10)-2000. Adam Hlobus.
19. Стары Менск. Галіна Булыка ў ARCHE 5(10)-2000. Adam Hlobus.
20. Альбомная лірыка. Леанід Дранько-Майсюк у ARCHE 5(10)-2000. Adam Hlobus.
21. Камасутра ў ARCHE 5(10)-2000. Adam Hlobus.
22. Батлейка, катрынка. Ева Вежнавец у ARCHE 5(10)-2000. Adam Hlobus.
23. Барысаўская рамантыка. Анатоль Прасаловіч у ARCHE 5(10)-2000. Adam Hlobus.
24. Партовы горад Экімань. Сяргей Шыдлоўскі ў ARCHE 5(10)-2000. Adam Hlobus.
25. Сустрэча, якой не будзе. Ірына Тоўсцік у ARCHE 5(10)-2000. Adam Hlobus.
26. Вершы. Ганна Панамарэнка ў ARCHE 5(10)-2000. Adam Hlobus.
27. Сакольшчына—Горадня—Вільня. Баляслаў Грабінскі ў ARCHE 5(10)-2000. Adam Hlobus.
28. Нататкі пра менскіх падлеткаў. Зьміцер Лапцёнак у ARCHE 5(10)-2000. Adam Hlobus.
29. Васямнаццаць месяцаў у пекле. Аляксей Шыдлоўскі ў ARCHE 5(10)-2000. Adam Hlobus.

[image]

A R C H E

[image]

A d a m H l o b u s

№ 5 (10) – 2000

[image]

Пачатак Навіны Форум Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]

АДАМ ГЛОБУС

[image] [image] 2000

[image] [image] [image]

З ь м е с т

Адам Глобус. Чаму я зрабіў аўтапартрэт у форме часопіса?
Ян Максімюк. Прыручэнне дэманаў

апытаньне ARCHE

Ці можа Старшыня Рады Беларускай Народнай Рэспублікі Івонка Сурвілла стаць прэзыдэнтам Рэспублікі Беларусі? (ZIP: 10 K)

Адам Глёбус

Гульні з народам. *Гутаркі з Адамам Глобусам, запісаныя Аляксандрай Андрыеўскай*
Адам Глобус. Настаўнікі
Вячаслаў Адамчык. Фатальная лічба „3“ (ZIP: 21 K)
Адам Глобус. Браслаўская стыгмата
Адам Глобус. Дамавікамерон найноўшы (ZIP: 19 K)
Адам Глобус. Камэнтар
Адам Глобус. Хоку пра снег
Пятро Васючэнка. Пяць філялягемаў пра Адама Глёбуса

расейскі погляд на Адама Глёбуса

Андрэй Савіцкі. Пашпартызацыя бесаў, або Койданаўскі Глобус
Надзя Садзікава. Беларускі дзэн, альбо „Дзевяць аповесьцяў“ Адама Глёбуса (ZIP: 20 K)

мастацтва

Сяргей Харэўскі. Адам Глёбус. Баляда

альбомная проза

Францішак Хлус, Марцін Юр. Здані і пачвары Беларусі

альбомная п’еса

Міраслаў Адамчык, Максім Клімковіч.

Прывід у Гайцюнішках (ZIP: 27 K)
альбомная лірыка
Уладзімер Караткевіч. Альбомная лірыка
Галіна Булыка. Стары Менск
Леанід Дранько-Майсюк. Альбомная лірыка
асьвета
Камасутра (ZIP: 33 K)
гісторыі
Ева Вежнавец. Батлейка, катрынка (ZIP: 21 K)
Анатоль Прасаловіч. Барысаўская рамантыка
Сяргей Шыдлоўскі. Партовы горад Экімань
Ірына Тоўсцік. Сустрэча, якой не будзе
лірыка
Ганна Панамарэнка. Вершы
успаміны пра XX стагодзьдзе
Баляслаў Грабінскі.
Сакольшчына–Горадня–Вільня (ZIP: 48 K)
запісы
Зьміцер Лапцёнак. Нататкі пра менскіх падлеткаў
хроніка
Аляксей Шыдлоўскі.
Васямнаццаць месяцаў у пекле (ZIP: 30 K)
кніга
Віктар Скорабагатаў. Кампазітар Ян Тарасевіч (ZIP:)

[image]
[image]

№ 5 (10) – 2000

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **16-08-2000**
[image]

Чаму я зрабіў аўтапартрэт у форме часопіса?

У часы еўрапейскага Адраджэння настаўнік (здаецца, Гірландаё) сказаў вучню (Мікеланджэла? А можа гэта сказаў Батычэлі, звяртаючыся да Леанарда да Вінчы… — неістотна), што не мае ніякага значэння, якую замову ты атрымаў — ці збудаваць сабор, ці паставіць конную статую, ці ўпрыгожыць кветкамі кош з садавінаю на кірмашы — галоўнае, ты павінен працаваць максімальна сумленна і творча. Усё сваё жыццё я прыслухоўваўся да гэтай парады. Якіх толькі замоваў не атрымліваў… Кінасцэнары, тэксты песняў, крытычныя артыкулы, ролі ў тэлефільмах, выступленне на сцэне, чытанне вершаў па радыё, роспіс кінатэатраў, маляванне рэкламных шчытоў на кірмашах, ілюстраванне кніжак і часопісаў, пераклады грузінскіх і расейскіх вершаў… Безліч замоваў, і ні ад адной я не адмовіўся. Не буду хлусіць. Не ўсё атрымлівалася ў мяне добра. Толькі прынцып заставаўся адзін і той жа: не адмаўляйся і працуй сумленна. Адпаведна, калі запрапанавалі зрабіць нумар ARCHE, прысвечаны мне, я даў згоду. Нідзе й ніколі не чуў, каб нехта замаўляў у мастака ягоны аўтапартрэт. А тут такая замова. Што з гэтага атрымалася? Мяркуй сам. Змяя ўкусіла сябе за хвост — сімвал барока. Так што, хутчэй за ўсё, пра *кошык* з кветкамі гаварылі Мікеланджэла, які перажыў

Адраджэнне з маньерызмам і заснаваў стыль барока, мой любімы стыль еўрапейскага мастацтва.
Адам Глобус

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]

№ 5 (10) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **29-08-2000**
[image]

Ян Максімюк
Прыручэнне дэманаў

„Дамавікамерон“[1] Адама Глобуса выйшаў у 1994-м годзе у… Але, сапраўды, дзе ён выйшаў? Калі браць фармальна — у Беластоку, бо там быў надрукаваны. Хаця напісаны быў у Менску, а адрэдагаваны ў Вільні. Гэтыя тры месты пазначаныя ў выходных звестках выдання. Але яго цяжка прыпісаць да нейкага пэўнага месца ў традыцыйным сэнсе. У духу канца стагоддзя і тысячагоддзя, аплеценага павуціннем Інтэрнэту, можна было б сказаць, што кніга з’явілася на сэрвэры „беларуская літаратура“, назвы ж трох гарадоў выступаюць тут толькі ў якасці тэхнічных дадзеных, нечага накшталт кампутарнага адрасу.

Казус з кнігай Адама Глобуса яшчэ раз пераканаўча сведчыць, якая сітуацыя склалася ў беларускай літаратуры і культуры, паказвае яе „віртуальны адрас“ у часапрасторы, не прыпісаны да пэўнага „абжытага“ месца. Бо няма такога фізічнага месца, дзе б беларуская літаратура адчувала сябе паўнавартасным гаспадаром ці жыхаром. Акрамя беларускай мовы, зразумела. Аднак мова — не фізічная прастора. Але яна не ёсць і проста інструментам. Нішто не цэментуе сучаснай беларускай нацыі мацней і не з’яўляецца найважнейшай яе асновай, як мова, нават калі большасць беларусаў усё яшчэ не ўсведамляе таго факту і застаецца ў атамізаваным і аморфным стане *homo sovietikus*’аў. Мова ўсё яшчэ дае беларусам шанец знайсці шлях

У перакладзе на польскую мову назва кнігі гучыць як „Дэманакамерон“. Дамавік (які мае цэлы шэраг рэгіянальных найменняў: дамавы, хатнік, гаспадар, падклічнік, хоўлік) у беларускай народнай дэманалогіі азначае хатняга духа (д’ябла), якому у польскай народнай

да ўласнай тоеснасці, наноў стацца гаспадарамі дзяржаўнай нічыйнай зямлі, якія сёння завуцца Рэспублікай Беларусяй. Ніякія іншыя нацыянальныя чыннікі не могуць і дакладнасці гэтую ролю.

Пакаленне Адама Глобуса, выхаванае ў расійскамоўных гарадах Савецкай Беларусі, сярод чужых галасоў і чужых сцен, адшукала шлях да ўласнага дому акурат дзякуючы роднай мове. Расійская мова, нягледзячы на тое, што ёю ў Беларусі карыстаюцца як удома, так і ў публічным жыцці, для нацыянальнай культуры ўсё яшчэ застаецца мёртвай мовай. Гэта правінцыйны, другасны від расійскай мовы, адарваны ад жывых народных гаворак і таму асуджаны на неаўтэнтычнасць і маргінальнасць насуперак высілкам тутэйшых русіфікатараў. Расійскамоўная літаратура, што ствараецца ў Беларусі, гэта прадукцыя другога і трэцяга гатунку не толькі ў „імперскім“ маштабе, але і ў лакальным, „<пост>каланіяльным“, вымярэнні. Так было цягам цэлага перыяду беларускай савецкай літаратуры, калі рэй у ёй вялі Максім Танк, Янка Брыль, Уладзімер Караткевіч і Васіль Быкаў, якія пісалі па-беларуску. Тое самае назіраем і цяпер, калі на першыя месцы заступілі Алесь Разанаў і Уладзімер Арлоў ды маладзейшыя Ігар Бабкоў і Адам Глобус.

Адам Глобус (у рэчаіснасці Уладзімер Адамчык) нарадзіўся ў 1958 годзе ў мястэчку Койданава (у савецкай рэчаіснасці Дзяржынск) каля Менску. Пра сваё паходжанне сам ён кажа наступным чынам: *У мяне класічная біяграфія пісьменніка ў другім пакаленні. Мой бацька нарадзіўся ў вёсцы пад Наваградкам, які на той час быў пад Польшчай. Стаў класікам беларускай літаратуры. Усюды ў нас знаны і паважаны. Мая ж маці — бібліятэкарка. Таму нарадзіўся я ў тыповым літаратурным клімаце. Выхоўваўся ў сяброўстве з шырока вядомымі беларускімі літаратарамі, зрэшты не толькі з імі, але і расейскімі, казахскімі і наагул савецкімі, бо ў свой час бацька вучыўся на вышэйшых літаратурных курсах у Маскве. Рос у літаратурным асяроддзі, аж пакуль нарэшце сам не стаў пісьменнікам* (*Kartki* 1/97, Беласток). Удакладнім, што бацька Адама Глобуса — празаік Вячаслаў Адамчык, аўтар, як і належыцца класіку, тэтралогіі, у якой разгортваецца шырокая панарама падзеяў у Заходняй Беларусі напярэдадні і пад час другой сусветнай вайны. Брат Адама таксама бавіцца

літаратурай, ён напісаў пару цікавых тэатральных п'есаў ды празаічных твораў з мяжы дэтэктыўнага і прыгодніцкага жанраў.

Перш чым стаць аўтарам „Дамавікамерону“, Адам Глобус скончыў Менскі тэатральна-мастацкі інстытут (цяпер Беларуская акадэмія мастацтваў) па спецыяльнасці, што тады называлася „манументальная графіка“. А ў 1988 годзе з'явілася дэбютная кніга 30-гадовага аўтара: паэтычны томік „Парк“. Потым у менскіх дзяржаўных выдавецтвах выйшлі яшчэ дзве кніжкі яго апавяданняў: „Адзінота на стадыёне“ (1989) і „Смерць-мужчына“ (1992). Пачынаючы са зборніка апавяданняў „Скрыжаванне“ (1993) Глобус пачаў выдаваць свае кнігі ў недзяржаўных выдавецтвах і ўвогуле за свае грошы. Толькі ён мог сабе гэта дазволіць фінансава.

Першыя кніжкі Адама Глобуса ўвогуле выклікалі вялікую зацікаўленасць крытыкі і чытачоў. Вядома, пісьменніка добра ведалі ў Менску, але хутчэй праз бацьку, чым праз уласную творчасць. Выданне „Дамавікамерону“, на нашу думку, адной з найцікавейшых з'яваў у беларускай прозе 90-х, таксама прайшло амаль незаўважаным. Толькі тагачасны Саюз Пісьменнікаў Беларусі штотыднёвік „Літаратура і мастацтва“ назваў кнігу агіднай, а самога аўтара аднёс да катэгорыі, якія жыруюць на найпадлейшых інстынктах постсавецкай публікі, што прагне *чарнухі і парнухі* пасля доўгага прымусовага чытацкага посту.

Больш несправядлівую ацэнку „Дамавікамерону“ і Глобуса — беларускамоўнага пісьменніка — і прыдумаць цяжка жываць у Беларусі на чым-кольвек, што звязана з беларускай мовай. Наклад кнігі ў 1994 годзе не перавысіў 1000 асобнікаў, але няма сумневу, што яшчэ й сёння ў хаце знайшлося б досыць нераспакаваных пачкаў „Дамавікамеронам“. Рэч у тым, што ў пасляваенны перыяд беларуская справа ў Савецкай Беларусі павярнулася на 180 градусаў і абясцэнілася літаральна на вачах. Ад беларускай мовы — якую ў 60-х скрозь лічылі ганебным кляймом мужыцкага (калгаснага) паходжання — на працягу наступных двух дзесяцігоддзяў масава адмаўляліся як у публічным, так і ў прыватным жыцці. Выжыла мова адно ў артыстычных ды інтэлектуальных асяродках. Сёння выкарыстанне беларускай

мовы ў Менску з'яўляецца самай пэўнай адзнакай, што адрознівае інтэлектуальную эліту ад плебсу. Эліта вымагае элітарнай літаратуры, і Глобус не можа не ведаць пра тое. Таму што дакладна ведае, што чытае плебс.
Бо ж Адам Глобус — ці не найбуйнейшы вытворца масавай літаратуры на абшары былога Савецкага Саюзу. На расійскай мове, зразумела. Попыт на гэткага роду літаратуру не абмінуў і Польшчы, а таксама многіх іншых краінаў былога лагеру. Насуперак чаканням, не эротыка і не парнаграфія завалодалі ўяўленнямі і сэрцамі мільёнаў кнігалюбаў на тэрыторыях толькі што здабытай выдавецкай і чытацкай свабоды, а *Hollywood-made dreams*, увасоблены ў безлічы *harlequin*-аў, *romance*'аў, *judith-kranz*'аў і *danielle-steele*'аў. На постсавецкай прасторы, апроч таго, неверагоднай папулярнасцю карысталіся бразільскія тэлесерыялы. Напачатку Глобус працаваў сам, пішучы працягі папулярных літаратурных хітоў ды штампуючы раманы паводле тэлесерыялаў, што дэманстраваліся на расейскім тэлебачанні. Іх наклады сягалі мільёну асобнікаў. Рынак і попыт раслі, таму Глобус стварыў нешта накшталт цэху менскіх пісараў, якія заняліся перанясеннем на паперу тэлевізійных гісторыяў і пісаннем працягаў самых розных заходніх бестселераў. Гэты працэс быў пастаўлены на шырокую нагу і даваў добрыя грошы. Пры даволі напружаных выдавецкіх тэрмінах (тэлесерыялы ўвогуле паказвалі пару разоў на тыдзень) даводзілася карыстацца дыктафонамі і наймаць спецыяльных кур'ераў, якія аператыўна дастаўлялі стужкі з запісамі ў Маскву.
Слынны жалезны сейф Глобуса, у якім сабраныя звыш 100 тамоў тварэнняў фірмы „Глобус & Со", стаў легендаю менскага літаратурнага асяроддзя. Мяркую, што не толькі дачка Скарлет са „Знесеных ветрам", але і яе ўнучка патрапілі ў новыя версіі кніжных лёсаў з-пад пяра, так бы мовіць, калектыўнай беларускай Маргарэт Мітчэл. Ігар Бабкоў, менскі паэт і празаік, гэтак выказаўся пра ўсюдыіснасць свайго сябра Адама Глобуса на постсавецкім выдавецкім рынку: *„Калі бачу новую заходнюю назву на паліцы менскай кнігарні, маім першым памкненнем з'яўляецца патэлефанаваць да Адама і запытацца, ці гэта кніга ягоная, ці нейкага рэальнага аўтара"* (з выступу на літаратурным семінары „Бязмежжа" ў Гайнаўцы ў 1996 г.). Несумненна, у гэтай дзейнасці не ўсё ў парадку з аўтарскімі

правамі, але не ўздымаецца ў мяне пяро, каб напісаць хоць слова асуджэння на адрас Глобуса і ягонай фірмы. Бо апроч масавай прадукцыі Глобус займаецца і сапраўднай літаратурай, а яго фірма дае сталы заробак добраму груду менскіх літаратараў, якія ў іншым выпадку мусілі б зарабляць сабе на жыццё значна далейшымі ад літаратуры заняткамі. Згаданая непрыхільная (і адзіная) рэакцыя менскага штотыднёвіка „Літаратура і мастацтва“ на „Дамавікамерон“ тлумачылася, як падаецца, дзвюма асноўнымі прычынамі. Першая з іх звязана з успадкаваным ад савецкай эпохі суцэльным табу на эротыку і секс у літаратуры. Другая палягае ў неадэкватным прачытанні паслання кнігі і прыпісванні аўтару інтэнцыяў, якіх ён у сапраўднасці не меў. Відавочна, „Дамавікамерон“ выкарыстоўвае эратычна-сексуальныя матывы настолькі шчыра і непасрэдна, што можа вымагаць пэўных агаворак не толькі ў беларускага чытача, які не меў ніякага ўзору такой літаратуры на сваёй мове, але і ў звычайнага польскага чытача, які мае багаты выбар літаратуры „на гэтую тэму“, як у перакладах, гэтак і ў айчынным пісьменстве. Прынцып, што „ў Савецкім Саюзе сексу няма“, які ўмацоўваўся дзесяцігоддзямі, падрыхтаваў грунт для аўтаматычнай грамадскай рэакцыі ў Беларусі: закрананне сексуальнай тэматыкі, не звязанай з натуральнай рэпрадукцыяй, з’яўляецца праявай маральнага разлажэння, калі не парнаграфіі. Гэта набыты ўмоўны рэфлекс, які выступае незалежна ад розуму.

Я перакананы, што нельга сур’ёзна абгрунтаваць і тую тэзу, быццам мэта аўтара ў „Дамавікамероне“ была выклікаць сексуальнае ўзбуджэнне ў чытача, інакш кажучы, пад літаратурнай шыльдай працягці парнаграфію. У такім сэнсе нашмат больш парнаграфічнымі будуць жаночыя раманы, нягледзячы на тое, што тэхналогія іхнай вытворчасці выключае выкарыстанне пэўных даслоўнасцяў і сцэнаў тыпу *hard core*. Але інтэнцыі *soft-core’*авых жаночых раманаў несумненна больш непрыстойныя, чым даслоўнасці Глобуса.

Глобус ступіў у зону, якой раней не наведваў ніводзін з беларускіх пісьменнікаў, і падрабязна апісаў сваё падарожжа. Здаецца, апісанне тутака — дакладнае слова, бо людзі, што ў курсе справы, без усялякіх сумненняў сцвярджаюць, што не менш за 80 працэнтаў гісторый, апаведзеных у

„Дамавікамероне“, здарыліся на самай справе ці то з удзелам аўтара, ці то яго знаёмых, якія пасля апавялі яму пра свае прыгоды (натуральна, калі выжылі). (Астатнія 20 працэнтаў гісторый адносяцца да такіх выпадкаў, у якіх ніводзін сведка не выжыў.)

Вартая адзначэння яшчэ адна вонкавая прыкмета прозы Глобуса: тапаграфія месцаў апісаных падзей пададзена з абсалютнай дакладнасцю. З „Дамавікамеронам“ можна зведаць Менск значна лепш, чым з афіцыйным планам гораду, які застаўся наўмысна скажоны, каб заблытаць арыентацыю заходніх разведчыкаў у беларускай сталіцы.

Секс з’яўляецца інтымным заняткам, у якім чалавек акрамя вопраткі скідае таксама ўсялякія іншыя маскі, дазваляе сабе пабыць „дэманам пажады“. У таталітарным грамадстве ён быў той сферай свабоды і натуральнасці, над якой дзяржава не мела кантролю, а таму спрабавала выракчы яе на неіснаванне, выкрасліць з грамадскай свядомасці. Глобусу ўдалося ўвайсці ў яе, зазірнуць пад штодзённую афіцыёзную маску *homo sovieticus’a* і паказаць глыбока схаваную чалавечнасць у яе прыродных камічна-жаласна-ўзнёслых разнавіднасцях і сітуацыях. Паказаць з *супераджываннем*. Магчыма, акурат з той прычыны ў кароткіх апавяданнях Адама Глобуса найрэльефней з усёй беларускай літаратуры спаўняюцца рэалістычныя пастулаты. Усе гісторыі не толькі адпавядаюць жыццёвай праўдзе (як мы вызначылі, усе яны маюць сваёй крыніцай рэальныя падзеі), але і літаратурнай праўдзе, г.зн. ствараюць пэўную літаратурную рэальнасць, у якой часткі і цэлае не супярэчаць і якая фармуе літаратурна замкнёны і самадастатковы свет. Гэта адна з асноўных характарыстык добрага пісьменства.

Уключэнне ў кантэкст менскіх эратычна-сексуальных гісторый (дый не толькі такіх) цэлага легіёну беларускіх дэманаў, д’яблаў і русалак некаму можа падацца залішне адвольным і штучным, арыентаваным на дасягненне сумнеўных эстэтычных мэтаў. Хачу рашуча запярэчыць. Няма нічога больш літаратурна і жыццёва апраўданага, чым такое намаганне ў стасунку да Менску. Бо Менск той горад, дзе *genius loci* не ўвасобіўся ні ў Голема, ні ў Цмока Вавэльскага. Ён быў заселены зборышчам лесавікоў, палевікоў, хутаў, вупыроў, русалак і кадукоў з балатоў, азёраў, лугоў, рэк, бароў,

урочышчаў і гаёў блакітнавокай Беларусі. Уся гэтая чартаўшчына асела ў горадзе разам з перасяленцамі з вёсак, якія прынеслі ў сталіцу свой напалову паганскі светапогляд разам з сялянскімі забабонамі, прымхамі і страхамі. З пачатку 60-х да пачатку 90-х насельніцтва Менску павялічылася амаль на мільён жыхароў. І перадусім міграцыя з вёскі, а не якісьці ўсплёск нараджальнасці абумовілі натуральны рост сталіцы. Дык вось, секс для тых перасяленцаў быў адной з праяваў дэманічных сілаў прыроды, якіх належала хутчэй засцерагацца, чым шанаваць. Таму дэманічная метафара Глобуса ў адносінах да беларускага эратызму ёсць трапнай і адэкватнай.

У „Дамавікамероне“ Адам Глобус паддае беларускага чытача двайному выпрабаванню — не толькі правярае ягоныя маральна-звычаёвыя ўстоі, але й прымушае яго пры чытанні кнігі прызвычаіцца да сексуальна-эратычнай лексікі, якой карыстаецца аўтар. З гэтага пункту гледжання Глобус — амаль піянер у беларускім пісьменстве. Пераклад на польскую мову не сустрэў вялікіх цяжкасцяў — яна ўжо вывучыла і пайменавала сексуальна-эратычную сферу крыху далей і шырэй. З беларускай мовай горш. Досыць нагадаць, што два ключавыя словы для вырашэння мастацкай задумы Глобус мусіў папросту прыдумаць, каб пазбегнуць выкарыстання агульнавядомых у славянскіх мовах вульгарызмаў, медычных тэрмінаў ці эўфемізмаў, запазычаных з мовы добра выхаваных дзяцей. А шмат якія іншыя словы і выразы у пэўных кантэкстах упершыню з’явіліся толькі на старонках кнігі Глобуса. Мяркую, што гэтыя лінгвістычныя эксперыменты аказаліся бясспрэчным поспехам аўтара.

Наапошку варта абмовіцца параю словаў пра назву кнігі Адама Глобуса, якая ўзыходзіць, бясспрэчна, да „Дэкамерону“ Джавані Бакача. У „Дамавікамероне“ не толькі актыўна выкарыстоўваюцца эратычныя матывы ў якасці рухаючай сілы апавяданняў, ён мае таксама значна больш істотнае падабенства з неўміручай кнігай вялікага тасканца. Як і Бакача, Глобус ахапіў сваёй увагай шырокую галерэю самых розных грамадскіх постацяў і тыпаў. „Дамавікамерон“, як і „Дэкамерон“, гэта спроба выявіць сугучную свайму часу „чалавечую камедыю“. Твор тасканца адзначыў канец Сярэднявечча і пачатак Рэнесансу ў Італіі. Аповеды Глобуса, будзем спадзявацца, адзначылі канец панурай эпохі *homo*

*sovieticus’*а і пачатак нацыянальнага рэнесансу ў Беларусі. Кніга, як было згадана, прайшла незаўважанай у Беларусі. Магчыма таму, што з’явілася не ў самы лепшы час для літаратуры наагул, калі большасць людзей заклапочана эканамічнай, а не літаратурнай, рэчаіснасцю. А магчыма таму, што заўчасна з’явілася ў беларускай літаратуры, спрабуючы як хутчэй скрышыць бастыёны эстэтычных схільнасцяў мінулай эпохі. У любым разе, толькі ў адным месцы „беларускай віртуальнай культурнай прасторы“ кнігу Глобуса прынялі з энтузіязмам і задавальненнем: якраз у Беластоку, дзе кніга друкавалася па-беларуску, а цяпер выходзіць у перакладзе на польскую мову. Некаторыя выразы з „Дамавікамерону“ сталі чымсьці накшталт своеасаблівых пароляў, якія выклікаюць культуралагічныя і этналінгвістычныя асацыяцыі, а таксама выбухі дэкамеронаўскага смеху сярод беластоцкіх беларусаў (тых, зразумела, хто яшчэ ў стане чытаць па-беларуску). Іх група нешматлікая, але затое заўзятая. Доказам таму — гэтае выданне.

Прага, май 1998

Гэты тэкст быў упершыню надрукаваны па-польску
як пасляслоўе да польскага выдання кнігі Адама Глобуса *Demonokameron*.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 5 (10) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **29-08-2000**
[image]

[image]

ARCHE

Adam Hlobus № 5 (10) – 2000

[image]

[image]

ADAM HLOBUS ARCHE
Адаманы Ілюстрацыі 2000

» да Зьместу «

[image] [image] [image]

Ці можа Старшыня Рады Беларускай Народнай Рэспублікі Івонка Сурвілла стаць прэзыдэнтам Рэспублікі Беларусі?

Адказы на наша пытаньне былі хутчэй пэсымістычнымі, чым аптымістычнымі, што выяўлялася найперш у іх ляканічнасьці. Усё ж, усім дзякуй.

Сяргей Варывоцкі,
(мэдык, асьпірант Інстытуту філязофіі НАН):
Прыгожае імя Івонка. Са старагерманскіх паходзіць. Значыць „той, хто страляе з лука“ або проста „дзеравяны лук“. Прозьвішча проста шыкоўнае. Ад літоўскага Sirvile. „Тая, што спадзяецца абняць/абхапіць/ахінуць“. Ёсьць і іншы варыянт тлумачэньня — „тая, што мае надзею пацягацца/бадзяцца альбо накінуцца/напасьці“. Увогуле... шляхетнае імя, паказвае на субстраты. „Галасуйма за прэзыдэнта Сурвіллу!“ — гучыць эпічна.
Але грамадзтва ў нас, як ні круці, традыцыйнае. І кабету, нават

разумную і паважную, на чале дзяржавы ўбачыць ня схоча. (Бацьку ўжо маем, а гэта была б матка, як у казцы.) Нават з улікам, што бальшыня насельніцтва — жанчыны. Гендэрная салідарнасьць стоадсоткава прайграе зайздрасьці ці трывалым прызвычаеньням.
Прэзыдэнтамі самі не становяцца, прэзыдэнтаў становяць тыя, хто мае інтэрас у краіне. Адпаведна і фундуюцца прэзыдэнты (і фінансава, і ідэалягічна) тымі ж зацікаўленымі бакамі. А хто ж Івонку штурхане? Яшчэ дэмаграфічны аргумэнт: прырост насельніцтва ў нас адмоўны, пэнсіянэраў болей як моладзі. Паджылы чалавек цэніць стабільнасьць, раўнавагу, спакой. Хаця б вонкавыя. Ці стане канадзкая місіс Survilla (хоць яна і тутэйшага роду) гарантам упэўненасьці й цішыні? А што лэдзі ведае-разумее пра нашыя праблемы, пражыўшы ці ня ўсё жыцьцё па-за Беларусяй?
Станоўчы адказ на анкетнае пытаньне магчымы, хіба толькі калі стане шаноўная спадарыня жонкай Дж.Сораса ці, скажам, Б.Гейтса.
Зрэшты, імя Галавы Беларусі на наступны тэрмін назваць ня так і цяжка (калі ведаеш папярэдняга). Падобныя ж анкетаваньні з тым самым посьпехам можна было б правесьці і наконт іншых кандыдатаў, напрыклад: „Ці стане Адам Глёбус прэзыдэнтам Рэспублікі Беларусі?“ Хоць значна цікавейшым здаецца пытаньне: „А навошта патрэбны Беларусі прэзыдэнт (калі патрэбны)?“.

Вітаўт Кіпель,
(дырэктар Беларускага інстытуту навукі й мастацтва ў Нью-Ёрку):
Роля Рады БНР сягоньня — роля сымбалічнага перахаваньня дзяржаўнасьці, і праца БНР пераважна вядзецца вонках Беларусі, у палітычных колах. Дасюль прынцып быў: ні ў якія нутраныя і арганізацыйныя справы ня ўмешвацца, бо ў Беларусі ў самой апазыцыі няма еднасьці, і гэтая еднасьць павінна выйсьці зь мясцовых каранёў. Дзейнасьць Рады БНР павінна заключацца, як і дасюль яна была, у сымбалічным перахаваньні дзяржаўнасьці. Яна мусіць быць таксама каталізатарам праводжаньня незалежніцкай ідэі ў палітычных колах Захаду. І так да часу, пакуль ня будзе створаная вольная Беларуская

дзяржава. Ніякай адмысловай аб'яднаўчай фігуры для беларускай апазыцыі не патрэбна, фігура выйдзе сама ў часе працэсу. Што мы фігуры ўсё шукаем, што мы ўсё шукаем манны зь неба? Фігура, што аб'яднае ўсіх, выявіцца ў ходзе працэсу.

Алег Латышонак,
(кіраўнік Беларускага Гістарычнага Таварыства ў Беластоку, лідэр Беларускага Дэмакратычнага Аб'яднаньня):
У асноўным усё магчыма на сьвеце, то можа й Івонка Сурвілла стаць прэзыдэнтам Рэспублікі Беларусі, але мусяць быць створаныя адпаведныя ўмовы: дэмакратызацыя краіны, зьмена выбарчага закону, закону аб грамадзянстве, каб яна мела права балятавацца. Калі б гэтыя ўмовы былі выкананыя, то наступны сцэнар вядомы зь Літвы, Латвіі. Безумоўна, лёсы сьвету цяпер рашаюцца перш за ўсё ў Вашынгтоне, і калі хто ня хоча быць у расейскай сфэры ўплыву ці проста ў Расейскай імпэрыі, мае толькі адзін выбар — далучыцца да магутнейшай імпэрыі, калі яна гэтага захоча. У Вашынгтоне цяпер робіцца палітыка. Нейкія палітыкі цяпер нават забываюцца здабываць падтрымку ў сваёй краіне, так стараюцца знайсьці падтрымку ў Вашынгтоне, гэта агульнасусьветны факт. І такая рэальнасьць. Іншая справа, ці хоча Івонка Сурвілла таго, пра што вы пытаецеся. Калі ня хоча, дык ня хоча, да палітыкі нельга прымушаць. Калі чалавек добра сябе адчувае на пасадзе, на якой ён ёсьць, адказнай, але не настолькі (Старшыня Рады БНР — гэта ўсё ж яшчэ не адказнасьць за краіну), дык ніхто яе не прымусіць.
На маю думку, Івонка Сурвілла ня можа аб'яднаць кагосьці на Беларусі. Дзеля гэтага трэба атрымаць аўтарытэт знутры гэтай палітыкі, звонку такія рэчы ня робяцца. Можа быць сцэнар нейкага гандлю краінаю між імпэрыямі, тады гэты аб'яднальнік можа выступаць звонку, але гэта ня ўласна беларускі фактар быў бы.
Здаецца, няма пакуль такога чалавека, які б сам адзін мог выйграць выбары ў Аляксандра Лукашэнкі, для гэтага трэба калектыў. Каб выйграць у Аляксандра Лукашэнкі, трэба не рабіць прэзыдэнцкіх выбараў.

Адам Мальдзіс,
(літаратуразнаўца, прэзыдэнт Міжнароднай Асацыяцыі Беларусістаў):
Беларусь — краіна непрадказальная, тут усё магчыма. Нягледзячы на тое, што мы маем сьвежыя прыклады абраньня на найвышэйшыя пасады эмігрантаў у Літве ды Латвіі, у дачыненьні да Беларусі ніякія аналёгіі не спрацуюць. У гэтым і ёсьць інтрыга нашае сытуацыі.

Аляксандар Прушынскі,
(граф, былы кандыдат у прэзыдэнты Беларусі):
Спачатку хацеў бы зазначыць відавочную перавагу Івонкі Сурвіллы — яна жанчына і за яе прагаласавала б добрая частка жаночага насельніцтва, мужчыны таксама б падтрымалі яе. Мінімум адсоткаў 15 на прэзыдэнцкіх выбарах ёй былі б гарантаваныя. Але справа вядзецца не пра тое, магла б прэтэндаваць пані Сурвілла на пасаду прэзыдэнта Беларусі ці не. Калі б пасада гэтая ў рэспубліцы была чыста дэкляратыўнай, тады ня важна, хто стаяў бы на чале дзяржавы. І менавіта Івонка Сурвілла — як інтэлектуал і харызматычная жанчына — магла б стацца тварам краіны, рэпрэзэнтуючы яе на міжнародным узроўні. Аднак, аб'ектыўная рэальнасьць (а яе на ўласнай скуры трэба паспытаць мінімум пяць гадоў) паказвае, што Беларусь знаходзіцца ў тупіку, ёй патрэбная не дэкарацыя, а „парань", гаспадар, які змог бы вывесьці краіну з крызысу, здабыць крэдытаў (а іх на сёньня нам патрэбна ня менш як 5 мільярдаў даляраў). Беларусі патрэбны чалавек, які, набыўшы стары дабіты „Мэрсэдэс", змог бы напачатку здабыць для яго саляркі, а з часам перарабіць яго на бліскучы стылёвы „Ролз-Ройз". Жанчына-эмігрантка магла б стацца ў Беларусі прэзыдэнткай, калі б яна была ня дзеячам-інтэлектуалам, а ўзначальвала ў замежжы, прыкладам, невялікую касмэтычную кампанію зь пяцьцю тысячамі працоўных. Тады б яна мела веды, як кіраваць Беларусяй — краіна, у рэшце рэшт, таксама прадпрыемства, толькі нашмат большых памераў.

Рышард Радзік,

(прафэсар Люблінскага ўнівэрсытэту, сацыёляг, беларусіст):
Я, па-першае, ня ведаю, хто яна такая. Ня думаю, каб… Як Вы кажаце, хто яна?.. Ня думаю, каб Старшыня Рады БНР мела шанцы стаць прэзыдэнтам Беларусі, бо яе ўплыў у Беларусі невялікі, як і беларуская прысутнасьць у сьвеце. Ня думаю, каб цяперашнія ўлады пагадзіліся, каб яна стала прэзыдэнтам Беларусі або кандыдавала на гэтую пасаду. Ня думаю таксама, каб цяперашняе беларускае грамадзтва згадзілася зь яе кандыдатурай на прэзыдэнта ці абрала яе ў выпадку вылучэньня, бо яно мала знаёмае зь ёй. Гэта нерэалістычны праект таксама з увагі на цяперашнюю сьвядомасьць беларусаў.

Вячаслаў Ракіцкі,
(тэатразнаўца, журналіст, галоўны рэдактар часопіса „Спадчына“):
Івонка Сурвілла, безумоўна, мае ўсе падставы для таго, каб прэтэндаваць на прэзыдэнцкае крэсла. Спадарыня Сурвілла, перадусім, — беларуска. Жанчына, якая дбае пра сваю краіну, разумее, дзе мае быць Беларусь. Яна ўсьведамляе дэмакратычныя каштоўнасьці, бачыць Беларусь, арыентаваную на заходнюю цывілізацыю — там нашае месца. Івонка Сурвілла — гэта адукаванасьць, прыстойнасьць і шчырасьць. А яшчэ — сапраўдны нацыяналізм. І таму, калі спадарыня Сурвілла пойдзе на выбары ў якасьці кандыдата, за яе аддадуць галасы толькі нацыяналісты — гэта максымум 10%. Нават больш рэальны палітык — Вінцук Вячорка — мае нікчэмныя шанцы на перамогу ў гэтай краіне, з дадзеным узроўнем сьвядомасьці. Што казаць пра Івонку Сурвіллу?

Міхаіл Чыгір,
(бізнэс-кансультант, былы прэм’ер-міністар Беларусі):
Балтыйскія дзяржавы далі нам цудоўны прыклад удзелу эмігрантаў у палітычным жыцьці сваіх краінаў. Людзі, некалі адарваныя ад сваёй радзімы, цяпер вярнуліся і займаюць найвышэйшыя пасады. Удзел Івонкі Сурвіллы ў прэзыдэнцкіх выбарах, у прынцыпе, магчымы, але мне здаецца, што большасьць беларускага насельніцтва яе не падтрымае, нягледзячы на тое, што яна дастойная гэтае пасады, шмат

зрабіла для таго, каб Беларусь была незалежнай дзяржавай. У мяне былі зь ёю пэўныя стасункі, я вельмі паважаю спадарыню Сурвіллу як чалавека. Але дзеля таго каб народ абраў яе прэзыдэнтам, трэба вельмі моцнае фінансаваньне, моцная прапаганда сярод насельніцтва. Найлепшым варыянтам быў бы той, калі б беларуская выбарная сыстэма набыла рысы празрыстасьці, даючы шанец вылучыцца на пасаду кіраўніка дзяржавы шырокаму спэктру палітычных дзеячаў. І пры такіх умовах я не выключаю магчымасьці выхаду Івонкі Сурвіллы, прынамсі, у другі тур выбараў. Я быў бы толькі рады стацца сьведкам такога.

Але зрабіць гэта, паўтаруся, зусім няпроста. Чалавек ня жыў у нас, ведае нашую рэчаіснасьць выключна з інфармацыйных крыніц, якія не заўсёды бываюць дакладнымі. Калі спадарыня Сурвілла гатовая на вялікую працу дзеля пераадоленьня стэрэатыпаў, калі яна мае адпаведныя грашовыя крыніцы, я магу пажадаць ёй толькі посьпехаў.

Яшчэ адным складаным момантам ёсьць нашая заканадаўчая база, якая не дае эмігрантам магчымасьці ўдзельнічаць у палітычным жыцьці. І тая палатка, што ў нас існуе, на перагляд законаў ня пойдзе, зважаючы на пазыцыю Лукашэнкі.

Разам з усім хацелася б зазначыць, што няведаньне Сурвіллай беларускай рэчаіснасьці можа лічыцца ня толькі мінусам, але і дзейсным плюсам для яе. Ёй невядомае тое дрэннае, што ў нас ёсьць, тыя грамадзкія заганы, ад якіх ня можа пазбавіцца ніводзін з тых людзей, што нарадзіліся і гадаваліся тут.

У Латвіі, мяркую, цяперашняя прэзыдэнтка апэлявала менавіта да гэтага. І народ ёй паверыў. Чаму б ня быць такому ў Беларусі?

Станіслаў Шушкевіч,
(старшыня Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады, першы кіраўнік незалежнай Беларусі):

Івонка Сурвілла — чалавек вельмі высокай адукацыі, сапраўдны інтэлектуал. Мы павінны ганарыцца тым, што на чале Беларускай Народнай Рэспублікі стаіць менавіта такая асоба. Аднак нельга забывацца і на тое, што яна прадстаўніца беларускай дыяспары. На маю думку, беларусы ў замежжы, на вялікі жаль, дрэнна арыентуюцца ў сучаснай сытуацыі, што

склалася ў нашай краіне, яны, у адрозьненьне ад эмігрантаў многіх іншых нацыянальных супольнасьцяў, моцна адарваныя ад рэчаіснасьці, што ў нас існуе. Безумоўна, варыянт Адамкуса ці Віке-Фрайбэрге для Беларусі ня выключаны, але калі б спадарыня Сурвілла прыехала на Радзіму, ёй спатрэбіўся б перакладчык, ня моўны, а сэнсавы, які б мусіў ёй тлумачыць спэцыфічныя зьявы беларускага палітычнага жыцьця. Я ня думаю, што Івонка Сурвілла пойдзе на такі крок — вылучыць сваю кандыдатуру на пасаду прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь. І магчыма, будзе мець рацыю, ня робячы гэтага. Я ж, у сваю чаргу, ня майстра разважаць над неверагоднымі сытуацыямі. Акрамя таго, мажлівасьць вылучэньня кандыдатуры спадарыні Сурвіллы выключаная нашым заканадаўствам.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
* * *
У наступным нумары:
апытаньне ARCHE
„Ці можа так стацца, што Вы прагаласуеце за Аляксандра Лукашэнку на прэзыдэнцкіх выбарах наступнага году?“

[image]
[image]

№ 5 (10) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **29-08-2000**
[image]

Гульні з народам

Гутаркі з Адамам Глобусам, запісаныя Аляксандрай Андрыеўскай

---

1. Жахлівы сон часоў перабудовы

Уяві сабе жахлівы сон савецкага дысідэнта: ты прачынаешся і ідзеш на працу ў ЦК. Ты чалавек з сутарэнняў, і раптам табе прапаноўваюць працаваць у камсамольскіх структурах, працаваць у ЦК.

Тады прыйшоў да ўлады Гарбачоў, абвесціў перабудову, намерыўся пераўтварыць СССР у ЗША. Гэтая перабудова мусіла памяняць свядомасць. Зрабіць тое было вельмі проста: даць людзям майго пакалення доступ да сродкаў масавай інфармацыі. І тады ў Маскве вырашылі, што ўсім гэтым нацыянальнасцям трэба кінуць па часопісе. Эстонцам далі „Радугу“, латышам — „Родник“, беларусам — „Крыніцу“. Гэта былі дзвюхмоўныя пляцоўкі, дзе магло б выказацца новае пакаленне. Паколькі ў нас рэспубліка была артадаксальная, то, замест таго каб аддаць „Крыніцу“ нам, яны аддалі Някляеву. А той запрасіў, каго хацеў, у тым ліку і мяне. Можна было і адмовіцца, але карцела паваяваць. І ЦК я ўспрымаў толькі як памяшканне.

Плацілі ў „Крыніцы“ мала, затое была свабода. Кожны месяц я

мог друкавацца.
Някляеў зрабіў геніяльную канструкцыю часопіса. Ён сабраў людзей, якія не толькі мелі супрацьлеглыя погляды на жыццё, але і этычна-эстэтычна былі зусім розныя. Адпаведна, часопіс падзяліўся на сектары. Мне дасталося не тое, што хацеў — не паэзія, не проза, не гісторыя, мне далі спорт, моду, музыку і мастацтва. І адпаведна ўсё, што я хацеў пісаць пра гэта, я пісаў. І мае сябры таксама пісалі. Сыс, Сцяпан, Клімковіч, Шайбак, Дубавец вырваліся з андэграўнду.
Анатолю Сідарэвічу дасталася ў „Крыніцы“ літаратура, гісторыя. Ён, напрыклад, напісаў кніжку за Чаропку. Вось Чаропка ходзіць і кажа, што ён напісаў геніяльную кніжку. Дык яе напісаў не ён, а Сідарэвіч, які браў прынесенае Чаропкам і сумленна перапісваў. І так было заўсёды. Колькі ёсць кніжкі, столькі людзі пішуць адны за другіх. Важнае назіранне, яно спрацуе ў маіх выдавецтвах пазней. Сідарэвіч паставіў за мэту зламаць сацыялістычны рэалізм у белліце. І ён гэтую задачу выканаў бліскуча.
Павал Якубовіч з дапамогаю „Крыніцы“ здыскрэдытаваў адыёзны часопіс, артадаксальны, антысеміцкі, называўся той часопіс *Политический собеседник*. Павал Ізотавіч з ім змагаўся пад штандарамі перабудовы, на старонках нашай „Крыніцы“. Кожны ў „Крыніцы“ меў свайго чытача. І ў выніку атрымалася тое, што мусіла атрымацца — паўмільённы наклад. 50 тысяч па-беларуску, 450 па-расейску. Калі ёсць такі наклад, адпаведна з'яўляецца жаданне і далей працаваць з масавай свядомасцю. Кожны з нас, сыходзячы з часопіса, сыходзіў са сваёй аўдыторыяй. Якубовіч сышоў у „Народную газету“. Я сышоў у сваё выдавецтва. Сідарэвіч пайшоў выкладаць у ліцэй. І калі Някляеў застаўся са сваімі хлопчыкамі і дзевачкамі, наклад стаў 2 тысячы, а пасьля — 600 асобнікаў.
„Крыніцу“ я лічу сваім першым досведам гульні з масавай свядомасцю, а першы, ён — незабыўны.
Другім тыражным праектам стаў комікс паводле Караткевічавага „Дзікага палявання...“. І мы з Валодзем Сцяпаненкам селі і намалявалі 96 малюнкаў. З нас смяяліся, што замест сур'ёзных спраўаў малюем коміксы. Але я быў упэўнены, што масавую свядомасць мы закранем. І наклад быў — 250 тысяч. Комікс у выдавецтве „Юнацтва“ надрукавалі вельмі кепска. Мы рабілі на чатыры колеры, а яны надрукавалі

на два. Але гэтая кніжка выканала сваю функцыю. Шкада, праўда, што нашым шляхам больш ніхто не пайшоў. Я спадзяваўся, мы зробім узор, і мастакі-кніжнікі зразумеюць, як трэба рабіць. Я лічу, што можна рабіць коміксы, якія будуць адпавядаць нашай ментальнасці. Ёсць дурні, якія думаюць, што можна амерыканскія коміксы выдаваць і мець з гэтага грошы. Лухта! Амерыканскія коміксы механічна на нашую свядомасць немагчыма перанесці.

Трэці значны паліграфічны праект з маім удзелам — газета *Ласковый май*. Павал Ізотавіч Якубовіч казаў: „Вова, запомні раз і назаўжды: 20 капеек горш, чым 30 капеек“. Газета каштавала 30 капеек, а наклад у яе быў 11 мільёнаў. Якубовіч адказваў за першую паласу, а ўсе астатнія палосы рабіў я. Праца ў *Ласковом мае* мне вельмі дапамагла. Я паверыў у свае здольнасці працаваць з вялізарнай аўдыторыяй. Дарэчы, у кожным нумары я друкаваў свае навелы з будучай кнігі „Дамавікамерон“. Мы зрабілі сем „Майскіх“ нумароў. Восьмы стаў фатальны. Ён быў прысвечаны смерці Віктара Цоя. Я зрабіў яго сам, без Разіна і Якубовіча, і папрасіў грошы за сваю працу. Бо я не атрымліваў ні 20, ні 30 капеек. А прасіў я грошы для Гены Рабцава, які перакладаў музычную інфармацыю з ангельскай мовы, і для Славы Ахроменкі, які тусаваўся ў расейскай рок-тусоўцы, браў інтэрвію ў Б.Г., ДДТ, Цоя… Я прыйшоў да Якубовіча і сказаў, што, калі мне не дадуць грошай, я забяру „Цоя“ і выдам у іншым месцы. Грошай не далі, і я выдаў усенароднага Віцю з камандаю намі створанай газеты *Частный детектив*.

Аднойчы я сустрэў Алеся Асташонка, і ён мне сказаў, што, калі дзялілі заробак за *Ласковый май*, маю долю парэзалі, і ён узяў сабе частку. Я яму: „Дык навошта ты мне гэта кажаш, ты б не браў, сказаў бы — аддайце іх Вову“. „Усе бралі, і я ўзяў!“ Такая бізнес-логіка пачала прарастаць на савецкім полі.

Грошы — спакуса. І не такія, як Асташонак, спакушаліся. У „Крыніцы“ з маёй долі ўзялі ўсе, акрамя Сідарэвіча. Анатоль наагул не ўдзельнічаў у праекце *Ласковый май*, па ідэйных меркаваннях, дзякуй і за гэта.

2. Карты, грошы, незалежнасць

З „Крыніцы“ я сышоў, але я ведаў, куды сыходзіць. Тады ў Маскве працаваў бацька Штырліца Юліян Сямёнаў, які стварыў

Савецкую Асацыяцыю Дэтэктыўнага, Прыгодніцкага і Палітычнага раману — САДППР. І я вырашыў стварыць беларускую асацыяцыю такіх раманаў — БАДППР. Я набраў пакет дакументаў і яе зарэгістраваў.

У „Крыніцы“ мне сказалі, што я павёў сябе няправільна, але я дагэтуль не разумею сваёй няправільнасці, чаму на мяне яны, Някляеў & Со, так пакрыўдавалі? Можа, мая падзеленая доля была замалая?

Ствараючы беларускую асацыяцыю, я вучыўся ў Сямёнава. У яго была *Совершенно секретно*, а ў нас *Частный детектив* з дадаткам *Все обо всем*. Але газеты я не любіў з дзяцінства, таму вырашыў з сябрамі выдаваць часопіс *АВС-детектив*. Чаму мы сталі выдаваць часопіс пад назвай *АВС*? Бо ўва ўсіх каталогах на літару „А“ перад намі стаяла толькі нейкая там *Авиация*. Любы чалавек, які браў падпісны каталог — а тады ўсе верылі ў падпіску — пачынаў яго чытаць з нашага выдання.

Мне вельмі часта задаюць пытанні: адкуль у вас грошы, што такое грошы, адкуль яны бяруцца, як яны робяцца. Дык вось, грошы даюцца людзям, якія займаюцца рэчамі, што прыносяць прыбытак. Ёсць людзі, якія бяруць грошы толькі для таго, каб іх траціць. А ёсць іншыя, якія бяруць крышку грошай і зарабляюць на іх самі ды яшчэ дапамагаюць іншым зарабіць вялікія грошы. Першыя грошы мне дапамог зарабіць путч. У нас з братам Міраславам і з Валодзем Сіўчыкавым было прыватнае выдавецтва. І калі пачаўся путч, да нас у кабінет прыйшоў шэры чалавек і сказаў: „Вам каюк. Нашы прыйшлі. Танкі ў горадзе. І мы ўсё прыватнае ў адзін дзень выкінем на сметнік і забудзем“. Але путч праваліўся, і я прыйшоў да шэрага чалавека і сказаў: „Дзе вашы танкі? Я не буду пісаць пра тваё скоцтва ў газету. А ты падпішаш мне гарантыйны ліст на крэдыт у банку“. Падпісаў.

Мы атрымалі крэдыт, 200 тысяч рублёў. Тады крэдыты бралі ўсе. І ўся гэтая новая замкавая архітэктура вакол Менску — закапаныя ў зямлю крэдыты. Узяўшы крэдыт, мы ўтрох, я, Міраслаў і Вова Сіўчыкаў, думалі, што мы з ім будзем рабіць. Мірык кажа: давайце ўкладзем грошы ў рэкламу. Грошы мы вырашылі ўкладаць не ў тэлевізійную рэкламу, а ў радыйную. Усе слухалі радыё, бо пачалася вайна на Каўказе, здаецца, грузіна-абхазская. Адпаведна, усе навіны — весткі з баёў. І ў гэтыя жахлівыя весткі мы ўставілі: „Падпісвайцеся на часопіс

АВС-детектив, першы ў СССР часопіс, прысвечаны дэтэктыўнаму жанру“. Мы сабралі 365 тысяч падпісчыкаў. За адзін дзень нашыя 200 тысяч ператварыліся ў 8 мільёнаў. Мы, адпаведна, вярнулі крэдыт, у адрозненне ад іншых, хто браў і не вяртаў. Мы разлічыліся з нашай дзяржавай. Больш ніколі ў фінансавыя гульні з дзяржаваю я не гуляў. Калі ёсць у фінансах рэчы небяспечныя, дык гэта браць дзяржаўныя крэдыты. Пачалася страшная інфляцыя, але мы паспелі купіць вагон паперы, і часопіс выдалі.
Ёсць яшчэ адзін праект, вельмі дарагі для мяне і паказальны. Калі разваліўся Саюз, развалілася і прававая сістэма. Зніклі дзяржманаполіі. Напрыклад, на выданне картаў. Міраслаў скеміў, што зараз мы можам карты друкаваць. Нам мастак Чарновіч намаляваў узоры, і мы выдрукавалі 100 тысяч калодаў. Але папаліся вось на чым: калі з друкарняй заключалі дамову, не ўключылі туды пункт, што яны збяруць нам гэтыя калоды. Таму ў нас былі пачкі — шасцёркі асобна, сямёркі асобна... І мы наймалі людзей, якія складалі карты ў каробачкі. Гульні, адным словам.

3. Амерыка, Амерыка, як мы цябе любілі
Усё жыццё я хацеў займацца менавіта кнігамі. І час надышоў. Аднойчы мы сядзелі ў гасцях у аднаго эстонскага выдаўца, Сашы Токарава, і ён кажа: „Слухай, усе перакладаюць і перакладаюць амерыканскія раманы, але гэта няправільна. Іх трэба пісаць!“ Быў час закаханасці ў Амерыку. Прыйшлі іх каштоўнасці, іх кінематограф, прыйшлі іх грошы, даляр прыйшоў. Гэта грошы, якіх мы раней не ведалі, застрахаваныя ад інфляцыі. І з верай у даляр прыйшла вера ў амерыканскія каштоўнасці. Мы выбралі ў якасці спробы фільм „Кашмар на вуліцы Вязаў“. Эстонец пытаецца: „А што з правамі будзем рабіць?“ — „Калі Ван Гог малюе крэсла, ён жа не абавязаны плаціць чалавеку, які зрабіў гэтае крэсла“ — я так сказаў. І зараз у гэтым пераканаць.
Мы прыдумалі схему, як кінематаграфічны матэрыял ператвараць у матэрыял літаратурны. Каб справа ляцела, была створана літаратурная студыя. І за месяц мы панапісвалі дзесяткі кінараманаў, у серыі *Бестселлеры Голливуда* і *Голливуд*.
Быў яшчэ адзін праект, цікавы не з боку літаратуры, а ў якасці

гульні з часам і масавай тэлесвядомасцю. Гэта трохтомнік *Твин-Пикс*. Быў такі серыял Дэвіда Лінча, які паказвалі па адной серыі ў тыдзень. Увесь рускі народ раз на тыдзень сядаў і глядзеў дэтэктыў, каб нарэшце даведацца, хто забіў Лору Палмэр. І мы падумалі, што калі напісаць кнігу за тыдзень, аддрукаваць за тыдзень і на вокладцы напісаць, што мы ведаем, хто забіў Лору Палмэр — мы абгонім тэлевізійны час. За тыдзень напісаўся раман, дзе даваўся адказ чытачу са славянскім менталітэтам: Лору забіў мент, па-амерыканску шэрыф. Кніга мела такі поспех, што мы былі вымушаныя напісаць працяг, тым больш, што мы паспявалі, пакуль па тэлевізіі яшчэ ішоў серыял. У другім томіку ў нас таксама мелася рэалістычная канцоўка: Лору забіў бацька. У нас была кароткая японская відэаверсія гэтага серыялу, і мы ведалі, што яе забраў да сябе касмічны карлік. Але калі б мы сказалі расейскамоўным чытачам, што касмічны карузлік забраў Лору Палмэр, нас бы не зразумелі. Такім чынам, мы не проста выкарыстоўвалі тэлебачанне і відэа, а былі канкурэнтаздольнымі з імі.

Санта-Барбара — яшчэ больш удалы праект: мы напісалі і выдалі 12 тамоў па матывах мыльнай оперы. У нас была свая сістэма, якую я называў „дрэва“. Вылучаўся адзін герой і звязаная з ім сюжэтная лінія. Узнаўляліся эпізоды з фільму, а потым пісаўся свой новы сюжэт.

Але апагеем усёй эпапеі з бестселерамі Галівуда было 8 працягаў знакамітага раману „Знесеныя ветрам“. Я да тае пары ніколі не думаў, што ў ЗША існуе культ вобразаў Рэта Батлера і Скарлет і гэтага фільму ўвогуле... Калі мы пісалі, мы ведалі, што існуе працяг — раман „Скарлет“, і напісала яго не Мітчэл. Раман рабіўся на замову Тэда Торнэра і кампаніі *CNN*. Торнэр у свой час выкупіў у Галівуда правы і зрабіў каляровую версію фільму. І я падумаў, чаму б нам не напісаць працяг? Напісалі. І разгарэўся жудасны скандал. На ўзроўні пасольстваў, на ўзроўні газет *International Herald Tribune* і *New York Times*. Калі наклад „Батлера“ склаў 4,5 мільёны асобнікаў, мы зразумелі, што не мы адны такія разумныя, што і яшчэ хто-небудзь можа сесці нам на хвост. Вырашылі Скарлет і Батлера пахаваць. Прычым той, хто рыхтаваў тэкст, вельмі не хацеў іх хаваць, але я сваёй рукой напісаў: „Батлер умер“. А потым мы павярнулі час назад, і пасля смерці Скарлет і Батлера спакойна напісалі

„Детство Скарлет“, „Мы назовём её Скарлет“, „Тайна Скарлет“...
Але я ніколі не чакаў, што з боку амерыканцаў можа быць такая агрэсіўная рэакцыя. Яны надрукавалі вялізнае інтэрвію з малапрыемнымі каментарамі ў *International Herald Tribune* і *New York Times* з вялікай карыкатурай: Красная плошча, Крэмль, на прыступках сядзіць тоўстая-тоўстая цётка, чытае кнігу, а на вокладцы напісана „Браты Адамчыкі. Знесеныя ветрам“. Потым мне распавялі, што на кніжным кірмашы ў Франкфурце амерыканцы павесілі вялізны плакат „Не купляйце кнігі братоў Адамчыкаў“. Пра нас тэлекампанія *CNN* зняла фільм і паказала па 32 каналах. Фільм пра літаратурных піратаў. Яны даводзілі, што мы не мелі і не маем права браць мітчэлаўскія вобразы і выкарыстоўваць іх як літаратурны матэрыял. Але тут я рашуча адказаў, што калі вы чарапашак ніндзя называеце Леанарда, Мікеланджэла, Рафаэль і Данатэла, вы ў італьянцаў пытаецеся? Па-другое, заканадаўства Еўропы і Амерыкі па аўтарскіх правах вельмі розніцца. У Еўропе няма права на вобраз. У мяне ў фільме быў такі маналог, калі я задаваў пытанні амерыканскаму народу. Пытаўся: скажыце мне, каму ў ЗША належыць права на вобраз Ісуса Хрыста? Калі ў вас няма такога чалавека, значыць права на вобраз не існуе. І калі мы пісалі кнігі пра Скарлет, мы ніякіх правоў і ніякага заканадаўства, тым больш беларускага, не парушалі.
Амерыканцаў, апроч таго, вельмі цікавіў яшчэ палітычны момант. Яны думалі, што я гэта зрабіў на загад КДБ. Бо ў іх ёсць 13 паўднёвых штатаў, якія хварэюць на такую арыгінальную хваробу, як сепаратызм. Рэт Батлер якраз і быў такім патрыётам Поўдня і сепаратыстам. І таму ў нашых раманах шукалі таго, чаго там не было. Яны думалі, што мы на загад КДБ стварылі кніжны праект, які судзейнічаў бы развалу ЗША. І наш Рэт Батлер імі ўспрымаўся некім накшталт імама Шаміля.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]

№ 5 (10) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 29-08-2000
[image]

Адам Глобус
Настаўнікі
Аўтапартрэтныя эцюды

1958(?) год. Баба Ядзя і начоўкі

Ляжу ў начоўках каля печы, ногі спавітыя пялюшкаю. Баба Ядзя рукою палівае мне на грудзі цёплую ваду і кажа: „А-ці-ці, а-ці-ці… Пасмейся, Валодзя. Усміхніся…“. Усміхаюся. „Ён смяецца!“ Да мяне нахіляецца блакітнавокі твар.

1959 год. Бацька і насавая хустачка

Мне купляюць вялікі шматок цукровай ваты. Ем. Салодкая да пякучасці тая залацістая вата. „Які ты мурзаты!“ — бацька дастае насоўку, слініць ражок і выцірае мае шчокі. Хустка пахне вільготным тытунём. Непрыемна. Крыўлюся. „Нельга хадзіць такім мурзатым“, — кажа бацька майму крыўлянню.

1960(?) год. Маці і горкія лекі

Цёмны кабінет акуліста. Выгнутае люстэрка накіроўвае сляпуча-балючае святло мне ў вока. Дакторка закапвае лекі ў вочы. Рэжа так, што ледзь не сікаюся. На вуліцы не лепш. І самы страх ахоплівае ў прадуктовай краме. Процьма людзей у белых халатах. „Баюся, баюся, баюся…“ Маці суцяшае: „Не бойся, гэта не дактары, а прадаўцы“. Дома яна ўгаворвае піць горкую мікстуру з лыжачкі. Каўтаю стаічна і кажу: „Калі трэба, дык трэба“. Сказ пра „трэба“ жыве ў сям’і і дагэтуль.

1961 год. Прабаба Маня і абрабаваныя могілкі

„Ніколі не біце каменнем партрэты на могілках і крыжы не ламіце, а то рукі адсохнуць па самыя плечы. Адсохнуць рукі і паадвальваюцца. Да вайны хлопцы з Латышавых паадломлівалі крыжы з помнікаў; рукі ў іх адваліліся. Потым маці з лыжачкі карміла. І жыдоўскія камяні не чапайце, не перакульвайце, не сядзіце на іх“, — так вучыць мяне і Толіка Кісяля прабаба Маня. Толік, старэйшы за мяне на два гады, верыць, а я не веру.

Цяпер Толік ходзіць у царкву, сведчыць праўду Хрыстову, перажывае, што я не патраплю ў Рай, а я не магу ўявіць, як я сяджу ў Пекле, а Толік глядзіць на мяне з Райскага парку. І тых адсохлых рук уявіць я не магу.

1962 год. Дзед Бронік і насценны гадзіннік

Каля печы вісіць гадзіннік з чорнымі стрэлкамі і срэбнымі гіркамі ў форме яловых шышак. Па гэтым гадзінніку дзед вучыць мяне распазнаваць час. Мы сядаем снедаць, і дзед доўга і старанна расказвае пра палажэнні стрэлак у адпаведнасці з часам. Мне нават дазваляюць указальным пальцам круціць вастрадзюбыя стрэлкі. Першае, што я запомінаю, — 6 гадзін, вялікая ўгору, а маленькая долу.

1963 год. Дзед Бронік і забытая мянташка

Зранку, як усталі, ідзём з дзедам Бронікам касіць траву трусам. Ён з касою, а я з посцілкаю. Адышліся ад дому мо з кіламетр, як дзед згадвае, што забыўся мянташку. Я бягу па яе. І туды, і назад — усё бегма. „Добра ты, Валодзя, бегаеш — роўна. Так і бегай. І рабі ўсё роўненька, не спяшайся“. Каб жа так і атрымлівалася — бегма і роўна.

1964 год. Мама і запалкі

Маці дае ў дарогу запалкі. Запалак сем, як і станцый, што мінаю на цягніку: Мінск-Таварная, Памыслішча, Пціч, Воўчкавічы, Фаніпаль, Бярэжа, Станькова. На кожнай станцыі, калі кранаецца цягнік, я ламаю запалку напалам. А калі цэлых запалак не застаецца, сыходжу на наступнай станцыі Койданава і іду да бабы Ядзі, якая і прыдумала даваць у дарогу запалкі.

1964 год. Эма і Клаўдзія

У дзіцячым садку мяне вучаць адрозніваць навобмацак дрэвы, мыць рукі „кружочкам“, не саромецца, калі прашуся ў прыбіральню, любіць паркі і скверы. Я ўдзячны выхавацелькам

Эме і Клаўдзіі.

1965 год. Бацька і насавая хустачка

Тата прыводзіць мяне ў дзіцячы сад. Каля брамы развітваемся. О, як мне не хочацца ісці ў сад. І раптам згадваю, што забыўся ўзяць насавую хустачку. Бягу праз сквер. Даганяю бацьку. Ён аддае мне сваю насоўку. Яна смачна пахне папяросным тытунём. „Нельга быць такім забыўчывым“, — кажа бацька да маёй стрыжанай патыліцы.

1966 год. Тата і лісты Ван Гога

Тата збіраецца адведаць сваіх бацькоў. Ён бярэ ў мамы грошай, каб набыць сандалі для бабы Броні. Ідзе ў краму і вяртаецца з кніжкаю замест абутку. Бацька прыносіць шыкоўнае, па тым часе, выданне лістоў Ван Гога. У бацькі сентымент да творчасці геніяльнага галандца. Ён нават аўтабіяграфію пачынае са сказа пра Вінцэнта: „Каб я меў шчыры талент Ван Гога, я б намаляваў сваю вёску не ў жоўта-сініх, а ў шарых танах“. Сандалі, вядома, набываюцца і завозяцца ў шарую вёску. А ў нашай кватэрнай бібліятэцы Ван Гог — адна з найдаражэйшых кніжак, па якой я вучуся маляваць, пісаць і любіць брата.

1967 год. Міша Пракоф’еў і намаляваны тралейбус

У трэцім класе 1 верасня да нас прыводзяць другагодніка — Мішу. Ён зусім не ведае арыфметыкі і піша на двойкі. Чытае кепска — па складах, як дашкольнік. А вось малюе Пракоф’еў фенаменальна. Крэйдаю на ўсю дошку ён выкрэслівае тралейбус у перспектыве, з коламі, штангамі і вадзіцелем за шклом. Мне даручаюць вучыць Мішу рашаць задачы і прыклады, а Пракоф’еў бярэцца навучыць мяне маляваць. Малюем мы разам, а арыфметыку я раблю за дваіх. Мастацтва, дзякуючы Мішу Пракоф’еву, захоплівае маю душу.

1967 год. Сяргей Каткоў і Ганна Соладава

Настаўніца ў маіх першых класах — ідыётка, добразычлівая дэбілка і генеральская жонка. Завуць яе Ганна Соладава. Бацькі лічаць, што прыроднай дабрыні дастаткова для пачатковай адукацыі, такое меркаванне трымаецца да той пары, пакуль у маім сшытку не з’яўляюцца сказы: „Кравец кроіт кровлю“ і „Маша памыла раму і шыбініцу“. Беларускую мову прыходзіць выкладаць іншы добры цяльпук па мянушцы Фантамас, які ўрокі навылёт чытае вершыкі і апавяданні з кнігі „Арляняты“. Пэўна, таму я з радасцю езджу на трамваі ў студыю да мастака Сяргея Каткова і малюю індзейцаў, якія самаахвярна змагаюцца

за незалежнасць з бледнатварымі бандытамі-акупантамі. Калі гутарка заходзіць пра першага настаўніка, я згадваю Сяргея Пятровіча Каткова.

1968 год. Каміля Мілько і Пражская вясна

Сястра матчынага айчыма — цётка Каміля — у 1968 годзе выходзіць з камуністычнай партыі. І не проста выходзіць, а з гвалтам на ўсё Койданава. І хто б мог падумаць, што ў нашым мястэчку пачнуцца хваляванні з-за ўводу савецкіх салдат у Прагу! Цётка Каміля ваявала: абараняла Піцер, а потым прайшла палову Еўропы. Якраз Прагу яна й вызваляла. Чэхі віталі савецкае войска. А тут раптам чэхі сталі здраднікамі, і савецкія танкі едуць па пражскім бруку. Каміля Мілько, дырэктарка гатэлю, надзяе пінжак з медалямі ды ідзе ў райкам партыі. „Чэхі не маглі здрадзіць!“ — „А вось і здрадзілі“. — „Не веру! А калі яны здраднікі, дык вось вам мой партбілет!“ Кідае і сыходзіць. У яе забіраюць прэстыжную працу. Але яна ніколі не пашкадуе пра свой учынак. Яна робіць з паперы вянкі на магілу. Уся Каміліна хата ў тых вянках. Мужны чалавек — цётка Каміля. Я вучуся ў такіх жанчын.

1969 год. Святлана і дуля з пальцаў

У трэці клас я хаджу на трэцюю змену, у 16.15. У класе 57 вучняў, і мы сядзім па трое за двухмеснай партаю. Школа перапоўненая. Вучоба ідзе абыяк. Маладзенькая настаўніца Святлана не спраўляецца з дысцыплінай і ставіць калы па паводзінах. Тых калоў толькі я збіраю поўны дзённік. І апошні атрымліваю за фігу. На вачах у класа я паказваю Святлане дулю. Яна бяскрыўдна разважае пра тое, што разумныя хлопцы ажэняцца з разумнымі дзяўчатамі… „Адамчык возьме замуж Стэльмах“. „Во на!“ — кажу я і скручваю з пальцаў кукіш. Пасля заняткаў Святлана просіць правесці яе дамоў. Зусім нечаканая прапанова. Па дарозе яна кажа, што любіць мяне і не хацела пакрыўдзіць, а самае галоўнае – я мушу змяніць свае хамскія паводзіны. Я слухаюся і больш не паказваю настаўнікам хвігаў.

1970 год. Дзед Валодзя, камень і пуга

„Валодзя, ты на Кумагеравых і Лазовікавых не глядзі, яны дурнаватыя і будуць цябе падвучваць каменем карову запыняць, не слухай, лепш падбяжы і пугай яе джыгні. А каменем можна карову скалечыць, вока выбіць. Бяды не

абярэшся. Ты лёгкі і бегаеш добра, табе прабегчыся — толькі сілы набрацца“. Слухаю я дзеда Валодзю, а сам думаю: нічога той карове не будзе, калі каменем упяку па скабах; думаць думаю, але запыняць лётаю з пугай.

1971 год. Анатоль Александровіч і дарослыя малюнкі

Мой сваяк Анатоль Александровіч вучыцца на мастака. Я захапляюся ягонымі малюнкамі. І, як магу, пераймаю Анатолеву манеру. Менавіта ў Александровічавых акварэлях я бачу розніцу паміж дарослым і дзіцячым малюнкамі. Дзякуючы Анатолю я станаўлюся дарослым.

1972 год. Мама і Жан-Батыст Сымон Шардэн

Ад першага наведвання Эрмітажу, куды мяне прыводзіць маці, застаецца яркі ўспамін пра невялікае палатно Шардэна „Нацюрморт з атрыбутамі мастацтва“. Я набываю паштоўку з рэпрадукцыяй сціплага рэчавіка і падоўгу разглядаю яе. Пазней, у гісторыі мастацтва, я вычытваю сказ: „На вастрыі пэндзля ў Шардэна было само жыццё“. Так-так, менавіта тое жыццё і ўражвае маю душу школьніка.

1973 год. Барыс Забораў і Поль Сэзан

Бацька не верыць у мае мастакоўскія здольнасці і адгаворвае паступаць у вучэльню. „Скончы школу, а там пабачым“. Я ўпіраюся. Бацька запрашае свайго перакладчыка на расейскую Навума Кісліка і мастака Барыса Заборава, каб ацанілі мае малюнкі. Забораў хваліць восеньскія краявіды. Кажа: „Калі ў яго на кніжнай паліцы стаіць альбом Сэзана, ён на правільным шляху“. Дзякуючы Сэзану і Забораву бацька пагаджаецца на маё паступленне ў мастацкую вучэльню.

1974 год. Святлана Шчамялёва і кавалачак крэйды

Калі не люблю які з прадметаў, дык гэта фізіку. Ненавіджу фізіку, так званую навуку аб прыродзе, з вельмі простай прычыны: у фізіку, як у сметніцу, скінулі ўсё, што не трапіла ў іншыя дакладныя навукі. Промні, вага, хуткасць, атамы, вектары блытаюцца ў маёй галаве. На апошнім іспыце па фізіцы я вярзу суцэльную абракадабру. Выкладчыца, жонка мастака Шчамялёва, задае мне дадатковае пытанне, і нервы мае ўспыхваюць. У руках я трымаю кавалачак крэйды, які разломваю напалам. Белыя драбочкі пырскаюць з пальцаў. „Валодзя, нашто так хвалявацца, я стаўлю табе чацвёрку“. Паводле законаў той самай фізікі разламаць маленькі кавалак

крэйды я не павінен быў бы, а вось жа трушчу.

1975 год. Аляксей Марачкін і жодзінскія сутарэнні

Мастак Аляксей Марачкін ніколі не выкладаў у мяне, але ягоны прыклад — мастак павінен быць сумленны перад самім сабою — натхняе. Першы раз я бачу Аляксееву майстэрню ў жодзінскіх сутарэннях. Уражвае. Вядомы мастак, а працуе ў сутарэннях. Толькі як працуе... Колькі вучняў мае… З Жодзіна ў мастацкай вучэльні займаецца процьма студэнтаў, і ўсе яны абіралі творчы шлях дзякуючы Марачкіну. Гэты перыяд — жодзінскі-падземны — я дагэтуль лічу найбольш плённым у творчасці Аляксея.

1976 год. Уладзімер Караткевіч і крэслы

З дому № 68 на вуліцы Апанскага, які стаіць насупраць Кальварыйскіх могілак, я з бацькамі і братам пераязджаю на вуліцу Маркса ў дом № 36. Пасля бруднага пад'езду, што смярдзіць смеццеправодам, мяне радуе не столькі чысціня новага пад'езду, колькі крэслы на кожнай лесвічнай пляцоўцы. Крэслы паставіў Караткевіч для сваёй старэнькай маці. Тады яшчэ не было кодавых замкоў і дамафонаў, таму крэслы намёртва прымацоўваюцца дротам да батарэяў. Вось такая ўвага да любімага чалавека застаецца мне прыкладам. А што больш за ўсіх на свеце Уладзімер Караткевіч любіў сваю маці, скажа кожны, хто яго ведаў.

1976 год. Сандзя Адамчык і фізкультура

Бацькаў стрыечны брат — Сандзя — хацеў стаць савецкім генералам, але ў савецкіх маршалаў і генералаў ёсць свае дзеці, якія не адмаўляюцца стаць наследнымі генераламі. І колькі Сандзя ні намагаецца, генералам не становіцца, хоць і вучыцца ў Маскве, і служыць у Казахстане, дзе мае ядзерную ракету. „За колькі ты прабягаеш 100 метраў?“ — пытаецца Сандзя. Я не ведаю, як не ведаю, на якую вышыню і даўжыню магу скочыць. „Што ж ты за мужчына, калі не ведаеш?“ Спрачацца з палкоўнікам Адамчыкам я не хачу, але войска вельмі не люблю, таму зазначаю, што гранату кідаю на сорак пяць метраў. „Гранату на 45 — гэта добра. Толькі трэба бегаць!“ І я пачынаю бегаць і бегаю ў парку амаль штодня.

1977 год. Міхась Савіцкі і інстытут

Каб паступіць у інстытут, на аддзяленне манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, даводзіцца шукаць падтрымкі. Такая завядзёнка: рэкамендацыі, паручыцельствы, пераправеркі. Тым

больш, што мой выкладчык жывапісу Альгерд Малішэўскі настойліва раіць паступіць вучыцца на графіка. „Будзеш кніжкі афармляць, булку з маслам есці“, — агітуе мэтр. Ён не толькі кажа, ён дапамагае арганізаваць мне і Валодзю Сцепаненку выставу. Запрашае на адкрыццё галоўнага інстытуцкага графіка — Васіля Шаранговіча з галоўным жывапісцам Пятром Крахалёвым. І рэкамендуе Сцепаненку і мяне. І вось тут маё: „А я ўсё адно буду манументалістам“. Карацей, чыста ў сваім стылі, на роўным месцы спатыкаюся і нажываю ворага. Каму патрэбны студэнт, які пярэчыць выкладчыку? Высветлілася — Савіцкаму. Міхась Савіцкі разам з драматургам Мікалаем Матукоўскім глядзяць мой дыплом і тэлефануюць да Вашчанкі — галоўнага манументаліста. У інстытут мяне бяруць.

1977 год. Алег Хадыка і свядомасць

Філосаф Алег Хадыка пераконвае мяне, што свядомасць чалавека ўтвараюць чатыры рэчы: мастацтва, эротыка, рэлігія і навука. Абвергнуць гэтую тэзу не магу. Пакуль што не магу.

1978 год. Баба Броня і ведзьмакі

Баба Броня кажа, каб не даваў рукі старым людзям, як яны маюць паміраць. Тлумачыць тым, што чортава сіла не дае лёгкай смерці, а праз руку можна гэтую сілу перадаць іншаму чалавеку, што жанчыне лягчэй перадаваць хлопцу, а мужчыну лягчэй, калі руку падасць дзяўчына. Баба Броня, калі тое расказвае, сядзіць на ложку, а я тым часам, седзячы за сталом, малюю чырвоныя дзверы дзедавай хаты. Праходзіць, можа, хвілін пяць, я і забываю пра бабіны словы. А яна раптам на ўсю хату: „Прасіць будуць, а ты не давай рукі!“. Так і запамінаецца папярэджанне.

1978 год. Алесь Жук і першая публікацыя

Алесь Жук прачытвае мае вершы і кажа: „Надрукую“. Кажа і нешта пазначае ў нататніку. І выдрукоўвае мае опусы ў тыднёвіку „Літаратура і мастацтва“. Ніводная публікацыя не прынесла больш радасці за тую першую. Ніводзін з рэдактараў не ўмее так трымаць слова, як Алесь Жук. Толькі я ўсё саромеюся папытаць, а што ён пазначаў у сваім чароўным нататніку.

1978 год. Іван Стасевіч і мая амбітнасць

У падручніку па гісторыі ёсць фотаздымак: на фоне спаленага ў 1945 годзе берлінскага Рэйхстагу стаіць сын палка Іван

Стасевіч. Легендарны чалавек выкладае ў мяне жывапіс. Аднаго разу, пастаяўшы каля майго палатна, ён гаворыць: „Я ўсё думаю, чаму гэта ты нікога не слухаеш, а малюеш так, як захочаш. А цяпер вось разумею: ты хочаш, каб пра цябе ўсе гаварылі. І табе неістотна, што скажуць — кепскае ці добрае. Можа, так і трэба. Малюй сабе, што хочаш…“

1979 год. Баба Броня і палітыка

У вёску да бабы Броні я прывожу паказаць свае вершы з фотаздымкам, надрукаваныя ў часопісе „Маладосць“. „Вось і ты, як і твой бацька Чэсь, пачаў займацца вершыкамі. А я й яму казала, і табе скажу… Кепскі гэта занятак. Палітыка. А палітыкаваць не трэба. Не палітыкуй, Валодзя. Уся гэта палітыка заканчваецца аднолькава, давядзецца ўцякаць у Польшчу ці куды далей. Мой брат, Ян Шайбак, таксама палітыкаваў, а цяпер каля мора ў Польшчы жыве і сюды прыехаць не можа…“

1979 год. Гіём Апалінэр і Радзіма

Вершамі Апалінэра я захапляюся доўга. Чытаю і перачытваю па-беларуску ў перакладах Эдзі Агняцвет, па-расейску, па-польску і нават знаёмага француза Бруна Баду ўгаворваю пачытаць уголас арыгіналы. Я збіраю ўсё, што магу знайсці пра геніяльнага лірыка XX стагоддзя. Я малюю сто, а можа і болей партрэтаў Гіёма Апалінарыя Кастравіцкага, нашчадка тых, хто са зброяю ў руках адстойваў польскую і беларускую дзяржаўнасць. Малюю забінтаваную галаву чалавека, параненага пры абароне Радзімы. Апалінэр мне падабаецца ўвесь цалкам з цёплымі кальсонамі, якія вельмі любіў насіць.

1980 год. Уладзімер Ракіцкі і маляванне

Мастак Уладзімер Ракіцкі вучыць мяне маляваць. Уласна малюнку ён мяне і не вучыць. Мы разам малюем увечары. Калі ў маіх малюнках ёсць хоць кропля мастацтва, дык дзякуючы таму, што я малюю поплеч з Ракіцкім.

1980 год. Міхась Раманюк і барока

Нармальныя адносіны з мастацтвазнаўцам Раманюком складаюцца ў мяне, толькі калі станаўлюся літаратарам. Студэнтам я канфліктую з ім. І Раманюк помсціць. На іспыце па гісторыі мастацтва я ўсё выдатна распавядаю яму пра барока, стыль, якім захапляюся. А ён ставіць чацвёрку, за мае фанабэрыстыя паводзіны на лекцыях. Помсціць. Зрэшты, за паводзіны мне ставяць і тройкі па малюнку, і калы па

архітэктурнай кампазіцыі… Варта ўсё ж вярнуць адзнаку па паводзінах ва ўсіх навучальных установах. А то выдатна ведаеш барока, а табе заніжаюць адзнаку з-за паводзінаў — крыўдна.

1981 год. Уладзімер Караткевіч і алкаголь

Аднойчы, прачытаўшы мае пачаткоўскія вершыкі, Уладзімер Караткевіч кажа: „Ніколі не пішы ў п'яным стане". І я не пішу ніводнага нецвярозага радка. Гэтую параду я выконваў і выконваю. А вось другую яшчэ трымаю пра запас. „Надыдзе дзень, калі не зможаш напісаць ні радка: ні прозы, ні вершаў, ні крытыкі… Тады сядай і пішы фантастыку. У цябе можа атрымацца фантастыка", — раіць Караткевіч. Я ж уласна фантастыкі так ні разу і не пісаў. Казкі пісаў. Фантастыка чакае свайго часу.

1982 год. Уладзімер Караткевіч і мой першы зборнік вершаў

Уладзімір Караткевіч дапамагае мне стаць афіцыйна прызнаным паэтам. Ён піша рэцэнзію на першы рукапіс майго зборніка пад непаэтычнай назваю „10 на 10". Адзіная вартасць тых вершаў, што пісаліся яны па-беларуску. А Караткевіч знаходзіць яшчэ некалькі станоўчых якасцяў.

1985 год. Уладзімер Коўзусь і паэзія

Майстар манерных роспісаў — Уладзімір Коўзусь — здзіўляе мяне сваім тонкім стаўленнем да паэзіі… Сустракаемся мы выпадкова ў кавярні. Ён пытаецца, чым я займаюся. А я ганарыста адказваю: пішу вершы. Коўзусь дастае з кішэні нататнік і кажа, што сам вершаў не піша, а толькі перапісвае чужыя. „Вось верш-грэгерыя пра цябе на глобусаўскую тэму: "У жылах геаграфічных картаў цячэ блакітная кроў"". Дзякуючы Коўзусю і я пачынаю перапісваць чужыя думкі ў нататнік, і яны дзіўным чынам робяцца маімі.

1986 год. Міхась Стральцоў і цэнзура

Міхась Стральцоў піша прадмову ўжо да 101-га варыянту зборніка вершаў „Парк". Караткевіч памёр. Ратуе зборнік Стральцоў і выратоўвае. Кніга выходзіць праз сем гадоў ад таго, як была напісаная. За гэтыя сем гадоў я ўзненавіджваю савецкі лад і ягоную сабачую цэнзуру.

1987 год. Уладзімер Някляеў і канец майго андэграўнду

Някляеў выцягвае мяне з андэграўнду ў літаратурна-чыноўніцка-дзяржаўны свет. Ён больш хоча выцягнуць Анатоля Сыса. Толькі Сыс непад'ёмны, а я сам лезу з сутарэнняў, дзе працую мастаком камісійных крамаў. Чаму я вучуся ў

Пракопавіча, дык пазбягаць ягоных памылковых крокаў. Да прыкладу, не сябрую з маладзейшымі за сябе, з такіх стасункаў адны непрыемнасці.

1988 год. Анатоль Сідарэвіч і дамавікі

„Прачытаў я тваіх „дамавікоў“ у „Літаратуры“ і скажу так: пазабаўляўся, і досыць, болей не пішы ты, хлопча, гэтых брыдкасцяў“, — раіць крытык Сідарэвіч.

І кожнага разу, дапісваючы чарговую показку пра сучасніка-дамавіка, думаю — вось гэты апошні, і можна будзе сказаць Анатолю: „Больш не пішу пра суайчыннікаў-пачварнікаў…“. І такім чынам больш за сто разоў.

1988 год. Павал Якубовіч і капейкі

Лёс зводзіць мяне з Якубовічам у рэдакцыі часопіса „Крыніца“. І не проста зводзіць, Павал Якубовіч загадвае аддзелам сацыяльных праблемаў, а я адзіны ягоны падначалены. З трохгадовай сумеснай працы я запамінаю тры рэчы: у кожным тэксце павінна быць хоць бы адна дакладна сфармуляваная думка; трыццаць капеек лепш за дваццаць капеек; іерархію неабходна ствараць, паважаць і любіць, без іерархіі пачынаецца хаос і бязладдзе. Менавіта з Якубовічам я раблю газетку накладам 13 000 000 асобнікаў, з думкамі ў тэкстах і коштам 30 капеек.

1988 год. Максім Танк і праўда з гумарам

Сям’я адной высокапастаўленай асобы бачыць у героях майго апавядання „Койданава“ сябе і ўсчынае гвалт на ўвесь Менск. Калі я ўступаю ў Саюз пісьменнікаў, да мяне падыходзіць Максім Танк і кажа: „Чытаў тваё “Койданава”. Так і пішы. Праўду з гумарам“. Больш з Танкам я ні разу пра творчасць не гавару. Адно вітаюся.

1988 год. Анатоль Ярмоленка і беларускі кліп

Кіраўнік ансамбля „Сябры“, спявак Анатоль Ярмоленка, выконвае песню на мае словы. „Сябры“ нават кліп здымаюць з песняю „Гары яно гарам, такое каханне“. Тады ўсім падабалася. Цяпер успамінаю — смешна робіцца.

1988 год. Каміля Мілько і касцёл

Вяду я на тэлевізіі публіцыстычную перадачу „Крок“, расказваю, паказваю і каментую злабадзённыя тэмы. Тады й прыязджае да мяне цётка Каміля. „Дапамажы, Валодзя, касцёл у Койданаве вярнуць вернікам“. Цётка Каміля — старшыня суполкі па вяртанні касцёла. Старая кабета, а вось першая ідзе

за справядлівасць змагацца. Я ў жывым эфіры і кажу, што койданаўскія камуністы не аддаюць каталікам сабор. Тлумачаць тым, што ў касцёле музычная школа і дзетак няма куды дзець. Я раю ім перавесці музшколу ў райкам партыі, а касцёл вярнуць тым, хто яго будаваў. Дзейнічае. Бо цётка Каміля ўжо і подпісы сабрала, і ўсе інстанцыі абышла, і TV у маёй асобе арганізавала… Павучыцца варта. Касцёл вяртаецца вернікам.

1989 год. Леанід Галубовіч і бацькава проза

Выпадкова сустрэўшы Лёню Галубовіча каля галоўпаштамту, я чую самыя грунтоўныя кампліменты пра бацькаў раман „Год нулявы“. Афіцыйная крытыка лічыць той раман за горшы. А Лёня хваліць і заклікае мяне вучыцца ў бацькі і браць за ўзор менавіта „Год нулявы“. Дзякуючы Галубовічу я два разы перачытваю той таўсценны том пра 1940 год у Беларусі.

1990 год. Алесь Асташонак і мае апавяданні

Свае першыя творы я чытаю сябрам Сцяпану, Клімковічу, Шайбаку, Сіўчыкаву… У нас выдатны літаратурны семінар. Потым семінар пачынае развальвацца, а жаданне пачуць нейкае слова пра свой твор не ад рэдактара, а ад сябра застаецца. Я пачынаю даваць апавяданні Алесю Асташонку. Ён, як старэйшы таварыш, вельмі тактоўна робіць заўвагі і хваліць. О, як патрэбна маладому пісьменніку гэтая пахвальба, каб хто ведаў… Асабліва Алесь вылучае маё апавяданне „Акадэмічны адпачынак студэнта Дз.“. Акрамя яго, ніхто на „Дз.“ не звяртае ўвагі дагэтуль.

1990 год. Лявон Барткевіч і амерыканская кружэлка

Незадоўга да ад’езду Лявона Барткевіча ў ЗША мяне з ім знаёміць кампазітар Яўген Магаліф. Барткевіч запісвае песню на мае словы, і яна выходзіць на кружэлцы ў Штатах. Кружэлка ў мяне прападае, як прападае і прайгравальнік для вінілавых дыскаў.

1990 год. Аляксандр Кішчанка і мая апошняя карціна

Я кідаю выяўленчае мастацтва. Пішу палатно з амбітнай назваю „За два імгненні, як чымсьці стаць“, дзе жывапіс імкнецца ператварыцца ў графіку, а графічныя элементы намерваюцца скласціся ў літары… Пішу і кідаю. І вось па журналісцкіх справах апынаюся ў майстэрні Аляксандра Кішчанкі, які раптам пачынае агітаваць мяне вярнуцца ў мастацтва. Ён расхвальвае мае студэнцкія працы, а я думаю:

ёсць у тым рацыянальнае зерне. Трэба маляваць. Я малюю і зараз, але выключна для сябе, і вельмі дзіўлюся, калі малюнкі купляюць.

1990 год. Казлоў і комікс

Ка-а-злоў… Ну і прозвішча. Не адзін казёл, а шмат казлоў. Ну, проста казёл, і тое лепш. І гэты Казлоў дзеліць грошы, што ў выдавецтве „Юнацтва“ ідуць на мастацкае афармленне кніжак, вялікія грошы за савецкім часам. І на калідоры гэтага выдавецтва Казлоў падносіць да майго вуха свой свіны нос і шэпча: „Ад такіх, як ты, мы пазбаўляемся адразу. Больш не прыходзь!“ А я набычваюся і адпрэчваю: „Не ты вырашаеш, хто кнігі афармляе. Маляваў і буду маляваць!“ І малюю я з Уладзімірам Сцяпанам дзевяноста шэсць малюнкаў у комікс па матывах аповесці Караткевіча „Дзікае паляванне“. І выходзіць наш комікс накладам 250 тысячаў. Даводжу я казловым, што не такія кабанчыкі, як яны, вырашаюць лёс беларускай кнігі, але менавіта такім я ўдзячны за навуку: бяздарных трэба сапраўды адпрэчваць, а здольны дарогу знойдзе.

1991 год. Валеры Панамароў і тутэйшыя

З кінарэжысёрам Валер’ем Панамаровым я экранізую „Тутэйшых“ Янкі Купалы. З-за свайго характару я не трапляю ў тытры. Ну і чорт з імі, з тытрамі. Поўнаметражны каляровы фільм для школьнікаў усё ж атрымліваецца, як сказаў бы школьны настаўнік, на „моцную тройку“. Зрэшты, самае трывалае ў жыцці робіцца на „тройку“.

1992 год. Сяргей Дубавец і грошы

У кожнага літаратара мусіць быць рэдактар, неабвержная аксіёма. Мне шанцуе. У мяне ёсць рэдактар, Сяргей Дубавец. Аднойчы ён прагаворваецца: „Каб у мяне былі грошы, я б скупіў усю тваю творчасць наперад і друкаваў толькі тое, што лічу патрэбным!“ Цікава, а колькі грошай патрэбна, каб мяне скупіць на карані? Шмат! А шмат, гэта колькі?

1993 год. Вера Маркава і заняткі

„Калі не знойдзеш добрага занятку, кепскія думкі, намеры і ўчынкі самі знойдуць цябе“, — кажа мне Вера Маркава. І сапраўды так, не трэба змагацца з кепскімі заняткамі, бо на месца кепскага можа стаць яшчэ горшае. Колькі п’яніцаў ператвараецца ў наркаманаў? Рыторыка. Варта шукаць дастойныя заняткі, знаходзіць і прысвячаць ім сваё жыццё. Так Вера Маркава ўвесь свой доўгі творчы шлях прысвячае

пераўвасабленню класічнай японскай літаратуры на расейскую мову, лепш за яе гэта не робіць ніхто, ні тады, ні цяпер.

2000 год. Бацька і ягоныя нататкі

Калі я прыходзіў да бацькі за некага прасіць ці прыносіў опус, напісаны з кімсьці разам, ён казаў: „Валодзя, глядзі сябе, пішы сваё, займайся сабою“. І паўтаралася тое шматкроць. А тут я чытаю ў бацькавых лірычных запісах: „Які гэта страшны выраз — глядзі сябе“.

Менск, 1999—2000 гады

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.gis.com.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 5 (10) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **29-08-2000**
[image]

Вячаслаў Адамчык
Фатальная лічба „3“
Генеалогія, альбо Радавод Адамчыкаў

Прозвішча Адамчык паходзіць з памежжа Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай (Берасце). На Слонімшчыну яно прыйшло разам са знакамітымі Агінскімі. Падкаморына Віленская Барбара з роду Агінскіх, жонка Мальхера Шэмета, сакратара камісіі па складанні Літоўскага Статуту, у 1651 годзе „вечным правам набыла за шэсцьсот коп грошай лічбы літоўскай з баярамі, падданымі і ўсімі прыналежнасцямі“ навакольныя фальваркі і вёскі і тут жа далучыла іх да маёнтку Наваельня, да якога ўжо прыналежала наша яцвяжская Варакомшчына. Так у тутэйшай мясцовасці з’явілася прозвішча Адамчык. Ад цівуноў ці аканомаў — невядома.
Пасля Шэметаў маёнтак перайшоў у спадчыну Шукевічаў.
У Гарадзенскім гістарычным архіве я шчасліва натрапіў на абрывак інвентару (1843) маёнтку Наваельня, які чамусьці апынуўся ў фондах Ашмянскага раёну. Але радасці маёй не было межаў — там пералічваліся назвы мне знаёмых і блізкіх вёсак. Да панскага двара іх прыналежала ажно дваццаць тры з мястэчкам Раготна і шасцю фальваркамі. У суседніх ад нашай Варакомшчыны Аханянах, невялікай вёсцы на 9 двароў, я з не

меншым дзівам прачытаў прозвішчы двух Адамчыкаў — Тодара і Сымона. Багацейшым аказаўся Тодар, не толькі на авечкі, свінні і валы ў хляве, але і на мужчынскія душы ў хаце — іх было ажно сем. І тут у дакумент умешваецца даўняе варакомскае паданне. Пабіўшыся з сынамі — адзін праз гэта павесіўся, а другі ўцёк з хаты — багаты гаспадар у Варакомшчыне Язэп Аблажэй, застаўшыся без дужых мужчынскіх рук, пасадзіў у сані і павёз у суседнія Аханяны сватаць сваю дачку. Павёз да братоў Адамчыкаў — Тодара і Захара, у якіх было найбольш хлопцаў. Аднога з іх — Янку — Язэп Аблажэй і ўзяў да свае дачкі прымаком.
Дзея гэта адбылася яшчэ напярэдадні адмены прыгону. Пасля цесцевай смерці Янка паклікаў да сябе ў помач малодшага брата Алеся (1834—1919). Нарадзіўшы чацвёра дзяцей, Аблажэіха гвалтоўна памерла. Янка Захараў Адамчык мусіў жаніцца другі раз. І браў ён удаву Ганну з вёскі Дудзічы (як сведчыць назва, там было, напэўна, нямала музыкаў-дудароў), якая, ажаніўшы сына Захара і заручыўшы дачку, кінула гаспадарку і сама пайшла замуж. Ад яе ўжо і нарадзіўся Тодар, будучы мой дзед Фёдар, сын Івана і Ганны, Адамчык (1865—1943).

Неўзабаве памірае Янка. Гаспадарку ў свае рукі бярэ старэйшы яго сын Лявон (іншы раз у дакументах — Леў; 1855(?)—1940). Дзеда ж майго, сірату Тодара, гадавала старэйшая сястра Хвядора, што была замужам у Ліжэйках, якія таксама, як і Варакомшчына, прыналежалі да панскага двара Наваельня, толькі былі іншага фальварку — Зосін. Падросшы і падужэўшы, Тодар у зводнай сястры быў і за пастуха, і за малацьбіта, і за сяўца.
Але звернемся да архіўных дакументаў. Згодна з інвентаром маёнтку Наваельня ад 5 снежня 1845 году, прыгонны Язэп (Іосіф) Аблажэй, дзевяты з адзінаццаці гаспадароў у вёсцы „Веракомшчызна“ 3-га фальварку Ахонаў (Ахонава — цяпер Варакомскія хутары), урабляў 7 дзесяцінаў* і 2010 сажняў добрай, 6 дзесяцінаў і 1900 сажняў сярэдняй і 6 дзесяцінаў ніжэйшай зямлі. Трымаў чатыры валы, аднога каня, тры каровы, сямнаццаць авечак, трое свіней і меў адзінаццаць калодаў пчол.

*Дзесяціна — 1,0925 га
Як тут не пасадзіш у сані дачку і не паедзеш сватаць яе за дужага хлопца, каб даглядзець спраўную гаспадарку!?
І можна было б жыць, як варакомцы кажуць, на шырокую нагу, каб не прыгон. Згодна з павіннасцю варакомскі селянін мусіў адбываць на пана тры з вупражжу (канём, валом) і тры пешыя дні. Гэта кожны тыдзень. Былі яшчэ знакамітыя гвалты, калі з хаты выходзілі ўсе (вядома, рабочыя), пакінуўшы на варце толькі аднога. На выпадак пажару ці зладзейства. Гвалты прыходзіліся найбольш на жніво і сенаванне.
Апрача таго была грашовая павіннасць — чынш. Варакомцы, надзеленыя 19 дзесяцінамі ворнай зямлі, плацілі ў год
1 р. 44 кап.

Не абыходзілася і без рэчавай даніны з сялянскага двара: па 3 курыцы, па 10 яек, па 3 талькі пражы, па 1 фунце неваду і 2 фунты сушаных грыбоў.
Сытна, уежна і ўлежна, як сказаў бы варакомец, жылося панам і падпанкам Шукевічам і Лахніцкім. Але час адмераны ўсяму, у тым ліку і прыгону. Праўда, дзед мой не зведаў яго.
У шаснаццаць ці семнаццаць гадоў Тодар вяртаецца ў родную варакомскую хату. Лявону, старэйшаму брату, гэта не ў нос — гаспадарку прыйдзецца дзяліць на двух. Прылучыўшы момант, калі слабейшы і малаярослы Тодар аказаўся ў варыўні ці стопцы, Лявон (я помню гэтага высокага сіва-рудаватага дзеда, па мянушцы Балабан**) разам са сваёю Аўдоцяю, схапіўшы за горла, намагаюцца яго задушыць. Невядома, чым скончылася б усё, каб на гэты лямант не надышла суседка Міхаліна…

**Балабан — даволі вялікі сокал, рыжавата-буры, якога калісьці выкарыстоўвалі ў якасьці лоўчай пташкі.
І гаспадарку сквапнаму Лявону прыйшлося падзяліць ужо на трох — яго, Лявона, зводнага брата Тодара і іхнага дзядзьку Алеся Захарава Адамчыка.

Як успамінаў мой бацька, Ладзімер Тодараў Адамчык, дзеду дасталася траціна — трэцяя частка валокі.
Атрымаўшы надзел, Тодар нарэшце пачаў падумваць пра жаніцьбу. Жаніўся ён ужо сталым хлопцам з беднаватай, як і сам, дзяўчынай. Браў яе, маладзенькую, з суседняе вёскі Рабкі.

Гэта пацвярджае мая выпіска з метрычнай кнігі Наваельненскай царквы Слонімскага прыходу Літоўскай духоўнай кансісторыі:
„Частка другая. Аб шлюбе
4 ліпеня 1893 году
Селянін вёскі Варакомшчына Фёдар Іванаў Адамчык, праваслаўнага веравызнання, першым шлюбам, 25 гадоў (на самой справе дзеду было 28 гадоў).
Сялянка вёскі Рабкі Фядора Варфалам'еўна Таўкун, праваслаўнага веравызнання, першым шлюбам, 20 гадоў.
Паручыцелі па нарачоным: сяляне вёскі Варакомшчыны Піліп Восіпаў Пыцель і Іван (Янэчак. — *В.А.*) Матэвушаў Нагорны.
Па нарачонай: сяляне вёскі Рабкоў Сцяпан Станіславаў Кузюк і Лявонці Антонаў Адамчык.
Настаяцель Наваельненскай царквы Якаў Іллюкевіч".
Баба Тадора, як прыгадваў бацька, пражыла сорак пяць гадоў. „Хварэла. Папрасіла есці і памерла. На Сёмуху, 7 чэрвеня 1918 году".
Дзед Тодар да канца дзён сваіх застаўся ўдаўцом.
Яны нарадзілі сямёра дзяцей: Стэфаніда, альбо па-вясковаму Стэпка, Настася, Юлька, Васіль, Маня, Ладзімер (мой бацька — *В.А.*), Змітрук.
Старэйшая з іх — цётка Стэпка — выйшла замуж у суседнія Рабкі за ўдаўца Петрука Грыцука (1883—1958) і нарадзіла яму чатырох сыноў і дачку Алену. Пражыла яна з усіх Тодаравых дзяцей найбольш — дзевяноста гадоў і два тыдні (1894—1984). Як прызнавалася мне, ніколі ў доктара не была: „Сорамна ж раздзявацца".

Малодшая за яе Настася, бо Юлька памерла дзіцем, выйшла замуж першаю за багатага ў вёсцы хлопца Янку Нагорнага. Ён трохі быў адукаваны. Падвыпіўшы, на вяселлях ці хрэсьбінах чытаў па памяці раздзелы з „Новай зямлі" Якуба Коласа. У былой Заходняй Беларусі гэта была папраўдзе народная паэма. Дай, Божа, нашым творам мець сёння такую папулярнасць. Янка Нагорны некаторы час быў сябром гміннай (валасной) рады, за што ў 1939 годзе, з прыходам бальшавікоў, быў арыштаваны і адпраўлены на лесапавал у Архангельскую вобласць. Цётку Настасю з пяццю дзецьмі на згоне зімы 40-га году вывезлі ў Казахстан, пад Акмолінск.

З двума стрыечнымі братамі я сустрэўся праз трыццаць пяць гадоў. Яны ўспаміналі, як у стэпе лавілі суслікаў. Маці смажыла іх. І гэтым сям'я выратавалася ад страшнага голаду. Пасля вайны Нагорныя пераехалі ў Польшчу. Там, у вёсцы Гжыбяны каля Лягніцы, цётка Настася і памерла. Гаварыла яна па-беларуску, і польскія дактары не маглі разабрацца, што значыць „баліць сярэдзіна і крыж".

Дарэчы, два мае стрыечныя браты апынуліся ў польскім войску. Адзін — у дывізіі Андэрса, што была сфармаваная на тэрыторыі СССР і пазней прыняла бой пад Монтэ Касіна, другі — у дывізіі, якая штурмавала вышыню пад Ленінам на Магілёўшчыне.

У сутнасці, яе паслалі на немінучую пагібель — немцы замацаваліся на вышыні і ў дзотах. Але Франак загінуў, вызваляючы Варшаву, у прадмесці Прага. Ладак, нараджэння 1922 году, апынуўся спачатку ў Англіі, потым — у ЗША, дзе скончыў політэхнічны інстытут. Там для мяне і згубіўся ягоны след. Кажуць, ён працаваў камерцыйным дырэктарам у касмічным цэнтры.

Але трэба нарэшце вярнуцца да генеалагічнага дрэва Адамчыкаў.

Бацька мой быў шостым дзіцем у немалой дзедавай сям'і. Як сведчыць метрычная кніга Наваельненскай царквы Дзятлаўскага *благачынія*, ён нарадзіўся 17 красавіка (ст. ст.) 1907 году. Хрышчаны 24 дня гэтага месяца.

Хроснымі бацькамі яго былі Хведар Аляксандраў Адамчык, стрыечны дзедаў брат, і бабіна малодшая сястра Параскева (па-вясковаму, мусіць, Параска) Таўкун.

Хведара Адамчыка, спраўнага гаспадара ў Варакомшчыне, я помню. Бываў не раз у яго ў хаце, забаўляючыся з ягонымі ўнучкамі-дзяўчаткамі, маімі равесніцамі, — і здзіўляўся з прыгожай лямпы з малочным абажурам і насценнага гадзінніка ў выштукаванай карычневай шуфлядцы.

Хведар ездзіў на дагледжаным жоўтым ці, праўдзівей, палавым кані, вымененым на старую вопратку ў польскіх пагранічнікаў, што ўцякалі з-пад Стоўпцаў у верасні 1939-га. Прыгадваецца і такі факт. Калі гарэла, расстраляная запальнымі снарадамі (таму і не памечана на мемарыяльных дошках у Хатыні) наша Варакомшчына, стары Хведар не баяўся куль і, стоячы над зарослай крапівой былою ямаю для спрату бульбы, дзе ўперамежку з перапалоханымі салдатамі ляжалі мы, дзеці і

жанчыны, падганяў наіўна-маладзенькіх хлопцаў да бою: „Вы толькі смелыя лазіць па маіх свірнах“. Багатыр, як кажуць у нас на багатага чалавека, Хведар, вядома, бальшавікоў не любіў.

Але вернемся да бацькі. З якім здзіўленнем і поўнай цікавасцю я прачытаў па-польску метрычны запіс у той жа царкоўнай кнізе: „25 лістапада 1932 году. Грамадзянін селянін Владзімеж Адамчык, сын Фёдара і Фядоры з дому Талкуноў, праваслаўны, вёскі Варакомшчыны гміны Дварэцкай, першым шлюбам, 25 гадоў.
Грамадзянка Браніслава Шэйбак, дачка Яна і Юзэфы з дому Баравікоў, праваслаўная (маці на самой справе была каталічкай. — *В.А.*), вёскі Варакомшчыны гміны Дварэцкай, першым шлюбам, 23 (26. — *В.А.*) гады.
Паручыцелі:
З боку нарачонага грамадзяне вёскі Варакомшчыны Ян сын Станіслава Нагорны і Дзімітры сын Фёдара Адамчык.
З боку нарачонай Ян сын Яна Шэйбак і Канстанцін сын Пятра Аблажэй”.
Прыгадваецца, бацька ўспамінаў: „Вяселле было перад запустамі (запусты 15 лістапада па старым стылі, значыць, па новым — 28-га), пасля ўсіх святых. На ўсе святыя былі ў споведзі. Восень у той год выдалася цёплая. Мы з Броняю варочаліся з Дварца, а насустрач нам ішлі босыя бабы. Вяселле [гулялі] у нядзелю рана ў нас, у Тодаравай хаце. Пасля вянца — вечар, ноч і панядзелак — у Шайбаковай хаце, у Броні. Аўторак, серада — зноў у нас, Адамчыкаў.
Маці за прадзівам, бывала, прыгадвала сваё замужжа: „Прысніла сон, што прачнулася ў Тодаравай хаце, а там — сонца, яснасць. Падумалася мне, што замуж пайду за Тодаравага Ладзімера. На гэта і выйшла“.
А тое, што расказвала перад смерцю, было нават страшнае: „Замуж ішла не любіўшы. Не хацела нават, каб дзіця ад Ладзімера было. Пайду на рэчку паласкаць бяллё і цісну свой жывот. Таму і ўрадзіўся ты гэтак нездароўчы. Нават голасу не падаваў. Думалі, жыць не будзеш. Адно ж баба Юзэфа, падаслаўшы пялюшку (пялёнку), палажыла цябе на цёплую печ, ты адагрэўся і голас падаў“.
Жылі бацькі ў бядоце. Аддзяліўшыся ад дзеда Тодара, наша сям’я знайшла прытулак у падпаветцы — даўнейшай

прыбудове пры хаце, дзе стаялі вазы, сані, плугі, бароны і іншыя сялянскія прылады і рэчы. Там бацька адгарадзіў куток, прабіў аконца і паставіў невялікую печ.
Бацька — сірата ў падлеткавыя гады, малазямельны — у сталыя. У дзяцінстве амаль не ведаў, што такое малако. Яго замяняла талакно — прарошчаны, высушаны і змолаты авёс. Штодня ўпрогаладзь. „Ідзеш, — расказваў ён, — а перад вачыма ржышча расце“. Дзед, аддаючы замуж бедных дачок, аддаваў ім звычайна ў пасаг і астатнюю карову.
Васілю, старэйшаму сыну, выпраўляючы яго ў прымы, дзед аддаў, як з гаркатою ўспамінаў і ўсміхаўся бацька, каня, вазок і стусінавую пугу.
А потым каня трэба было купіць. Удавец Тодар коней любіў — яны ў яго заўсёды паліскаліся ад сытасці і дагледжанасці. Напэўна, лічыў, што дзеці як-небудзь пераб'юцца самі, а скаціну трэба накарміць.
Умеў і пакладаць [лягчаць] іх. Помніцца, як храплі і білі задзёртымі ўгору капытамі дужыя жарабцы, калі іх валілі, сабраўшыся на прыгуменні, маладыя мужчыны.
Востры, наточаны ножык быў заўсёды ў дзедавай кішэні. І як баяліся гэтага ножыка пяці-сямігадовыя хлапчукі. Без памяці, толькі чубкі мігцелі, імчалі з нашага панадворку, згледзеўшы майго лысаватага, курносага дзеда. А ён у дадатак быў яшчэ жартаўнік. Бывала, вылегчае барана і нясе ў барановай машонцы два яечкі. Падыме іх і патрасе перад маладзіцамі. А тыя — у злосць і кляцьбу. А калі спячэ іх на вуголлях у пячорцы на прыпеку — мне, малому, ласунак.
Мяне ён чамусьці любіў і расказваў мне нямала сёння ўжо забытых казак.

У вайну дзед цяжка захварэў. Канаў у гарачцы, успамінаючы сваю найлюбшую дачку Настасю, вывезеную саветамі ў Казахстан. Хапаў сякеру і выбягаў з хаты ці, дакладней, з гумна, дзе жыў пры меншым сыне Змітруку, бег забіваць Міхася Лазовіка, які пры бальшавіках, будучы старшынём сельсавету, пісаў даносы і складаў спісы на вываз [дэпартацыю]. Дзеда лавілі, бо магла ўчыніцца новая бяда — немцы арыштавалі б сям'ю Лазовіка, бо сам ён падаўся ў партызаны.
І вось кароткая даведка пра смерць дзеда, выпісаная мною з наваельненскае царкоўнае кніжкі (Дзятлаўскі архіўны ЗАГС).

Дарэчы, запіс зроблены па-беларуску, як відаць, на праваслаўных святароў патрэбна цвёрдая рука, каб яны да Бога загаварылі родным словам.
„1943 год. Студзень. 26 дня памёр, 27 пахаваны жыхар вёскі Варакомшчына Дзятлаўскага раёну Адамчык Фёдар, сын Івана і Анны, удавец, праваслаўны, 78 гадоў.
Протаіерэй: Вяч. Лапацінскі.“
Бацька, што меў на лічбы камп’ютарную памяць, чамусьці ўдакладняў, што дзед памёр 28 лютага. І я яму веру болей, чым запісу ў метрычнай кнізе.
І мне прыгадваецца марозны хмуры дзень. Белы атынкаваны дом у мястэчку Наваельня, дзе мы, пагарэльцы, знайшлі часовы прытулак. Азяблы бацька, які забег пераабуцца і сказаў, што на могілкі ўжо вязуць дзеда. Я зірнуў у акно і ўбачыў жалобны картэж: фурманка з новаю жаўтлява-ружоваю труною, наперадзе яе — высокі, лысы дзядзька Пятрук з узнятым карычневым крыжам.
А за возам — купка жанчын і мужчын. Збоку воза ў накінутай на галаву і на плечы балонкавай хустцы ідзе цётка Стэпка. Дзеда пахавалі поруч з яго ўнучкаю, маёю роднаю сястрою Геняю (Яўгеніяй), што памерла ад водры напрадвесні 1941 году. Дату і дзень Генінай смерці называў бацька: „Як зязюлька закуе, так і яе ўспомню. Паўдзеўкі было — „Кацюшу“ спявала. У маі памерла, у чацвер, пятнаццатага“.
Да гэтых успамінаў іншы раз дамешваўся і мацерын жалосны голас: „Спытала я ў яе: „Памрэш?“ „Памру“, — кажа. „А якую ж табе на смерць сукенку скласці?“ Я адчыніла куфар і паказваю на кітайскі шоўкавы шалік, які мне бацька з чыгункі, з Маньжурыі [Манчжурыі] прывёз. „Во гэту“, — сказала яна, паказаўшы на шалік. З яго і пашыла ёй вэлюм“.
Памятаю, перад пахаваннем кароткую труну паставілі ў настылай халоднай царкве, помню дзяўчынку ў труне з пасінелымі губкамі, з венчыкам на лобе, і гэтую зеленаватую вуаль, пашытую з празрыстага ядвабу…
Запісу аб смерці сястры я не знайшоў — царква, як гаворыцца, была ўжо адлучана ад дзяржавы.
Метрыка Геніна ёсць. Яна на польскай мове і з недаравальнымі памылкамі. Месцам нараджэння чамусьці памечана суседняя вёска — Рабкі. А мне помніцца, як я начаваў у дзеда Шайбака, бо ў тую ноч (10 жніўня 1938 году) мая маці нарадзіла дзіця.

Гэта і была мая сястра Геня.

Вось нарэшце надышла пара, калі я мушу зірнуць на галіны з другога боку майго генеалагічнага дрэва. Па матчынай нітцы я паходжу з Шайбакоў. І мусіць трэба агаварыцца, што ў нашым рэгіёне поруч з славянскаю тапанімікай можна натрапіць на літоўскую альбо татарскую. Вёскі літоўскія, а праўдзівей — яцвяжскія, як, для прыкладу, Погіры, Малдуці, Гезгалы, Ятвезі, межавалі з славянскімі Седлярамі, Ганчарамі, Рыбалавымі, Дубатоўкамі, Агароднікамі, а тыя, у сваю чаргу, з татарскімі: Таркачамі, Уланаўшчынай, Шайбаковым, Карыцамі.
Як Шайбакі апынуліся ў нашай яцвяжскай Варакомшчыне — для мяне яшчэ застаецца загадкаю. Што на рэчцы на Ятры ці Ятве стаяў Шайбакоў двор, гэта я знайшоў у адным з тамоў Актаў, выдадзеных археаграфічнай камісіяй у Вільні. А Ятра, ці Ятранка абмывае агароды тых жа Шайбакоў яшчэ сёння. Але прозвішча Шайбак у нашай ваколіцы цяпер звычайнае, хоць паходзіць яно ад вядомага хана Шайбака, разбітага з яго цьмою пад Лідаю.
Калі ж аднойчы я прызнаўся казахскаму паэту, што ў маіх прадзедаў па матчынай лініі было такое прозвішча, той здзівіўся і прывітаў мяне камплімент: „О, з такім прозвішчам вы былі б у нас у пашане. Яго калісьці насілі аўтарытэтныя людзі, і мы пра гэта не забываемся“.
Добрае слова, як вучыць Каран — яно, як дрэва добрае: корань яго цвёрды, а галіны ў небе…
Таму і бяруся за адну з іх — разгортваю інвентар альбо рэестр панскага двара Наваельні Слонімскага павету, Гарадзенскай губерні, складзены 5 снежня 1845 году. Ён, двор, ужо раздзелены паміж сёстрамі Шукевічанкамі — Генрыетай Валовічыхай і Ёзафінай Ляхніцкай. Ці не апошняя вядомая як расійская пісьменніца? Не, хутчэй яе дачка. Але цікавасць мая ў іншым. Да трэцяга з васьмі фальваркаў — Ахонаў прыналежала наша невялікая, усяго на адзінаццаць двароў, Веракомшчына (так у дакуменце — *В.А.*). Трэці двор — Шайбакі, мае прапрадзеды, дзевяты — Іосіфа (Язэпа) Аблажэя, куды ў прымы прыстаў мой прадзед па галіне Адамчыкаў — Янка Захараў. Але пра яго ўжо апавядалася вышэй. Шайбакі ў параўнанні з Аблажэем не вельмі і багатыя: адзін конь, два валы, дзве каровы, чатыры авечкі, дзве свінні. Гэта на дзесяць

душ, дзе пяцёра рабочых.
Надзел кожнаму двару: прысядзібнай зямлі — 2000 сажняў (0,910 га), ворнай — 19 дзесяцін 10 сажняў (валока альбо 21 га), сенажаці — 2 дзесяціны 28 сажняў (трохі больш як 2 га). Зрэшты, з голаду Варакомшчына, нават прыгонная, не памірала. Яго найчасцей прыносілі войны, у якіх, як заклятая, кожны раз палала наша саламяная, прыдарожная вёска. Вынішчаў яе і мор — халера, крываўка ці чума. Пра гэта сведчыць круглы пляскаты камень з замшэлым і ўжо нечытэльным тэкстам. Я разабраў толькі два словы: Сьвента Марыя (па-польску). Камень ляжыць перад вёскаю. Савецкі танк ссунуў яго з сярэдзіны вуліцы, балазе не разбіў.

Але разгорнем пажоўклы інвентар, спісаны рыжаватым чарнілам. Шкада, што ў ім пазначаныя ўсяго толькі імёны і прозвішчы асноўных гаспадароў, альбо, кажучы моваю справаводцаў, юрыдычныя асобы. Далей усё абязлічана — рабочыя і „прочие“ душы. Не вызначаны сем'і, не ўказаныя гады, як гэта іншы раз рабілася ў інвентарах іншых маёнткаў. Таму ў трэцім двары асноўным гаспадаром упісаны Казімер Шайбак, а прозвішча яго брата, роднага ці стрыечнага, Фелікса Шайбака, ужо няма.
Я знайшоў гэтае прозвішча ў „Алфавіце метрыкаў Дварэцкага касцёла“, складзеным у 1931 годзе ксяндзом Янам Карвелісам. Там аказаўся толькі год смерці Фелікса Шайбака — 1881. Тут жа быў зафіксаваны і год скону (1889) яго сына — Пятра, майго прадзеда па маці. Апошні памёр адносна маладым, маючы гадоў сорак. Пасля сябе ён пакінуў нямала смешных і забаўных гісторыяў, якія дайшлі нават да мяне, і точаны драўляны кубак з золатам. Яго прапіла на кірмашах з падкімі на чужое мужчынамі і распазычыла сваякам (тады якраз распрадаваліся панскія двары) маладая ўдава, мая прабаба Ганна.
Не дзіва, што, вярнуўшыся з бежанства, з далёкага чараміскага Бугуруслану, куды трапіла ў 1915 годзе, яе дачка Разалія прыгадала марна растрачанае золата і да паўсмерці збіла васьмідзесяцігадовую маці. Тая толькі здужала дайсці ў хату да сына Янкі, каб ужо паказаць скрываўленыя сінякі і бітыя раны і яшчэ папрасіць, каб прыгатавалі вады ёй памыцца, бо яна сабралася памірaць. У тую ж ноч яна і сканала.
Аднак бяда аплочваецца бядою, зло — злом. На абочыне шашы

насупраць нашае вёскі грузавік, за рулём якога сядзеў п'яны савецкі афіцэр, рэзка хіснуўшыся ўбок, бартом ударыў спадарожнай жанчыне ў плечы. Жанчына ўпала, але з гарачкі яшчэ паднялася, села і пачала здымаць рукавіцы…
Мужчыны, якія ішлі ўслед, у забітай жанчыне пазналі Шайбачыху Разэлю з Варакомшчыны. Гэты трагічны выпадак здарыўся напрадвесні 1953 году.
Кожная сям'я, зрэшты, мае свой немінучы, наканаваны лёсам знак. Ці, праўдзівей, фатальную непазбежнасць. Гэтак жа трагічна загінула і старэйшая сястра Разаліі — Станіслава, зваліўшыся на чыгуначным пераездзе з воза, нагружанага снапамі ці сенам, і трапіўшы галавою якраз на рэйку.
Мая маці, успамінаючы цётку Станіславу, кожны раз расказвала з сарамлівым смехам, як яна ў завейныя зімовыя дні, калі хадзіла да польскай школкі ў далекаватыя Аханяны, начавала там у свае цёткі. А маладая салдатка, муж якой ваяваў дзе-небудзь пад Псковам, прымала ў сябе дома дужых рыжых абознікаў-немцаў, што дастаўлялі на фронт за Наваградкам амуніцыю і правіянт.
„А нам што, малым?.. Салдаты насыплюць і цукерак, і цвыбікаў [сухарыкаў]. А яе Бортнік, мужык, добры быў. Вярнуўшыся з фронту, бабе Ганне акоп зрабіў, бо хата згарэла…"
Малодшы брат майго дзеда Іосіф, ці па-наску Язэп, троху ўмеў пісаць. Напэўна, скончыў народнае вучылішча, што адкрылася ў суседніх ад нас Карыцах. Таму ў часе рэвалюцыі, калі інтэлігентнаму чалавеку давяралі толькі кірку з лапатай, ён, бядак, мог заняць вышэйшую, нават кіраўнічую пасаду: Іосіфа Шайбака прызначылі дзяжурным па станцыі.
Там, на Паволжы, дзе ён апынуўся з сястрою Разаліяй, у часе эпідэміі халеры, якая пачалася разам з голадам, Іосіф Шайбак і памёр.
„Нябожчыкаў вазілі, як дровы, — помніцца, прыгадвала баба Разэля. — З усяго вялікага дому на два паверхі засталася толькі я ды мужчына".
Але бабе Разэлі, калі яна расказвала пра свае бежанскія пакуты, голад і жорсткасць бальшавікоў, амаль ніхто ў нашай Варакомшчыне не верыў. „Выдумляе", — казалі.
Бальшыня варакомцаў, асабліва гультаі, чакалі, як яны казалі, прыходу камуны. Калі ў нашага суседа Юліся Нагорнага з капою дзяцей у хаце хтосьці спытаў, чаму ён не ўстаўляе ў акно

заміж пабітай новую шыбу, той адказаў: „А нашто? Неўзабаве прыйдуць бальшавікі і дадуць мне хату з вазонамі“.
Праўда, дзеду майму Янку Пятровічу Шайбаку (1875—1944), прыйшоўшы, бальшавікі далі, як бедняку, з панскага двара, здаецца, з Язяран, дзе калісьці гаспадарыў брат Дамейкі, сытую вішнёвую карову. Я пасвіў яе і помню, як ашалела-радасна крычалі мне, найменшаму з іх, варакомскія пастухі: „Чэсік, пасі ўсюды! Вайна пачалася“.

У той жа, ужо згаданай касцельнай кнізе, якую склаў ксёндз Ян Карвеліс, у раздзеле „метрыкі шлюбныя“ я натрапіў на прозвішча свайго дзеда. Вянчаўся ён, Ян — сын Пятра і Ганны — Шайбак, у 1899 годзе. Браў за жонку Юзэфу Баравік, дзяўчыну з працавітай каталіцкай сям'і. Дарэчы, ён і сам быў католікам. Юзэфін бацька Лаўрын [Ваўжынец] Баравік меў асаблівы аўтарытэт сярод навакольнага сялянства — ён у Дварэцкай воласці працаваў пісарам.
У яго, як прыгадвала мая маці, была адна на ўсю вёску лазня, смольная, добрая хата, абнесеная парканам, а за ім — садок, які называлі Лаўрынавым раем, і ў ім — калоды пчол.
Матчын дзед быў працавіты і спраўны гаспадар.
Матчын бацька, Ян Пятровіч, аказаўся чалавекам іншай натуры — любіў скрыпку, рыбалку, доўгія на ўсё лета адлучкі з дому, калі ён ездзіў ажно ў Кітай на будаўніцтва Манчжурскай чыгункі.
„Бывала, надыдзе вясна, пара сяўбы, а наш бацька збіраецца на чыгунку, — успамінала не раз яго дачка, мая маці Браніслава, — дома ўпраўляецца пры малых дзецях адна Юзэфа, твая баба. Яшчэ і грошы зарабляе: назбіраўшы разам з дзецьмі воз камення на полі, вязе яго прадаваць. Тады якраз брукавалі шашу“.
Для мяне мой дзед пахнуў тытунём і рыбай. На ім вясёлкай адсвечвала луска, асабліва на грудзіне, дзе ў яго вісела торба з рыбаю, а пальцы на правай руцэ былі жоўтыя ад тытунёвага дыму. Помню яго торбачку з крэсівам, асколкам крэменя і пухкай, рудавата-цёмнай, як сухая порхаўка, губкай.
Прыгадваю, як ён варыў, тоўк і сушыў скрылі яловай губы.
А найперш у памяці ўваскрасае яго самаробная, што вісела на сцяне над ложкам, светла-яловая скрыпка. Дзед быў яшчэ музыка.

Гэта адбывалася, як у нас кажуць, не за маю памяць. Узяўшы скрыпку і сабраўшы гурт спеўных маладзіц, дзед у велікодныя дні хадзіў па вёсцы і пад вокнамі хатаў выспёўваў валачобныя песні.
У дзеда быў спрыт не толькі да скрыпкі, але і да кельмы — ён умеў вымураваць цагляную печ. Як і паставіць новую хату. Сваю ён будаваў, нават не маючы каня, болей перанёсшы дзеравін на ўласных плячах.
Коні з'явіліся ў яго пазней, калі, зарабіўшы грошай на чыгунцы, ён вяртаўся ўвосень дадому. Тады і пачынаўся гандаль коньмі. Дзед ператвараўся ў цыгана. А дзе гандаль, там і барыш, там і гарэлка.
Ізноў жа ўспамінала мая маці Браніслава, як, не стрываўшы гэтага гандлю і залітых гарэлкаю вачэй, баба Юзэфа перахрысцілася і дастала з-за коміна недасушаны грабовы біч. Дзед, упаўшы на парозе, толькі цяжка стагнаў.
Пасля такога хрышчэння дзед тыдні два адлежваўся на печы, а прычакаўшы вясны, зноў ехаў на заработкі ў далёкую Манчжурыю.
Адтуль ён прывозіў такія-сякія падарункі, а найперш не знаныя дагэтуль у нашай Варакомшчыне прыгожыя шоўкавыя хусткі і шалікі.
Памёр дзед на згоне зімы 44-га году, захварэўшы на запаленне. Бо пасля спаленай немцамі хаты на голым хутары, дзе ўжо нават засадзіў садок, ён збудаваў дашчаную будку, у якой жыў з новаю жонкаю, бо Юзэфа памерла перад вайною, і ў якой застудзіўся пад час вялікага студзеньскага марозу. Яму, здаецца, яшчэ не было і сямідзесяці.
Як адзначалі ў даўнейшых пасведчаннях аб смерці, пасля сябе ён пакінуў трое дзяцей: два сыны і дачку, маю маці Браніславу.

Старэйшаму сыну Яну бралася за сорак.
Ёсць і метрыка яго хрышчэння. Для мяне засталося толькі загадкай, чаму хрысцілі дзядзьку Яна не ў блізкім Дварэцкім, а ў дальшым — Дзятлаўскім касцёле.
„Тысяча дзевяцьсот трэцяга году кастрычніка семнаццатага дня ў Дзятлаўскім Рымска-Каталіцкім прыходскім касцёле (збудаваны ў 1632 годзе, фундатар Леў Сапега. — *В.А.*) ахрышчана дзіця імем Іван [Ян] ксяндзом Юстынам Пятранісам, настаяцелем Дзятлаўскага касцёла з здзяйсненнем

усіх абрадаў таемнасці.“
Не ведаю, у якім годзе, але дзядзька Ян скончыў Рабкоўскае народнае вучылішча і зіму ці дзве ў роднай вёсцы працаваў настаўнікам — тым, вядомым па коласаўскай паэме „Новая зямля“ вясковым дарэктарам.
Ад пашы да пашы — ад глухое восені да ранняга прадвесня — у свайго будучага швагра вучыўся мой бацька, Ладзімер Тодаравіч. Вучыліся па чарзе ў хатах, дзе былі вучні.
Колькі вучняў у хаце, столькі дзён хата служыла школкаю. А ў Петрука Аблажэя, вядомага ў нашай вёсцы штукара і гультая, дзяцей было найбольш.
Мой бацька са смехам успамінаў: „Мы вучымся, а ён, Пятрук, прывязаўшы за бэльку, мне круком сухую аўчыну. Наступае босаю нагою на вяроўку. Бачыць, што вучыцяль павярнуўся да дошкі і стаіць да яго спінаю, ён адскочыць і зробіць які выбрык нагою, альбо рукамі паказвае розныя муштрыкі. Дзеці, вядома, рагочуць. Ім ужо не да вучобы, калі дзядзька чвэрыць розныя штукі“.
А пра гэта ўжо расказвала маці. Шаснаццацігадовы рослы хлопец, калі польскі фронт перад Вялікаднем 1919 году наблізіўся да мястэчка Наваельні, уцякае з дому і, прызнаўшы сябе за паляка, уступае добраахвотнікам (охотнічым) у шэрагі польскага войска. Уцякае не адзін, а намовіўшы равесніка і суседа Язэпа Рака (арыштаваны пазней, у 30-ыя гады, у Слуцку за пераход польска-савецкай граніцы).
Першае баявое хрышчэнне неабстраляныя салдаты прымаюць недалёка ад роднае хаты каля вёскі Рыбакі на рэчцы Маўчадцы (цяпер там збудаваны знакаміты санаторый „Радон“). Ім шанцуе — бальшавікі, кінуўшы зброю і кажухі, якія тут жа падбіраюць варакомскія пастухі, спешна ўцякаюць на ўсход. Вызвалены Наваградак. Згаладалае польскае войска, трацячы падбітых, здарожаных коней, губляючы не столькі ад куляў, колькі ад хваробы сваіх неабвучаных салдат, наступае на Менск.
Недзе ўжо за Наваградкам шаснаццацігадовы шараговец захварэў на тыфус. Пэўна, заразіўся. Завашывены і ледзьве жывы, ён варочаецца дадому — у родную Варакомшчыну. Наша баба Юзэфа, кабета разумная ды спрактыкаваная ў леках, зёлкамі ды напараным льняным семем адхадзіла сына. Але, акрыяўшы, добраахвотнік зноў уцякае з дому, каб паступіць у

падафіцэрскую школу ў горадзе Слоніме. Аднак афіцэрскага ці падафіцэрскага звання польскія вайсковыя ўлады прысвоіць беларусу-добраахвотніку не захацелі. І паступова беларус-католік пачынае разумець, што ён не сапраўдны паляк, а чалавек нейкага другога, ніжэйшага гатунку.
„Што я беларус, — прыгадваючы тыя далёкія гады, расказваў мне ўжо сам дзядзька Ян, калі астатні раз наведаўся ў родную Варакомшчыну з Польшчы, з кашубскага мястэчка Лэба, дзе апынуўся пасля вайны, прайшоўшы ў другі раз добраахвотнікам нялёгкі фронт, — што я беларус, даведаўся, пасталеўшы, калі пачаў выпісваць віленскія газеты на роднай мове“.
Тады ён і арганізаваў з больш-менш пісьменных маладых мужчын-вяскоўцаў, што скончылі народнае вучылішча і маглі ўжо чытаць газеты і разбірацца ў палітычный сітуацыі, якая запанавала ў Заходняй Беларусі, гурток грамадоўцаў. У Агніску каляёвым (“культурным вогнішчы” чыгуначнікаў) станцыі Наваельні яны ўжо ставілі беларускія спектаклі, аб чым нават паведамляла віленская прэса, і праводзілі таемныя сходы.
У нашай Варакомшчыне ў хаце дзядзькі Яна на гэтакім беларуска-нацыянальным, затоеным ад паліцыі і канфідэнтаў-шпегаў сходзе пабылі дзеячы Беларускай сялянска-работніцкай грамады, шматлікай, папраўдзе народнай партыі, якая налічвала ў сваіх шэрагах каля ста тысяч сяброў, найболей сялян. Мой бацька-нябожчык прыгадваў прозвішчы Рак-Міхайлоўскага, Валошына, Мятлы, Аўсяніка.
Апроч сялянска-асветніцкай дзейнасці, мой хросны займаўся зборам нашага варакомскага фальклору.
Шкада, што гэты неацэнны скарб — запісы песняў, казак, паданняў, прыказкаў і прымаўкаў, поруч з падшыўкамі віленскіх беларускіх газет і часопісаў, купленых на астатні сялянскі грош, выданнямі Кухты і Клецкіна — увесь гэты скраб згінуў у агні 41-га году, калі запальнымі снарадамі была расстраляна наша вёска і яе навакольныя хутары.

Восенню 1944 году дзядзька Ян ужо другі раз добраахвотна ўступае ў Польскае войска, каб скончыць вайну каля чэшскай Прагі. Прадчуваючы, што ўсёдасведчаны смерш ці НКВД за нацыянальна-беларускую дзейнасць можа не дараваць, застаўся як польскі салдат на землях „адзысканых“ — нямецкіх, што

адышлі пад народную Польшчу. Нават атрымаў за ўзнагароду баўэрскую гаспадарку. Дадому не вярнуўся, паклікаўшы ў помач васемнаццацігадовага сына. Дый цяжка было вяртацца да старэйшай за сябе на дванаццаць гадоў жонкі, да якой калісьці, беззямельны, прыйшоў у прымы і з якою жыў не ў згодзе.
Але нядрэмнае вока НКВД высочвала і выследжвала нацыянальных беларускіх дзеячоў не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. Арыштаваны і кінуты за краты разам з акоўцамі (Армія Краёва) і гамулкаўцамі (польскія камуністы, што папалі ў апалу), дзядзька Ян ні за што адбыў два гады турмы. На волю ён выйшаў разам з тым жа Гамулкам, у дні хрушчоўскай адлігі, што прынесла пацяпленне і ў Польшчу.
Астатнія гады жыў на беразе Балтыйскага мора, у мястэчку Лэба, загадваючы адным са збожжавых складаў, якія збудавалі яшчэ немцы і куды з караблёў згружалі зерне.
Там на чужыне і памёр ён, змагар за беларускую справу, як паміралі тысячы гэткіх, адданых Бацькаўшчыне, то ў халоднай тундры, то ў гарачай Аргенціне, то за блізкім светам, у нечуванай Аўстраліі.
Малодшы дзядзькаў брат Юзаф, што за прыкладам старэйшага цягнуўся да беларускага друкаванага слова, зведаў ужо савецкую турму і вярнуўся адтуль хворы на трасцу. Гэта з яго гарышча ў мой карычневы „шкапік“ трапілі кніжкі Адама Станкевіча, Уладзімера Жылкі, Наталлі Арсенневай, Антона Навіны, Вінцука Адважнага, Максіма Гарэцкага...
Не менш цікавыя гісторыі можна было б расказаць пра маіх стрыечных братоў, што, прайшоўшы высылку, фронт, апынуліся далёка ад роднага парогу. А дзеці іхныя, тым болей унукі, што гавораць па-ангельску, па-польску, па-эстонску ці па-расейску, наўрад ці будуць распытваць і ўяўляць тую шарую вёску ў шэсцьдзесят хат з саламянымі стрэхамі, з-пад якіх іхныя дзяды выпырхнулі ў свет.
Генеалагічнае дрэва Адамчыкаў так шырока разрослася, што галіны яго аплялі ўсю земскую кулю. І няхай прыветна і ўтульна шумяць.
Я толькі мушу ўспомніць тут свайго малодшага брата Яна, што марыў стаць музыкантам, але, скончыўшы мараходнае вучылішча, трапіў матарыстам на кацер, які абслугоўваў ледакол „Ленін“. У беспрасветны кіпучы шторм, што гнуў і

ламаў на палубе парэнчы, іхны кацер даплываў ледзьве не да берагоў Англіі, каб падвезці паліва ледаколу, які вёў разведку. З гэтых падарожжаў малодшы брат вярнуўся дадому хворы. Першая аперацыя ў Бараўлянах прадоўжыла яму жыццё, але не нашмат. Другое ўжо не было, бо не выявілі захворванне — лячылі туберкулёз.
А ён хацеў жыць. Яму ішоў усяго сорак дзевяты. „Чэсік, знайдзі лякарства“, — папрасіў ён, працягваючы кволую руку пры нашым астатнім спатканні. Праз тыдзень ён памёр. Стаяў грымотны жнівень 1993 году.
Якая фатальная для мяне лічба „3“. Я нарадзіўся ў 1933-ім, маці памерла ў 1983-ім, малодшы брат — у 1993-ім.
22 снежня 1999 году
Менск

P.S. Згодна з гіпакратаўскім трактатам „Аб сядміцах“, у чалавека ёсць сем сезонаў, якія называюць узростамі: да сяміжды сямі — пажылы — аж да пяцідзесяці шасці гадоў, да сяміжды васьмі, і адтуль — стары. Значыць, сённяшні мой век паміж шостым і сёмым сезонамі. І мне ўжо забаронена ўжываць салодкае, есці толькі салёнае і памяншаць насалоду.
На гэтым скончу, прыгадаўшы толькі Арыстотэля: „Той, хто шукае мяне, знойдзе мяне ў дзецях…“.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 5 (10) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **29-08-2000**
[image]

Адам Глобус
Браслаўская стыгмата

Празрыстыя краявіды… Як іх не любіць?! Раніцаю зайсці ў блакітны сасоннік, спусціцца да возера і плаваць, плаваць, плаваць…

А на мастакоў, што ўладкаваліся на пагорках Браслаўшчыны, я не люблю глядзець. Тоўстыя, брудныя, смярдзючыя, баязлівыя тупікі. Баязлівыя? Так! Яны баяліся вар'ятні — такой вялізнай, галоўнай у Віцебскай вобласці лякарні для душэўна хворых. Вар'ятня стаяла ў мястэчку Слабодка, за кіламетраў дзесяць ад Браслава. Дзівоснае месца, дзе неба ўтрая большае, чым у якім іншым кутку Беларусі. Невытлумачальная з'ява: крышталёвыя азёры, горы і велізарнае неба. Тупікі з пэндзлікамі спрабавалі ўціснуць тое неба ў рамкі сваіх крывых палотнаў. Якое глупства! Якая марная марнасць — і ловы ветру, і ловы неба. Божа, не карай неразумных. Даруй мне і майму сябру Алесю за ўсё, што адбылося з намі на Браслаўшчыне. Браслаўшчына, твой знак назаўсёды застанецца на правай Алесевай далоні, наскрозь працятай цвіком.

На Браслаўшчыне я апынуўся з-за слоўка „невыязны“.

У Савецкім Саюзе нікому не трэ было тлумачыць, што такое метка „невыязны“, бо амаль усе былі гэтымі самымі „невыязнымі“ — не маглі выбрацца за жалезную заслону. Адна шостая Зямлі існавала асобна, а мне хацелася ездзіць па свеце на цягніках, караблях і самалётах. Я верыў у сваю зорку, у лёс

падарожніка і трэніраваўся — запісваўся ў розныя экспедыцыі, і не істотна кім. На Браслаўшчыну я паехаў землякопам у складзе археалагічнай групы. У мае абавязкі ўваходзіла закопванне раскопаў. Не раскопванне, а закопванне, каб помнікі мелі той выгляд, які сустракаў археолагаў. Люда Дучыц — археолаг акуратны, яна і наняла нас з Алесем закопваць. Выключная праца. Засыплеш раскоп, закладзеш пажоўклым дзірваном, адыдзешся і залюбуешся пясчана-жоўтым квадратам на глыбока-зялёнай спіне старажытнага, як славянскі свет, гарадзішча. Мастацтва! Я табе кажу. Уражвае. Плаціlі мала. З рыдлёўкаю шмат не заробіш. А таму мы яшчэ малявалі знаходкі: косткі з надпісамі — руны, прасліцы, пацеркі, пярсцёнкі… Усялякае рознае малявалі акуратна пёркам, тушшу на добрай паперы. Можна сказаць — мы рысавалі праекты пракаветных цацак. Вымалёўвалі і насміхаліся з Люды. Яна прыплочвала школьнікам за кожную дробную знаходку — за манету, за руну, за пярсцёначак — капейкамі або цукеркамі. Школьнікі скемілі і пачалі самі рабіць надпісы на костках і падкідаць у раскоп. Можна зразумець, кожнаму хочацца зарабіць цукерачку. Разам з фальшрунамі ў раскопе з’явіліся гузікі з дзедавых фрэнчаў, пацеркі бабуляў і ўсё такое падобнае. Дучыц перастала даваць цукеркі. І тут удакладню: гузікі з дзедавых фрэнчаў не зразаліся ў родным доме, яны збіраліся на закінутых хутарах. У сямідзесятых гадах мінулага (вось так, ужо *мінулага*!) стагоддзя пакінутых хутароў на поўначы Беларусі стаяла безліч. Хутаране перабіраліся ў вёскі, мястэчкі і гарады. Цяжкае відовішча — пакінутае чалавечае гняздо. Праваленыя стрэхі, пазабіваныя дошкамі вокны, здзічэлыя каты, трава на падворку ў пояс, кнігі, сточаныя мышамі… Рай для этнографаў з марадзёрскай душою. Ні я, ні Алесь не мелі такой душы. Калі што і забіралі з хутароў, дык выключна дзеля мастакоўскай працы. Я любіў старыя фотакарткі. Яны, зазвычай, віселі ў рамцы пад шклом, і мышы іх не згрызалі. У мяне дагэтуль ёсць каробка са здымкамі браслаўчан. Але збіраў я тыя картачкі не дзеля калекцыі. Я шукаў святы твар. Вось уяві: чалавек рабіў у хаце свой асабісты алтар з унукаў, сыноў, дзядоў, сваякоў… Замаўляў рамку, выразаў шкло, ляпіў здымачкі, вешаў фотааалтарык побач з абразом. Божая Маці ў чырвоным кутку, а дзеці (мы ж усе яе дзеці!) побач на сцяне. І, пэўна, для

гаспадара раскіданага гнязда твары сваякоў былі святымі. І я ўглядаўся ў старыя здымкі, імкнуўся ўбачыць тое святое ззянне. З тым жа намерам я наведваўся ў вар'ятню. Маляваў стрыжаных налыса жанчын і мужчын. Яны страцілі розум і сталі іншымі ад нас. Іншымі, гэта істотна. Бо святы чалавек — іншы, не такі, як ты і я. Вечарамі я вёў гутаркі з дактарамі. Пытаўся, ці многа ў іх мастакоў, пісьменнікаў, філосафаў? І што здзівіла: такіх амаль не трапляе ў лякарню. Большая частка вар'ятаў паходзіла з браслаўскіх сялян. Дактары сказалі, што і вар'ятню тут збудавалі, каб далёка не вазіць хворых. Чаму вар'яцеюць браслаўчане, дактары не ведалі. А я мог толькі адчуваць непрапарцыйнасць зямлі і неба.

Праз гадоў дванаццаць я сустрэну мастака-краявідніка, які спытаецца, ці захаваў я малюнкі вар'ятаў. Скажу: захаваў. Ён здзівіцца і перапытае. Праўда, захаваў? І скажа, што трыццаць гадоў ездзіць пісаць дзіўныя краявіды і ні разу не бачыў, каб хто іншы зацікавіўся вар'ятамі. Не стаў я тлумачыць пра неба, а табе скажу… Не вар'яты са сваімі гісторыямі хваробы мяне цікавілі і цікавяць, а святло, што сыходзіла з велізарнага неба, святло і святасць. Таму й апынуліся мы з Алесем у закінутым касцёле, у мястэчку Опсе. Хутароў і касцёлаў з цэрквамі мы абышлі безліч і пад Браславам, і пад Друяй, і пад Краславай, і пад Мёрамі, і пад Дзвінскам. Сыбота і нядзеля былі ў нас вандроўнымі днямі. У Опсе стаяла жнівеньскае пекла. Пот каціўся ў вочы. У касцёл мы ўлезлі праз акно. Калі кінуты хутар — трагедыя адной сям'і, дык кінуты і разрабаваны сабор — трагедыя нацыі. Арганныя трубы валяліся на падлозе сярод папяровых мяхоў з-пад угнаенняў. Ні абразоў, ні алтара не было. Толькі на адной арцы пад самай столлю вісела вялікае ўкрыжаванне. Трэба забраць! Не істотна, хто з нас выказаў тую думку. Трэ было зняць і знесці ўкрыжаванне. Але як? Хрыстос вісеў метраў за пятнаццаць ад зямлі. Паразглядаўшы скляпенні, мы заўважылі ў іх круглыя дзіркі, праз якія некалі апускаліся і ўздымаліся жырандолі. У такую дзірку з цяжкасцю, але мог пралезці чалавек. І праз дваццаць пяць гадоў я не магу самому сабе патлумачыць, чаму рызыкнулі палезці ў тую дзірку. Як і кожны нармальны чалавек, я пабойваюся вышыні. І забаўкі кшталту пастаяць на даху на самым краі, каб мыскі

чаравікаў віселі над бездаННю, не для мяне. А тут мы ўзняліся на гарышча, поўнае галубоў, прайшлі да адтуліны і па чарзе зазірнулі ўніз. Ад дзіркі да ўкрыжавання было метры з два, рукою не дацягнешся. А таму давялося спускацца, ісці ў гаспадарчую краму, набываць вяроўку, выразаць альховае вудзільна і рабіць аркан. Падобным ласо паўночнаамерыканскі каўбой лавіў каня. З арканам мы забраліся на касцёльнае гарышча другі раз. Я пралез у дзірку. Алесь трымаў мяне за ногі. Я вісеў галавою ўніз і спрабаваў заарканіць скульптуру. Крыж досыць шчыльна прылягаў да сцяны. І ў мяне не выходзіла накінуць пятлю. Я зрабіў, можа, спробаў дваццаць, покуль не пацямнела ў вачах. Алесь зацягнуў мяне назад, да галубоў. Мы перакурылі. Непрыстойны занятак — паленне тытуню ў саборы. Каюся. Але каб супакоіцца, я мусіў выпаліць папяросу. Мы супакоіліся, і ў дзірку палез мой супольнік. Я ўпінаўся нагамі ў драўляную бэльку і ўчэпіста трымаў Алесевы ногі. А ён целяпаўся над цэментовай падлогаю галавою ўніз. Ёсць! Злавіў! Словы гучалі далёка, як з іншага свету. І тут мяне наведала адна з самых мярзотных думак… А што калі адпусціць Алеся? Узяць і адпусціць. Ён заб'ецца! Мяне не асудзяць… Хто давядзе, што я знарок адпусціў яго? Выцягвай! Выцягвай! Крычаў мой мілы таварыш. Я скамянеў, баючыся ўласных разваг. Дык што рабіць? Ён жа мяне толькі што выцягнуў! Я напружыўся і вывалачыў сяброка. Але гэта была толькі палова з запланаванага. Цяпер мы мусілі адарваць крыж ад сцяны і спусціць на вяроўцы ўніз. Пятля ўдала ахапіла ўпоперак укрыжаванне. Вяроўка ляжала на Хрыстовых грудзях, ішла пад левую руку, за крыж, і выходзіла на правае плячо. Лепей і быць не магло. Тарганулі. Крыж трэснуў за Хрыстовай галавою. Вяроўка засталася ў нашых руках, а скульптура паляцела ўніз. Я ўжо бачыў, як яна разбіваецца на тысячы дробных кавалачкаў. Але… Я пабачыў дзіва. За метры два ад зямлі крыж змяніў траекторыю з вертыкальнай на гарызантальную. Ён спланаваў, як лёгкі папяровы самалёцік, спланаваў і лёг на пыльную гурбу ўгнаення. Каб хто іншы… А што мне да іншых? Я табе сведчу: укрыжаванне ўпала з пятнаццаціметровай вышыні на каменную падлогу і не разбілася. Мы спусціліся. Зацярушаны пылам Хрыстос чакаў унізе. Пашкодзілася толькі правая рука, што зачапілася за стары папяровы мех. Раскрышілася тры пальцы.

Пазней мой брат школьнік выража тыя пальцы з дрэва і адрэстаўруе скульптуру.
А тады ў нас дух заняло. Моўчкі мы разабралі крыж на дошкі. Аднялі рукі Ісуса, зняліся яны надзіва лёгка. Схавалі ўсё тое ў мяхі і панеслі на аўтобусную станцыю. Адчуванне, што за намі сочаць, не пакінула нас і ў Слабодцы, куды мы вярнуліся позна ўвечары. Мы схавалі Хрыста за скрыні з археалагічнымі знаходкамі і селі вячэраць.
Там, у Слабодцы, працуючы землякопам, я палюбіў сала і навучыўся піць спірт. Свіное сала я проста ненавідзеў, а тут раптам пачаў яго есці з апетытам, усмак, з асалодаю. Дый што на той Браслаўшчыне магло прагнаць пасляпрацоўны голад, акрамя беларускага сала? Нішто. Мы напіліся вогненнай вадкасці, наеліся шкварак з хлебам ды цыбуляю і паваліліся спаць. Была субота.
А ў нядзелю мы хадзілі ў лазню. Слабодка — зусім маленькае мястэчка, і грамадская лазня там адна, у вар'ятні. Па нядзелях там мыюцца тыя, у каго няма прыватнага памывачнага комплексу. Мы з Алесем прыйшлі самыя першыя, папарыліся, паплавалі ў возеры і пачалі мыцца. Мыемся мы па-рознаму. Ён пачынае з ног, а я — з твару. Ён высокі, вышэйшы за мяне на галаву. Пэўна таму я памыўся першы і сядзеў чакаў, а ён яшчэ толькі намыльваў свае доўгія каштанавыя валасы. Ён абмываў галаву, а я збіраўся сыходзіць, калі выпадкова зірнуў у ягоную шайку. У тазіку было поўна крыві. Паўнюткі таз крыві з мылам. Кроў! Стой! Зараз, я набяру чыстай вады! Алесь стаяў з заплюшчанымі вачыма над тазам. Я лінуў на яго вядро сцюдзёнай вады. Ён і не зразумеў, што халоднай. „Адкуль кроў? Гэта я ў цябе пытаюся? Паглядзі галаву". Ён схіліўся. На галаве крыві не было. Яна цякла з правай прабітай наскрозь Алесевай далоні. Чорт! Недзе тут цвік, мусіць, быў. Мы чамусьці вырашылі знайсці той цвік. У паўзмроку лазні поўзалі пад лаўкамі і шукалі цвік, пакуль я не сказаў: досыць. Уся лазня была перапэцкана чалавечай крывёй. Так-сяк Алесь апрануўся, і мы пабеглі ў псіхіятрычную лякарню, да лекара. Той апрацаваў рану ёдам і перавязаў. Верыць у гісторыю з містычным выратаваннем крыжа ён адмовіўся, а мы й не настойвалі. У размовах з псіхіятрам нельга настойваць. Асабліва на тэрыторыі яму падуладнай больніцы. Зрэшты, я б яму і не распавёў пра крыж, каб не спірт. Доктару было сумна,

а тут такое здарэнне: дзірка ў руцэ, а пацыент не чуе болю. Ён наліў нам і сабе па паўшклянкі медыцынскага. Языкі развязаліся. А ў кожным псіхіятру хаваецца духоўнік. Вось і пачуў ён нашы споведзі. Добра, што псіхіятры ў адрозненне ад псіхапатаў — матэрыялісты. І мы п'яныя спакойненька пакінулі лякарню.

За брамаю нашы погляды на здарэнне разышліся. Алесь настойваў на вяртанні крыжа ў касцёл, а я пярэчыў. Які касцёл? Дзе ты бачыў касцёл? Склад угнаенняў там, а не касцёл! І калі я даведаюся, што ў Опсе аднавілі касцёл, вярну крыж ксяндзу. Чуеш, мы вернем укрыжаванне ксяндзу!

Я не думаў, што касцёл у Опсе некалі адновіцца. Дакладней, я быў упэўнены: ён не адновіцца ніколі. Жалезная заслона, ваяўнічы атэізм…

Алесь прыйшоў да мяне і сказаў, што трэба вяртаць крыж. Паміж зняццём і вяртаннем мінула пятнаццаць гадоў. Мы пагрузілі ўкрыжаванне на задняе сядзенне Алесевага легкавіка і паехалі ў Опсу. Мы і з Менску не паспелі выехаць, як легкавік заглух. „Ты можаш вяртацца, а я папраўлю машыну, сам завязу і аддам укрыжаванне". Я вярнуўся. Алесь завёз драўлянага Ісуса на Браслаўшчыну, але я не быў таму сведкам, я проста веру яму.

Вільня, красавік 2000 году

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 5 (10) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **29-08-2000**
[image]

Адам Глобус
Дамавікамерон найноўшы
Навелы з кнігі

Бабнік

Бабнік дастаў мужчыну. Натуральна. Давёў да злому, да істэрыкі і бойкі з нажом. Гэткая пачвара — Бабнік.

Некалі даўно паэт спытаў у мужчыны:

— Ці не ахоплівае цябе жаданне забіць чалавека?

Тады не ахоплівала, мужчына заставаўся перакананым пацыфістам і ненавідзеў зброю.

— Нож не зброя, — настойваў паэт. — Можна ўзяць кухонны мясарэз і разваліць горла, каб паскуда крывёю засмяялася. Бывай, бывай, сонца з перарэзаным горлам! Так напісаў іншы паэт. Але хопіць пра лірыку.

Бабнік з паганялам Кумляк з'явіўся ў Менску вясною. Дэмбельнуўся з дэсантнага батальёну ў горадзе Кнураве, што недзе ў Хахляндыі, і прывалокся ў беларускую сталіцу. Пагуляў, папіў, пабіўся з міліцыянтамі і пакаціўся да бацькоў пад Магілёў. Дзе зноў піў...

Варта сказаць: з таго часу Бабнік квасіў штодня. Ва ўсялякім разе, ніхто за наступныя чатырнаццаць гадоў ні разу не пабачыў яго цвярозым, ступені ап'янення варыявалі ад весялосці пасля ранішняга піва да абсікання ў ложку з жанчынай, якую людзі называюць Бібліятэчніцай, а Бабнік

кліча Похвай.
П’янкі-гулянкі ў пасёлку Прапойск скончыліся канфліктам на танцах. Дэмбельнуты дэсантнік патаптаў міліцыянтаву фуражку. Ахоўнікі парадку, каб не садзіць боўдзілу, стрэслі з Бабнікавых бацькоў хабар і прапанавалі яму вымятацца з пасёлка. Бабнік прыпёрся ў Менск да брата-жывапісца. Той пасяліў Бабніка ў майстэрні і ўладкаваў на аўтазавод электрыкам. Прапойскаму хлопцу выдзелілі інтэрнат. Стасункі з пралетарыятам не вельмі натхнялі электрыка. Яго вабіла мастацкая эліта, асабліва жаночая палова. Бабнік соваўся па майстэрнях, весяліўся, трахаўся, абрастаў знаёмствамі і з дапамогаю брата паступіў ва ўніверсітэт, на завочны геафак. У тыя часы і адбылася першая Бабнікава прыгода з нажом... Мужчына сядзеў у майстэрні, рабіў шыльду для камісійнай крамы, дзе гандлявалі ўжыванымі строямі для нявестаў. Уваліўся Бабнік. Чырвоны, вочы гараць, рукі калоцяцца...
— Слухай, я твайго разьбяра зарэжу... Й-ён — сука, маю бабу... Я прывёў... А-а-а йон — сабака, яе... Дупы адно аднаму нюхаюць... Ты...

— Ды не зарэжаш ты разьбяра. Ён тры гады адсядзеў і біцца навучыўся. Так што аглядайся, каб самому не атрымаць стамескаю ў нырку. І што здарылася, у рэшце рэшт? Ты прыйшоў да разьбяра ў майстэрню? Так?
— Так!
— Прыйшоў не адзін, а з лахудраю?
— Ды не лахудра яна! Жаніцца я сабраўся... Бо-о-ожа! Яна — дачка рэктара кансерваторыі...
Менавіта сям’я рэктара ўпячэ Бабніка за краты, але пра тое пазней. А цяпер раз’юшаны Бабнік марыў зарэзаць разьбяра.
— Вы шмат выпілі? — пацікавіўся мужчына.
— Шмат, і леглі... Я з ёю, а разьбяр на канапе.
— Ты яе трахнуў?
— Канечне, і не адзін раз, а потым заснуў, а прачнуўся... Яны на канапе перапіхваюцца...
— Ты кінуўся біцца?
— А што рабіць?
— Ты пачаў біцца з разьбяром? Ці не?
— Пачаў, хацеў...
— І разьбяр набіў табе пысу?

— Ды не набіў ён мне морды...
— А-а-а, не набіў, проста сказаў, каб ты сыходзіў з майстэрні?
— Ну, сказаў... Бо-о-ожа мілы, я зарэжу яго, зарэжу, падпільную ўвечары п'янага і заб'ю.
— А што далей?
— Не ведаю...
— Тады скажы, чаго ты хочаш?
— Каб ён не чапаў маёй нявесты...
На спрошчанае мужчынам пытанне: „Нашто ты нюхаў Бабнікаву лахудру?“ Разьбяр даў досыць пераканаўчае тлумачэнне:
— Касавокая сама захацела. У цемры ж не відаць, хто касавокі, а хто не...
Няцяжка здагадацца: ніхто так і не прышыў разьбяра. Бабнік замірыўся з касавокай лахудраю і ўзяў у жонкі, і ў іх нарадзілася дзіця. Бабнік пасяліўся ў кватэры галоўнага цымбаліста БССР. Піць ён кінуць не змог, з дзеўкамі качацца працягваў. І свой сацыяльны статус змяніў дзякуючы не толькі сям'і, але і перамене месца працы — з аўтазаводу ён перабраўся працаваць у Саюз кампазітараў Беларусі, вядома ж, электрыкам, але і не толькі. Бабнік выконваў у Саюзе шмат далікатных даручэнняў. Капаў магілы для майстроў ноты і ўкладаў творцаў у труны.
Толькі на першы погляд пакласці нябожчыка ў труну лёгка. А калі ў моргу не даглядзелі і ў якога віртуоза адна нага была выпрастаная, а другая сагнутая? Мала таго, што сваякі не далі грошай на касцюм, і сакратару Саюза давялося здымаць з плечыкаў свой святочны гарнітур, дык і калена нябожчыка востра тырчала з труны. У такіх сітуацыях Бабнік быў незаменны. Хай завярнуў труну, хай падраў абіўку, але нагу віртуозу зламаў і выпрастаў. Скупыя сваякі нічога і не заўважылі — ні добрага гарнітура, ні зламанай нагі, ні ўсмешкі далакопа. Праз слёзы і смутак цяжка нешта заўважыць. Як і праз смех. Менавіта праз смех Бабнік гаварыў, што пахавае ўсіх беларускіх кампазітараў. Толькі наўрад ці гэта зробіць адзін чалавек. Праўда, пахаваў Бабнік шмат чаго, у тым ліку і сваю першую сям'ю.
Не склаліся ў Бабніка адносіны з цешчаю, і ён паслаў яе ў похву. Так і сказаў, вярнуўшыся з чарговых хаўтураў:
— Ідзі ты ў похву.

Тая прапанавала, каб ён памыў пялюшкі, а Бабнік яе адаслаў. У цешчы схапіла сэрца, і Бабніка выгналі з кватэры знакамітага цымбаліста. Выперлі яго і з універсітэту, за двойкі і пропускі. Толькі ён не перажываў. Урачыстых вечарын у Саюзе кампазітараў не бракавала. Сыты і п'яны Бабнік крочыў па жыцці кульгавай хадою. Нагу пашкодзіў у войску, няўдала скокнуў з парашутам. Але кульгавасць не замінае ў ложку. І Бабнік качаўся з дзявулямі і, як мог, паўтараў подзвігі Казановы. Ні век, ні выгляд, ні сацыяльны статус партнёрак не мелі аніякага значэння. Ён нават змог трахнуць хорам, разам з двума літаратарамі — лірыкам і драматургам — пажылую жонку аднаго алкаголіка-чыноўніка, пра што шэптам распавёў усяму сярэдне-культурнаму Менску. Чорт яму суддзя.
Тым часам у СССР набіраў сілу нацыянальна-вызваленчы рух паняволеных народаў. Палітыка пазабівала ўсе галовы савецкага насельніцтва, і хто як маркітуецца ў ложку, а не на трыбуне апошняга з'езду КПСС, мала каго цікавіла. Бабнік зафарбаваўся ў нацыяналіста, беларускага, вядома. Махаў бел-чырвона-белым сцягам на мітынгах. Хадзіў на пасяджэнні нацыяналістычных суполак, таварыстваў, франтоў і партыяў. І разам з гэтым не забываўся азірацца на матэрыялістычны бок хуткаплыннага жыцця. Не было такога змагара за незалежнасць, якога б не ведаў Бабнік, не было той вечарыны ці з'езду патрыётаў, дзе б не прысутнічаў ён. Бабнік быў у курсе падзей. І ўсё, што ведаў дэсантнік з Кнурава, ведалі ў КДБ. Інфармацыі хапала. За яе плацілі. Электрык атрымаў на ўскрайку Менску, у Малінаўцы, навюткую кватэру. Кампазітары чакалі кватэры па пяць-дзесяць гадоў, а электрыку далі без чаргі за інфарматарскія паслугі. Ну, не за выпрастванне ж нагі віртуоза даюць бясплатнае жытло?!
А што за кватэра без гаспадыні? Бабнік узяў за сябе бухгалтарку. На вяселлі Бабнік напіўся так, што на гаўбцы ў кутку адтрахаў лепшую бухгалтарчыну сяброўку. Бухгалтарка, праўда, спала і таму не стала рэзаць і забіваць паскуду, што спакусіла яе законнага мужа — Бабніка.
Жыццё бегла хутка. Незалежнасць такая-сякая адваявалася. Саюз кампазітараў паціху пачаў здыхаць. Загаварылі пра бізнес і капіталізм. Бабнік завёў сваю справу: падрабляў пячаткі ў пашпартах. Быў такі перыяд у жыцці тубыльцаў, калі ў чырванаскурым дакуменце, каб выехаць за мяжу, трэ было

паставіць пару пячатак: адну пра тое, што грамадзянін РБ, другую, што маеш права перасякаць беларускія межы. Яе вялікасць Бюракратыя красавала. Пры ёй квітнеў Бабнік. Ён праз знаёмых беларусаў з Польшчы даставаў запрашэнні, упісваў туды прозвішчы менскіх бандзюганаў і дробных спекулянтаў, заносіў дакументы ў міністэрства замежных спраўаў, дзе і ставіліся без чаргі патрэбныя пячаткі. Толькі не такія наіўныя людзі працавалі ў міністэрстве, каб ставіць, хай і за хабар, пячаткі бандытам. І тады Бабнік, хаваючыся за знаёмства з міністрам, пачаў наймаць мастака-рок-н-рольшчыка, каб той маляваў патрэбныя ўзоры ўсім, каго не вітала МЗС. Грошы цяклі праз Бабнікавы кішэні. А гарэлка з півам ліліся праз ягонае прагнае горла. І ўсё гэта здавалася бясконцым, але надышоў час Ч. Памежнік у Берасці ўгледзеў пяць несапраўдных пячатак. Ён не стаў арыштоўваць крымінальнікаў. Парваў пашпарты.

Бандзюгі вярнуліся ў Менск, знайшлі Бабніка, завезлі ноччу на родны аўтазавод, пасадзілі на ланцуг на дно пустога басейна і пачалі пускаць ваду. Бабнік ледзь не захлынуўся. Яго дасталі. Пабілі. Паказалі паяльнік, які наступным разам будзе ўстаўлены ў дупу і ўключаны, калі не знойдуцца 2500 даляраў, каб сплаціць доўг за збаёданыя дакументы.

Напужаны і збіты дэсантнік прыбег да мужчыны.

— Я тут пры чым?

— А ў цябе ёсць грошы.

Во логіка.

— Мае грошы належаць маім дзецям. А дзяцей чапаць нельга. А што сказаў твой брат?

— Не дае.

— Прадай кватэру.

— А дзе я жыць буду?

— А ты жыць не будзеш...

— Брат дасць, ты з ім пагавары, у яго ж толькі адзін брат на свеце.

Зноў логіка.

Брат грошы даў. Толькі спачатку Бабнік напісаў запіску, у якой прызнаваўся, што падрабляў пячаткі ў пашпартах на замову крымінальнікаў. Прозвішчы ўсіх бандытаў красаваліся ў тым данасе на самога сябе.

Бандзюганы даляры ўзялі, запіску пачыталі, паабяцалі

кампазітарскага далакопа болей не чапаць.
Бабнікаў брат стаў бяднейшы на 2500 даляраў. А Бабнік пабагацеў. Крымінальнікі вярнулі яму 600 з 2500. Сказалі, што ён абуў лоха і сумленна зарабіў. Увечары Бабнік шырока баляваў у бары Саюзу пісьменнікаў з лірыкам і драматургам за грошы абрабаванай братавай сям'і.
— Што ж ты робіш, падла пуставокая? — спытаў мужчына.
— Бо-о-ожа, сам падумай — а за што мне жыць? І маці сказала, каб я брату з ягонай сквапнай жонкаю доўг не вяртаў, яны яшчэ заробяць...
Мужчына зразумеў: Бабнік — чума, інфекцыя на кульгавай назе з чырвонай мордай. Ад чумы трэба трымацца на адлегласці, на максімальнай аддаленасці. Пэўна, тое сама дапетрыла і бухгалтарка і кінула Бабніка.
А ён прыбіўся ў ложак да лыжкамыйкі з бара. І пераехаў да яе ў Калодзішчы, дзе ўладкаваўся на аэрадром грузчыкам. Вайсковыя лётчыкі вазілі сякую-такую кантрабанду. Бабнік лётаў па Менску і гандляваў прасавальнымі дошкамі, памперсамі і ўсім-усялякім. Але на аэрадроме быў адзін закон, які Бабнік каб і хацеў, выканаць не мог: на працы мусіш быць цвярозы. Бабніка выперлі з аэрадрома, пагнала яго і лыжкамыйка, бо заспела ў сваім каладзішчанскім ложку з непаўналетняй суседкаю.
Бабнік вярнуўся ў сталіцу і пачаў ляпіцца да Бібліятэчніцы, самотнай мілажальнай асобы, якой, як яна ўсім казала, не было каму пашкрэбці чэляс. Завязаўся турэмны раман. Бо аднаго разу ў Бабнікаву кватэру пастукалі міліцыянты. Сям'я рэктара падала на Бабніка ў суд за доўгатэрміновую нявыплату аліментаў. Суд некалькі разоў папярэджваў і нарэшце асудзіў боўдзілу на тэрмін. Міліцыянтам Бібліятэчніца сказала, што Бабніка няма, але тыя не паверылі, ператрэслі хату і знайшлі злоснага аліментшчыка ў прыбіральні. Бабніка пасадзілі на паўгода.
У турме пачаліся прыпадкі. Арганізм патрабаваў гарэлкі. А дзе яе возьмеш за кратамі? Бабнік біўся галавою аб сцяну, курчыўся ў сутаргах і пускаў пену. Сукамернікі спачувалі, трымалі за рукі, за ногі і ўстаўлялі дошку ў рот, каб кусаў, грыз яе і не выў. Гэнай дошкаю і павыбівалі Бабніку зубы.
Шчарбатага, яго перавялі з турмы на Валадарскага ў родную Магілёўскую вобласць, на пасяленне. Там ён зноў пачаў піць.

Мужчыны тое тычылася мала. Але, зноў з'явіўшыся ў Менску, Бабнік не знайшоў лепшага месца для распуснага жыцця за мужчынаву кватэру. Так склалася, што мілажальная Бібліятэчніца жыла ў кватэры, купленай у крэдыт за мужчынавы грошы. Яна, у адрозненне ад свайго сужыцеля, працавала й паціху сплочвала пазыку. Такая была дамоўленасць. І раптам — гангрэна. Дзе Бог? Вірусалім, Вірусалім!!! Мужчына папярэдзіў. Не дапамагло. Наагул, размовы чумы не лечаць. А ў мужчынавай-бібліятэчніцынай кватэры загулі п'янкі-гулянкі. Звычайна, зайшоўшы да Бібліятэчніцы, мужчына бачыў голага Бабніка на канапе з адкаркаванай бутэлькаю гарэлкі і тэлевізарам на поўны гук. Бібліятэчніца піла меней за Бабніка. Яна глытала гузікі без дзірачак, супакойвалася рэланіўмам і да таго падобным. Нарэшце Бабнік дастаў мужчыну, і той узяў нож і сказаў:
— Адрэжу галаву! Калі кульгавая нага хоць раз пераступіць парог яшчэ маёй кватэры!
Бабнік ачах. Брат звазіў яго ў псіхіятрычную клініку і закадаваў ад алкагалізму.
Бібліятэчніца з'ехала з мужчынавай кватэры ў Малінаўку, да Бабніка.
Міліцыянты зноў маюць намер вярнуць яго ў турму, бо не працуе і не плоціць аліментаў у сям'ю рэктара-цымбаліста. Людзі кажуць, што мужчына пабіўся з Бабнікам і прагнаў Бібліятэчніцу з-за рэўнасці. Гэта няпраўда. Яна проста зняважыла мужчыну сваімі паводзінамі, сваім сужыцельствам з Бабнікам.
27.10.1997

Віннік

Віннік шанаваў вермут. Сярод вінаў ён аддаваў перавагу горкім напоям. Ісціна, якая тоіцца ў віне, на думку Вінніка — горкая. Сярод вермутаў ён лічыў за найлепшы сухі марціні з Італіі, але з асалодаю смакаваў любы з іх, і самы найтаннейшы быў у радасць. Кактэйлі ён не паважаў. Адзінае, што ён дазваляў сабе ў спякотны дзень, — кінуць у шклянку колькі крышталікаў колатага лёду. Піць свой вермут Віннік мог з раніцы да вечара і цалюсенькую ноч. Напіваўся зрэдку, пад настрой і выключна сам-насам. Размаўляў з сабою ўголас, спяваў і танчыў, плакаў і клаўся спаць на падлозе. Ён, пэўна, спіўся б ушчэнт, каб не

яшчэ адно моцнае захапленне: калекцыянаванне размаітых трункаў. Віннік збіраў алкагольную калекцыю з дзяцінства. Напачатку складаліся ў альбом налепкі, знятыя з пляшак. Пазней састаўляліся на палічку бутэлькі незвычайных формаў, а ў шуфляду хаваліся разнастайныя коркі. Праспекты і каталогі трункаў вельмі лагічна знайшлі сваё месца ў зборы разам з рэцэптурнымі кнігамі па вінаробстве і самагонаварэнні. Таму над выбарам асноўнага занятку ў жыцці асабліва задумвацца не давялося. Пры першай магчымасці Віннік узяў крэдыт і адчыніў краму. Нясквапнасць і дасведчанасць у хуткім часе ператварылі маленькі магазінчык у невялікі гандлёвы склад.
Чаго толькі не было на тым складзе! Трункі, напоі, алкагольныя вадкасці з усяго свету. Пералік назоваў і коштаў прымусіў Вінніка набыць кампутар. Паміж стэлажамі з бутэлькамі давялося ставіць люстэркі, каб сачыць за наведнікамі. Пад касавым апаратам Віннік трымаў газавы рэвальвер. Шмат людзей цягнуцца да алкаголю, і жабракоў сярод іх болей, чым заможных, бедных нашмат больш, чым багатых, такі свет.
Канфлікты, інцыдэнты і дробныя казусы давялі самастойнага Вінніка да думкі пра тое, што варта наняць памочнікаў. На касе села шыкоўнавалосая дзеўка. Пры дзвярах стаў шыракагруды ахоўнік. У каморку за кампутар нанялася сухарлявая бухгалтарка.
Неяк сам сабою расклаўся пасьянс з вяселлямі. Рудая, абсыпаная з галавы да пятаў залацістым рабаціннем касірка выскачыла за Вінніка. А шыракаспіны ахоўнік узяў сабе бляклатварую бухгалтарку.
Віно, як ісціна, мае завядзёнку пералівацца з адной формы ў другую. Яно лілося ў прагны рот ахоўніка, у вусны вогненнай касіркі і ў страўнік гаспадара гандлёвага складу. Бухгалтарка не піла, суцяшалася тытунёвым дымам.
Калі ў Вінніка была ў жыцці мара: сабраць найлепшую калекцыю вінаў, купіць на поўдні зямлі пад вінаграднікі, пабудаваць вінзавод, адчыніць сетку фірменных крамаў і кантраляваць увесь замкнёны цыкл вінаробства — дык у астатніх супрацоўнікаў ніякіх вялікіх планаў не вымалёўвалася. Жылі днём сягоннішнім. І штовечар напіваліся ці накурваліся марыхуаны, як жонка ахоўніка.
Каб здзейсніць мару, Віннік шмат ездзіў па розных краінах. Пад

час вандровак ён займеў рогі, настаўленыя ахмялелай жонкаю і зусім п'яным ахоўнікам. Рогі не дапякалі Вінніка. Бадацца ён не збіраўся. Побыт, не знітаваны з мараю, яго не абыходзіў. Пераліванне вадкасці з адной істоты ў другую Віннік лічыў працэсам нятворчым, а для сябе — не лёсавызначальным. Іншы кшталт — шкода, утвораная жонкаю ў калекцыйным серванце. Зло ўдарыла Вінніка ў самае сэрца. Паскудства рабілася ў п'яным дурмане, без усялякіх зламысных намераў. Распусніца бавілася з цяглявістым каханкам, ісці на склад яны паленаваліся і скралі бутэльку з запаветнай паліцы. Нараніцу, убачыўшы недаравальны памер шкоды, вырашылі не прызнавацца і не каяцца. Такая звычка ў большасці жанчын — рабіць, што заманецца, а праўды не казаць. Замест бясцэннага каньяку ў бутэльку налілі густазапаранай гарбаты.

Віннік, згледзеўшы падмену, засмуціўся да смерці. Каб адпомсціць, вырашыў пазабіваць палюбоўнікаў. Напачатку ён замацаваў сексуальную сувязь сваіх рагадаўцаў тым, што пазбягаў полавага жыцця з жонкаю.

Асноўная падрыхтоўка да злачынства пачалася з татальнага сачэння за наёмнымі супрацоўнікамі. Выкрылася, што наркаманка-бухгалтарка хоць і не ўжывае трункаў, але пляшкі крадзе пастаянна. Па якасці і моцы напояў Віннік вызначыў: жанчына зладзейнічае дзеля мужа. Калі той напіваўся, дык дазваляў жонцы накурвацца да бяспамяцтва. Выходзячы з гэтага, Віннік вырашыў спачатку атруціць ахоўніка. Давялося з'ездзіць на лікёра-гарэлачны завод, дзе і быў насыпаны ў пляшку мыш'як. Атрутны напой быў закаркаваны на станку, і таму не адрозніваўся ад астатніх бутэлек. Заставалася падмяніць пляшкі ў торбачцы зладзейкі!

План забойства выконваўся марудней, чымся жадалася. Рудагрывая распусніца інтуіцыйна пачула небяспеку. Жанчыны маюць такую здатнасць — адчуваць набліжэнне зла. Касірка зрабілася асцярожная і перастала піць з не ёй адкаркаваных бутэлек. У дадатак пачала сачыць за мужам. Адкрылася шмат дадатных якасцяў у Вінніку, пра якія раней яна і не здагадвалася. Да прыкладу, муж быў вельмі дасціпны і акуратны ў побыце, прыбіраў і стаўляў на месцы рэчы не толькі за сабою, але і за ёю. Праўда, дадатныя якасці мужа не спынілі рыжую лахудру, і яна панасыпала цыяністага калію ў калекцыйныя вермуты.

Вядома, Віннік любіў вермут, але, каб пераканаць жонку і ўсіх астатніх у тым, што хворы на імпатэнцыю, цалкам адмовіўся ад ужывання алкаголю, замест якога паліў па абедзе духмяныя цыгары.
Здзяйсненне помсты адбылося прэсна і будзённа. Наркаманка скрала пляшку. Віннік падмяніў бутэлькі. І ледзь не папаўся на гарачым. Каб схаваць сполах і ліхаманку, ён пачаў запрашаць бухгалтарку ў рэстарацыю. Кампутаршчыца расчулілася нечаканай увагаю гаспадара і дала згоду.
Пра запрашэнне яна мужу не сказала, спаслалася на неабходны візіт да краўчыхі і ўручыла ахоўніку пляшку з атрутаю. Той узрадаваўся вольнаму вечару і запрасіў на кілішак рудагрывую палюбоўніцу.
Пакуль бухгалтарка банкетавала з Віннікам, які скардзіўся на распусную жонку, тая разам з каханкам сканала ў ложку. Следства цягнулася доўга і звялося да арышту бухгалтаркі-наркаманкі. На судзе Віннік выступіў як сведка.
Гэтыя смутныя падзеі адбываліся ў час, калі ў краіне ўжо дазвалялася мець прыватныя крамы, але яшчэ не скасавалі смяротнае пакаранне.
Наркаманку асудзілі на смерць за спланаванае забойства мужа і ягонае палюбоўніцы. Жанчыну, хутчэй за ўсё, не расстралялі б. Але яна сама не вытрымала несправядлівага абвінавачання і засілілася ў камеры.
Дазнаўшыся пра самагубства, Віннік захацеў напіцца. З паліцы на яго прынадна пазіралі бутэлькі з вермутам і цыяністым каліем. Віннік ведаў, што ісціна ў віне, што яна страшэнна горкая. Ён піў віно, гаварыў уголас з тымі, хто, дзякуючы яму, пакінуў алкагольна-наркатычны свет. Віннік тапіў і тапіў віну ў віне. Каб ён каўтаў вермут, дык даўно б сустрэўся са сваімі ахвярамі твар у твар. Але ён напіваўся херасам.
З таго памятнага вечара Віннік стаў аматарам херасу, бо ісціна ў вермуце занадта горкая, як палын.
17.07.1998

Грашавік
Грашавік зрабіў важнае ў бізнесе адкрыццё і назваў яго законам падабенства. Ён грунтаваўся на тым, што чалавек кепска адрознівае падобныя рэчы. Зыходзячы з такой высновы і рабіліся справы. Выбіраліся найдаражэйшыя, эксклюзіўныя

тавары, і запускалася вытворчасць падобных, толькі значна таннейшых рэчаў. Такім было першае правіла — зніжэння цаны. Другое правіла, павышэння цаны, дзейнічала ў супрацьлеглым накірунку. Для ўзораў масавай прадукцыі ствараўся тэхналагічны эталон з якасных матэрыялаў.
Справы ў Грашавіка ішлі добра, бо ён не залежаў ад нейкай адной галіны ў таваравытворчасці, лёгка мяняў накірункі, лавіў моду і любіў заўтрашні дзень. Найсаладзейшае ў жыцці: вечарам думаць пра золак... — любіў паўтараць удачлівы Грашавік.
Захапленне імправізацыямі, вывучэнне селекцыі, праца з копіямі і перайманьнямі самі сабою адбіліся і на інтымным жыцці. Грашавік пазнаёміўся з сёстрамі-блізнятамі. Доўга не мог выбраць паміж старэйшай на паўгадзіны і малодшай. Нарэшце запрасіў да сябе жыць старэйшую. Грашавік ёсць Грашавік. Ён выбраў большую лічбу, хоць цудоўна ведаў: болей не заўсёды лепей.
Сямейнае жыццё не заладзілася. Мужа цікавілі абнаўленні, рух, стылёвыя пошукі. Жонка ж мела схільнасць да кансерватызму, стабільнасці і санлівага мяшчанства. Як большасць мяшчанак, яна мусіла завесці і завяла каханка. У інтымныя таямніцы яна пасвяціла сястру. Тая са злой радасцю дапамагала падманваць Грашавіка. Помсціла за тое, што выбралі не яе. Сёстры пераапраналіся адна ў адну, ствараючы жонцы бездакорныя алібі. Каб на месцы Грашавіка з ягоным законам быў іншы, падманы і здраджванні доўжыліся б да бясконцасці. Грашавік жа праз месяц ведаў праўду. Чым больш ведаеш, тым болей журбы носіш у сэрцы.
Дзеля ўратавання сям'і і рэпутацыі Грашавік сустрэўся з палюбоўнікам жонкі. Прапанавалася круглая сума за спакушэнне жончынай сястры. Палюбоўнік, што з радасцю зазначыў пра сябе падмануты муж, выглядаў рыхтык ён сам, толькі бедны. Калі не ведаць пакрыўджанага і крыўдзіцеля, можна было б прыняць іх калі не за блізнюкоў, дык за родных братоў адназначна. Матэматычныя і псіхалагічныя разлікі Грашавіка не спраўдзіліся толькі наконт лічбы, за якую распуснік пагадзіўся дзейнічаць. Да сумы давялося прыпісаць ажно два нулі з правага боку. Кожная рэч мае цану, і добра таму, хто можа заплаціць належны кошт. Грашавік дзеля прыліку патаргаваўся і перадаў найміту пачак банкнотаў.

Бедная копія Грашавіка слова стрымала. Калі Грашавік разам з жонкаю нібыта нечакана наведаўся на леціша жончынае сястры, дык перад наведнікамі прадстала такая карціна. Малодшая з блізнятаў ляжала на краі ложка і юрыла похву металёвым вібратарам. Чэлес палюбоўніка, які стаяў каля ложка на каленях, быў загнаны ёй у дупу. Нулі прыпісваліся дзеля менавіта такой адкрытай сцэны. Пабачыўшы Грашавіка, палюбоўнік палічыў, што напоўніцу адпрацаваў трыццаць срэбранікаў, выцягнуў чэляс, апрануўся і рушыў на электрычку. Ён сыходзіў годна, як сапраўдны артыст. Прысутныя маўчалі, бо здавалася, палюбоўнік яшчэ вернецца на сцэну, каб пакланіцца і паслухаць воплескі ўдзячных гледачоў.
Жонка, як і мусіць быць у падобных выпадках, працягнула істэрыку, якую пачала, калі муж абвінаваціў яе ў здрадзе і паабяцаў неўзабаве паказаць доказы. Вінаваціць сябе, сястру і палюбоўніка яна не бачыла сэнсу. Смяротныя грахі, кшталту распуснасці, сквапнасці і зайздрасці, прыпісваліся Грашавіку. Да істэрыкі старэйшай далучылася малодшая, яна размахвала ў паветры бліскучым вібратарам і крычала, што ў Грашавіка няма ніякай павагі да інтымнага жыцця іншых людзей, што яго нічога не цікавіць, акрамя ўласных капіталаў і іх павелічэння за кошт таленавітых людзей, якім ён зайздросціць. Грашавік разліў па шклянках ледзяное шампанскае, якім астудзіў гарачы гвалт, і спакойна запярэчыў. Яго цікавіць у жыцці не столькі капітал і секс, колькі феномен падабенства. І ён, не то што яны, навучыўся бачыць розніцу ў рэчах падобных і знаходзіць супольныя рысы ў рэчах далёкіх. Гэта яны не адрознілі лепшае ад горшага і палічылі, што два мужчыны лепш за аднаго. Толькі ён не пакрыўдаваў, бо на пакрыўджаных ваду возяць. Наадварот, ёсць прапанова годна выйсці з сітуацыі і жыць утраіх. Лічба 3 не толькі большая за лічбу 2, але і лепшая на 33, 3333... адсоткі.
Блізняты параіліся адна з адной і прынялі прапанову.
2 лепш за 1 на 100 працэнтаў... — палічыў пра сябе Грашавік.
19.07.1998

Даносчыца
У кабінеце замала святла. Дастаткова, ці амаль дастаткова для чалавека з добрым зрокам. А ў Даносчыцы зрок кепскі. Яна напружвае вочы. Літары на паперы плывуць, радкі хвалююцца,

тэкст зліваецца ў суцэльную кашу.
— Можа Вы, таварышу міліцыянер, запішаце? — Даносчыца бліскае акулярамі ў бок вусатага капітана.
— Не дазволена. Цябе, як ты кажаш, білі, ледзь не гвалтавалі. Пабоі зняла ты. Заява мусіць напісацца ўласнаручна. А ў чым праблема?
— Лямпачка ў вас слабая. Нічога не бачу.
— Сядай за мой стол, — вастраносы міліцыянт уключае настольную лямпу.
Жаўтлявае святло робіць выразнымі краі аркуша, а тэкст так і не праясняецца.
„Супакойся. Гэта з-за хвалявання. Ты ўсё згадаеш да драбніцаў. Гэтыя сытыя, задаволеныя жыццём вепрукі адкажуць за ўсё. Яны думаюць, маючы грошы, можна беспакарана крыўдзіць людзей? Так не будзе. Іх асудзяць і пасадзяць. Ці пасадзяць і асудзяць. Без розніцы.“
— У чым затрымка? — капітан ссоўвае на патыліцу плямістую шапку.
— Я напісала, каму і ад каго заява, а далей не ведаю, з якога моманту пачынаць, я ж іх дзесяць гадоў ведаю, а можа і болей.
— Пачні з сустрэчы. Дзе і як вы сустрэліся ў той вечар?
„Сапраўды. Глупства нейкае. Я іх ведаю дзесяць гадоў. Старэйшага, дык дакладна гадоў дзесяць. Ён прыходзіў у школу, чытаў свае вершы. Нармальныя вершы… Якія вершы? Якая школа?“
Мы: я і браты Грамовічы — сустрэліся на скрыжаванні вуліцаў Маркса і Валадарскага. Сустрэча адбылася ў чацвер 21 красавіка, прыблізна а палове на дванаццатую ўвечары. З імі быў…
„Сапраўды. З імі нехта быў. Хто? Не помню. Яны былі з кімсьці…“
… нейкі знаёмы. Я з братамі выйшла на праспект Скарыны, дзе мы ўзялі таксоўку і паехалі на пляц Перамогі. Яны прапанавалі зайсці ў бар „STAR“. Я збіралася пайсці ў кінатэатр „Перамога“, на фуршэт з нагоды прэм'еры спектаклю, дзе іграе мая маці.
„Ідыёцкі спектакль. Маці там іграе вялізны мужчынскі чэляс. Хуй як такі. Ну і роля! Прамаўчым пра ролю…“.
Але прапанова Грамовічаў мне спадабалася. Я іх даўно ведаю і не думала, што ўсё скончыцца бойкаю. У бары мы выпілі віскі. Усе па сто грамаў. Бар зачыняўся, але барменка ведала старэйшага з Грамовічаў, таму дазволіла нам пасядзець хвілінаў дзесяць пасля

закрыцця. Мы выйшлі.
„І мне захацелася сцаць. Так захацелася, што я ледзь не ўсцалася на месцы. Я сказала, што паміраю, хачу ў прыбіральню. Мы перабеглі праз пляц Перамогі. Але прыбіральня за крамаю „Прадукты“ зачынілася. Старэйшы з Грамовічаў прапанаваў зайсці да яго“.
Старэйшы з братоў прапанаваў зайсці да яго. Мы зайшлі.
„Дзякаваць Богу, жыве ён поруч з пляцам Перамогі. Пасля прыбіральні мне стала весела. І зусім не ад апаражнення мачавога пузыра. У мяне заставаліся яшчэ дзве таблеткі экстазі. Пра экстазі пісаць не будзем. Зрэшты, правільна казалі: не накладай кайф на кайф. А тут яшчэ і гарэлка“.
На стале з’явілася гарэлка. Мы выпівалі. Пачалі размаўляць пра тэатр.
„Сапраўды. Мы гаварылі пра лёс тэатру. Смешна. Сяджу ў мянтоўцы. Пішу заяву, як артыстка з драматургамі гаворыць пра тэатр“.
— Прабач, я не прыспешваю, — думкі Даносчыцы перарывае міліцыянт, — але мне сапраўды не надта ёсць калі.
— Я хуценька. Зараз скончу.
Я сказала, што браты прадалі свой талент. Іх не цікавіць мастацтва, толькі капітал.
„Няпраўда. Не! Праўда! Я і такое казала. Я казала, што яны тлустыя кабаны. Што яны прыгнятаюць людзей. Што пакідалі сваіх першых жонак з дзецьмі. Старэйшы спрабаваў мяне супакоіць. А малодшы сказаў, каб валіла „на хуй“. А я сказала, што нікуды не пайду. Ён схапіў мяне за шыю і пацягнуў да дзвярэй. Старэйшы вызваліў мяне“.
Малодшы Грамовіч схапіў мяне за шыю й пачаў біць. Старэйшы адцягнуў яго. Я сышла.
„Я не сышла. Я зачынілася ў шафе. У вялізнай люстраной на ўсю сцяну шафе. Малодшы. Сука. Казёл. Вырадак. Выцягнуў мяне з шафы. Як толькі люстэрка не пабілася?! Нам былі б капцы. Люстэрка метры на тры. Ён выкінуў мяне на лесвічную пляцоўку. Як сабаку. Без курткі, без сумкі, без чаравікаў. Нічога! Адрыгнуцца ваўку авечыя слёзы. Суд і краты“.
Прашу праваахоўчыя органы міліцыі разабрацца і пакараць вінаватых.
„Трэ было напісаць, як маці вучыла. Білі. Спрабавалі згвалтаваць. Не, і гэтага хопіць“.

— Таварышу міліцыянер, я скончыла.
Капітан уважліва чытае заяву.
— Праўду напісала?
— Іх пасадзяць?
— Суд вырашыць…
„Вось, блядзюга! Прыйшла да мужыкоў, напілася, істэрыку закаціла. Яе выкінулі, а яна данос накатала“.
— Вы заўсёды носіце акуляры? — удакладняе міліцыянт.
— Так.
— Вы ў гэтых акулярах былі ў той вечар?
— У гэтых.
„Ну і артыстка. Не чырванее. Білася з двума мужыкамі, а акуляры цэлыя“.
— Будзем разбірацца! — міліцыянт насунуў шапку на лоб.
24.08.1999

Стварэнне
Каменная альтанка. Раніца. Зімна. Марозна. Піва бутэлечнае. З рыльца. Пакрысе. Па глытку. Па кропельцы. Сняжынкі круцяцца, лунаюць, падаюць. Дыяментавыя парушынкі. Ляцяць праз мяне. Празрыстасць. Бязважкасць. Супакоенасць.
Уздоўж рэчкі. На праспект. У падземны пераход. Станцыя метро „Плошча Перамогі“. Бар „Казачок“. Стоячы. З пластыкавай шклянкі. Пяцьдзесят каньяку „Глорыя“. Размова з барменам. Душэўная. Пра футбол. Прапануе яшчэ паўста. Адмаўляюся.
Паўз Оперны тэатр. У Траецкае прадмесце. Карчма. Цёпла. Смажаным мясам пахне. За чорным столікам. Сто гарэлкі „Крышталь“ і шклянка тоніку. Іскрыстыя вадкасці. Адна за адною. Змешваюцца з крывёй.
Праз мост. На гару. Да царквы. Каля раённнага ДАІ. Па прыступках. У сутарэнні. Бар байкераў. *Johnni B. Good*. Руды бармен. Лыбіцца. Порцыя тэкілы. Хлабысь. Рок-н-рол. Дзеўка. Радзімая плямка на шчацэ. Смачная. Шакаладная манетка. Смяецца.
У скверык. Да мастакоў. Дзеўка з плямкаю ўчапілася ў мой локаць. Мастачка-няздара. Гандлярка грабеньчыкамі і драўлянымі крыжыкамі. Кіруем у майстэрню. Праз гастраном. Штоф. Джын „Ведрыч“. Капшук разбух.
Платная прыбіральня. За *McDonald's*-ам. Чыста. Светла. Цёпла.

Выструменьваецца боль. Клас! Хаваемся ў каморку прыбіральшчыцы. „Ведрыч“ з хлебам. Са шклянак. Млосць. Поўны ўнітаз. Хлеб. „Ведрыч“. Тэкіла. „Крышталь“. Піўны шум. Мыю твар. Спалоскваю рот джынам.
Больш ні глытка. Мароз цверазіць. Гастраном „Узвышша“. Мінералка. Для мяне. Джын „Ведрыч“ для сябровак. Секс уратуе свет. У бамбасховішча. Пад салонам мастацтваў. Яны п’юць, я іх распранаю. Падабаюся. Падабаюцца. Сплятаемся ў клубок. Смочкі. Пальцы. Секелі. Языкі. Локці. Скабы. Валасы. Пахі. Уздыхі. Вадкасці. Канвульсіі. Заціханне. Заміранне. Сон. Салодкі. Цяжкі.
Золак. Таксоўка. Дом. Лазенка. Мыюся. Люстэрка. Я — самае прыгожае на свеце Стварэнне.
Менск, 1999—2000 гады

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 5 (10) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **29-08-2000**
[image]

Адам Глобус
Камэнтар

Вершы

1.
СТОЛ

Зіма.
Стол, засланы цыратай.
На цыраце намаляваны яблык.
На яблыку ляжыць жывы яблык.
Разрэзаў яблык напалам,
Так што нават цыратавы яблык
Атрымаў сапраўдны шнар.
Надта ўжо хацеў зьесьці яблык.
Зіма.

2.
РЭЧАВІК ЗЬ МЯСАРЭЗКАЙ

На батарэі сушыцца мясарэзка.
Сонца промнем разрэзала яе
На кавалкі.

3.
РАНІЦА

Пад блакітным акном
На рудой падлозе

Стаіць чырвоная лава.
На лаўцы маленечкі рудзенькі зэдлік.
На ім, за вялікім сталом,
Сяджу я.
Гляджу ў печ, на агонь,
А потым павярнуся сьпінаю да печы
І пазіраю ў сінюю шыбу.
Шыба плача.
Адбітак агню ліжа сінія сьлёзы.
На чырвоным стале,
Засланым белай падрапанай цыратаю,
Ляжыць белы ручнік.
На ручніку — залатыя бліны.

4.

ЛУЖЫНА

Лужына з аднаго вераб'я зрабіла два —
Адзін п'е ваду,
Другі — неба.

5.

ДОМ І КОТ

Нерухомасьць архітэктуры
Парушыў мантаж
Дому з катом.
Па даху мякка ішоў кот.
Па даху ампірнага дому.
Было відаць:
Як бязгучна кот ставіў лапы.
Было відаць:
Поўную адсутнасьць гуку.
Карынцская капітэль
Зь лістамі акантаў,
Зь нерухомымі вірамі валют
Не зьвярнула на сябе ўвагу ката,
Як і бляшаны ўдаў вадасьцёчнае трубы.
Кот дайшоў да вільчыка,
Зьнік у шчыліну паміж дахам і небам,
На хвіліну пакінуўшы на небе
Чорны хвост.

6.
ДАТЫ

9.2.1981 году. Тэлеграма:
ПАМЁР КАЗІМЕР КРОПКА ПРЫЯЖДЖАЙЦЕ КРОПКА
10.2.1981 году. Тэлеграма:
У РЭГІНЫ НАРАДЗІЎСЯ СЫН КРОПКА

Да сваіх візуальных статычных вершаў пачатку 80-х
я стаўлюся скептычна і лічу патрэбным гэта адзначыць.
Але калі вершык пачаткоўца неабходны ў якасьці камэнтару да творчасьці клясыка, ён варты згадкі.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 5 (10) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **29-08-2000**
[image]

[image]

A R C H E

[image]

A d a m H l o b u s

№ 5 (10) – 2000

[image]

Пачатак Навіны Форум Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]

Адам Глобус

[image] [image] [image]

» да Зьместу «

[image] [image] [image]

Адам Глобус
Хоку пра снег

Крыжы пад
снегам…
Вось і ўсё, што
магу ска-
заць пра
Радзіму.

* * *

Срэбная цішы-
ня — на
прыдарожны
лес
снег
церушыцца.

* * *

Стой,
прытармазі…
Вунь бяжыць

каля лесу
па снезе ліса.

* * *

У снежны вечар
зялёнае
гарбаты
сабе запарыў.

* * *

Толькі ў
дзяцінстве
можна
пабудаваць са
снегу свой
замак.

* * *

Перад
дзвярыма
з барэта й
палітона
абтрасаю снег.

* * *

Схілілі лапы
высачэзныя
елкі
пад цяжкім
снегам.

* * *

Уздоўж дарогі
снежна-белыя
слупкі
мяне вітаюць.

* * *

Сцукраваны
снег
шархоча,
нібыта жвір,
пад падэшвамі.

* * *

Лютаўскі вецер
зранку мяне
частуе
снежнай
крупою.

* * *

Казачны
настрой —
у тэатральным
парку
дзеці снег
ядуць.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум

№ 5 (10) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 29-08-2000
[image]

Пятро Васючэнка Пяць філялягемаў пра Адама Глёбуса

— літаратуразнаўца, загадчык катэдры беларускае мовы і літаратуры Лінгвістычнага ўнівэрсытэту. У свой час сябар літаб'яднаньня „Тутэйшыя". У 1999 годзе выйшла ягоная кніга прозы „Прыгоды адпаго губашлёпа (Аповеды пра Валенціна)" (Рэдакцыя газэты „Частный детектив").

1. Капялюш нязвыклага колеру

Герой аповеду Адама Глёбуса „Слон" штодзень творыць у гарадзкім парку адну й тую ж скульптуру — „Слана" з рубэроіду, дроту ды іншых матар'ялаў, якіх поўна ў скрынях для сьмецьця. І кожнага разу з панылаю аднастайнасьцю гэты твор зьнішчае галоўны „знаўца" мастацтва — дварнік па мянушцы Лістапад. Тут накрэсьлена схема ўзаемаадносінаў мастака й асяродзьдзя, што спрацавала б і ў тым выпадку, калі на месцы „слана" стаўся б „Чорны квадрат" або жырафа".

Іншы аповед Глёбуса, „Капялюш пажарнага колеру", пра тое, як па пляжы пахаджвае якісьці дзівак у экстравагантным галаўным уборы і эпатуе грамадзкасьць. І гэта — аповед-мадэль: мадэлююцца стасункі паміж мастаком і натоўпам. Гэткія старадаўнія, што аж узыходзяць да Купалаўскага „Кургану"...

У кожным з аповедаў адчуваецца супраціў асяродзьдзя — ён зусім непазьбежны, калі на ягоным „натуральным тле" пачынае нязвыкла мільгаць чыёсьці „я". Гэты канфлікт у мініятуры падаецца як адмысловая гульня, у якую ўцягнутыя аўтар, пэрсанажы й чытачы. Яно зразумела: вобраз мастака схоплены

тут у нясьпелай, „дзяцінай“ фазе станаўленьня. А сталеньне адбудзецца, няйначай, тады, як атрад новай, „гульлівай“ інтэлігенцыі аформіцца ў сьпелую генэрацыю „інтэлектуальнае прозы“.
1992

2. Глёбус і скаталёгія
Скаталёгіяй нараклі эстэтызацыю жыцьцёвага бруду, смакаваньне брыдкага ў мастацтве. Узоры літаратурнае скаталёгіі ў розныя эпохі стварылі Пэтроні, Рабле, маркіз дэ Сад, Заля, Сартр, Генры Мілер. Блізкія да такіх твораў „Млосьці“ й „Амстэрдам“ Адама Глёбуса.
Часам ахвочыя пагідзіцца чытачкі гэтых твораў прызнаюцца, што ня могуць без ванітаў дачытваць іх да апошняе кропкі. Але ж дачытваюць.
Лічыцца, што насалоду ў брыдкім знаходзяць адно хворыя людзі. Аднак жа бруд у красным пісьменстве найчасьцей зьяўляецца наступствам вонкавае хваробы. Хварэе калялітаратурнае асяродзьдзе зь ягонымі чарнобылямі й постчарнобылямі. Яно спараджае сваіх монстраў, якіх Глёбус спраўна апісвае ў „пачварніках“ ды „басэйніках“. Ён тут выступае, бы „санітар“ гарадзкіх джунгляў, паляўнічы на зданяў. Дарма казаць, што ў гэтых творах даволі бруду.
У хворым асяродзьдзі пачынае пакутаваць літаратура, чуйная да дысгармоніяў жыцьця. Гэта засьведчыў Юры Гумянюк у слынным двухрадкоўі:

Хварэе паэзія ў
тлустай
бутэльцы.
Блішчаць яе
вочы празь
сіняе шкельца.

Літаратура задыхаецца ў бруднай, тлустай абалонцы жыцьця. Згадайма, што фізычная хвароба ды яе брудныя праявы ўсьведамляліся йшчэ „нашаніўцамі“ як сымбаль нездароўя нацыі. Пра што паведамляў у допісе з Горак нашаніўскі карэспандэнт, мала яшчэ каму вядомы Максім Гарэцкі? „Ужо другі месяц у Горках працуе лятучы атрад па вачавых хваробах.

І кожны дзянёк каля земскай бальніцы вялікая таўпа людзей, хворых на вочы, найбольш бедных сялян. Беларусь сьлепа й душой, і целам...“
А гэтае Купалава, споўненае надзвычайным трагізмам і скрухай:

А чалавек —
ком гною, сала
Быдлём,
сьляпнём жыве
і гіне.

Ніжэй няма куды й апусьціцца. Чыстая скаталёгія.
Пакуль „празаікі“, паводле выказваньня Купалы ў артыкуле „Чаму плача песьня наша?“, яшчэ не ачысьцілі жыцьцё ад мярцьвечыны й бруду, літаратуры даводзіцца гэны бруд эстэтызаваць. А што ёй яшчэ застаецца рабіць?
Калісьці я прапанаваў наступную формулу мастацтва XX стагодзьдзя: гэта кветкі, якія прарасьлі праз асфальт, сьмецьце, бруд і друз, і закрасавалі над імі.
1996

3. Мілер, Глёбус ды кампанія
Моц Мілера ў наступным: на самым дне кляякі ягоны герой-рабак шукаў людзкасьці й знаходзіў яе, і пераконваў, што ўсюды жыцьцё, нават у коле дзявятым скаталягічнага пекла. Ягоныя творы споўненыя нейкай шалёнай вітальнасьцяй, прагай жыцьця, што працінае ўсе дзевяць колаў навылёт. А рабак, не зважаючы ні на што, марыць зьмяніцца ўсё ж у чалавека.
У параўнаньні зь Мілерам асобныя ягоныя пасьлядоўнікі (прыкладам, небарака Эдзічка Лімонаў) выглядаюць недаросткамі.
У той жа час прыхільнікаў беларускае скаталёгіі я не магу назваць адэптамі Мілера. Яны цярэбяць шлях празь беларускія рэаліі — фальклёрныя, этнаграфічныя, псыхалягічныя, і, пэўна, дасягнуць адметных вынікаў.
Карэньнямі беларуская скаталёгія палягае ў нацыянальнай аўтэнтыцы. Рыгор Барадулін згадвае ў „Здубавецьці“ паганскага бажка Юра, які распальвае беларусаў у сакральна-непрыстойных прыпеўках ды показках. У прозе Адама Глёбуса

грахаваднічаюць дамавікі, лесуны, русалкі. Беларусь — краіна з гісторыяй ды міталёгіяй, што сягаюць у пракаветныя часы, і яе літаратары падступаюць да скаталягічнай тэмы больш грунтоўна. Іронія згладжвае брутальнасьць іхных твораў.
1999

4. Закапаны аўтобус

Надзвычай цікава Адам Глёбус тлумачыць паходжаньне назвы „Дамавікамэрона". Выводзіць яе не ад Бакача.
З адказаў на пытаньні Раісы Мшар для „ЛіМу":
„— Слова „дом" мае для мяне безліч прачытанняў: адсюль і „Дамавікамерон", адсюль і „дамавік", тут і „дамавіна"...
— Адсюль і закапаны аўтобус? Вы ж пісалі: „Я нават марыў закапаць у лесе аўтобус і ў ім жыць. Хай у лесе, хай пад зямлёю, хай не дом, а аўтобус, але ж асобны і мой".
— І закапаны аўтобус таксама. Абсалютна нармальна, што чалавек, які нават мае ўласны дом, шукае дом лепшы, ідэальны... Касмічны карабель — гэта ж таксама дом"
(ЛіМ, 1998, 25 верасьня. С.7).
Архетып дому ў нашай літаратуры — не навацыя. Адам Міцкевіч паставіў у цэнтар свайго сусьвету шляхецкі маёнтак, Колас — лесьнікову хату. Мяркую, кожны зь беларускіх літаратараў будуе свой сьвет як дом. Мне асабіста хацелася, каб у маім літаратурным доме было ўсё — абраз на сьцяне, мышы ў падпольлі й кілбасы з кумпякамі ў каморы.
Закапаны аўтобус — спынены рух, затарможаны мадэрн. Колісь Казімер Малевіч замарозіў мастацтва ў сваім „Чырвоным квадраце".
Гадаванец мастацкае вучэльні, Глёбус пераймаў досьвед кубістых ды супрэматыстых, рэалізоўваў яго сьпярша ў жывапісе, пасьля ў літаратуры. Інтэр'ер, адлюстраваны ў аповедзе „Вова Вова", — цалкам кубістычны:
„У плане пакой квадратны. Вышыня сцяны супадае з яе даўжынёю. Акно і дзверы зачыненыя. У пакоі цёпла. Пахне шпалерным клеем. Падлога акуратна засланая абгортачнай папераю. На паперы, пасярэдзіне пакоя, стосам ляжаць стужкі шпалераў. Стужкі аднолькавай даўжыні, якая адпавядае вышыні сценаў. Сцены, з якіх знялі старыя шпалеры, падобныя да геаграфічных картаў, а дзіркі ад цвікоў — да абазначэнняў населеных пунктаў. Аконная рама ахоплівае чатыры

фрагменты мікрараённага клятчастага краявіду. Аконная рама белая, як столь і дзверы. У адным з чатырох кутоў стаяць драбінкі, каля іх — табурэт. Калі па столі з кутоў пакоя пракрэсліць уяўныя дыяганалі, якраз у кропку перакрыжавання ўбіты крук, на якім вісіць шкляны шараабрысны свяцільнік. Шар не гарыць. У пакоі светла. За акном дзень. На падваконні ляжаць каўпакі ад дзвюх разетак і выключальніка, зашрубка і шэсць шрубак. Шыбы пацеюць, зацягваюцца мутнасцю. Кубічная прастора адгароджаная ад свету — стандартным акном, пабеленай столлю, дашчанай падлогаю і гладкімі дзвярыма“.

Гэты літаратурна-кубістычны баль ладзіцца дзеля таго, каб на стэрыльна чыстай прасторы шасьцігадовы шпунт мог двойчы вывесьці імя большага брата — *Вова Вова*. Наватвор, аднак жа, потым схаваецца пад наклеенымі шпалерамі.

У адным з раньніх вершаў Глёбус пацьвердзіў, што „ў квадрата чатыры вуглы“ і здолеў вобразна ўпісаць у гэты квадрат беларускую „Пагоню“:

Час ідзе,
Час ляціць,
Час імчыць.
Не стрымаць,
Не спыніць,
Не разбіць...
Росквіт
вызначыць
заняпад.
Застаецца
нязменным
квадрат.

А вокладку альманаха „Тутэйшыя“ Глёбус згабляваў таксама пад „Пагоню“, адно кубістычную. Кубістычны вершнік атакуе кубістычнага цмока; замест мяча ў руцэ вершніка кубістычная галінка.

Кубістычны вершнік не пакрыўдаваў. На ім заехала ў літаратуру цэлая каманда Глёбуса — Уладзімер Сьцяпан, Уладзімер Сіўчыкаў, Максім Клімковіч, Міраслаў Шайбак. „Глёбусятня“, як мы называлі іх за часамі „Тутэйшых“. Стыль „глёбусятнікаў“ адрозьніваўся сваёй нефілялягічнасьцю.

Адразу бачна было, што піша не філёляг, а мастак, — вэрбальны тэкст замяняўся выявай.
Яны ж навучылі, як на літаратуры зарабляць капейчыну і пры гэтым ня кланяцца дзяржаве.
1998—2000

5. Погляд дзіцяці
Згадайце, зь якой бессаромнасьцю нас разглядаюць дзеці. Яны ўважліва й бесцырымонна абмерваюць нас позіркам, зважаюць на кожную загану, кожную хібіну ў нашым абліччы. Дарослыя ад гэтага позірку часам угінаюцца й курчацца. Можна падумаць, што дзеці самыя бездакорныя — але гэта ня так. Бездакорным можна назваць хіба гэты дапытлівы бессаромны позірк.
Глёбус у шэрагу твораў праяўляе гэткую ж дзяціную цікаўнасьць. Самаагаленьне бяз сораму — таксама прыкмета інфантыльнасьці. „Толькі не гавары маёй маме“, — на ўсялякі выпадак просіць „я-герой“ Глёбуса, бо мама, пэўна, некаторыя рэчы не ўхваліла б. „Дамавікамэрон“, трэба думаць, трэба хаваць не адно ад дзетак, але й ад строгай мамы. Але ж дзеці любяць назіраць за дарослымі, у тым ліку й за дарослымі ў спачывальні. Глёбусаў герой-назіральнік паводзіць сябе часам як ліхі чэхаўскі хлопчык, *enfant terrible*.
У шэрагу аповедаў герой Глёбуса згадвае сваё маленства. Ён то адпачывае ў Артэку, то забівае ката (апошняе на мяжы літаратурнага фолу).
Зь нядаўняга часу назіральны герой Глёбуса ўзяў на сябе місію літаратурнага кантралёра[1] , што выкрывае чужыя грахі й грашкі. Пры гэтым закранаюцца рэальныя асобы зь беларускага культурніцкага бамонду.

[1]Некалі „Тутэйшыя" друкавалі сваё выданьне „Кантроль".

Падобны герой бегаў калісь па старонках „Вожыка“. і наколваў на свае іголкі савецкіх грахаводнікаў.
Вобраз маралізатара ў гэтых аповедах сам крыху камічны — як Чорт з „Камэдыі“ Марашэўскага, што навучае Дзёмку, як трэба

жыць.
З гэтае нагоды калегі трывожацца за творчы лёс самога Глёбуса: маўляў, цяжка рухацца далей з такой ношкай — наколатай на вілы чалавечай недасканаласьцю. Але ж гэтую ношку лёгка й скінуць...
Нехта ўзьвядзе Глёбуса ў ранг „культавай постаці“ — як раней рабілі пісьменьніка „народным“, нехта абурыцца ім, але першы й другі сьпярша яго прачытаюць.
2000

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]

№ 5 (10) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **29-08-2000**
[image]

Андрэй Савіцкі Пашпартызацыя бесаў, або Койданаўскі Глобус

— мастак, публіцыст, адна з самых скандальных постацяў артыстычнага жыцця беларускай сталіцы. У 1995 годзе публічна падтрымаў захады Аляксандра Лукашэнкі па зьмене замежнапалітычных і культурных прыярытэтаў Беларусі, але ўжо ў 1996-м гэтаксама публічна дыстанцыяваўся ад палітыкі А.Лукашэнкі. Прынцыпы і бескампрамісны, часам да

Адам Глобус нагадвае мне бронзаўку — ёсць такі жук бліскучы, цяжэнькі. На яго вельмі цікава глядзець, але чамусьці гідка браць у рукі. Гэты жук да людзей дэманстратыўна абыякавы — у адрозненне, прыкладам, ад вясёленькай божай кароўкі. Цяжка сказаць, наколькі супастаўныя літаратура і энтамалогія, але ад тэкстаў Глобуса застаецца адчуванне не зусім чалавечага бачання свету. Не тое, каб узвышанага — анёльскага! дэманскага! — не, БІЯЛАГІЧНА не зусім чалавечага.

З пункту гледжання „генезісу творчасці“ Глобус своеасаблівы. У ягоным выпадку ход быў пра „ўшчыльненне“ беларускай літаратуры. Я разумею Глобуса ў тым, што эпас пра меліяратараў і трагічны шэпт хворых на рак архітактараў, якія, седзячы перад кінутай у маладосці дачкой, успамінаюць апошні партызанскі бой пад Ашмянаю, — спрыкрыцца. Адаму Глобусу „выпала жыць у цікавы гістарычны час“. І цяпер ужо няма розніцы, стаў бы ён добрым лагерным дзесятнікам ці дрэнным сакратаром партарганізацыі Саюзу пісьменнікаў, каб ён жыў у зусім іншую гістарычную эпоху. Адзінае правіла гульні цяпер — гэта гульня без правілаў. І чалавек Уладзімер Адамчык, і пісьменнік Адам Глобус гэта і разумее, і здольны

ажыццявіць — як у жыцці, так і ў працах, мастацтвах працы. Хоць, між іншым, называць Глобуса пісьменнікам нарэшце — насуперак ягонаму жаданню. Для мяне ён мастак — не толькі па старой памяці, але і паводле тыпу вобразнага мыслення.

бехапрацаўнасьці, і нарэшце — крытыкі. У ARCHE друкуецца ўпершыню, піша па-расейску ў традыцыях расейскай крытычнай школы. Сын жывапісца Міхаіла Савіцкага, аднае з цэнтральных фігураў беларускага мастацтва 60-90-х.

Я не люблю тэкстаў, дзе аўтар доўга і грунтоўна падводзіць чытача да высновы, якая самому аўтару была вядомая ад самага пачатку — і ён трымаў яе, як фігу ў кішэні, каб пасля з захапленнем прад’явіць: во бачыце, да чаго мы прыйшлі.
Куды больш годныя тыя тэксты, дзе скрыптар, ідучы за зменаю адчуванняў, не маніць — і часта сам здзіўляецца выніку. Яшчэ сумленнейшыя матэматыка, тэарэмы: маем — трэба даказаць. А яшчэ лепшая аксіёма: маем, і пайшлі ўсе да д’ябла. Хоць самы цікавы занятак — даказванне аксіёмаў. У сучаснай беларускай літаратуры — калі прыпусціць, што такая ёсць — Глобус з’яўляецца беспасярэднім нашчадкам сацыяльна арыентаванай, „па-грамадзянску актыўнай“ літаратуры. Літаратуры сацыяльнага і крытычнага рэалізму. Літаратуры, якая своеасабліва памяняла свой выгляд, каб захаваць сутнасць.
Тое, што Глобус — рэаліст, для мяне аксіёма. Якую варта даказаць, як аксіёму паралеляў. Хоць у Сярэднявеччы яго, хутчэй за ўсё, назвалі б наміналістам.
Наагул Глобус — вялікі майстар блытаніны. І цалкам

відавочна, што гэтым задаволены. У ягонай змрачнаватай блытаніне — адлюстраванне таго часу, у якім ён жыве. Не ў „які“, а менавіта ў „якім“ — бо стылістыка, сюжэты, персанажы, мова — укарэненыя ў гэтым часе і іх ужо не выцягнуць і не перанесці — нярэдка ўва ўсіх сэнсах гэтага слова.
Абыякавасць Глобуса да людзей — зваротны бок вялікай цікавасці да таго, што чалавек хавае ад сябе і іншых, пры нязручным пытанні прымаючы выгляд карэктнай няўважлівасці. Усе зручныя, карэктныя і ўзвышаныя пытанні даўно зададзены — і адказы на іх атрыманыя ў залатых капальнях Калымы, у Бухенвальдзе, у тыфозным бараку, а рысу падводзіць саркома хворага на AIDS. Спроба максімальнай рэалізацыі ўласнае няздатнасці, у кожны з момантаў якой вы цалкам упэўненыя ў непахіснасці сваёй рацыі. Найбольш поўна праблемы культуры былі вырашаны ў Кампучыі дактарамі Сарбоны Пол Потам і Енг Сары. Дзесяткі тысяч чарапоў, прабітых цвікамі, у мэтах эканоміі патронаў, — вычарпальнае вырашэнне многіх праблемаў „Паэтыкі“ Арыстоцеля і трактата Псеўда-Лангіна „Аб узнёслым“.
Для мяне неаўтэнтычнасць Фройда яшчэ і ў тым, што ён унікнуў магчымасці даследаваць праблему лібіда ў газавай камеры, аддаўшы перавагу смерці ад раку на сваім ложку — вось і ўсё, што можна сказаць пра „Эрас і Танатас“. А Аліўе Мэсіян, прайшоўшы праз Верхні лагер Бухенвальду, усё ж напісаў свой „Квартэт на скон вечнасці“.
Сапраўды дастойныя людзі Ўсходняй Еўропы і Расіі маюць троху адрозны анталагічны досвед. І таму для іх захапленне „праблемай полу“ неўласцівае — неістотнае. Гэта для іх толькі субстрат, на якім можна даследаваць больш сур’ёзныя праявы чалавечага быцця.
А вось фрайдысты-амерыканцы — усяго толькі сексуальна заклапочаныя пераросткі. Акселераты, што вырашаюць праблему „рая“.
Перш чым заняцца працамі Глобуса, ягонымі тэкстамі — нават ставячыся да яго як да сучасніка, г.зн. не зусім сур’ёзна — варта ўдакладніць яшчэ пару вызначэнняў. Не пра тое, што Глобус робіць са словамі, а пра тое, што словы робяць з ім. У ягоных тэкстах — як удалых, так і няўдалых — ёсць відавочная цяга да волі. Не да беларускай „волі“, па якой можна тужыць, якую можна страціць або *„ўзяць“ ці то ў пана, ці то ў маскаля**,

як нешта, чаго ты спрадвеку спадзяваўся, але не поўніцай табе ўласцівае. Не, прага волі польскай і расійскай — якое пазбавіць і якою абдараваць немагчыма. Волі, што перасягае цераз усе катэгорыі Шапэнгаўэра і топіць іх, сама таго не заўважаючы. „Ваяваць палякі не ўмеюць, але бунтава-аць...“ — трапна вызначыў Мандэльштам. Як, зрэшты, і расійцы, узбагачаныя вугра-фінскім і цюркскім этнічным субстратам — ваююць ды бунтуюць без сэнсу ды літасці. Для Глобуса гэтая прага бессэнсоўнага і бязлітаснага, прага волі — цяжкая: яна ўскладненая стагоддзямі гадаванай *тутэйшай*, койданаўскай скрытнасці. Але імкненне зладзіць у царкве шабас замест фэсту ды пакачаць па пожні іерадыяканаў і архірэяў, на мой погляд, несумненна, прысутнічае.

Гэта не эпатаж — гэта прага *не-за-висимости*. Нежаданне вісець на чыімсьці „за“ ў чужым хляве. Хоць гэтая прага высілкамі дурняў выродзілася ўва ўсяго толькі *незалежнасць*. Магчымасць ляжаць, ні ад каго не залежачы. Увогуле праблемы беларускага адраджэння робяцца гранічна простымі: чым больш *свядомыя* журналісты спяваюць пра Басаева, тым відавочней, што ім адно ўласціва: ілюстрацыя да радка Высоцкага — „Лежу — так больше расстоянье до петли“. Глобус ні ляжаць, ні вісець не жадае. У гэтым — ягонае процістаянне таму, што завецца беларускай літаратурай. Беларускай літаратурай, у якой гістарычна значэнным прызнавалася тое, з чым *згаджаліся* — цудоўнае слова — і заўсёды непрымальнай лічылася неадпаведнасць звычным, і таму агульнапрызнаным, прынцыпам і нормам.

Наагул, у тэкстах Глобуса цімала гульні — часам занадта: яна выклікае пярэчанне і псуе тэкст. Гульня робіцца натуралістычнай — і ёсць рызыка перабору, шкоды для густу. Усё ж такі гэта ўказвае на неабыякавасць аўтара да таго існавання, якое ён апісвае ў такіх не-быццёвых формах. Чартаўшчына — як люстэрка сучаснасці. Чаму б і не, калі сучаснасць — выражэнне чартаўшчыны.

У наш час мастакі сталеюць позна. Замнога дадатковага досведу трэба набраць. Дадатковага — бо да традыцыйнага разумення чалавека гэты досвед нічога не дадае, але ставіць яго пад сумнеў. Невырашальнае сумненне: калі кандыдат навук гвалціць уласную дачку, а афіцэр б’е гумавай палкай старога дзеда па твары — і ў гэтую палку натыканыя аскялепкі

брытваў. Вобраз і падабенства Божыя — ці дэвіз Алімпійскіх гульняў: „Шпарчэй, вышэй, мацней“. Можна, безумоўна, займацца інтэлектуальным ананізмам і пісаць пра Гайдэгера, але ад будучыні гэта не пазбавіць.

Ці можна ўявіць сабе ў музеі плачучага бальшавіка? — спытаўся Маякоўскі. Ці можна ўявіць сабе чарговага дамавіка сярод людзей, што жылі некалі ў Койданаве? — спытаюся я, не параўноўваючы Глобуса з Маякоўскім і Койданава з музеем. Параўнаю толькі — плачучага бальшавіка з дамавіком. І той, і другі — інфернальныя, ірэальныя. Людзі койданаўскіх апавяданняў менш рэалістычныя, чым плачучы бальшавік, як і дамавік рэальнейшы за музей. Рэальныя, жывыя людзі, жыхары мястэчка, Бабкі Тэклі, местачковыя п’янтосы і школьныя вучыцелькі сапраўды жылі: яны знікаюць, вагаюцца, паміраюць ці здатныя памерці. Тады як „дамавік“ у зялёным палітоне і плачучы бальшавік несмяротныя: яны, як чэрці, здольныя назаўсёды застацца ў памяці.

Твар ціхай правінцыйнай бабулькі сціраецца ў памяці — слёзы на твары вусатага пралетара, які нідзе, акрамя ўяўлення аўтара, не існаваў, застаюцца. Прастрэленае паліто Леніна не больш рэальнае, чым бес, што жыве ў тэлефоне. Толькі гэты бес можа і матэрыялізавацца — прыйсці да вас у зялёнай балонні і прад’явіць пасведчанне. А з ім — другі, мокры, з аўтаматам. На шчасце Глобуса, ён не асвоіў шырокага пласту магчымых „дамавікоў“: „ахоўнікаў“, „нарнікаў“, „разводнікаў“, „бамжатнікаў“ і „аператыўнікаў“. Але ад гэтага асваення нікому не варта заракацца.

Рэалістычнасць Глобуса — у адчуванні ірэальнасці таго, што адбываецца. Рэальнасць, дадзеная нам у адчуваннях і ўспрыманнях, можа выбухнуць фантасмагорыяй: „Штаны і трусы, блядзь, ніжэ кален. Дакументы! Ах, член? Гэта там ты член, а тут ты хуй. Мордай к сцяне, рукі назад“. Вы што, думаеце, гэтая фантасмагорыя не вечная?

Рэалізм у тым жа й заключаецца, што чалавека можна за тры тыдні ператварыць у стогнучае мяса, у нешта, жахлівейшае за жывёлу, — а ўкормленыя бесы застануцца. Можна і хутчэй зрабіць чалавека ценем уласных вантробаў, але для гэтага патрэбныя спецыялісты, а таксама неабходнасць у такой сістэмнай трансфармацыі. Усё гэта — справа тэхнікі. У выпадку з Глобусам — справа тэхнікі пісьма. Ён усведамляе —

ці адчувае — гэтую магчымую перамену быцця, магчымую заўсёды і скрозь. Магчымую таму, што яна закладзена ў прыродзе самога чалавека. Напэўна, таму Глобус так і ўпадабаў чарцей. Або яны яго.
Досвед „дамавікоў“ Глобуса — досвед звар’яцелага побыту, хама з цемры, домакіраўніка з апраметнай. Дробнага беса, які набыў сотавік — і забыўся нумар Звера. Гэта досвед сацыяльнай смерці і вычварнага духу, на якія пачэпленая маска гіперсексуальнасці. Глобус адстараняецца не толькі ад сваіх герояў, але і ад аўтара ўласных тэкстаў — Сальеры ў джынсах, які штангенцыркулем вымярае чэрап сатаны і павярае гармоніяй памеры іншых ягоных органаў.
Бесы Булгакава — убачаныя, перажытыя. У іх ёсць пакінутая ў спадчыну аўтарам калі не спагада, дык павага да пакутаў. Глобусавы чэрці — пры ўсёй розніцы культураў, роляў і масак аўтараў — рацыянальныя і *бязлітасныя*, неміласэрныя, як касір гастраному.
Разбэшчанасць аўтара „Дамавікамерону“ — яго нельга цалкам атаясамліваць з самім Глобусам, бо аўтар нярэдка й сам уваходзіць у тэкст — у раскошы, з якой асэнсоўваецца зло: у зацішку, ля настольнай лямпы. Можа і добра, што Глобус не задумваецца над тым, што словы, у якія ён гуляе, ужо сталі жыццём, а не гульнёй. Таварышаванне з бесамі — справа цяжкая.
Што трывожыць мяне — павярхоўнае стаўленне Глобуса да смерці. Дэманстратыўнае, са спробай прыхаванага цынізму. Так гаварыць пра Яе маюць права толькі тыя, хто памірaў, і тыя, хто памірае. Але першыя — не стануць, а другім не да таго.
Сваім разуменнем задачы прозы як абавязанай глядзець у нерухомыя вочы трупа Глобус нагадвае расійскага пісьменніка Шаламава, вязня Калымы, — але ўсё ж прынцыпова, бясконца далёкі ад яго. Я ўжо не кажу — біяграфіяй. Досведам асабістай смерці і бесстароннім усведамленнем уласнага знікнення, несмяротнай злосцю да чужога табе чалавека. Але ўсё ж, як і для Шаламава, для Уладзімера Адамчыка адчуванне знікнення разам з сабой і ўсяго свету ёсць апраўданнем тэксту.
Шаламаву сказалі ў дзень вызвалення: пабыў у малой „камандзіроўцы“ — пабудзь у вялікай. Глобусаў свет — не ведаю, ці ўсведамляе ён гэта сам, — свет вялікай камандзіроўкі, дзе бесы — выведнікі, вертухаі, канваіры.

Ды ўсё ж на месцы Глобуса „Дамавікамеронам“ я б назваў кнігу пра Койданава. Гэтыя людзі — яго людзі — жылі ў хатах, але большай часткай ужо не жывуць: засталіся толькі ў ягоных апавяданнях. Там яны працягваюць жыць, але ўжо ў ІНШЫМ Койданаве, якое там, „недзе, некалі, мабыць“. „Койданава“ ў нашмат большай ступені „выклікае цені“, чым абодва „Дамавікамероны“. „*Тата, а чаму ты босы*?“ — несамавітае, спрадвечнае пытанне. Колькі разоў і ў якіх няведамых мясцінах яго прамаўляла невядомае дзіця? „*Тоня хварэла ўсё сваё доўгае жыццё на чыста беларускія хваробы: млявасць, агульную слабасць і каўтун.*“ Гэта не проста крэпка збітая фраза — гэта вечная паўтаральнасць успамінання ценяў страчанага жыцця — якое і ў ноч ідзе, і плача, сыходзячы.

А ў кожнага дамавіка можна запатрабаваць пасведчанне асобы — калі пакажа, натуральна.

„Койданава“ напісана сухой прозай чалавека, які ўспамінае пра страчаны свет і які страціў больш, чым трэба, каб успомніць слова „шчасце“. Бабы Тэклі і Стэфы, *дзядзькі* Стасі, п’яніцы і агароднікі — ужо ірэальныя постаці і твары, што сыходзяць, — з таго свету, як сцені, моляць Адысея пазнаць і згадаць іх. Хоць Глобус — не Адысей. І няма ў яго Наўзікаі.

Вось жа дамавікі такія ж паўнакроўныя, як фізкультурнікі Дайнэкі і Заваёўнікі космасу са знаёмымі тварамі ідэйных стукачоў. Зрэшты, Глобусавы бесы — яшчэ дробныя бесы. Яны лезуць у чужы ложак, у чужую размову, гвалцяць пры ўзаемным задавальненні хатніх гаспадынь і — у самым жудасным выпадку — здатныя апоўначы зжэрці дурніцу-цётку на мосце. У што й сам аўтар, шчыра кажучы, не верыць.

Бесы Глобуса — заўважаныя ім цені тых, хто прымушаў ламамі драбіць граніт у залатых капальнях і працаваць шуфлямі на даху Чацвёртага энергаблоку. Яшчэ ніводзін дамавік у Глобуса не гаркнуў: „Праца ў Беларусі — справа гонару, справа мужнасці і гераізма!“ Ці гэта немагчыма?

Я сам быў бесам — калі ў 87-м годзе на загад райваенкамату разносіў начамі позвы з чырвонай палоскай — павесткі ліквідатараў. Я запомніў гэтыя твары, як яны мяняліся пры ўручэнні позвы: „Пастаўце подпіс“. Магчыма, Глобусу патрэбны новы бес — Пазоўнік? Магу пракансультаваць.

Дамавікі Глобуса — не бунт цела, узбуджанага чытаннем Фройда. Гэта паўсядзённасць, вызваленая ад правілаў

прыстойнасці. Не ў коітусе справа, не ў лібіда — усведамленне „апушчанасці“ людзей у іх „даплыванні“ да поўнага трызнення — гэта і выклікае ў свядомасці вусцішны карагод: „Дамавікамерон“.
Героі Глобуса — не зусім людзі. Яны існуюць у некалькі іншай сістэме каардынатаў, у іншым адліку „першага“ і „апошняга“. Што б яны ні рабілі — пісалі карціны, спароўваліся, бязмоўнічалі на п’яную галаву, тэлефанавалі — аўтар глядзіць на іх як на крыху іншых істот — біялагічна іншых.
Адстароненасць і аналітычны холад — асаблівасць прозы Глобуса. Свядома стрыманы валявы парыў пераўтвараецца ў нешта якасна іншае: не гасне, а зазнае дзіўнай метамарфозы — застывае. І таму ў шматлікіх спалуках „персанажаў“ няма ні эротыкі, ні парнаграфіі. Як можна ўважаць за парнаграфію грунтоўнае апісанне капуляцыі хатніх мухаў або лускакрылых? Глобус піша пра людзей, бы энтамолаг — нат калі робіць гэта са шчырасцю, як у „Койданаве“. Або самі людзі паўстаюць перад Глобусам у выглядзе напаўнасякомых, або сам аўтар вывучае свет нерухомым позіркам празрыстых вочак дзіўнага багамола. Хутчэй за ўсё, і тое, і тое.
Магчыма, самае цікавае ў жыцці тое, што ўсё мае паўтор — новай можа быць толькі абалонка. Усё існае застаецца. Ацтэкскія гекатомбы ці гаранінскія расстрэлы, п’яніца Лі Бо, які патануў, шукаючы адлюстравання месяца, ці Інакенці Аненскі, што сканаў на брудных прыступках вакзалу.
Тое, пра што піша Глобус, — не новае, у сутнасці. Вядомае ўсім, вядомае здаўна. Нават у амерыканцаў дыяпазон гэтага светаадчування — ад простае фразы „неба блакітнае, вада мокрая, жыццё гаўнянае“ да фільмаў Джыма Джармуша.
У літаратурнай традыцыі заўсёды жыве адчуванне — чаканне, што прывід Смердзякова можа пастукаць да вас у дзверы. Тэма Глобуса — дробныя бесы рэалізму і рэалізм дробных бесаў. Сёння і цяпер.

** Курсівам вылучаныя словы, ужытыя па-беларуску ў арыгінале. Пераклад з расійскай Алеся Векі*

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 29-08-2000
[image]

Надзя Садзікава
Беларускі дзэн, альбо „Дзевяць аповесьцяў“ Адама Глёбуса

Час, калі зацікаўленьне ўсходняю філязофіяй здавалася на Захадзе чымсьці незвычайным і экзатычным, адышоў у мінулае. У апошнюю палову стагодзьдзя яно ператварылася ў трывалую традыцыю, якая завалодала розумамі пэўнай часткай інтэлектуалаў Эўропы і Амэрыкі. Раз-пораз з розных бакоў Атлянтыкі зьяўляюцца людзі, што не знаходзяць у заходняй цывілізацыі гэткіх неабходных усім ГАРМОНІІ, ВЕДЫ ды СУПАКОЮ і зьдзяйсьняюць дзеля іх пошуку ўласную „Вандроўку на Ўсход“.

Адным з найбольш значных эпізодаў зьліцьця літаратурнай ды філязофскай традыцыяў застаецца стварэньне ў VI–VII вв. індыйскімі мысьлярамі ды паэтамі своеасаблівай культурнай парадыгмы, якая заняла пазьней цэнтральнае становішча ў мастацтве Кітаю, Японіі, Індыі на доўгія стагодзьдзі. Сутнасьцю альбо асноўнай тэзаю гэтай канцэпцыі было цьверджаньне, што эстэтычная асалода ад літаратурнага твору дасягаецца не праз вобразы, якія ствараюцца з дапамогаю наўпроставых значэньняў словаў (то бок сюжэту), а з дапамогаю тых асацыяцыяў, уяўленьняў, эмоцыяў, якія

ўзьнікаюць дзякуючы гэтым вобразам. Дактрына старажытнай індыйскай паэтыкі прадуглежвала, што аўтар укладвае ў свой твор нейкі схаваны сэнс („дхвані“), які ў рэшце рэшт перадае сапраўднаму знаўцу пэўны паэтычны настрой („раса“). Гэтая здольнасьць перадачы „таемнага эфэкту“ лічылася найвышэйшым родам паэзіі ў параўнаньні з больш простымі сюжэтна-апавядальнымі формамі.
Зь цягам часу з усяе разнастайнасьці людзкіх пачуцьцяў ды эмоцый старажытныя індыйскія філёзафы вылучылі дзевяць, на іх думку, вызначальных, якія пасьля трансфармаваліся ў дзевяць асноўных паэтычных настрояў. Трактат па драматургіі, што прыпісваецца легендарнаму індыйскаму мысьляру Бгарату, зьмяшчае навуковую клясыфікацыю ды парадак паэтычных настрояў („раса“):

1 — эротыкі, каханьня,
2 — сьмеху, іроніі,
3 — спачуваньня,
4 — гневу, лютасьці,
5 — мужнасьці,
6 — страху,
7 — агіды,
8 — зьдзіўленьня, адкрыцьця,
9 — спакою, што вядзе да адмаўленьня сьвету.
Празь некалькі стагодзьдзяў тэорыя „дхвані“ (паэтычнае сугестыі, натхненьня) сфармавалася канчаткова.

Дзэн-будысты Японіі ды Кітаю вызнавалі ў мастацтве прынцып, паводле якога асноўнаю мэтай мастака зьяўляецца стварэньне ў творы пэўнага настрою, які пасьля навейваецца чытачу (гледачу). У мастацтве Дзэн націск падае не на тое, што паказвае мастак ці апісвае паэт, а на тое, ЯК ён гэта робіць і ШТО пры тым адчувае глядач альбо слухач. Пры гэтым пануе своеасаблівая клясыфікацыя настрояў. Для традыцыйнага японскага верша хоку характэрнымі зьяўляюцца чатыры асноўныя настроі: самота, нечаканае пазнаваньне, сум, таямніца.
Філязофскім падтэкстам мастацтва Дзэн зьяўляецца прыярытэт цяперашняга перад мройнасьцю мінулага ды бессэнсоўнасьцю будучыні. Шэдэўры майстроў Дзэн — гэта спыненыя й

данесеныя да чытача (гледача) імгненьні цяперашняга (сапраўднага) жыцьця. Гэта пах гарэлага лісця на пачатку мглістага восеньскага сутоньня, самотны крык птушкі ў гушчары, палёт дзікіх гусей у промнях сонца.
Сярод заходніх пісьменьнікаў XX стагодзьдзя заўважным наступнікам школы Дзэн стаўся Д.Сэлінджэр, які ўжыў яе асноўныя прынцыпы ў літаратуры. Пасьля рэалістычнае аповесьці *The Catcher in the Rye* у 1953 г. Сэлінджэр выдаў збор „Дзевяць аповедаў“, зьмясьціўшы ў якасьці эпіграфу славуты каан (загадку) Дзэн аб плясканьні адною далоньню. Крытыкі адразу ж заўважылі, што гэткі эпіграф і мноства „цьмянасьцяў“ у тэксьце, напэўна, намякаюць на прысутнасьць нейкага „іншага сэнсу“ ў навэлях гэтага збору. Сярод разнастайных інтэрпрэтацыяў „тайнапісу“ Сэлінджэра зьявілася вэрсія, згодна зь якой 9 аповедаў — гэта 9 паэтычных настрояў старажытнаіндыйскай паэзіі, а „цьмянасьці“ — своеасаблівая ўстаўка рэлігійна-філязофскіх канцэпцыяў школы Дзэн у структуру мастацкага твору. Меркаваньне, што гэты збор пісьменьніка — спроба зьяднаць сюжэтную амэрыканскую літаратуру з традыцыйнымі прынцыпамі „дхвані-раса“, было пасьля аб’ектыўна пацьверджана шэрагам дасьледчыкаў творчасьці Сэлінджэра.
Цікава, што гэткую ж сэнсавую кампазыцыю для свае кнігі „Толькі не гавары маёй маме“ абраў Адам Глёбус, які зрабіў падзагалоўкамі аповесьцяў гэтай кнігі 8 настрояў традыцыйнае індыйскае паэтыкі (дзявятая аповесьць вымыкаецца з клясычнае традыцыі):

(1) „Трыкутнік“ (аповесьць пра першае каханьне),
(2) „Артэк“ (іранічная аповесьць),
(3) „Сынэма“ (аповесьць пра супераживаньне),
(4) „Карыда“ (падарожная аповесьць пра лютасьць),
(5) „Гісторыя ката“ (аповесьць пра мужнасьць),
(6) „Амарыліс“ (апавяданьне пра дзіцячыя страхі),
(7) „Млосьці“ (аповесьць пра гідкасьці),
(8) „Толькі не гавары маёй маме“ (раман пра зьдзіўленьне),
(9) „Дарагі мой сябра Адам“ (раман пра лёгкае расчараваньне).
Гэткая будова кнігі, без сумневу, сьведчыць пра абазнанасьць аўтара ў традыцыйных канонах старажытнаіндыйскай паэтыкі. У зьвязку з гэтым цікавай падаецца спроба прааналізаваць

названыя аповесьці (абыходзячы мастацкія вартасьці ці хібы) з гледзішча вымогаў „дхвані-раса“, якія ставяцца перад аўтарам. У аснову аналізу й параўнаньня леглі кнігі Д.Сэлінджэра „Дзевяць аповедаў“, І.Галінскай „Загадкі вядомых кнігаў“, А.Уотса „Шлях Дзэн“, Чжан Чжэнь-Цзы „Практыка Дзэн“.

Пачнем з **другой аповесьці** — „Артэк“. Яна апісвае побыт хлапчука-падлетка ў міжнародным піянэрскім лягеры. Адразу ж варта адзначыць, што гэтая аповесьць — адна з найбольш удалых ува ўсім зборы з гледзішча паэтычнага настрою „дхвані-раса“.

З мэтаю навеяньня (паэтычнае сугестыі) кожнага з настрояў школа „дхвані-раса“ рэкамэндавала аўтарам выкарыстаньне пэўнага колеру, які належала настойліва згадваць пад час апавяданьня. Дзеля стварэньня настрою сьмеху, іроніі („раса-2“) выкарыстоўваўся белы колер альбо пара году, якая зь ім асацыявалася — лета. Тэарэтыкі школы „дхвані-раса“ таксама выказвалі думку, што пры выяўленьні гумарыстычнага настрою паводзіны пэрсанажаў, іхныя вопратка й гаворка мусяць адхіляцца ад нормы.

У аповедзе Глёбуса „Артэк“ дзеяньне адбываецца ў канцы лета — пачатку восені. Іранічны стыль апавяданьня, абраны аўтарам у дачыненьні да свайго героя і дзеяньняў вакол яго, зьяўляецца ў аповедзе дамінантным і ўжо сам сабою выклікае адпаведны настрой. „Артэк“ як адзін з манумэнтаў ды сымбаляў савецкае эпохі — ледзь не ідэальны аб’ект зьдзекаў для постсавецкага літаратара. *Там* недарэчна і сьмешна выглядае ўсё: звычка ўсюды хадзіць шыхтом, рытуалы вітаньня й купаньня ў моры, прымусовае вывучэньне дзесяці піянэрскіх сьпеваў, ночныя праверкі ды шмат яшчэ чаго.

Відочна адхіляецца ад нормы адзеньне галоўнага героя — майткі да кален, паўзьверх якіх надзяюцца ўдвая карацейшыя шорты. Гутарковая мова пэрсанажаў — гэта й зусім асаблівая рэч. Герой аповеду гаворыць на сваёй роднай мове („не як усе“). Тэма „беларускасьці“, увогуле вельмі выразнай у аповесьці, робіцца тут, калі зірнуць з пазыцыі „дхвані-раса“, героем другога пляну. Іронія робіцца асноведзьдзю самаўсьведамленьня героя беларусам.

Згодна з індыйскімі паэтычнымі традыцыямі, уяўнае павінна быць прыгожшым за рэчаіснасьць. Гэтаму правілу цалкам

адпавядае стаўленьне хлапчукоў-беларусаў зь піянэрскага лягеру да свае Айчыны і адзін да аднаго.
Аповесьць заканчваецца заўвагаю, што савецкія кінэматаграфісты здымалі фантастычныя, нерэалістычныя фільмы пра „Артэк“. Цікава, аднак, што паэтычны гумар аўтара аповесьці чытач можа з поўным правам перанесьці і на „аўтарскае кіно“ самога Глёбуса, рэалістычнасьць ці сюррэалістычнасьць якога цалкам можа стацца падставаю для іроніі, але гэтым разам іроніі самога чытача…

Трэцяя аповесьць, „Сынэма“, у загалоўку якое пазначана „суперажываньне“, паводле схемы адпавядае паэтычнаму настрою „раса-3“. Індыйская паэтыка дапускае трактаваньне гэтага настрою як суму, тугі, журбы, жалю, спагады, суперажываньня, а таксама чуласьці, спачуваньня, міласэрнасьці. Для перадачы гэтага паэтычнага настрою прыдатным лічыцца шэры колер.
Як „Артэк“ — удалы аб’ект для іроніі, гэтак жа й кінэматограф — добрая падстава для суперажываньня. Сам прынцып кіно палягае ў тым, што глядач спачувае героям, бачыць у іх сябе альбо хоча перажыць тое, што перажылі яны. Напэўна, цяжка дакладна вызначыць, якія менавіта зь пералічаных пачуцьцяў выкарыстаў аўтар і якія хацеў выклікаць у чытача ў кожнай зь невялікіх навэлек, што складаюць аповед. Ды гэта й няважна. Агульны паэтычны настрой выказаны ў аповедзе даволі літаральна. Навэлі аповеду — гэта паралельныя лініі, па якіх аўтар рухаецца ад кінагледача да кінаўдзельніка і наадварот. Гледачы робяцца акторамі, а акторы — гледачамі. Эпізод, у якім герой аповеду, хлапчук-падлетак, знаёміцца ў салёне кінатэатру з дарослай жанчынай — амаль дакладная копія сцэны зь фільму Фэліні „Амаркорд“. Жыцьцё й кіно — два бакі аднае рэчаіснасьці. Акторы й людзі аднолькава патрабуюць увагі, спачуваньня, міласэрнасьці. Шэры колер — колер рэчаіснасьці кіназалі. Ён узьнікае ў аповедзе ў найбольш драматычныя моманты. Аўтар узгадвае „сіне-шэрыя“ твары сваіх землякоў перад тэлевізіяй і нават прыходзіць да высновы, што ў тэлевізара „трупнае сьвятло“. Аповед заканчваецца апісаньнем жахлівае бойкі ў вёсцы Латыголь паміж „тутэйшымі“ ды салдатамі. Вось такое ў нас кіно…

Чацьверты аповед збору, „Карыда“ (пра лютасьць), кампазыцыйна дастаткова просты. У ім падрабязна апісваюцца адведзіны аўтарам славутае барсэлёнскае карыды. Паводле тэорыі „дхвані-раса“ паэтычны настрой гневу, лютасьці („раса-4“) патрабуе цэлага шэрагу выяўленчых сродкаў. У прыватнасьці, лічылася неабходным дзе-нідзе ўжываць страхатлівы, напышлівы стыль, чырвоны колер, ужываць даўгія і складаныя словы.
У аповедзе Глёбуса „Карыда“ гэтыя патрабаваньні няўхільна выконваюцца. Аўтар пасьлядоўна апісвае шэсьць боек з быкамі, у кожнай зь якіх прысутнічаюць чырвоныя мулеты тарэадораў і ліецца кроў. Аповед дасягае кульмінацыі на шостым, самым прыгожым ды моцным быку. Тут аўтар быццам пераўвасабляецца ў быка, і, выкарыстоўваючы запатрабаваны „пышны“ стыль, апявае сваю „бычыную“ лютасьць, нянавісьць да пікадораў, тарэра, гледачоў. Паралельна з гэтым зададзены паэтычны настрой навейваецца чытачу праз завуаляванае стаўленьне самаго аўтара да карыды. Яскравым і яўным зьяўляецца толькі тое, што а) на карыдзе цікава, б) быка забіваюць падступна і „несумленна“, в) быка папросту шкада. Тым ня менш, стоены недзе ў падсьвядомасьці аўтара і ў тэксьце аповеду пратэст супроць карыды ўсё ж перадаецца чытачу і стварае настрой „раса-4“. Патрэбны эфэкт узмацняецца таксама з дапамогаю прысутных у аповедзе „складаных і даўгіх“ словаў, ролю якіх выконваюць назовы стадыёну, сабору, матацыкла, напісаныя да таго ж на замежных мовах лацінкаю.

Зьмешчаная **пятай** „Гісторыя ката“, згодна з сваім падзагалоўкам ды схемай настрояў „дхвані-раса“ — гэта гісторыя пра мужнасьць. Гісторыя, безумоўна, адна з найцікавейшых у гэтым зборы.
Аповед пачынаецца з наўпроставай апэляцыі да Сэлінджэра. Пяты аповед Сэлінджэра са збору „Дзевяць аповедаў“, „У яліку“, пабудаваны на гульні словаў „kike/kite“ („kike“ — жыд, „kite“ — лятучы зьмей). У гэтым аповедзе хлопчык Лаянэл уцякае з дому, зблытаўшы словы кухаркі „вялікі брудны жыд“ (у дачыненьні да ягонага бацькі) са словамі „вялікі брудны зьмей“, што здаецца яму жахліва абразьлівым. У расейскім перакладзе ідзе гульня словаў „иуда“ і „чудо-юдо“. У Глёбуса

адпаведнай зьвязкай у пачатку аповеду служаць словы „кат“-„кот“. Выкарыстаньне розных значэньняў аднаго й таго ж слова, паводле тэорыі „дхвані-раса“, — адзін з прыёмаў навейваньня паэтычнага настрою мужнасьці. „Таемным узбуджальнікам“ гэтага настрою лічылася перавага ў творы „памаранчавага“ (аранжавага, залатога) колеру і выкарыстаньне складаных словаў. У пятым аповедзе Глёбуса дзея адбываецца ў месяцы „сонечным і залатым“, у кастрычніку. Складаная сюжэтная кампазыцыя — неабходны прыём для перадачы паэтычнага настрою „раса-5“. Творы такога роду павінны апяваць вайсковы чын, мужныя ўчынкі, упэўненасьць у сабе, шырыню поглядаў і, нарэшце, радасьць. Аповед Глёбуса „Гісторыя ката“ зьмяшчае некалькі сюжэтных ліній з падзеямі маленства, юнацтва і сучаснасьці галоўнага героя-аўтара. Цэнтральная сюжэтная лінія („кат“-„кот“) — гэта гісторыя пра тое, як хлопчык-шасьціклясьнік, каб давесьці сабе сваю сьмеласьць, мужнасьць, пазбавіцца дзіцячых жахаў, вырашае злавіць і забіць, а менавіта павесіць, ката.
Далей у даволі іранічным стылі аўтар разглядае падобныя сытуацыі, што адбываліся зь ім ужо ў іншых прасторава-часавых рэаліях. Распавёўшы цалкам у традыцыях „дхвані-раса“ аб разнастайных вычынах, мужных учынках і нават шырыні поглядаў свайго героя, аўтар выконвае яўную задачу — знаёміць чытача з тым, што можа й што ня можа, зь яго пункту гледжаньня, вызнавацца за мужнасьць.
Акрамя таго, у аповедзе маецца схаваны (да пэўнай ступені) намёк на тое, што й сам аўтар у цяперашні час зьяўляецца мужным чалавекам. Ён, як і згаданы ім у аповедзе „мужны“ чэскі мастак, „намаляваў“ нам свайго павешанага ката. І нават магчыма, што гэтая мужнасьць шчырасьці — адзіная сапраўдная і неабходная мужнасьць у гэтым аповедзе.
А як маецца кот? Не забіты, памілаваны хлопчыкам, ён усё ж сустракае сьмерць. Аднак канец гісторыяў „раса-5“ мусіць быць радасным (у Сэлінджэра хлопчык Лаянэл вяртаецца з маці дадому).
Нярадаснаму фіналу Глёбусавага апавяданьня можна прыпісаць розны сэнс альбо ўвогуле не заўважыць яго. Але абазнаны чытач напэўна адзначыць простую (знарочыстую ці выпадковую) аналёгію з эпізодам, апісаным К.Кастанэдам у адной зь ягоных кніг. Кастанэда вырашае „зьлітавацца“ і

выпусьціць злоўленага ім і прыгаворанага да сьмерці трусіка. Аднак калі ён, нарэшце, ловіць зьвярка, што мітусіцца па клетцы, то бачыць, што той ужо мёртвы. „Час блуканьня трусіка па гэтай прыўкраснай пустэльні скончыўся“, — кажа яму дон Хуан. „Сілы, што вядуць людзей і жывёл, прывялі гэтага трусіка да мяне, і гэтаксама яны прывядуць мяне да мае ўласнае сьмерці“. Інакш кажучы, жыцьцё трусіка не залежала ад К.Кастанэды, як і жыцьцё ката не залежала ад хлопчыка з аповеду Глёбуса. *Тут* мужнасьць ні пры чым. Трусік і кот памерлі таму, што ў іх ужо не засталося часу. І з пэўнага гледзішча канец аповеду можна лічыць радасным, толькі радасьць гэтая вельмі спэцыфічнага роду.

Шосты аповед, „Амарыліс“, прысьвечаны страху.
Хоць аповед насычаны эпізодамі, якія падкрэсьліваюць і выклікаюць пачуцьцё трывогі, адчаю і фатальнасьці, тут усё ж яскрава дамінуе псыхааналіз. Страх у аповедзе прадстаўлены даволі фармальна, у выглядзе ўспамінаў героя пра некаторыя эпізоды свайго маленства. Аднак сугестыўнага эфэкту гэтыя ўспаміны з мноства прычынаў ня робяць.
Аўтар прапануе чытачу згуляць у гульню „адшукай мяне“, і сам, напэўна, не ўяўляючы, што ж можна знайсьці ў канцы такое гульні.
І хаця, натуральна, псыхааналіз ні ў якай ступені не зьяўляецца мэтай гэтага артыкулу, паралелі, прапанаваныя аўтарам, занадта відавочныя, каб іх не заўважыць.
Два ключавыя словы ў тэксьце апавяданьня — бібліятэка і амарыліс. Бібліятэка — гэта месца, дзе герой-аўтар па волі лёсу заставаўся адзін у раньнім маленстве і адчуваў страх. А амарыліс — расьліна, што расла ў бібліятэцы і вырасла ў назву аповеду аб страху. Засушанае лісьце амарылісу — гэта засушаныя страхі. „Лепей за ўсё вучыцца любіць кнігі побач з кветкамі“, — робіць выснову герой аповеду. І гэтым даводзіць відавочнасьць і завершанасьць паралелі „бібліятэка-амарыліс“ і „кнігі-страх-любоў“. Меркаваньне, якое арганічна выцякае з гэтага, выглядае так: хлопчык робіцца пісьменьнікам, бо любіць розныя „страшылкі“ альбо проста моцныя адчуваньні і перажывае іх побач з кнігамі. Пры ўсёй нібыта абсурднасьці гэтая заява не пазбаўленая сэнсу. „Так, падсьцерагаюць страхі, так, чакаюць“, — сьцьвярджае аўтар аповеду. Прычым кажа ён

гэта спакойна, амаль з задавальненьнем…
Такім чынам, калі герою Сэлінджэра з аповеду № 6 удаецца перамагчы свае страхі, то герою Глёбуса ўдаецца, відаць, нешта іншае. Ён робіць свае страхі часткаю сябе, ён вучыцца кіраваць імі і, галоўнае, — атрымліваць ад іх задавальненьне. Ці страшна гэта для чытача? Хутчэй, наадварот…

Сёмая аповесьць збору, „Млосьці“, згодна з клясыфікацыяй „дхвані-раса“, павінна адпавядаць сёмаму па ліку паэтычнаму настрою, якім зьяўляецца агіда. У індыйскай паэтыцы гэты канон аўтарам прапаноўвалася выяўляць праз яскравую супярэчнасьць між тым, што маецца на ўвазе, і напісаным. Інакш кажучы, выклікаючы сваім аповедам у чытача пачуцьцё брыдкага, агіднага, аўтар, тым ня менш, павінен быў выклікаць у яго высокім мастацкім майстэрствам эстэтычную асалоду. Акрамя таго, у творы „раса-7“ для стварэньня настрою агіды аўтарам рэкамэндавалася ўводзіць такія псыхалягічныя станы герояў, як узбуджэньне, туга, страх, трывога.
У аповесьці „Млосьці“ ўсе гэтыя прыёмы выкарыстоўваюцца. Аўтар ад першых радкоў заяўляе, што мае намер распавесьці пра самыя гідкія моманты свайго жыцьця. А з усяго жыцьця для пачатку абірае век (18 год), „у якім практычна ўсе праявы жыцьця выклікаюць агіду“. Аднак успаміны пра юнацтва, напісаныя дарослым чалавекам, вельмі цяжка альбо нават немагчыма апісаць пры дапамозе аднае толькі агіды. Гідкасьць тут як бы й несапраўдная, „суб’ектыўная“. Таму ў поўнай адпаведнасьці з прынцыпам „дхвані-раса“ аб супярэчнасьці між напісаным і тым, што маецца на ўвазе, прыгоды маладога чалавека, што падаюцца чытачу як „агідныя“, спачатку выклікаюць хутчэй суперажываньне, сьмех, іронію і зьдзіўленьне. Пры гэтым, аднак, самі дзейныя асобы паводзяць сябе дастаткова ўзбуджана і агрэсіўна.
Належны настрой нарастае паступова. Ён зьяўляецца пакрыёма, калі герой вывозіць свайго п’янога выкладчыка зь вясковай практыкі ў Менск. Далей ён толькі ўзмацняецца. Моцным стымулам для перадачы настрою агіды аўтару паслужыла, без сумневу, туалетная тэма, якая ўзьнікае ў аповесьці чатыры разы, а таксама цэлы арсэнал скарыстаных пахаў. Такім чынам, да канца апавяданьня водар замілаваньня юнацтвам, якому яшчэ ўсё дазволена, саступае месца зусім

іншым водарам і іншаму настрою. Аўтар, паводле ўласнага меркаваньня, паспытаўшы чалавечыны ў адной зь менскіх кавярняў, налякаў чытача й лёсамі сваіх былых выкладчыкаў, і становішчам цяперашніх мастакоў, і жабракамі ў пераходах, і выхавальніцамі дзіцячых садкоў, і нават сапраўды агіднай сцэнай зь зьяўленьнем даўгога рабака з роту калегі. Можна сказаць, што гэткім чынам, то бок апісаньнем яскрава непрыемных сцэнаў, аўтар ня толькі вывеў настрой агіды на ўсьвядомлены чытачом узровень, але своеасаблівым чынам выканаў патрабаваньне выкарыстоўваць у творах „раса-7“ немілагучныя словы й спалучэньні гукаў.
Варта адзначыць і яшчэ адзін вытрыманы ў аповесьці прынцып „раса-7“. У творы, прысьвечаным настрою агіды, ня можа быць настрою каханьня. Пры апісаньні сцэнаў каханьня не рэкамэндавалася „даводзіць іх да кульмінацыі“. У аповесьці Глёбуса ўсе апісаныя сцэны каханьня ў рэшце рэшт чымсьці азмрочаныя. У адным выпадку дзяўчына галоўнага героя прызнаецца ў каханьні да іншага, а ў іншым — парачку засыпявае выкладчык.

Восьмая аповесьць Глёбуса — „Толькі не гавары маёй маме“. З пазыцыяў „дхвані-раса“ яе сюжэт — побыт чалавека за мяжою — цудоўна пасуе для перадачы паэтычнага настрою „раса-8“, то бок зьдзіўленьня, адкрыцьця. У аповесьці апісваецца побыт героя-аўтара ў Амстэрдаме.
Паводле тэорыі „дхвані-раса“, навеяньне настрою „раса-8“ адбываецца шляхам апісаньня перажываньняў героя, пачынаючы з турботаў, неўладкаванасьці, якая потым праз радасьць пераходзіць у зьдзіўленьне, адкрыцьцё і задаволенасьць. Колер гэтага паэтычнага настрою — жоўты.
У аповесьці Глёбуса герой пасьлядоўна праходзіць усе стадыі гэтага настрою, зьдзяйсьняючы доўгае і турботнае падарожжа ў Галяндыю. І вось нарэшце ён на месцы. Амстэрдам дзённы і ночны — невычэрпны скарб для таго, хто жадае ўражвацца. Навокал усё чужое й дзіўнае. Аўтару падабаецца быць зьдзіўленым, і ён з асалодаю апісвае норавы тамтэйшых жыхароў, гандляроў наркотыкамі, музэй сэксу, музэй дыямэнтаў, гатэль, у якім жыве, і, натуральна, самае экзатычнае — вуліцу чырвоных ліхтароў. Жоўты колер у аповесьці не дамінуе. Ёсьць, аднак, японцы і жанчыны жоўтае

расы. Кульмінацыйным эпізодам аповесьці становіцца сэкс героя-аўтара з прасталыткаю-гермафрадытам. Уражаньне ад гэтага здарэньня прыгаломшвае.
Цікава тут узгадаць сёмы зь „Дзевяці аповедаў“ Сэлінджэра, „Блакітны пэрыяд дэ Дам’е-Сьміта“. У аналягічным па сэнсе эпізодзе герой перажывае містычнае азарэньне, адкрыцьцё, стоячы ля вітрыны крамы артапэдычных прыладаў. Раптам проста перад ім успыхвае нейкі агнявы шар, які ляціць яму ў пераносьсе. Уражаны герой, які дагэтуль настойваў, каб манашка Ірма займалася зь ім маляваньнем, празь некаторы час запісвае ў дзёньніку: „Адпускаю сястру Ірму на волю, — няхай ідзе сваёй дарогай. Усе мы манахі“. Так Сэлінджэр апісаў у сваім аповедзе нейкае рэлігійнае звышінтэлектуальнае прасьвятленьне (саторы), якое наведала героя і падштурхнула яго да „іншага“ погляду на навакольную рэчаіснасьць.
У аповедзе Глёбуса пасьля сустрэчы з гермафрадытам герой запісвае ў дзёньніку: „Дыямэнт, набыты ў Амстэрдаме, не выклікае сумневу“. Варта адзначыць, што паводле сыстэмы дзэн-будызму любое моцнае перажываньне альбо ўражаньне (у тым ліку й заняткі сэксам) здольнае ўводзіць „падрыхтаванага“ адпаведным чынам чалавека ў саторы. Аднак, хутчэй за ўсё, уласна саторы герой Глёбуса ўсё ж не перажыў. Тым ня менеў, зьмена стаўленьня да сябе і да навакольнага сьвету пасьля сустрэчы з гермафрадытам адназначна адбываецца. Ён болей не хавае набытага ў Амстэрдаме дыямэнту, а, наадварот, дэманстрацыйна выкладае яго на стол. Больш за тое, ён разумее, што ягонае прызначэньне ў сьвеце — гэта „лёгкі шпацыр, зіхценьне і ліючасьць“. Ён больш „не ахвяра, не паэт, не мастак, не беларус, не кліент“. Ён — проста чалавек і „праява часу“, бо ЎСЕ МЫ — МАНАХІ…
Такім чынам, зьдзіўленьне адбылося. Аўтар зьдзівіўся сам і зьдзівіў чытача. Хочацца верыць, што гермафрадыт трапіўся яму цалкам заслужана. Бо ён (гермафрадыт) — ня проста сацыяльна-інтэлектуальны сымбаль і ўвасабленьне новай Эўропы, ня толькі захапляльная сэксуальная прыгода, пра якую можна папросту распавесьці знаёмым. Ён — падарунак пісьменьніку Адаму Глёбусу, і пра сапраўдны сэнс гэтага падарунка для яго самаго мы наўрад ці калі даведаемся…

І, нарэшце, **першая і дзявятая** аповесьці. Узаемасувязь паміж

імі ўяўляецца нечакана цікаваю. Першая аповесьць — „Трохкутнік“ — пра каханьне, а дзявятая — „Дарагі мой сябра Адам“ — згодна з падзагалоўкам, пра расчараваньне. Аднак з прычыны, якую лепш назваць невытлумачальнай, паняткі гэтыя ў зборы аповесьцяў Глёбуса перапляліся і сталі практычна неаддзельныя адзін ад аднаго.

Сюжэт першай аповесьці, адпаведны настрою „раса-1“, — адзін трохкутнік каханьня ў другім. Сямнаццацігадовы юнак кахае сваю суседку з адной парты Вольгу Пакроўскую. Спачатку ўсё ідзе добра, але потым у яе пачынаецца раман з выкладчыкам Палякоўскім (першы трохкутнік). На нейкай стадыі раману Вольга пачынае здраджваць выкладчыку зь іхным агульным сябром (другі трохкутнік), але, у рэшце рэшт, вяртаецца да выкладчыка.

Каханьнем у аповедзе займаюцца і суседзі героя, і яго сябры, і знаёмыя. Стаўленьне аўтара да героя — сябе ў юнацтве — можна назваць любоўна-іранічным ці нават трапяткім: хай ён патрапляе калі-нікалі ў няёмкае становішча, хай робіць штосьці ня так, але яму толькі 17.

Такім чынам, паводле сюжэтнай лініі гэтая аповесьць быццам сапраўды пра каханьне.

Адпаведны падсьвядомы паэтычны настрой навейваецца чытачу пры дапамозе традыцыйнага ў „дхвані-раса“ сіняга колеру. Паводле старажытнаіндыйскіх літаратурных канонаў эпітэт „сіні“ выклікае асацыяцыю зь сіняю кветкай лётасу — неадменным атрыбутам бога каханьня Камы. У аповедзе „Трохкутнік“ і спадніца, і плашч, і нават валасы гераіні — сінія. Цікава, аднак, што само пачуцьцё каханьня паводле старажытнаіндыйскіх канонаў не зьяўлялася эмоцыяй станоўчай. Бо пажада для індуіста — шлях, што вядзе да няшчасьцяў і зла. Каханьне да жанчыны спараджае нізкія жаданьні ў адносінах да іншых і замінае духоваму дасканаленьню. У аповедзе Глёбуса яго першае каханьне нясе горыч, пакуты, і, што самае галоўнае, — расчараваньне. „Нічога цікавага НЕ БЫЛО. Ніхто не застрэліўся, не атруціўся?“. Менавіта гэтыя, кінутыя на пачатку аповесьці, словы быццам павісаюць над усім тэкстам і пачынаюць затапляць яго схаванай эмоцыяй расчараваньня. Бо гэта ж нейкі шчасьліўчык, хтосьці іншы, застрэліўся ад каханьня (як у Сэлінджэра), атруціўся мыш’яком (як у Флёбэра). Аўтар

неўсьвядомлена прэзэнтуе тое, што нічога такога не адбылося, як факт сумны і нездавальняючы.
Аднак, акрамя гэтага прыхаванага расчараваньня аўтара ў тым, што нічога зь ім не адбылося, у аповесьці ёсьць і іншае, *адкрытае* расчараваньне ўва ўласным першым каханьні.
Яно дэманструецца чытачу ў сцэне апошняй сустрэчы героя зь яго былым каханьнем — Вольгай. Празь некалькі год пасьля апісаных у аповесьці падзеяў іхныя шляхі выпадкова крыжуюцца. Аўтар-герой гэтым разам *адкрыта расчараваны* і сам гэта ўсьведамляе. Як ён мог кахаць яе? Гэтую непрыгожую, навязьлівую жанчыну?! Атрымліваецца, што ўсё дарэмна! І сьлёзы, і перажываньні… Можна, аднак, меркаваць, што расчараваньне гэтае не такое ўжо й смутнае. Бо ён жа даўно забыўся й думаць пра Вольгу. Гэтая стрэча — хутчэй звыклы непрыемны эпізод, чым глябальнае крушэньне мрояў. І паўтораныя пры канцы аповесьці словы пра тое, што „нічога цікавага так і не адбылося; ніхто не ўтапіўся і не парэзаў венаў“, пацьвярджаюць гэта і гучаць іранічна, але ня сумна. Можна нават сьцьвердзіць, што такім крыху дзіўным спосабам герой Глёбуса ўсё ж выканаў патрабаваньні індуізму. Як і герой Сэлінджэра, які застрэліўся і такім чынам вызваліўся ад пажады, герой Глёбуса ўратаваўся таксама. Але зрабіў гэта ўсё ж па-эўрапейску, а не па-індыйску. У выніку расчараваньне не расчаравала. Вакол была процьма іншых красунь. Адным словам, добра, што ніхто не атруціўся…
Аднак той факт, што расчараваньне ў першым каханьні канкуруе ў аповесьці з расчараваньнем ад яго адсутнасьці, робіць гэтую навэлю вельмі супярэчлівай і наўрад ці адпаведнай уласна настрою „раса-1“.

Дзявятая аповесьць прэзэнтуецца як „раман пра лёгкае расчараваньне“, яна замыкае кампазыцыю кнігі і быццам люстэркава адбівае першую.
Аповесьць, аднак, не заснаваная на клясычных прынцыпах „дхвані-раса“. Гэта тыпова эўрапейская аповесьць, напісаная ў аўтабіяграфічна-спавядальным стылі. Аднак, калі ўзяць пад увагу, што ў грунце клясыфікацыі „дхвані-раса“ ляжыць прынцып паэтычнай сугесты, то гэтая аповесьць, безумоўна, апявае каханьне, а не расчараваньне.
Малады чалавек, герой аповесьці, едзе зь сябрамі ў Ленінград,

дзе ў музэі знаёміцца зь дзяўчынаю-іншаземкай. Кароткі раман абрываецца, не пасьпеўшы пачацца, аднак застаюцца ўспаміны ды лісты.
У адрозьненьне ад першае аповесьці, сюжэтная лінія тут узбагачаецца не складанымі любоўнымі трохкутнікамі, а проста закаханымі парачкамі: сябры-спадарожнікі галоўнага героя (ён і яна), сам герой і яго дзяўчына Агі, Агі ды яе мужчыны на радзіме, і, нарэшце, дачыненьні героя з жанчынамі.
Мілосная гісторыя Агі й Адама, як у адкрытым, так і ў падсподным кантэксьце аповесьці, — гэта кактэйль практычна ўсіх абліччаў каханьня: рамантычнага захапленьня, зачараваньня, пяшчоты. Жарсьць, пажадлівасьць, блізіня, рэўнасьць. Захопленым эратызмам сагрэтыя ўсе апісаньні Агі. Блізкая й непазьбежная ростань толькі ўзмацняе пачуцьці. Вядома ж, тое, чаму не наканавана зьдзейсьніцца, здаецца самым жаданым.
Галоўным колерам аповесьці робіцца чырвоны — менавіта гэткага колеру бялізну носіць Агі. Менавіта чырвоны прыцягвае галоўнага героя-юнака, узбуджае яго, і, магчыма, застаецца найбольш хвалюючым успамінам пасьля расстаньня. У індыйскай традыцыі чырвоны — ня колер каханьня. Аднак, паводле эўрапейскае традыцыі, менавіта ён — колер жарсьці й пажады.
Такім чынам, прычына расчараваньня — немагчымасьць новае стрэчы і працягу гэтага каханьня — ня можа прыглушыць як экспліцытна, так і сугестыўна дамінуючага ў аповесьці настрою эротыкі й каханьня, якія перадаюцца чытачу рознымі мастацкімі сродкамі.

Для лягічнага завяршэньня ў кнізе не стае аповесьці, якая б адпавядала дзявятаму паэтычнаму настрою: супакою, які прыводзіць да адмовы ад сьвету („раса-9“). Частка, якое бракуе ў „Толькі не гавары маёй маме“, дзіўным чынам знаходзіцца ў іншай кнізе аўтара, у „Новым Дамавікамэроне“ (1998). Гэта навэля „Ганіцелька“ (№ 55).
Настрой „раса-9“ павінен выяўляцца праз абыякавасьць героя да захапленьняў і справаў сьвету. У Сэлінджэра дзявятаму паэтычнаму настрою адпавядае гісторыя пра хлопчыка-вундэркінда Тэды. Хлопчык вяртаецца з бацькамі на параплаве

ў Амэрыку пасьля вандроўкі па Эўропе, дзе ён зрабіўся славутым з-за сваіх здольнасьцяў да парадаксальнага мысьленьня. Ён уражвае прафэсара-спадарожніка адказамі на самыя складаныя й зусім не „дзіцячыя“ пытаньні. Ён памятае сваё мінулае ўцялесьненьне і, між іншым, прарочыць сваю хуткую сьмерць, якая, паводле ягоных словаў, нічога для яго ня значыць. Вуснамі маленькага мысьляра Сэлінджэр зноў прэзэнтуе чытачу сынтэз асноўных канцэпцыяў школы Дзэн і індуізму. Тэды ў аповедзе — чалавек, які дасягнуў прасьветленасьці „ў выніку вызваленьня ад прагі жыцьця“. Канец аповеду не дазваляе даведацца, ці збылося прароцтва Тэды пра ягоную сьмерць. Такі аповед Сэлінджэра.

Дык што ж тая **„Ганіцелька“**? Галоўны герой навэлі — мужчына, што, шпацыруючы па горадзе, адначасна спрабуе вярнуць сабе страчаную душэўную раўнавагу. Ён ідзе ў няпэўным кірунку, упрошваючы сябе ў думках то перастаць злавацца, то перастаць смуткаваць, і, слухаючыся імпульсаў свае сьвядомасьці, патрапляе ў нейкі ўпадабаны ім утульны дварок. Там ён сядае на лаву цытрынавага колеру і робіцца сьведкам пагоні дзяўчынкі год 7–8 за хлопчыкам прыкладна гэткага ж веку. Потым ён знаёміцца зь дзяўчынкаю, якая, пасьля няпэўнае заўвагі „сьмерць нічога не зьмяняе“, прарочыць сваю хуткую сьмерць ад удару дваровымі арэлямі па галаве. Пасьля гэтага мужчына працягвае свой шлях, у той час як дзеці ўжо пачынаюць гушкацца. Выйшаўшы з двара, мужчына чуе пранізьлівы крык і рэагуе на яго „заспакаяльнымі“ словамі: „Душа пустая“.

Разабрацца ў гэтай вельмі кароткай навэлі практычна немагчыма. Эмацыйна яна яшчэ болей супярэчлівая, чым аповесьць „Трохкутнік“ („раса-1“), зь якою павінна, паводле канонаў, складаць нейкую ўзаемадапаўняльную структуру. Яе супярэчлівасьць — выразнае люстра мэнтальнасьці нашага сучасьніка, які шукае спакою і адцягненасьці, але не ўяўляе, дзе й як іх трэба шукаць.

Сапраўды, у адрозьненьне ад Сэлінджэра, які зрабіў націск на спакойна-абыякавым мысьляру Тэды, Глёбус мае ў цэнтры ўвагі чалавека, які яшчэ толькі *стаіць на шляху* да супакою, але даволі далёка ад самое яго сутнасьці. Розьніца гэтая вельмі важная, бо менавіта філязофскі роздум Тэды, а таксама яго спакой і ўпэўненасьць стваралі ў аповедзе Сэлінджэра

заспакаяльную і ў пэўнай ступені „адцягненую“ атмасфэру. У навэлі Глёбуса, наадварот, герой на рэдкасьць трывожна ўплывае на чытача. Сугестыўнымі крыніцамі ўзьнікненьня трывожнага фону робяцца ў навэлі выслоўі „няма злосьці“ й „няма смутку“, зь якімі герой зьвяртаецца да сябе з самога пачатку. Гэтае меркаваньне заснаванае ня толькі на інтуіцыйных адчуваньнях, але й на некаторых дасягненьнях сучаснае псыхалёгіі, паводле якіх выкарыстаньне адмоўных часьціцаў кшталту „не“ зьяўляецца неэфэктыўным для саматрэнінгаў, падобных да тых, якімі заняты герой навэлі. Гэта адбываецца таму, што адмаўленьні („не“ альбо „ні“) блякуюцца, не ўспрымаюцца нашай падсьвядомасьцю. Інакш кажучы, калі мы кажам „ніколі ня буду злаваць“, то папросту накіроўваем сабе загад „*буду* злаваць“. Таму герою навэлі для стварэньня ў чытача і ў самога сябе нутранога супакою варта было б замест нэгатыўных словаў „няма злосьці“ і „няма смутку“ паўтараць пазытыўныя цьверджаньні кшталту „Дабрыня абкружае мяне паўсюль“ альбо „Маё сэрца поўнае радасьці“.

На сюжэтным узроўні трывожны эфэкт ствараецца з-за бязладных памкненьняў галоўнага героя і даволі блытаных выказваньняў іншых пэрсанажаў. Напрыклад, дзяўчынка, якая, паводле сюжэту, — чалавек, што дасягнуў „прасьвятленьня“, кажа, што „магла і хацела ўдарыць і пабіць“ хлопчыка, за якім гналася, але, з другога боку, сьцьвярджае, што яна на яго не крыўдуе і ўвогуле „нельга крыўдаваць“.

І, нарэшце, застаецца яшчэ адно важнае пытаньне. Ці адведваньне дзіўнага дворыка дапамагло герою знайсьці духовую раўнавагу? Каб паспрабаваць зразумець гэта, варта больш пільна прыгледзецца да фіналу.

З аднаго боку, рэакцыя героя („душа пустая“) на сьмерць незвычайнай дзяўчынкі без сумневу нэгатыўна ўспрымаецца грамадзкай сьвядомасьцю і сугестыўна дапаўняе ў навэлі сэрыю трывожных вобразаў. Але з другога боку, у гэтым выслоўі ўзгадваецца адна з найважнейшых катэгорыяў дзэн-будызму — Пустэльня, якая зьяўляецца і сутнасьцю, і брамаю ў „супакой, што прыводзіць да адмаўленьня сусьвету“. Паводле Дзэн, пустым зьяўляецца Розум прасьветленага чалавека. Ён толькі адбівае, не даючы ні адзнакаў, ні ймёнаў навакольным рэчам; ягоная сутнасьць — бестрывожнае сузіраньне.

У сувязі з гэтым магчымыя два варыянты: альбо аўтар намякае на пэўнае зьмяненьне духовага стану свайго героя, альбо галоўны герой навэлі канстатуе наяўнасьць Пустэчы ў душы іншага пэрсанажу — незвычайнай дзяўчынкі. Разыходжаньне тэрмінаў „розум—душа“ ў гэтым выпадку наўрад ці мае нейкае значэньне. Бо выразіць і апісаць Пустэльню, як і адказаць на ўсе пытаньні, немагчыма. Нават вынаходлівыя майстры Дзэн абмяжоўваліся намёкам. Шосты патрыярх спытаў Хуэй Чжэна: „Адкуль ідзеш?“ Хуэй Чжэн адказаў: „Іду з гары Су“. Патрыярх сказаў: „Што гэта і як зь яе сыходзяць?“. Хуэй Чжэн адказаў: „Што б я ні сказаў, усё будзе ня тое…“.

Збор „дзевяці аповедаў“ цалкам завершаны. Іх аказалася дзесяць.
Прывабнасьць канцэпцыі „дхвані“ для пісьменьніка цалкам зразумелая і вытлумачальная. Зьяднаўшы ў адну кнігу дзевяць аповедаў і дзевяць паэтычных настрояў, аўтар можа прэзэнтаваць чытачу абагульнены эмацыйны й духовы партрэт чалавека ўвогуле альбо чалавека свайго часу. Д.Сэлінджэр прадставіў чытачу Амэрыку й амэрыканцаў 40–50-х гадоў і сябе самога, Адам Глёбус — свайго лірычнага героя і Беларусь 70–90-х.
Беларус канца стагодзьдзя зьяўляецца перад намі ў дзесяці частках. Які ён? Перш за ўсё, гэты абагульнены вобраз можна назваць аптымістычным. Найлепш яму ўдаецца сьмяяцца, іранізаваць. Ён здольны адрозьніць сьветлае й цёмнае, сапраўднае й робленае, здольны быць шчырым перад сабою. Гэта, з аднаго боку, эўрапейскі тып, які можа супераживаць, быць сэнтымэнтальным, але хоча здавацца ці быць мужным і пэрыядычна блытае расчараваньне з каханьнем. З другога боку, гэта тыпова славянскі вобраз. І расчараваньне, і агіда, і зьдзіўленьне, і страх — усё гэта можа ўмэнт перамяніцца на ўсім знаёмае „што міне, то будзе міла“. Месца рэлігійнага экстазу ў яго мітусьлівым жыцьці заняў іншы экстаз і надышлі іншыя прасьвятленьні. Адкрыцьці тыпу „ўсе мы манахі“ альбо „дыямэнт, набыты ў Амстэрдаме, не выклікае сумневаў“ не прывялі яго да адмаўленьня сьвету. Але аднойчы, прысеўшы ўва ўтульным дворыку на жоўтую, як падводная лодка, лаўку, ён распачаў новую хвалюючую вандроўку…
Па сутнасьці, зазірнуўшы ў гэтыя дзесяць вокнаў, можна

зразумець адно. Сучаснаму беларусу, як і сучаснаму эўрапейцу ўвогуле, калі-нікалі пачынае чагосьці бракаваць у заходняй цывілізацыі. І, азірнуўшыся навокал у пошуках адвечных Мысьленьніцтва, Веды, Супакою, ён бачыць Усход. Ён таксама хоча адказаць на распаўсюджаны, як „Пэпсі-кола“, дзэнскі каан: „Чым ёсьць Буда?“. Магчыма, гэта проста гермафрадыт, а магчыма, і штосьці іншае. Бо ўнівэрсальнасьць і вартасьць гэтае спэцыфічнае загадкі ў тым, што адказаць на яе правільна можна па-рознаму, а менавіта — па-свойму.

Пераклала з расейскай Сьвятлана Курс

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 5 (10) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **29-08-2000**
[image]

Сяргей Харэўскі Адам Глёбус. Баляда

...**У** сярэдзіне 80-х гадоў у беларускае мастацтва прыйшла генэрацыя мастакоў з новым бачаньнем сьвету. Да іх фармальныя пошукі ў беларускім мастацтве абмяжоўваліся ўтылітарнымі задачамі — стварэньнем, напрыклад, „суворага стылю“ або насьледаваньнем „стылю нацыянальнаму“. Але вось прыйшло трэцяе паваеннае пакаленьне, якое выгадавалася і атрымала адукацыю толькі ў Менску, без вырашальнага ўплыву маскоўскай ці пецярбурскай школаў. Неўзабаве яно пачало групавацца ў суполкі накшталт „Нямігі 17“, „Галіны“, „Формы“... Для тых часоў гэта была рэвалюцыя. Паўсталі арганізацыі, альтэрнатыўныя афіцыйнаму Саюзу Мастакоў! Творчасьць Цішына, Пятрова, Мартынчыка ці Баброва нагэтулькі выломвалася з агульнага фону тадышняга БССРаўскага мастацтва, што ў афіцыйнай крытыкі не ставала нават словаў для іх бэшчаньня. Пры гэтым тое пакаленьне характарызавала шырэйшая эрудыцыя. І мастакоўская ў прыватнасьці. Разам зь цікавасьцю да несавецкага, большага сьвету... З уменьнем чытаць мастацтвазнаўчую крытыку наадварот. Сюррэалізм, абстракцыянізм ці поп-арт былі ў тагачаснай Беларусі лаянкай... А маладое пакаленьне вабілі плыні й кшталты, найбольш ганьбаваныя савецкімі

— віленскі мастацтвазнаўца, аўтар кнігі „100 твораў мастацтва XX стагодзьдзя“ (якая мае ў хуткім часе выйсьці ў выдавецтве „Наша Ніва“), што падводзіць вынікі стагодзьдзя беларускага выяўленчага мастацтва ад Фэрдынанда Рушчыца й Марка Шагала да Леніка Тарасэвіча. Адзін з творцаў новай „Наша Ніва“ (з 1991 году), яе нязьменны мастацкі

мастацтвазнаўцамі. Іх вабіла ўсё забароненае рэжыстар. Лішне казаць, што й рэлігія, тлумачаная кожным на свой тут, накладала значны адбітак на іхную творчасьць. Адам Глёбус належыць менавіта да гэтай генэрацыі. Хіба з адным адрозьненьнем. Ён фармальна не далучаўся ў тых „нефармальных“ суполак. Аднак, як і ягоных раўнаслаўкаў, яго вылучыла менавіта памкненьне стварыць сваістую форму. Загаварыць на сваёй мове.

Апошнім вучнёўскім і першым самастойным творам Глёбуса стала „Баляда“. Напісанае ў 1983 годзе, гэты ўваходзіла ў дыплёмную праграму Адама Глёбуса, і яе кожны апошні студэнцкі твор, яно міжволі праграмнае. „Баляда“ — квінтэсэнцыя мастакоўскай „культывацыі інтэлекту“.

Літаратурныя і крытычныя цыклы Сяргея Харэўскага ўнасілкаў, яго друкаваліся пад псэўданімамі Анатоль Сіюль і Гэры Кумаленскі. Сёлета выйшла нашая кніга „Зьвяры-суайчыньнікі“, якая злучыла пад адной вокладкай узоры беларускага літаратурна-заалягічнага постмадэрнізму — тэксты, што друкаваліся пад рубрыкаю „Вось сымбаль твой...“ у „Наша Ніва“ ў 1991-1995 гадох.

Як мастак-манумэнталіст паводле спэцыялізацыі, Глёбус мысьліць катэгорыямі архітэктуры. Гэтая рэч таксама магла б аказацца ў архітэктурнай аблямоўцы. Кампазыцыя палатна падпарадкавана архітэктанічнай лёгіцы. Перадусім ёсьць гарызантальны нясучы абрыс у доле, што пазначае плоскасьць, зь якой дагары вырастаюць астатнія аб’ёмы. Наступная гарызанталь палегчаная, распалавіненая чырваньню. А вэртыкаль, утвораная размахам рук, якая сыходзіць строма ўверх, за край палатна, прапарцыйна роўная аб’ёму

гарызанталяў… Дзьве жаночыя постаці. Дзьве песьні. Два лёсы. Расьсечаныя й наноў сабраныя, расьсечаныя йзноў… Тое, што за гэтымі двума жаночымі вобразамі стаяць рэальныя асобы, сам мастак не хаваў. У палатне ён увасобіў канкрэтны этап сваёй біяграфіі, этап ростаняў і новых саюзаў у асабістым жыцьці. …Дарэчы, і ў віленскага мастака Пятра Сергіевіча была падобная па сюжэце карціна, напісаная ў 30-я гады ў духу кубізму. Таксама „Баляда“. Таксама аўтабіяграфічная. Толькі цэнтральным вобразам там быў сам аўтар на ростанях… Хлопец на кані, які ў шарую гадзіну думае, у які бок кіравацца…

У „Балядзе“ Глёбуса два жаночыя пэрсанажы, прычына інтымных перажываньняў, зьнітаваныя не міжсобку, а з тым, хто іх вымысьліў і злучыў неверагодным чынам… У чатыры ўмоўныя рукі, шырокі размах якіх сягае ў бясконцасьць. Яны, нібы абярэг, утвараюць вялікі салярны знак.

Нягледзячы на манумэнтальнасьць кампазыцыі, яе рэальны памер сьціплы — 52х52 см. Зрэшты, і гэта — адна з праяваў архітэктурнага бачаньня, дзе любы маленькі шкіц — заява на эвэнтуальнае ўвасабленьне ў любым маштабе. Архітэктура займае ў мастакоўскім жыцьці Глёбуса вялікае месца. Гэта ня толькі шматлікія графічныя работы на архітэктурныя матывы, але й праца на рэстаўрацыі фрэсак касьцёла ў Мсьціславе, і нават эскіз вітража для гэтага касьцёла.

Манумэнтальна трактуе Глёбус у „Балядзе“ і колер. Яшчэ Тамаш Аквінскі вылучаў „яркасьць ды яснасьць“ як неад’емныя характарыстыкі хараства. „Таму мы называем прыгожымі тыя рэчы, што афарбаваны зыркім колерам“, — пісаў Сьвяты Тамаш. Я ня ўпэўнены, ці ўхваліў бы ён менавіта гэткую каляровую гаму. Бо скарыстаныя ў „Балядзе“ чатыры колеры, пры іх пачуцьцёвым багацьці, у хрысьціянскім разуменьні двухсэнсоўныя. Уласна, колер тут адзін — звонкі чырвоны. А зеляніна тут толькі, каб падкрэсьліць пякучую чырвань і глыбіню чорнага… Спалучэньне чорнага, чырвонага і зялёнага выказвае максымальную інтэнсіўнасьць пачуцьця, якое можа мець любы працяг. У рэальным жыцьці таксама.

Амаль матэматычная выверанасьць аб’ёмаў, дасканалая раўнавага каляровых прапорцыяў нагадвае карціны Малевіча або Мандрыяна, для якога форма была спосабам інтэлектуальнае гульні. Розьніца ў тым, што для Глёбуса гэта

ня проста форма. Бо шыі абедзьвюх сьпявачак перасечаныя… чорнымі гаржэткамі. Выпадковасьць? Не падобна. Бо надта ж усё выверана. Гэта падказка, а мо самавыкрыцьцё. Гэткі знак часта сустракаецца ў работах Глёбуса. У „Партрэце брата“ вочы й рот перакрытыя чорнымі палоскамі, як на здымках з крымінальнае хронікі. Нібыта няцяжка зразумець мэтафару — чалавек імкнецца да ананімнасьці, самаканьсьпірацыі ў несвабодным грамадзтве, ня маючы магчымасьці самасьцьвярджацца гучна. Зь іншага боку, гэтыя дзьве плямы чорных палосаў становяцца неад'емным элемэнтам кампазыцыі, пабудаванай на простых, блізу геамэтрычных элемэнтах. Дый манера жывапісу ў гэтым партрэце гранічна аскетычная.

Гэтаму партрэту папярэднічаў аўтапартрэт, напісаны кантражурам, яшчэ з часоў вучобы. Той, ранейшы — амаль рэалістычны. Адно толькі манерная гульня з блікамі здраджвае рэалізму. Паміж гэтымі двума партрэтамі вялізарная дыстанцыя.

Пазьней Глёбус пра станаўленьне сваёй мастацкай манеры пісаў: „Усю маладосьць я займаўся жывапісам і маляваньнем, прашукаў ідэалаў і не знайшоў. Ці то занадта зялёнымі былі дрэвы, ці вельмі ярка сьвяціла сонца, ці вада ў возеры недастаткова сіняй здавалася. Я штодня намочваў аркуш паперы, налепліваў яго на кавалак тоўстага шкла й маляваў пяром з тушшу ды пэндзлем з акварэляй. Калі малюнак не задавальняў, я змываў яго губкаю й пачынаў наноў. Стосы малюнкаў расьлі, а ідэал аддаляўся ў асмужаную невядомасьць. Я маляваў рэчы, целы, дзіркі паміж рэчамі й целамі, я ўрэшце пачаў маляваць амаль дасканалыя геамэтрычныя фігуры…“

Гэтая амаль дасканалая геамэтрыя красамоўна прадстаўленая ў партрэце Францішка Скарыны, ці ня самай арыгінальнай трактоўцы гэтага вобразу ў нашым мастацтве. Постаць чалавека зьмешчаная ў самы кут палатна, больш за тое, яна амаль напалову выходзіць за яго. Толькі лякальныя плямы адзежы й барэту пазначаюць самую фігуру. Рысы твару геамэтрычныя: палоска вока, трыкутнік вусаў, прастакутнік валасоў. Каляровы лад таксама абмежаваны лілёвым і бэзавым. Але прапорцыі каляровых плямаў дастаткова адлюстроўваюць сюжэт — сыход самотнага чалавека ў вечнасьць. І пустка,

вялікае нішто за плячыма Скарыны, уражвае...
У Глёбуса ёсьць партрэт яшчэ аднаго клясыка — Якуба Коласа. Гэта ўжо зусім іншая стылістыка, блізкая да гіпэррэалізму з аднаго боку, а з другога — нават да інсталяцыі, бо беспасярэднай часткаю твору служыць і натуральнае лісьце. Колер служыць хутчэй датасоўным элемэнтам да кампазыцыі. У пералівах шэрага, вохрыстага, жаўтаватага паўстае графічна дакладны твор. Гэта ці ня першы ў паваенным беларускім мастацтве прыклад канцэптуалізму. Сьведама ўтрыраваны, амаль гратэскны ў сваёй велічы вобраз клясыка-монстра. Вялізарнае месца займае ў творчасьці Глёбуса й графіка. Сэрыя, напрыклад, прысьвечаная Маскве, што выстаўлялася ў 1999 годзе ў Вільні, альбо кніжная графіка — пачынаючы з ілюстрацыяў да Караткевіча, выкананых у жанры коміксу, канчаючы ілюстрацыямі да ўласнага „Дамавікамэрону“ — сьведчаць пра разнастайнасьць і невычэрпнасьць мастакоўскае манеры. Але ляканічныя, зьведзеныя амаль да геамэтрыі формы ўсё тыя ж... Немалы ўплыў на пазьнейшую графіку Глёбуса зрабіла творчасьць Кейта Гарынга, заўчасна памерлага нямецкага мастака, стваральніка сваістага кшталту „сграфітавага“ жывапісу. Зрэшты, крыніцы ўплываў заўсёды маюць свае межы, бо бясконца трансфармуюцца ў залежнасьці ад задачаў.
Але сьпярша была „Баляда“. Нягледзячы на тое, што мастак паўтараў гэты сюжэт у іншых карцінах, „Баляда“ засталася ўзорам дасканалае формы, якое ён шукаў гэтак упарта. „Баляда“ рэпрадукавалася ў часопісах „Маладосьць“ і „Крыніца“, патрапіла на вокладку кнігі Адама Глёбуса „Койданава“. Тое, што яна, як і большая частка ягоных мастацкіх твораў, прайшла незаўважанаю мастацтвазнаўцамі, сьведчыць, наколькі Глёбус выперадзіў мастацкі час Беларусі. Дарэчы, гэта ў поўнай меры тычыцца і ўсяго ягонага пакаленьня. Задорын і Цішын, Мартынчык і Баброў, Пятроў і Лапо знаходзяць сабе прызнаньне ў іншых краёх з-за адсутнасьці сеткі недзяржаўных галерэяў і нацыянальнага рынку мастацтва.
Які лёс чакаў Глёбуса ў Беларусі як мастака? Бадай, як і ягоныя калегі, ён быў бы змушаны шукаць сябе ня тут. Ці не таму ягоны сыход у літаратуру быў прадыктаваны ня толькі асабістымі пошукамі ідэальных формаў?

Сёньня мастак Глёбус прэзэнтуе свае творы ў Інтэрнэце, знаходзячы сабе прыхільнікаў абапал Атлянтыкі, выстаўляецца ў віленскіх галерэях і аздабляе кнігі. А „Баляда“ застаецца пакуль ягонай прыватнай уласнасьцю.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]

№ 5 (10) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **29-08-2000**
[image]

Францішак Хлус (Уладзіслаў Ахроменка)
Марцін Юр (Максім Клімковіч)
Здані і пачвары Беларусі
Тэхнатронныя здані

Блуд метрапалітэнны

Даследчыкі пячораў і сутарэнняў даўно заўважылі, што ў чалавека, які апынуўся пад зямлёй, назіраюцца адхіленні ў псіхіцы: парушаецца часова-прасторавае ўспрыманне свету, блытаюцца лева і права, перад і зад. Але калі раней, да навукова-тэхнічнае рэвалюцыі, пад зямлю апускаліся хіба што спелеолагі, скарбашукальнікі ды аматары смяротнае рызыкі, то цяпер пасажыраплыні метрапалітэнаў зацягваюць долу штодня мільёны людзей. Сітуацыя пагаршаецца тым, што людзі, збітыя ў натоўп, у чаканні цягнікоў нервуюцца, а іхнія адмоўныя і агрэсіўныя імпульсы не знаходзяць выйсця ў замкнёнай прасторы жалезабетонных лёхаў станцыі. Бетонныя сцены экрануюць гэтыя імпульсы і ўзмацняюць, вяртаючы іх у натоўп. З даўніх часоў невытлумачальныя і змрочныя падзеі пачалі адбывацца і ў мінскім метрапалітэне. Вось што паведамляецца

ў афіцыйным рапарце дзяжурнага па станцыі „Кальварыйская“ на імя міністра падземных камунікацыяў і сховішчаў:
„31 лютага мінулага году ад станцыі ў гадзіну ночы адышоў у бок Аўтазаводскай апошні цягнік, але праз пяць хвілінаў мне затэлефанаваў дзяжурны па дэпо — да яго цягнік так і не прыйшоў. Мы абследавалі ўвесь тунэль з ліхтарамі, але ніякіх слядоў гэтага цягніка намі знойдзена не было. Тэлефонныя размовы з дзяжурнымі па ўсёй лініі таксама не далі аніякіх вынікаў. На падставе гэтага прашу спісаць з майго падуліку казённыя ватоўку і боты, якія ляжалі ў кабіне машыніста“.
Далейшае расследаванне аддзелу транспартнай міліцыі паказала, што ватоўку і боты дзяжурны занёс дахаты, але цягнік знік сапраўды. Знайшоўся ён толькі на трэці дзень, нечакана апынуўшыся на запасных шляхах. Машыніст быў п’яны страшэнна і абсалютна не мог растлумачыць сваёй трохдзённай адсутнасці. Справу хацелі закрыць, але следчага зацікавілі паказанні пацярпелага пасажыра, нейкага пісьменніка-дэтэктыўшчыка А., які сцвярджаў, што падобныя рэчы здараліся і раней, але ніхто, нават нешматлікія сябры, не давалі яму веры, бо лічылі, што ён, вялікі аматар позніх застолляў у рэстарацыях і ў бары Саюза Пісьменнікаў ды распусты ў кватэрах самотных паненак, спрабуе падобным чынам апраўдацца. Спраўдзіць словы А. было цяжка; следчыя эксперыменты, тым не менш, не далі аніякіх вынікаў. Пра гэтую гісторыю ўспомнілі ў сувязі з наступным.
Той А. стала займаўся літаратурным вывучэннем полавых адхіленняў і стэрэагамных парадоксаў, апісваючы іх у галоўнай працы жыцця, кнізе пра хцівых пачвараў. Ён і ягоная лабарантка, не маючы прыдатнага месца для літаратурнай навукі, вырашылі правесці пазалабараторныя літаратурныя даследаванні ў экстрэмальнай сітуацыі — у апошнім цягніку метро.
На канцавой станцыі яны не пакінулі вагон, а схаваліся пад сядзеннямі. Дэтэктыўшчык і лабарантка моцна здзівіліся, калі прайшло паўгадзіны, а цягнік не прыехаў у дэпо — ён імчаў па, здавалася, бясконцым тунэлі. Кнопка выкліку машыніста не працавала.
Нарэшце цягнік прыйшоў на нейкую незнаёмую станцыю, якая не была пазначана на ніводнай схеме. З дынаміка прагучаў д’ябальскі рогат, у якім пераляканаму пісьменніку-

дэтэктыўшчыку пачуліся словы: „Канцавая станцыя — „Блуд“. Цягнік далей не ідзе. Просьба пакінуць вагоны.“
А. і лабарантка выйшлі на платформу і агледзеліся. На станцыі не было ані эскалатараў, ані нават прыступак. Літаратар са спадарожніцай, не маючы іншага выйсця, вырашылі выбірацца праз тунэль. Яны ішлі па рэйках цэлую гадзіну і, убачыўшы наперадзе святло, прыспешылі крок. Але якім было іхняе расчараванне, калі небаракі пабачылі тую самую станцыю! Стомленыя блуканнем у цемры, цікаўнікі селі ў вагон. Лабарантка была ў роспачы, А. — таксама, і, не бачачы іншага выйсця, разумеючы, што жыццё скончана, лабарантка прапанавала А. аддацца блуду.
„Гары яно гарам, такое каханне“, — згадаў А. свой паэтычны радок, але вырашыў не пярэчыць.
Апрануўшыся, А. і ягоная памагатая спачатку не заўважылі, што яны не толькі памяняліся майткамі, але і надзелі іх навыварат.
„Што ні раблю, адны памылкі спрэс“, — згадаў дэтэктывіст яшчэ адзін уласны радок, але ж майткі ўсё ж вырашыў не пераапранаць.
Пасля акту небаракі паспрабавалі зрабіць другую спробу выбрацца са станцыі „Блуд“. Гэтая спроба была паспяховай — неўзабаве дэтэктыўшчык з лабаранткай апынуліся на станцыі „Кальварыйская“, дзе здаліся дзяжурнаму міліцыянту.
А праз тры дні цягнік зноў з’явіўся на запасным шляху дэпо. Гэтым разам таксама машыніст не мог даць верагодных тлумачэнняў гэтаму здарэнню. Станцыю „Блуд“ так і не змаглі адшукаць, а выяўленая анамалія была падобная да тых, што назіраюцца ў зачараваных урочышчах і заклятых гаёх, якія ў народзе носяць назоў Блуд. Старыя людзі гукаюць, што з іх можна выбрацца, толькі надзеўшы вывернутую вопратку, — інакш заўсёды будзеш вяртацца на тое месца, з якога выйшаў.
Цікавае, але спрэчнае думкі наконт знікнення цягнікоў прытрымліваецца адзін маскоўскі навуковец, добраахвотны памочнік следчага, вядомы сваімі юдафобскімі настроямі: ён сцвярджае, нібыта вядучы інжынер праекту мінскага метрапалітэну Х.Шапіра запраектаваў разваротнае кола для цягнікоў у форме кальца Мёбіюса, праехаўшыся па якім, цягнік трапляе ў іншае вымярэнне. Падставамі для такога сцвярджэння з’яўляецца тое, што Х.Шапіра, спраектаваўшы

мінскае метро, не дачакаўся завяршэння будаўніцтва і адразу ж з'ехаў ці то ў сектар Газа, ці то на заходні бераг ракі Ярдан. Што тычыцца дэтэктыўшчыка А., тая прыкрая гісторыя так уразіла яго, што ён, па чутках, кінуў не толькі вытанчаную распусту з самотнымі паненкамі, але і значна большыя заганы — паленне тытуню і ўжыванне алкаголю. Зрэшты, злясліўцы сцвярджаюць, што А. кінуў распусту, алкаголь і нікатын адно з прычыны паталагічнае сквапнасці, якая з узростам пачала прагрэсаваць.

З гэтага фантастычнага, але праўдзівага здарэння вынікае, што нават выпадкова надзетыя навыварат майткі могуць уратаваць не адно пісьменніцкае жыццё…

1995

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 5 (10) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **29-08-2000**
[image]

[image]

ARCHE Adam Hlobus № 5 (10) – 2000

[image]

[image]

АДАМ ГЛОБУС 2000

» да Зьместу «

[image] [image] [image]

Міраслаў Адамчык, Максім Клімковіч

Прывід у Гайцюнішках

TV-п'еса

Фарс-дэтэктыў

Міраслаў Адамчык (літаратурны псэўданім Міраслаў Шайбак) — выдавец і пісьменьнік, брат Уладзімера Адамчыка (Адама Глёбуса). Максім Клімковіч — сын Алеся Махнача, унук аўтара словаў да гімну БССР і заслужанага савецкага літаратурнага работніка Міхася Клімковіча. П'есы „Нагавіцы сьвятога Георгія“ і „Чорны квадрат“, напісаныя ў суаўтарстве М.Адамчыкам і М.Клімковічам, былі з посьпехам пастаўленыя менскім тэатрам „Вольная сцэна“. Тандэмам яны напісалі таксама трылер „Каханка д'ябла“. У ARCHE-Постмадэрнізм друкаваўся раман „Заўсёды сьветла каля турэмных муроў“ Уладзімера Сакалова, у якім ёсьць і доля крыві аўтараў гэтай п'есы.

П'еса-экспромт адлюстроўвае літаратурныя густы, тыповыя для кола сяброў Адама Глёбуса пачатку 90-х.

Дзейныя асобы:

БРУНА ЧЫК — дэтэктыў
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ — літаратар
ЮЗАФ РАК — палкоўнік
АГАТА РАК — жонка Юзафа
КАЗІМІР ВЯРЫГА — ксёндз
АДАМ ШЫШДУДАР — доктар, Агацін кузэн
РАЗАЛЛЯ РАК — сястра Юзафа
ЁСЕЛЬ ЦЭСЛЕР — аканом
ЗОСЯ — пакаёўка
ПРЫВІД
САМСОН — сабака ангельскай пароды

Заходняя Беларусь. 30-я гады.

Сцэна 1

Віленская кватэра Бруна Чыка. За акном касцёл святых Пятра і Паўла. Бруна Чык і Вадзімір Даўгалевіч разбіраюць пошту.

ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Ліст ад пані Твардоўскай.

БРУНА ЧЫК: Кінь у камін.

ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Не чытаючы?
БРУНА ЧЫК: І гэта ў камін.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Пан Берналік просіць знайсці злодзея, які замест фальшывых банкнотаў прадаў яму пачак рэзаных газетаў. А на халеру яму былі фальшывыя банкноты?
БРУНА ЧЫК: Ведаю, гэтым займаецца Мадэй з Новай Вялейкі. Прапануе партыю буйных фальшывых купюр за чвэрць наміналу і дае на спробу пару сапраўдных, а кажа, што фальшывыя. Пан Берналік ідзе з імі да ювеліра Рабіновіча, разменьвае. Калі ўжо габрэй не заўважыў падробкі, то грошы можна браць. Пан Берналік пазычае ва ўсіх сваякоў злотыя і купляе партыю фальшывых грошай. Толькі Мадэй замест грошай пакуе рэзаную газету.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Хай Берналік звернецца ў паліцыю.
БРУНА ЧЫК: І скажа, што хацеў купіць фальшывыя грошы?
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: А Мадэй хай і надалей дурыць людзей?
БРУНА ЧЫК: Мадэй закону не парушыў: грошай жа ён не падрабляў.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Тэлеграма: у маім маёнтку ў Гайцюнішках з’явіўся прывід. Буду ў пана пасля полудня. Палкоўнік Юзаф Рак.
БРУНА ЧЫК: Кінь у камін.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Як? У агонь? Я ўсё жыццё марыў злавіць прывіда.
БРУНА ЧЫК: І што ты з ім будзеш рабіць?
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Я цяпер пішу аповесць „Каралеўскае паляванне“ і хачу запусціць у яе прывідаў.
БРУНА ЧЫК: Ты ж пішаш дэтэктыў, а прывіды — гэта фантастыка.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Якая фантастыка? Вось тэлеграма. І не ад летуценнай паненкі — ад вайскоўца.
БРУНА ЧЫК: Часам вайскоўцы больш палахлівыя за паненак.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Я б не казаў, каб на свае вочы не бачыў чорта. Маленькага такога, чорнага — скакаў па кабінеце. З фіранкі на стол, са стала на канапу. Хоць і выпіўшы быў, а перапалохаўся страшэнна.
БРУНА ЧЫК: Памятаю я гэты выпадак. Ты потым месяц у санаторыі лячыўся.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Я разумею, дактары пра кровазліццё

ў воку казалі. Але ж чорт натуральны быў, ён мне попел у вока і сыпануў.
БРУНА ЧЫК: З рэальнасцю такога чорта яшчэ магу пагадзіцца, але прывідаў лавіць… Дай сюды *(кідае тэлеграму ў агонь)*.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Дарма ты, Бруна, у замагільны свет не верыш. Вось да маёй маці ў дзяцінстве Маці Божая прыходзіла, па галоўцы палашчыла.
БРУНА ЧЫК: Я ж не толькі ў чорта, я і ў Бога не веру!
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: І чалавек ад малпы пайшоў? Як па-мойму, дык ад Бога. Лягчэй жыць, калі так думаеш.
БРУНА ЧЫК: Я хутчэй метафізік. Ніхто ніадкуль не паходзіў. Мне так лягчэй жыць.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Дык што, ты і ў прывід Барбары Радзівіл не верыш, які алхімік Твардоўскі выклікаў на загад караля Жыгімонта Аўгуста?
БРУНА ЧЫК: Прывід каралевы — гэта прыгожа. А што засталося, як Жыгімонт Аўгуст злавіў яго — адзін трупны пах.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Трупны пах — гэта сера, сімвал Д'ябла.
БРУНА ЧЫК: Серай пахне толькі сера, як тухлыя яйкі — серавадародам. Ты ж не лічыш, што ад іх патыхае Д'яблам?
Гучыць званок у дзверы.

Сцэна 2

Тыя ж і палкоўнік Юзаф Рак.
ЮЗАФ РАК: Палкоўнік Рак, па рэкамендацыі генерал-маёра Салагуба.
БРУНА ЧЫК: Мой сябар пісьменнік Вадзімір Даўгалевіч.
ЮЗАФ РАК: Вы атрымалі маю тэлеграму?
БРУНА ЧЫК: Так, але мушу расчараваць пана, я не спецыяліст па прывідах. Справа ў тым, што я ў іх не веру.
ЮЗАФ РАК: Гэта і добра. Я і сам не надта веру. Хацелася б, каб за справу ўзяўся чалавек дысцыплінаваны і цвярозы.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Пан палкоўнік на свае вочы бачыў прывіда?
ЮЗАФ РАК: Не ў крыўду пану, размова мусіць быць канфідэнцыйнаю.
БРУНА ЧЫК: Не шкодзіць, Вадзімір якраз буйны спецыяліст па сувязях з замагільным светам. Так бы мовіць, знаўся ўжо з гэтым насланнём.

ЮЗАФ РАК: Калі так, то я не супраць. Я сам прывіда покуль не бачыў, толькі чуў яго крокі, ходзіць уночы па доме. А жонка — пані Агата — бачыла і страшэнна перапалохалася.
БРУНА ЧЫК: Я ўсё ж параіў бы пану палкоўніку звярнуцца да святароў.
ЮЗАФ РАК: Ды жыве ў мяне ксёндз, пасля таго выпадку жонка запрасіла. Але лепей не стала, відаць, раз'юшыўся прывід. Дык я на яго сабаку завёў, нанач у калідор выпускаю. Перастаў хадзіць.
БРУНА ЧЫК: Так і выдатна.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Сабака ад прывіда не ўратуе.
ЮЗАФ РАК: Па калідоры хадзіць перастаў, але ж цыдулкі з пагрозамі піша: „Рыхтуйся, стары дурань, да смерці", а па вечарах у коміне скавыча. Прашу прабачэння.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: А ці няма ў маёнтку патаемных хадоў?
ЮЗАФ РАК: Як набыў летась палац, то перабудаваў. Каб што было, знайшлі б.
БРУНА ЧЫК: Я б узяўся шукаць забойцу, украдзеную рэч, але лавіць прывіда не бяруся.
ЮЗАФ РАК: Тое ж мне казалі ў контрразведцы. І параілі звярнуцца да прыватнага дэтэктыва. Я ж у сейфе сакрэтныя дакументы трымаю. А калі прывід цыгары мае ды каньякі крадзе, то можа і да дакументаў дабрацца.
БРУНА ЧЫК: Першы раз чую пра прывідаў, якія паляць цыгары і п'юць каньяк. А больш нічога ў вас не знікла?
ЮЗАФ РАК: Таму я і прыехаў. Заўчора прывід украў мой кішэнны гадзіннік, гадзіннік з музыкай, які граў паланезік, асабісты падарунак начальніка дзяржавы. Я разумею, пан Чык бярэцца за маю справу? Прывіда лавіць неабавязкова, трэба знайсці гадзіннік.
БРУНА ЧЫК: Няўжо гадзіннік настолькі каштоўны?
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Падарунак Пілсудскага?
ЮЗАФ РАК: Не толькі. Пад накрыўкай я выдрапаў код сейфу ў маім кабінеце, а там сакрэтныя дакументы. Маю слабую памяць на лічбы.
БРУНА ЧЫК: Ніякіх пільных справаў на гэты тыдзень не маю. Відаць, давядзецца прыняць вашую прапанову. Вадзімір, зірні ў расклад, калі пойдзе цягнік на Пінск.
ЮЗАФ РАК: Не турбуйцеся. Я ўжо замовіў купэ. Цягнік

адыходзіць праз чатыры гадзіны. З раніцы будзем у маёнтку.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Я прапаную паехаць на маім аўтамабілі, тады мы паспеем яшчэ сёння.
ЮЗАФ РАК *(здзіўлена)*: Гэта ваш „мерседэс“ пад вокнамі?
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ *(хаваючы вочы)*: Надоечы ў Берліне паставілі маю п’есу.
ЮЗАФ РАК: З тэхнічнага гледзішча я вас разумею, але з патрыятычнага…

Сцэна 3

Гасцёўня ў маёнтку. Бруна Чык, Юзаф Рак, Вадзімір Даўгалевіч, Ёсель Цэслер. На падлозе стаяць сакваяжы. Вялікі круглы стол, буфет.

ЮЗАФ РАК: Мой аканом — Ёсель Цэслер.
ЁСЕЛЬ ЦЭСЛЕР: Я нават не пачуў, як вы пад’ехалі.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: У майго „мерседэса“ рухавік працуе так далікатна, што можна на капот манету рубам паставіць — не зваліцца.
ЮЗАФ РАК: У маёнтку ўсё спакойна?
ЁСЕЛЬ ЦЭСЛЕР: Зноў прывід хадзіў — праз акно бачыў — белы такі. Можа, пакаёўку падняць?
ЮЗАФ РАК: Ды не, мы тут самі. І ты ідзі кладзіся.
ЁСЕЛЬ ЦЭСЛЕР: То ўсім дабранач *(у дзвярах паварочваецца)*. Каньяк, што вы замаўлялі, у буфеце стаіць.
Ёсель Цэслер выходзіць.
ЮЗАФ РАК *(дастае з буфету графін і бляшанку з печывам)*: Ну што, панове, возьмем з дарогі па кілішку? *(Разлівае каньяк у тры чаркі.)* Трэцяя гадзіна ночы, не хочацца падымаць прыслугу.
БРУНА ЧЫК: Дзякуй, але адмаўляюся. Блага засынаю на новым месцы.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: А я з ахвотай.
Юзаф Рак і Вадзімір Даўгалевіч выпіваюць, глядзяць адзін на аднога, потым на Бруна Чыка, разліваюць яго кілішак па сваіх, зноў выпіваюць і закусваюць печывам.
ЮЗАФ РАК: Але, пся крэў, дзе мой сабака? Самсоне!
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Можа, выбег у парк?
ЮЗАФ РАК: Магчыма, але… Цалкам неверагодна, каб ён кінуў пост. Ангельскай пароды. Самсоне!
Выходзяць.

Сцэна 4

Спачывальня. Юзаф Рак, Агата Рак. Вялікі ложак, бюро, шафа. Юзаф запальвае святло. Агата прачынаецца.

ЮЗАФ РАК: Самсоне! Самсоне, пся крэў!

АГАТА РАК: Як ты хутка вярнуўся.

ЮЗАФ РАК: Агата, дзе Самсон, каб яго ваўкі парвалі?

АГАТА РАК: Юзаф, ты прыехаў не адзін?

ЮЗАФ РАК: Ну, усё, цяпер прывіду аман, прывёз паляўнічых: следчага Бруна Чыка і пісьменніка Вадзіміра Даўгалевіча. *(Бярэцца за клямку шафы.)* Ты што такая спалоханая?

АГАТА РАК: Зноў прывід…

ЮЗАФ РАК: Лухта *(адчыняе шафу)*.

У шафе сядзіць нябожчык у мундзіры палкоўніка з усімі ўзнагародамі, акрываўлены твар прыкрыты канфедэраткай.

ЮЗАФ РАК: Лухта. *(Зачыняе шафу, глядзіць на свой адбітак у люстэрку, зноў адчыняе.)* Нябожчык у нашай шатні? Дзе мая шабля?

АГАТА РАК: Нябожчык?! *(Вішчыць, кідаецца да Юзафа.)* Юзафе, Юзафе! *(Цягне яго ад шафы, млее.)*

ЮЗАФ РАК *(бярэ жонку на рукі)*: Супакойся, не хвалюйся, гэта толькі прывід.

АГАТА РАК: Забяры мяне адсюль, вынесі на паветра, мне блага.

Юзаф Рак выносіць жонку са спачывальні. У расчыненай шафе — акрываўлены труп. Здалёк чуваць крык палкоўніка: „Самсоне!“ і Агацін: „Прывід! Ратунку!“

Сцэна 5

Тэраса. Юзаф Рак, Агата Рак, Бруна Чык, Вадзімір Даўгалевіч. Агата ляжыць на лаўцы, Юзаф трымае яе за руку.

ЮЗАФ РАК: Супакойся, Агатка, нікога там не было.

БРУНА ЧЫК: Зноў прывід?

ЮЗАФ РАК: Мая жонка Агата. Пан Бруна Чык і пан Вадзімір Даўгалевіч. Не бойся, яны дапамогуць нам.

ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Пані бачыла прывіда? А мне ніяк не пашчасціць.

АГАТА РАК: Ён, ён бачыў *(паказвае дрыжачай рукой на мужа)*.

Заходзяць Адам Шышдудар і Разалля Рак.

РАЗАЛЛЯ РАК: Ты крычала?

АДАМ ШЫШДУДАР: Прапусціце мяне *(слухае пульс)*. Нервовы шок. Яе што напалохала?
ЮЗАФ РАК: Адам, пабудзь з ёю, і ты, Разалля. *(Адводзіць на бок Бруна Чыка.)* У мяне ў шафе сядзіць нябожчык.
Бруна Чык, Юзаф Рак, за імі і Вадзімір Даўгалевіч сыходзяць.
АДАМ ШЫШДУДАР: Агата, што ты бачыла?
АГАТА РАК: У шафе за люстэркам — прывід.
РАЗАЛЛЯ РАК: Я б памерла ад страху.

Сцэна 6
Спачывальня. Юзаф Рак, Бруна Чык, Вадзімір Даўгалевіч. Шафа зачынена.
ЮЗАФ РАК *(працягвае)*: Падыходжу, адчыняю шафу і бачу — сябе.
БРУНА ЧЫК: У люстэрку?
ЮЗАФ РАК: Не, я ж адчыніў шафу. Нябожчыка — самога сябе ў парадным мундзіры. Глядзеце самі *(адчыняе шафу)*.
У шафе нябожчыка няма.
БРУНА ЧЫК: Вы ўпэўнены?
ЮЗАФ РАК: Хіба я вар'ят? Я вайсковы чалавек. Ён быў тут, і гэта быў я *(залазіць у шафу, выкідае адтуль жончыны сукенкі)*.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Мусіць, гэта быў прывід у вашым абліччы.
ЮЗАФ РАК: Гэта быў я. Што я, сябе не пазнаю? *(Выходзіць з пустой шафы з шабляю)*.
БРУНА ЧЫК: І што, падабенства было дакладнае?
ЮЗАФ РАК *(раззлавана)*: Рыхтык я. Вось як на партрэце. Парадны мундзір, ордэны, канфедэратка.
БРУНА ЧЫК: Пан палкоўнік дакладна быў нежывы, там у шафе?
ЮЗАФ РАК: У мяне была скрываўленая галава, шмат крыві. Вы не верыце мне?
БРУНА ЧЫК: Веру. Вось і на шаблі кроў.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Але адкуль у прывіда кроў? Можа ён вупыр, можа пярэварацень ці вурдалак.
ЮЗАФ РАК: Так, жахлівае відовішча, але ж сам ён не сышоў.
Заходзяць Адам Шышдудар, Агата і Разалля Рак
АДАМ ШЫШДУДАР: Дзе труп?
ЮЗАФ РАК: Уцёк. Тут, у шафе сядзеў.
РАЗАЛЛЯ РАК: Гэта быў сапраўдны прывід.

АДАМ ШЫШДУДАР: Труп не мог сысці, гэта я вам сведчу як доктар. Так што або мушу пагадзіцца з Разалляй, або, хутчэй за ўсё, гэта галюцынацыя.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Усе дактары настойваюць на адным: калі што надзвычайнае, то адразу ж: трызненне на глебе алкагалізму.
ЮЗАФ РАК: Якія, Адаме, галюцынацыі! Яго ж бачыла і Агата.
АГАТА РАК: Я не бачыла.
ЮЗАФ РАК: Ты ж мусіла бачыць?
АГАТА РАК: Мусіла, але не бачыла.
ЮЗАФ РАК: А чаго самлела?
АГАТА РАК: Ад таго, што мусіла ўбачыць. Ты ж сказаў — нябожчык.
БРУНА ЧЫК: Давайце спынім спрэчкі. Бо да згоды не прыйдзем. Ясна адно: знік мундзір і на шаблі свежая кроў.

Сцэна 7

Кабінет палкоўніка. Юзаф Рак сядзіць, абапершыся на шаблю. Бруна Чык і Вадзімір Даўгалевіч.

ЮЗАФ РАК: Самае дурное, сяджу вартую, як той сабака, і не ведаю, ці на месцы паперы.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Не перажывайце, пане палкоўніку. Бруна знойдзе ваш гадзіннік.
БРУНА ЧЫК: Чаму вы ўпэўнены, што ён прыйдзе рабаваць менавіта сейф? Мо ён абмяжуецца цыгарамі й каньяком?
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Відаць, у замагільным свеце свая логіка.
БРУНА ЧЫК: У такім разе нам не дадзена яе зразумець.
ЮЗАФ РАК: Якая замагільная логіка, пане пісьменніку, усё проста, як у войску: навокал адны шпіёны. Вось, напрыклад, мой аканом, Ёсель Цэслер — жыдоўска-бальшавіцкі шпіён.
БРУНА ЧЫК: Вы што, бачылі, як ён падае ліхтарыкам сігналы расейскім самалётам?
ЮЗАФ РАК: Вось, здаецца, і служыць у мяне дваццаць гадоў, і чалавек прыстойны, але жыватом чую, раптам што, і прадасць. Або вось, напрыклад, Агацін кузэн — доктар Адам Шышдудар — натуральны нямецкі шпег. Вучыўся ў Берліне, перапісваецца з немчурой.
БРУНА ЧЫК: А яшчэ хто жыве ў доме?
ЮЗАФ РАК: Пробашч Казімір Вярыга — ліха яго матары,

таксама ад святасці не свеціцца. Яшчэ сястра мая Разалля, дурніца маладая. Вось і ўсе.
БРУНА ЧЫК: А з прыслугі хто ў маёнтку?
ЮЗАФ РАК: З тых, хто жывуць тут, толькі аканом і пакаёўка Зося, я б яе даўно выгнаў, ды жонка не дае.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: А пакаёўка, часам, не вядзьмарка?
ЮЗАФ РАК: Наконт вядзьмаркі не ведаю, гэта ў ксяндза спытайце. Але скажу па шчырасці: пакаёўка — таксама брыда добрая. Раз за дупу ўшчыпнуў, дык адразу жонцы расказала.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: А ранейшыя гаспадары не скардзіліся на прывіда?
ЮЗАФ РАК: Ніхто тут ні пра якога прывіда не чуў. А з'явіўся ён адразу пасля рамонту. Жонка пачала скардзіцца, што ўночы нехта ходзіць, і чым далей, тым горай. Я дык моцна сплю, мяне захочаш — не пабудзіш. Вось і я, нарэшце, нябожчыка ў шафе пабачыў. І куды ён мог падзецца? *(Глядзіць на вялікі сейф.)*
БРУНА ЧЫК: І доўга пан палкоўнік збіраецца пільнаваць сейф? Можа, злодзею гэта і трэба?
ЮЗАФ РАК: Заўтра замоўлю майстра, каб сейф адчыніў і код змяніў. А зараз як кінуць дакументы без нагляду? Навокал адны шпіёны.
Стук у дзверы.
ЮЗАФ РАК: Каго там прынесла? Незамкнёна!
У кабінет уваходзіць Агата Рак.
АГАТА РАК: І вы не спіцё? Я папрашу, каб Зося прынесла кавы.
БРУНА ЧЫК: Не турбуйцеся, пані Агата, мы ўжо пра ўсё пагаварылі.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Не будзем замінаць. Дабранач.
БРУНА ЧЫК: Дабранач.
ЮЗАФ РАК: Дабранач, панове. У мяне сняданак, як у войску, а восьмай, у гасцёўні.
Бруна Чык і Вадзімір Даўгалевіч выходзяць.

Сцэна 8
Кабінет. Агата і Юзаф Рак.
АГАТА РАК: Ты не хочаш адпачыць? Ты такі стомлены, Юзафе *(лашчыць мужа па галаве)*.
ЮЗАФ РАК: Покуль злодзей у доме, які можа быць адпачынак! Я мушу вартаваць сейф.

АГАТА РАК: І ты не прыйдзеш да мяне?
ЮЗАФ РАК: Калі баішся адна, кладзіся тут, у кабінеце.
АГАТА РАК: На гэтай жорсткай і рыпучай канапе я не засну.

Сцэна 9

Калідор. Бруна Чык і Вадзімір Даўгалевіч.

ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Палкоўнік мае рацыю, што прывід мусіць з'явіцца яшчэ гэтай ноччу. Якраз чырвоная поўня, ты заўважыў?
БРУНА ЧЫК: Ты яшчэ скажы — крывавая. Пайшлі лепш спаць. Пакінь ноч прывіду.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Не, яшчэ прайдуся па доме.
Бруна Чык і Вадзімір Даўгалевіч разыходзяцца.

Сцэна 10

Тэраса. Ксёндз, хаваючыся, паліць. Бруна Чык зазірае на тэрасу і заўважае ксяндза.

БРУНА ЧЫК: Ойча Казіміру?
КСЁНДЗ *(перажываючы, што яго заспелі за непачцівым заняткам)*: Так. А вы Бруна Чык? Мне пра вас ужо расказаў доктар Адам.
БРУНА ЧЫК: І вы падняліся на лямант пані Агаты?
КСЁНДЗ: Так, вось запераживаў, чалавек слабы, запаліў з хвалявання. У плябаніі такога не дазволіш сабе. Каб мая ахмістрыня даведалася...
БРУНА ЧЫК: Пан ксёндз так блізка бярэ да сэрца падзеі ў маёнтку.
КСЁНДЗ: На мяне ўскладзена вельмі адказная місія — выгнанне Д'ябла, і перш чым турбаваць біскупа, я мушу ўпэўніцца, што ў доме сапраўды Д'ябал.
БРУНА ЧЫК: А вы яшчэ не маеце пэўных доказаў існавання гэтага так званага прывіда? Ды паліце, не зважайце на мяне.
КСЁНДЗ: Не магу на вачах у людзей паліць. А што тычыцца прывіда, то Святы касцёл вельмі скептычна ставіцца да гэтых з'яваў.
БРУНА ЧЫК: Дык пан ксёндз мае сумненні?
КСЁНДЗ: Гаспадар ужо прасіў мяне пасвянціць срэбную кулю. Але давялося адмовіць: гэта справа варажбітоў і паганскіх шаманаў.

Сцэна 11

Гасцёўня. Адам Шышдудар і Разалля Рак. На стале кошык з бутэлькамі. Вадзімір Даўгалевіч хоча ўвайсці, але вяртаецца і становіцца за парцьеру.

АДАМ ШЫШДУДАР *(працягвае)*: …а гэты пісьменнік, я па вачах бачу, што п'яніца, п'е за грошы твайго брата.

РАЗАЛЛЯ РАК: Мяне непакоіць Бруна Чык, гэты можа дазнацца. Я чытала ў газетах, што ён лічыцца адным з лепшых прыватных следчых, ён за адзін вечар знайшоў злодзеяў, якія абрабавалі лецішча Пілсудскага.

АДАМ ШЫШДУДАР: Вядома, лепш бы Юзаф звярнуўся ў паліцыю.

РАЗАЛЛЯ РАК: Ён ужо звяртаўся ў контрразведку, але пасля таго што ён нагаварыў пра прывіда, яго палічылі за вар'ята.

АДАМ ШЫШДУДАР: Дык ён жа і ёсць натуральным вар'ятам, дапіўся, што свой адбітак у люстэрку палічыў за нябожчыка.

РАЗАЛЛЯ РАК: Ты ж сам ведеш, што ў гэтым доме не ўсё так проста. І мы мусім зрабіць на гэтым свой інтарэс…

Вадзімір Даўгалевіч за парцьераю п'янавата прытуляецца спачатку да сцяны, а потым да парцьеры і разам з парцьераю вывальваецца ў пакой. Адам Шышдудар хапаецца за кошык.

РАЗАЛЛЯ РАК *(пазнае Вадзіміра)*: Вы не моцна пабіліся?

ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: А не, нічога страшнага. Калі вы думаеце, што я падслухоўваў… *(Вадзімір падымаецца.)*

Сцэна 12

Кабінэт. Юзаф Рак. З кошыкам, поўным бутэлек піва, заходзіць Адам Шышдудар.

АДАМ ШЫШДУДАР: Не патурбаваў?

ЮЗАФ РАК: Зноў нямецкім півам разжыўся?

АДАМ ШЫШДУДАР: Тое, што вы любіце.

ЮЗАФ РАК: Немцы, вядома, брыда, але піва варыць умеюць. Сядай.

Адам Шышдудар адкаркоўвае бутэлькі, п'юць.

АДАМ ШЫШДУДАР: А яшчэ кажуць: па начах не спяць адно злодзеі і прывіды.

ЮЗАФ РАК: А ты што не спіш?

АДАМ ШЫШДУДАР: Прыйшоў сумненнем падзяліцца. Наконт прывіда.

ЮЗАФ РАК: Які прывід? Самы натуральны нябожчык…

АДАМ ШЫШДУДАР: Нябожчык мо і натуральны, але я заўважыў такое, чаго і ваш Бруна Чык не згледзеў.
ЮЗАФ РАК: Відаць, падазраеш каго?
АДАМ ШЫШДУДАР: Справа вашая, але я б з Ёселя вока не спускаў.
ЮЗАФ РАК: Лічыш, ён прывідам ходзіць?
АДАМ ШЫШДУДАР: А хто ж яшчэ? Усе ж у доме, на месцы, калі ён з'яўляецца, а ці ў сваім флігелі Ёсель, ніхто не бачыць. Да таго ж усе ключы ў яго ёсць. Яму выгодна Вас прывідам запалохаць, каб Вы з маёнтку з'ехалі, і ён тут за гаспадара застанецца.
ЮЗАФ РАК: Так і я пану Бруна казаў, што Ёсель у мяне на падазрэнні. Нешта ж ты іншае заўважыў.
АДАМ ШЫШДУДАР: Кроў на шаблі.
ЮЗАФ РАК: Гэта і мая Агата заўважыць *(падымае пачышчаную шаблю)*.
АДАМ ШЫШДУДАР: Як медык кажу: дзіўнаватая кроў. Кансістэнцыя не тая.
ЮЗАФ РАК: Дагаворвай — не людская кроў?
АДАМ ШЫШДУДАР: Без лабараторнага аналізу сцвярджаць не бяруся.
ЮЗАФ РАК: І ты мяне прывідам прыйшоў палохаць?
АДАМ ШЫШДУДАР: Ды не, пра Ёселя падказаць.
ЮЗАФ РАК: А жыдоўская кроў ад чалавечай розніцца?
АДАМ ШЫШДУДАР: Не больш, чым варшаўскае піва ад кракаўскага. Вы падумайце наконт аканома, лепш свайго чалавека ўзяць. А я пайду ўжо. Дабранач.

Сцэна 13

Калідор. Вадзімір Даўгалевіч, стаіўшыся за рогам, бачыць, як праходзіць палкоўнік з шабляй. Палкоўнік заходзіць у прыбіральню, зачыняецца і насвістае. Вадзімір Даўгалевіч чуе асцярожныя крокі па калідоры, вызірае за рог і бачыць, як зачыняюцца дзверы кабінету, крадзецца да іх і рэзка расхінае. Бачыць пусты кабінет. Робіць крок наперад. На галаву яму апускаецца рука з поўнай бутэлькай. Бутэлька разлятаецца, дзверы зачыняюцца.

Сцэна 14

Калідор. Торгаецца клямка на дзвярах прыбіральні, дзверы не

адчыняюцца. Чуваць удар плячом у дзверы і лаянку палкоўніка.
ЮЗАФ РАК *(з-за дзвярэй)*: Пся крэў! Што за жарты? *(Зноў удар.)* Хто зачыніў? Ліха ягонай матары. Заб'ю, засяку!
Дзверы калоцяцца пад моцнымі ўдарамі. На калідор выбягаюць ксёндз, за ім Бруна Чык.
БРУНА ЧЫК: Пане палкоўніку!
ЮЗАФ РАК *(не чуючы)*: Засяку, заб'ю падлу!
Ксёндз спрабуе адамкнуць прыбіральню. У гэты момант расколваецца філёнга — яе прапорвае шабля. Ксёндз пералякана адскоквае. Бруна спрабуе збоку адкінуць засаўку. Філёнга вылятае, з-за яе з'яўляецца рука з шабляй і сячэ паветра.
БРУНА ЧЫК: Спыніцеся на хвілінку, пане Юзафе. Гэта я, Бруна Чык.
Рука прыбіраецца, у дзірцы недаверлівы твар палкоўніка.
ЮЗАФ РАК: То, халера, чаго не адчыняеце?
Бруна выпускае Юзафа Рака, на лямант з'яўляюцца Агата Рак, Разалля Рак і Адам Шышдудар.
АГАТА РАК: Зноў прывід? Напаў на Юзафа ў прыбіральні?
РАЗАЛЛЯ РАК: Ты біўся з ім, Юзафе?
Юзаф Рак, не зважаючы жанчын, зашпільвае фрэнч, спускае ваду і з гонарам ідзе да кабінету. Усе глядзяць яму ўслед.
АДАМ ШЫШДУДАР *(ціха)*: Наш палкоўнік пашаткаваў прывіда і спусціў у каналізацыю.
Юзаф Рак, не азіраючыся, бярэцца за клямку дзвярэй кабінету — яго пачынае калаціць, ён спалохана адскоквае, глядзіць на руку.
АДАМ ШЫШДУДАР: Здаецца, у Юзафа нервовы шок.
БРУНА ЧЫК: Больш падобна да электрычнага. *(Дастае насоўку і ёю адчыняе клямку.)*
З другога боку дзвярэй за клямкай цягнецца дрот, Бруна Чык абрывае яго, за ім у кабінет заходзіць Юзаф.

Сцэна 15

Кабінет. Юзаф Рак і Бруна Чык. Агата, Разалля Рак, Адам Шышдудур, ксёндз у дзвярах. Сейф расчынены. На канапе ляжыць накрыты з галавою посцілкаю непрытомны Вадзімір Даўгалевіч.
ЮЗАФ РАК *(не заўважаючы Вадзіміра, зазірае ў пусты сейф)*: Перахітрыў, падла. Украдзеныя сакрэтныя дакументы. *(Дастае з сейфу цыдулку, глядзіць і хавае яе ў кішэню.)*
Бруна Чык адхіляе посцілку. У Вадзіміра Даўгалевіча твар заліты півам і крывёю.

РАЗАЛЛЯ РАК: Нябожчык, той самы!
Агата Рак млее, валіцца на Ксяндза.
Юзаф Рак: Цяпер не ўцячэ! *(Кідаецца да канапы, мерыцца закалоць Вадзіміра шабляю.)*
АДАМ ШЫШДУДАР: Хвілінку. Ён яшчэ жывы.
ЮЗАФ РАК: Я ж казаў, і ў шафе быў жывы нябожчык.
Бруна Чык ліе з графіна ваду на твар Вадзіміру Даўгалевічу, той расплюшчвае вочы, садзіцца на канапе.
БРУНА ЧЫК: Я ж казаў табе, што па начах трэба спаць, а не лавіць прывідаў.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Прывід напаў на мяне.
БРУНА ЧЫК: Ты бачыў яго?
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Так, жахлівае відовішча.
БРУНА ЧЫК: І як ён выглядаў?
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Усё адбылося захутка. Я не паспеў разглядзець. Не было калі прыглядацца.

Сцэна 16
Гасцёўня. Юзаф, Агата, Разалля Рак, Адам Шышдудар, ксёндз, Бруна Чык, Вадзімір Даўгалевіч з забінтаванай галавой. Зося разносіць каву.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: …азіраюся, бачу — клямка на дзвярах сама паварочваецца, а нікога няма. Хачу паклікаць каго, і мову адняло. І чую, мяне, як магнэсам, да тых дзвярэй цягне. Расчыніў — нікога. І толькі голас у галаве гучыць: зрабі крок наперад і не азірайся. Я яго і паслухаўся.
БРУНА ЧЫК: Вадзіміру, сейф быў адчынены?
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Так. Не. Я ж прывіда ўбачыць хацеў.
Зося *(да Юзафа)*: Вам падліць кавы?
ЮЗАФ РАК: Не замінай.
Перад Юзафам Ракам стаіць графін з каньяком, ён падлівае сабе і Вадзіміру Даўгалевічу. Яны п'юць. Бруна Чык адмаўляецца і, як астатнія, п'е каву.
АГАТА РАК: Дык вы бачылі яго?
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Так, удвая большы за мяне. Праўда, як след не разглядзеў. Бутэлька ляцела мне на галаву, здавалася, з-пад самай столі.
БРУНА ЧЫК: Мушу расчараваць. Зламыснік стаяў на фатэлі пад дзвярыма. Але забіваць цябе не збіраўся.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Бутэлькай з півам па галаве?

БРУНА ЧЫК: Менавіта што поўнай. Поўнай не заб'еш, яна разлятаецца. Каб так ляснулі парожняй, ты б сам стаў прывідам.
АДАМ ШЫШДУДАР: Так вы, пане Бруна, думаеце, і папярэднім разам прывіда не было?
БРУНА ЧЫК: Нават на шаблі было столькі крыві, што, пагадзіцеся, доктар, такую траўму ніхто з прысутных не ўтоіў бы, быў бы забінтаваны горш за пана Даўгалевіча.
ЮЗАФ РАК: Халера, дзе гэта Ёсель? Тады сабака знік, цяпер Ёселя не відаць.
ЗОСЯ *(засцілаючы на стол)*: Дык пятая ж гадзіна ночы. Спіць Ёсель у сваім флігелі.
ЮЗАФ РАК: А што ты яго бароніш, Зоська, ліха цябе не бярэ?
АГАТА РАК: Юзафе, табе не сорамна?
ЮЗАФ РАК: Мне сорамна? На сябе паглядзі, у расхрыстаным пеньюары ходзіш. Мне мо й сорамна, мяне ў прыбіральні замкнулі, поўны дом следчых і ксяндзоў, а прывід сейф абрабаваў ды яшчэ і цыдулку пакінуў.
Агата Рак паказвае Зосьцы, каб прыбрала каньяк ад мужа. Тая паціху хавае яго і замыкае ў буфеце.
ЮЗАФ РАК *(дастае цыдулку)*: Рагач, рогі мне намаляваў.
АГАТА РАК: Юзафе, чым піць, лепш патэлефануй маёру Шмарлоўскаму з контрразведкі, укралі ж сакрэтныя дакументы — а ты пра нейкія рогі ўспомніў.
ЮЗАФ РАК: Сціхні, дурніца!
БРУНА ЧЫК: Не хвалюйцеся, пані Агата, мяркуючы па паводзінах вашага мужа, ніякіх дакументаў, а тым больш сакрэтных, у сейфе не было.
ЮЗАФ РАК: Хоць адзін разумны чалавек у доме. Хіба я вар'ят трымаць сакрэтныя паперы ў сейфе, які адчыніць нават мая жонка? Але я думаў — раптам вайна. *(Спахоплівaецца.)* А дзе мой каньяк? Думаеце, дапіўся, што нябожчыкі ў шафах трызняцца? Зоська, дзе ключ схавала ад буфету, курва?
ЗОСЯ: Што мне пані загадала, я тое і раблю. *(Хаваецца за Агату.)*
Юзаф Рак глядзіць праз шкло на каньяк. Выцягвае шаблю, мерыцца секануць па буфеце. Ксёндз хапае яго за руку.
КСЁНДЗ: Пакіньце гэтую рэч на захаванне да заўтра мне.
РАЗАЛЛЯ РАК: Юзафе, пан ксёндз мае рацыю, пакінь шаблю.
Юзаф Рак аддае шаблю.

КСЁНДЗ: Пайду прыбяру з вачэй *(сыходзіць)*.
АДАМ ШЫШДУДАР: Мяне гэты тэатр стаміў. Калі дакументаў не было, дык пра што й гаварыць? *(Сыходзіць.)*
ЮЗАФ РАК: А вось рэвальвера не аддам. Трэба сыходзіць з гэтага дому. Які я гаспадар, калі пакаёўка ключы ад мяне хавае, ксяндзы шаблі забіраюць і нават сястра супраць мяне? *Юзаф Рак надзяе канфедэратку, аддае чэсць і выходзіць. У двары чуецца спеў палкоўніка:*

Ад панядзелка
да панядзелка
Смачна п'ецца
нам гарэлка.

За сталом няёмкае маўчанне.
АГАТА РАК: Выбачайце, панове, Юзафа, у яго сёння цяжкі дзень. Але ён неўзабаве вернецца.
БРУНА ЧЫК *(падыходзіць да буфета, разглядае талерку)*: Кобальт ад Мэйсана, але, дарэчы, не лепшы за Нёманскую парцаляну. Нездарма князі Радзівілы і дагэтуль замаўляюць там посуд.
РАЗАЛЛЯ РАК: Пан Бруна спецыяліст па парцаляне?
У двары чуюцца два стрэлы. Бруна Чык падскоквае да акна.
АГАТА РАК: Ён заўсёды страляе, калі стоміцца.
БРУНА ЧЫК: Я ўсё ж выйду *(сыходзіць)*.

Сцэна 17
Флігель аканома. Бруна Чык, Ёсель Цэслер. Вялікая выбеленая руская печ. Перапалоханы Ёсель накідае плашч.
БРУНА ЧЫК: А пан палкоўнік не мог выйсці незаўважаны праз браму?
ЁСЕЛЬ ЦЭСЛЕР: Ды не, я ж не спаў. Бачу, святло ў доме гарыць, але не ведаў, ці я патрэбны.
БРУНА ЧЫК: А, часам, іншага выйсця з парку няма?
ЁСЕЛЬ ЦЭСЛЕР: Ой, пан следчы ж ведае, пан палкоўнік так баіцца шпіёнаў, замураваў усе брамкі. А паркан такі, што і з драбінамі не пералезеш.
БРУНА ЧЫК: Кажаце, і сюды не заходзіў?
ЁСЕЛЬ ЦЭСЛЕР: Ды не заходзіў, кажу вам, што можа быць трэба яму тут а пятай раніцы. Ён і так да мяне ніколі не заходзіў. Ён мне тэлефанаваў, бачыце, апарат паставіў і

тэлефанаваў, тэлефанаваў, спакою не было і не будзе. Вось і цяпер, відаць, дзе ў альтанцы адпачыць прылёг. Вось толькі ліхтар вазьму і пойдзем шукаць.
Ёсель Цэслер бярэ ліхтар, Бруна Чык дастае свой кішэнны. Выходзяць.

Сцэна 18
Гасцёўня. Ксёндз, Вадзімір Даўгалевіч, Агата, Разалля Рак, Адам Шышдудар, Зося. Заходзяць Бруна Чык і Ёсель Цэслер. Бруна Чык трымае прастрэленую канфедэратку палкоўніка.
БРУНА ЧЫК: Мушу прызнацца, не ўпільнаваў. Не варта было адпускаць яго аднаго. Пан палкоўнік знік.
ЁСЕЛЬ ЦЭСЛЕР: Пан Бруна ўвесь парк абшукаў. Адно, што засталося, выбачайце, пані Агата, канфедэратка, і тая з дзіркаю.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Прастрэленая?
БРУНА ЧЫК: Гучалі два стрэлы, але дзірка адна.
РАЗАЛЛЯ РАК: Нехта страляў у Юзафа?
БРУНА ЧЫК: Не думаю.
АГАТА РАК: Вы проста супакойваеце мяне.
БРУНА ЧЫК: Калі развіднее, яшчэ раз абыдзем парк. А вы, пане Адаме, здаецца, ужо клаліся спаць?
АДАМ ШЫШДУДАР: Нават не паспеў распрануцца, як пачуў стрэлы.
КСЁНДЗ: Хіба тут спакойна заснеш?
АДАМ ШЫШДУДАР: На месцы Юзафа я б таксама знік. Прастрэліў канфедэратку і схаваўся. Паглядзець, што атрымаецца.
АГАТА РАК: Ён бы папярэдзіў мяне.
БРУНА ЧЫК: Выбачайце, але я ў гэтым не ўпэўнены.

Сцэна 19
Кабінет. Бруна Чык і Вадзімір Даўгалевіч.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Што ты маўчыш?
БРУНА ЧЫК: Думаю.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Пра што?
БРУНА ЧЫК: Што трэба прыкруціць дрот да таршэра. За сталом цемнавата.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Кола падазроных звузілася. Калі знік палкоўнік, у гасцёўні не было доктара, ксяндза і аканома. Я

лічу, што забойца доктар. Я выпадкова пачуў яго размову з Разалляй. Разалля пераконвала Адама забіць яе брата.
БРУНА ЧЫК: Так і казала?
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Ну, не зусім так, але зразумела. Казала: „Ты мусіш зрабіць гэта“, а потым згадала Юзафа. Вось Адам і забіў.
БРУНА ЧЫК: Забойства няма, покуль няма трупа. А тут нават няма ні крыві, ані слядоў барацьбы, канфедэратка ляжала на непрымятай траве кроках у дзесяці ад алеі.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Яго маглі задушыць. І ён адстрэльваўся.
БРУНА ЧЫК: Сабе ў галаву? Адам адпадае, у яго не было часу на забойства.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Ён мог страляць са свайго акна.
БРУНА ЧЫК: А дзе ж тады труп?
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Ёсель заадно з Адамам. Той застрэліў, а Ёсель схаваў.
БРУНА ЧЫК: Хуценька закапаў і пасадзіў зверху кветкі?
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Зацягнуў у свой флігель.
БРУНА ЧЫК: Уяві сябе на месцы Ёселя, дзе ты ў флігелі схаваеш нябожчыка?
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Натуральна, на печы. Ты там глядзеў?
БРУНА ЧЫК: Вось на печы я і не глядзеў, на печы нябожчыкаў не хаваюць.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Я ўсё ж настойваю, каб абшукаць Адамаў пакой. Знойдзем гадзіннік. У каго гадзіннік, той і забойца.

Сцэна 20

Калідор. Вадзімір Даўгалевіч і Бруна Чык пад дзвярыма Адама Шышдудара.

БРУНА ЧЫК: Ты ўпэўнены, што доктара няма ў пакоі?
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Я сам чуў, як ён казаў, што пойдзе супакойваць гаспадыню.
БРУНА ЧЫК: Асцярожнасць не зашкодзіць.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ *(прыкладае вуха да дзвярэй)*: Халера, ён у пакоі.
БРУНА ЧЫК: Што робіць?
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Размаўляе.

БРУНА ЧЫК: То ён не адзін *(Хоча ісці)*.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Чакай, там нешта ўсчынаецца. Падобна да бойкі.
БРУНА ЧЫК: Я б не быў такі катэгарычны.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Ён некага душыць. Чуеш енк?
БРУНА ЧЫК: Нешта падобнае.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Давай уломімся і схопім на гарачым учынку.
БРУНА ЧЫК: На тваім месцы я б пастукаўся.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ *(стукаецца, шум за дзвярыма імгненна заціхае)*: Спазніліся, задушыў *(расхінае дзверы)*.

Сцэна 21

Пакой Адама Шышдудара. Бруна Чык і Вадзімір Даўгалевіч у дзвярах. Адам, распрануты, сядзіць на ложку.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Дзе труп?
БРУНА ЧЫК: Выбачайце, пане доктару, мы праходзілі побач, і майму сябру падалося, што вы не адзін.
АДАМ ШЫШДУДАР: Менавіта падалося.
БРУНА ЧЫК: Тады мы пойдзем. Выбачайце, што патурбавалі.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Як гэта падалося, як гэта выбачайце? Ты ж сам чуў *(падыходзіць да ложку)*.
БРУНА ЧЫК: Хадзем, Вадзіміру, я табе растлумачу.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Вы некага задушылі. Што вы хаваеце пад коўдрай?
АДАМ ШЫШДУДАР: Прынамсі, не нябожчыка.
Вадзімір Даўгалевіч, злаўчыўшыся, сцягвае коўдру, пад ёй — закрыўшы твар, аголеная Разалля Рак.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: А вы казалі — падалося, то, сапраўды, выбачайце. Пан разумее, мусім быць пільнымі.
АДАМ ШЫШДУДАР: Шкадую, пане Даўгалевіч, што прывід не прыбіў вас бутэлькаю.
Бруна Чык і Вадзімір Даўгалевіч выходзяць.
БРУНА ЧЫК: Спадзяюся, нарэшце ты ляжаш спаць.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Так, вып'ю чарку і лягу.

Сцэна 22

Гасцёўня. Бруна Чык, Вадзімір Даўгалевіч, Адам Шышдудар, ксёндз, Агата і Разалля Рак, Ёсель Цэслер. Зося разлівае гарбату. Сняданак.

АДАМ ШЫШДУДАР: Ты Агата, мужная жанчына. Умееш хаваць перажыванні.
АГАТА РАК: Калі ты, Адаме, пра тое, што знік Юзаф, то я сэрцам адчуваю — усё высветліцца. Дый Разалля, бачу, не вельмі бярэ гэта да галавы. Трэба ведаць майго мужа і яе брата.
БРУНА ЧЫК: Мы з Ёселем абшукалі парк, сутарэнні і гарышча. Ніякіх слядоў.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Усе падзеі трэба звязаць у адзін ланцуг. На што разлічваў прывід? Палкоўнік і Бруна мусілі прыехаць цягніком толькі зараз. Але я зблытаў яму карты — прывёз іх на машыне яшчэ ўвечары. Ведаючы, што пані Агата спіць, прывід перакінуўся трупам палкоўніка і сеў у шафу. Вось вам і вынік — украдзены сакрэтныя дакументы, і гаспадар скончыў жыццё самагубствам.
БРУНА ЧЫК: У сейфе не было чаго красці.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Па гэтым і адчуваецца рука прывіда. Каму яшчэ спатрэбіцца рабаваць сейф, у якім нічога няма? Толькі прывіду!
КСЁНДЗ: А ў вашай практыцы, пане Чыку, былі падобныя выпадкі?
БРУНА ЧЫК: Каб чалавек знік, не пакінуўшы ніякіх слядоў, то не.
АГАТА РАК: Раскажыце нам, як вы злавілі злодзеяў, якія абрабавалі лецішча маршала Пілсудзкага ў Друскеніках.
БРУНА ЧЫК: Гэта нецікава. Звычайны крадзеж. Не так даўно я таксама займаўся справай з прывідам. Да мяне звярнуўся кліент, якога шантажавалі. І прызнаўся мне, што месяц таму гуляў у карты з панам Торбачкам, выпадкова забіў яго, тнуўшы графінам па галаве, і, натуральна, спалохаўся, схаваў труп у куфар і пайшоў у сад капаць яму. Калі вярнуўся, убачыў, што кватэра абрабаваная, укралі не толькі грошы, срэбра і каштоўнасці, але і куфар з трупам. А праз месяц той злодзей, які абрабаваў кватэру, даслаў яму ліст, у якім патрабаваў грошай, а інакш гразіўся прывезці куфар з нябожчыкам назад.
АГАТА РАК: Які жах! І шмат злодзей патрабаваў грошай?
БРУНА ЧЫК: Мой кліент быў у стане выплаціць такую суму.
АДАМ ШЫШДУДАР: За месяц труп мусіў моцна засмярдзець. Вы знайшлі яго?
БРУНА ЧЫК: Знайшоў, але не труп. Шантажыстам аказаўся сам нябожчык, пан Торбачка, які прачухаўся ў куфры, глянуў у

акно, за якім гаспадар капаў магілу. Паскідаў у куфар, што трапілася пад руку, і ўцёк.
КСЁНДЗ: Хцівасць не мае межаў.
АГАТА РАК: Вы, пане Чыку, залішне далікатны, баіцёся лішні раз патурбаваць. Калі трэба абшукаць пакоі, то не саромцеся, пачніце з маёй спачывальні.
БРУНА ЧЫК: Спадзяюся, панства зразумее, што гэта не мая пустая цікаўнасць. Але, калі хто мае што супраць…
РАЗАЛЛЯ РАК: А што вы думаеце знайсці?
ЁСЕЛЬ ЦЭСЛЕР: Пан мяркуе, што нехта хавае гаспадара ў сябе?
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Мы мусім знайсці гадзіннік.
АДАМ ШЫШДУДАР: У мяне таксама ёсць гадзіннік. І як вы адрозніце, чый ён?
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Палкоўнік расказваў, што ён грае вось так *(напявае паланез)*. У вас таксама з музыкай?
АДАМ ШЫШДУДАР: Не, у мяне больш просты.
АГАТА РАК: Дык пачнем з майго пакою?
Маўчанне. Бруна Чык глядзіць на ўсіх па чарзе. Раптам чуецца механічнае гранне паланезу. Усе глядзяць на ксяндза. Музыка замаўкае.
КСЁНДЗ *(да Адама)*: Гэта ваш гадзіннік граў?
АДАМ ШЫШДУДАР: Мой жа без музыкі. Гэта ваш, ойча.
КСЁНДЗ: Я наагул не маю гадзінніка *(лезе ў кішэню, дастае залаты гадзіннік, кладзе на стол)*.
РАЗАЛЛЯ РАК: Я пазнаю, Юзафаў гадзіннік.
БРУНА ЧЫК *(адкрывае накрыўку)*: Так, тут выдрапаны код сейфу.
КСЁНДЗ: Спадзяюся, усе разумеюць, мне яго падкінулі.
БРУНА ЧЫК: Не хвалюйцеся, пане ксёнджа, стрэлкі пераведзены, каб ён зайграў менавіта пад час сняданку.
КСЁНДЗ: Пане Чыку, хадземце, я выкажу вам свае падазрэнні. Тут гэта рабіць небяспечна. Злодзей сярод нас.
Бруна Чык і ксёндз выходзяць.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ *(папраўляючы павязку на галаве)*: Гэта ксёндз, як я й падазраваў.
АГАТА РАК: Як вам не сорамна вінаваціць ксяндза, якога пан Юзаф сам запрасіў пажыць у маёнтку!

Сцэна 23

Кабінет. Бруна Чык і ксёндз.
КСЁНДЗ: Гэта ўсё доктар. Украў, абрабаваў і гадзіннік мне падкінуў.
БРУНА ЧЫК: Чаму вы так лічыце?
КСЁНДЗ: Да сняданку кішэні ў мяне пустыя былі, я б заўважыў, як апранаўся. А за сталом ён побач са мной сядзеў, тады і падкінуў.
БРУНА ЧЫК: А навошта Адаму рабаваць сейф?
КСЁНДЗ: Не ведаю. Але палкоўніка ён не любіў. Адпомсціць мог.
БРУНА ЧЫК: Гаспадар чым пакрыўдзіў яго?
КСЁНДЗ: Не яго, а Разаллю. Адам сватаўся да сястры палкоўніка, а той адмовіўся пасаг даць.
БРУНА ЧЫК: Магчыма, тут і ёсць сувязь, але знікнення Юзафа гэта не тлумачыць.
КСЁНДЗ: Сапраўды, калі толькі гаспадар сам дзе не схаваўся, то мушу паверыць у падкопы Д'ябла. *(Сыходзіць.)*

Сцэна 24
Кабінэт. Бруна Чык. Заходзіць Вадзімір Даўгалевіч.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Ты адпусціў ксяндза?
БРУНА ЧЫК: Так.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Разумею, ты хочаш, каб я пайшоў сачыць за ім.
БРУНА ЧЫК: А хто сказаў, што ён збіраецца ўцякаць?
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Ён жа злодзей. Ты сам казаў: у каго гадзіннік, той і злодзей.
БРУНА ЧЫК: А ў каго гадзіннік цяпер?
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: У цябе.
БРУНА ЧЫК: Значыцца, цяпер злодей я. Маглі падкінуць табе.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Я перакананы — ксёндз абрабаваў сейф.
БРУНА ЧЫК: Нашто яму сакрэтныя дакументы, якіх там, дарэчы, не было?
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Ну, я ж не следчы. Можа, ён клептаман, можа, шпіён. За ім трэба сачыць.
БРУНА ЧЫК: Хочаш, сачы. Толькі для шпега ты занадта вядомы і прыкметны. І не забудзься прыхапіць каску палкоўніка.
Вадзімір Даўгалевіч сыходзіць.

Сцэна 25

Кабінет. Бруна Чык. Заходзіць Адам Шышдудар.

БРУНА ЧЫК: Прыйшлі зрабіць прызнанне?

АДАМ ШЫШДУДАР: Вы здагадаліся *(кладзе на стол папку)*.

БРУНА ЧЫК: Дзіўна, я лічыў, вы прыйдзеце трошкі пазней. Толькі нашто пан доктар падклаў гадзіннік у кішэню менавіта ксяндзу?

АДАМ ШЫШДУДАР: Мог бы й вам, але той сядзеў бліжэй. Вы ж не паверылі, што ён рабаўнік — на тое і быў разлік.

БРУНА ЧЫК: Сакрэтныя дакументы? *(Разглядае папку.)*

АДАМ ШЫШДУДАР: Калі і ёсць тут сакрэты, то хіба ад пані Агаты — лісты каханак. У пана палкоўніка была неспакойная маладосць.

БРУНА ЧЫК: Я не скажу, што ў яго спакойная старасць. І вы да гэтага спрычыніліся. Вы ўкралі гадзіннік, падпільнавалі, як гаспадар сышоў з кабінету, замкнулі яго ў прыбіральні, толькі пачалі адмыкаць сейф, як вам сабраўся перашкодзіць Вадзімір.

АДАМ ШЫШДУДАР: Выбачайце, але на скорую руку не мог прыдумаць лепшага спосабу нейтралізаваць яго на час.

БРУНА ЧЫК: Але вы не змаглі ўтрымацца ад спакусы і тут жа ў кабінеце развязалі папку.

АДАМ ШЫШДУДАР: Зразумела. І ўбачыў, што гэта далёка не планы мабілізацыі. Але для маіх мэтаў любоўная перапіска падыходзіла больш. Рэч у тым, што Юзаф не хоча аддаваць за мяне Разаллю. А пан жа бачыў: мы з Разалляй кахаем адно аднога!

БРУНА ЧЫК: Я ўдакладню. Разаллю вы можаце браць у жонкі хоць сёння, але ж палкоўнік не дае пасагу.

АДАМ ШЫШДУДАР: Так, мы хацелі дабіцца ад Юзафа, каб аддаў ёй частку бацькоўскай спадчыны. Але цяпер, калі палкоўнік знік, я вырашыў ува ўсім прызнацца.

БРУНА ЧЫК: Мяне запрасіў сюды гаспадар, і па яго вяртанні я мушу ўсё расказаць яму.

АДАМ ШЫШДУДАР: Пан следчы яшчэ спадзяецца, што ён вернецца?

БРУНА ЧЫК: А вы маеце сумненні?

АДАМ ШЫШДУДАР: Адзіны чалавек у маёнтку, хто ўсур'ёз жадае смерці гаспадару, — ягоная жонка, пані Агата. Я ж папярэдзіў палкоўніка ў цыдулцы: ён раганосец.

БРУНА ЧЫК: Яна здраджвае мужу?
АДАМ ШЫШДУДАР: Так, прашу прабачэння, курва, маркітуецца, як швейная машынка. Таму яе Юзаф і звёз з Вільні ў маёнтак.
БРУНА ЧЫК: А тут у яе ёсць пэўны каханак?
АДАМ ШЫШДУДАР: У Агаты няма нічога трывалага. Яна нават, ведаючы пра нас з Разалляй, заляцалася да мяне. А я ж яе стрыечны брат.
БРУНА ЧЫК: Я яшчэ па дарозе сюды зразумеў, што калі па доме ходзіць прывід, які крадзе цыгары і каньяк, то ён мусіць заходзіць і да жанчынаў.
АДАМ ШЫШДУДАР: Мушу расчараваць. Прывідам я не хадзіў. Усе свае злачынствы я пералічыў.
БРУНА ЧЫК: Сапраўды, для прывіда пан занадта рацыянальны. Хаця дзеля справядлівасці адзначу: вы прызналіся нават у тым, чаго не рабілі. Палкоўніка ў прыбіральні зачыніла Разалля.
АДАМ ШЫШДУДАР: Ад вас цяжка нешта ўтоіць. І ўсё ж раю больш пільна прыгледзецца да гаспадыні. Вы яе недаацэньваеце.
Чуваць грукат і лямант на калідоры. Стук у дзверы. З'яўляецца пакаёўка Зося.
ЗОСЯ: Пане Чыку, ваш сябра, пан Даўгалевіч, праваліўся ў сутарэнні.
БРУНА ЧЫК: То што, у доме няма каму яго выцягнуць?
ЗОСЯ: Яго ўжо выратаваў пан ксёндз. Сядзіць цяпер у гасцёўні, п'е каньяк пана палкоўніка.

Сцэна 26
Кабінет. Тыя ж. З'яўляецца Агата Рак.
БРУНА ЧЫК: Вас, пані Агата, таксама патурбаваў мой сябра?
АГАТА РАК: Я ведаю, дзе схавалі Юзафа. У маёй спачывальні, пад ложкам.
АДАМ ШЫШДУДАР *(нахіляецца да Бруна Чыка)*: Я ж вам казаў.
БРУНА ЧЫК: Вы зазіралі туды?
АГАТА РАК: Я адчула смурод, зазірнула, а ён ляжыць пад ложкам у парадным мундзіры.

Сцэна 27

Спачывальня. Бруна Чык, Агата Рак, Зося, ксёндз, Адам Шышдудар, Разалля Рак. Бруна Чык выцягвае з-пад ложка кілім. На ім здохлы сабака ангельскага заводу ў парадным мундзіры палкоўніка.
ЗОСЯ: Пярэварацень!
АДАМ ШЫШДУДАР: Гэта ж Самсон! Аднога ўжо знайшлі.
БРУНА ЧЫК: А што на гэты конт думае Святы касцёл?
КСЁНДЗ: Я веру толькі ў Боскія цуды.
АДАМ ШЫШДУДАР: Калі палкоўнік быў ваўкалакам, то як мы гэта пахаваем: як сабаку ці як палкоўніка?
РАЗАЛЛЯ: Не будзь цынікам! Пахаваем як сабаку палкоўніка.
БРУНА ЧЫК: Відавочна, Самсона зарэзалі шабляй.

Сцэна 28
Спачывальня. Тыя ж. Чуецца крык Вадзіміра Даўгалевіча.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Бруна, я злавіў злодзея!
У спачывальню заходзіць Ёсель Цэслер з дзвюма пляшкамі каньяку. За ім Вадзімір Даўгалевіч.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ *(убачыўшы сабаку)*: Ужо знайшлі палкоўніка? А я злавіў злодзея. Краў гаспадарскі каньяк. Ну, і смярдзіць у вас тут. Як у Стамбуле.
АГАТА РАК: Ёсель, няўжо гэта праўда?
ЁСЕЛЬ ЦЭСЛЕР: Так, пані, вельмі вінаваты.
БРУНА ЧЫК: Пан Цэслер, сёння ж субота, хіба вы не прававерны юдэй? Сёння нават працаваць нельга, не тое што красці. Я не веру.
ЁСЕЛЬ ЦЭСЛЕР: Яшчэ больш вінаваты.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Ды краў ён, і ў маю пастку трапіўся. Выпіў я для выгляду чатыры чаркі. Каньяк на стале пакінуў, а сам схаваўся. Ведаю — прывід каньяк крадзе. Заходзіць аканом, азіраецца і забірае каньяк.
АГАТА РАК: Ёсель, відаць, хацеў яго ў буфет паставіць?
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Ды не, я яго ўжо ў парку спыніў, да сябе ў флігель цягнуў. А вам, пані Агата, сказаў бы, што я ўсё выпіў.
БРУНА ЧЫК: Пане Цэслеру, відаць, вас нехта прымусіў, запалохаў?
ЁСЕЛЬ ЦЭСЛЕР: Не, сам, усё сам, думаў на шабас выпіць.
З парку чуецца стрэл. Усе пдбягаюць да вокнаў, а спалоханы Ёсель Цэслер не ведае, дзе схавацца.

Сцэна 29

Тыя ж. У дзвярах з'яўляецца чорны з перапою Юзаф Рак. З рэвальверам.

КСЁНДЗ *(гледзячы ў акно)*: Зноў нікога.

ЮЗАФ РАК: Што, пахаваць мяне вырашылі, як сабаку?

ЁСЕЛЬ ЦЭСЛЕР: Вось ваш каньяк, пане палкоўніку.

ЮЗАФ РАК: А, і ты з імі, бальшавіцкая морда. Заб'ю шпега.

Юзаф Рак бярэ пляшку, п'е з рыльца, валіцца на ложак.

ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Я магу напіцца, каб нікога не бачыць, але напіцца, каб мяне ніхто не бачыў…

ЮЗАФ РАК: Прачнуся, усіх пазабіваю.

ЁСЕЛЬ ЦЭСЛЕР: Прашу прабачэння. Але вось так заўсёды, калі што, то вінаваты бедны Ёсель. Гаспадар хоча выпіць, а Зося замыкае буфет, думаеце, ён прыстаўляе рэвальвер ёй да сэрца? Не, ён ідзе да Ёселя, прыстаўляе рэвальвер яму да скроні і кажа, што я бальшавіцкі шпіён. І я мушу наліваць гарэлку. І я ведаю, што ён не заб'е Ёселя, покуль у мяне ёсць, што выпіць. Ён залазіць на печ і кажа, што заб'е мяне, калі Ёсель скажа каму хоць слова. Ён прачынаецца, я наліваю, а ён кажа, што заб'е мяне, як прачнецца зноў. А ўсе ходзяць і шукаюць пана палкоўніка, а ён спіць у мяне на печы. А бедны Ёсель хоча жыць. І вось у мяне скончылася гарэлка. Што я мушу рабіць? Я мушу красці ў суботу, каб уратавацца. Але Ёселю і тут не шанцуе — яго ловяць, і зноў Ёсель ува ўсім вінаваты…

Сцэна 30

Кабінет. Бруна Чык, Юзаф Рак.

БРУНА ЧЫК: Як пан палкоўнік пачуваецца?

ЮЗАФ РАК: А ведаеце — і няблага. У маладыя гады я мог выпіць вядро пазнанскага лікёру і гарцаваць на кані.

БРУНА ЧЫК: Дарэчы, вось ваш гадзіннік і так званыя сакрэтныя дакументы.

ЮЗАФ РАК: Як вы знайшлі іх?

БРУНА ЧЫК: Аддаў прывід. Сам. А я абяцаў не называць яго імя. Магу дадаць адно, ён прасіў паскорыць вяселле Адама і Разаллі.

ЮЗАФ РАК: Дык гэты нямецкі шпег і сабаку майго зарэзаў?

БРУНА ЧЫК: Не, гэта зрабіў іншы прывід, тут іх у вас поўна.

(Падыходзіць да каміннай паліцы, падае бульбіну на вяроўцы з

уторкнутымі ў яе пёркамі.) Вось гэты, напрыклад, скавытаў па вечарах у гасцёўні, вісеў у коміне.
ЮЗАФ РАК: Дык хто зарэзаў Самсона? Хто сядзеў у маёй шафе?
БРУНА ЧЫК: Гэтага прывіда вы мусіце злавіць самі. Я браўся знайсці ўкрадзеную рэч.
ЮЗАФ РАК: Я толькі і раблю, што лаўлю яго, але хітры, гад, заўсёды мяне апярэджвае.
БРУНА ЧЫК: А вы самі апярэдзьце яго.
ЮЗАФ РАК: Якім чынам?
БРУНА ЧЫК: Ператварыцеся ў прывіда.
ЮЗАФ РАК: Што мне — накінуць на галаву прасціну і начамі тупаць на калідоры?
БРУНА ЧЫК: Не, я параю іншае. Зрабіце, як у той казцы, калі салдат кладзецца ў труну вурдалака і чакае яго вяртання.
ЮЗАФ РАК: Трэба ісці на могілкі і выкопваць труну?
БРУНА ЧЫК: Не, ваш прывід прыходзіць не з могілак.
Стук у дзверы. Заходзіць Зося.
ЗОСЯ: Пане Чыку, пан пісьменнік залез на гарышча і не можа спусціцца.
БРУНА ЧЫК: То перадайце яму наверх пляшку гарэлкі. Відаць, у яго скончыўся запас энергіі.

Сцэна 31
Гасцёўня. За сталом гуляюць у „66“ Адам Шышдудар, ксёндз, Агата, Разалля Рак. Бруна Чык разглядае талеркі на буфеце. Вадзімір Даўгалевіч сядзіць збоч на фатэлі.
АДАМ ШЫШДУДАР: Габлюйце, пане ксёнджа.
АГАТА РАК: Айцец не дастаткова прагматычны, каб добра гуляць у карты. Але з ягонай лёгкай рукі заўсёды прыходзяць аб’яўкі.
РАЗАЛЛЯ РАК: Адкрываць не трэба. Козыр віна. І вось вам віновы туз.
КСЁНДЗ: Не гнявіце Бога, адразу ў казыры.
Вадзімір бярэ са століка пустую чарку, змрочна зазірае ў яе і ставіць назад.
БРУНА ЧЫК *(бярэ ў рукі талерку)*: Усё ж пагадзіся, Вадзіміру, Кузняцоўская парцаляна не мае еўрапейскай вытанчанасці. Шмат азіяцкай дурасці — птушак у золаце. А вось талерка ад Гарднера выглядае больш сціпла і прыстойна.

ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: І як ты можаш гэтым цікавіцца, табе чарапкі даражэйшыя за прывіда. Яго лавіць трэба. Ты талеркі разглядаеш, пан палкоўнік пакуе партфель, сабраўся ехаць да натарыюса ў Вільню. І Зоська зноў буфет зачыніла.

Сцэна 32

Тыя ж. Заходзіць Юзаф Рак з сакваяжам. Ён нападпітку.

ЮЗАФ РАК: Ненадоўга развітваюся з усімі. Справы вымушаюць ехаць. Спадзяюся быць тут ужо заўтра на вячэру.

ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Мо вас падвезці да вакзалу? У буфеце б узялі па чарцы на развітанне.

ЮЗАФ РАК: Дзякую, але мяне адвязе Ёсель, ён ужо заклаў брычку.

АГАТА РАК: Патэлефануй мне з Вільні. Я нагадаю табе, каб купіў у цукерні за Вастрабрамскай бляшанку дацкага печыва.

Юзаф Рак цалуе жонку. Выходзіць.

АГАТА РАК *(раскладае карты)*: Пасля цяжкай ночы хіліць у сон.

Заходзіць Зося, адмыкае буфет.

ЗОСЯ: Паехалі ўжо.

АГАТА РАК: Зося, заўтра перасадзіш з аранжарэі кветкі. Разбітае сэрца на магілу Самсона. *(Выходзіць.)*

Сцэна 33

Гасцёўня. Бруна Чык і Вадзімір Даўгалевіч.

БРУНА ЧЫК: А ты, Вадзіміру, спаць не збіраешся? Сённяшняя ноч мусіць быць спакойнаю.

ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Сёння поўня на небе, самы час для з'яўлення прывіда.

БРУНА ЧЫК: Прывіда будзе лавіць палкоўнік.

ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Ён жа з'ехаў ды не ведае, як лавіць. А я вось падрыхтаваў бутэльку свянцонай вады і вяроўку. Сёння ў бібліятэцы кніжку знайшоў, там адзін святар — Мацапура — піша, што, калі на прывіда пырснуць свянцонай вадою, то ён зматэрыялізуецца, і яго можна будзе браць голымі рукамі *(папраўляе павязку на галаве)*.

БРУНА ЧЫК: Паслухайся мяне, хадзем спаць.

ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Ані ў якім разе.

БРУНА ЧЫК: Я настойваю.

ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Ну, добра, калі ты так настойваеш, то

хадзем. Усё адно без мяне ніхто не зловіць.

Сцэна 34

Гасцёўня. Азіраючыся, заходзіць Юзаф Рак, крывіцца на гук уласных крокаў, сядае ў фатэль, сцягвае боты, дастае з буфета пляшку, ставіць у бот. Крадком ідзе на калідор.

Сцэна 35

Спачывальня. Агата Рак у ложку. Без стуку адчыняюцца дзверы, заходзіць Прывід.

АГАТА РАК: Ты казаў, што прыйдзеш пазней. Але я ўсё адно зачакалася.

Па падлозе слізгае цень ад Прывіда.

АГАТА РАК: Хадзі да мяне. У цябе прыемныя прахалодныя рукі. Як я кахаю цябе.

Прывід і Агата Рак мілуюцца.

Сцэна 36

Спачывальня. Тыя ж. Зноў без стуку крадком прачыняюцца дзверы. З-за іх ставіцца на падлогу спачатку адзін бот, потым другі. Прывід хаваецца пад ложкам. Агата Рак удае, нібы спіць. Следам за ботамі з'яўляецца Юзаф Рак, дастае пляшку, выцягвае шаблю, прыглядаецца да жонкі. Хаваецца ў шафу. Адтуль чуецца бульканне.

Сцэна 37

Калідор. Вадзімір Даўгалевіч з грамнічнаю свечкаю, вяроўкай на плячы і бутэлькай свянцонае вады. Падыходзіць да дзвярэй гаспадарскай спачывальні, прачыняе дзверы, зазірае за іх.

Сцэна 38

Спачывальня. Агата ў ложку ўдае, што спіць. Юзаф Рак храпе ў шафе. Прывід пад ложкам. Вадзімір Даўгалевіч прыслухоўваецца. Ідзе да шафы, адчыняе — скурчыўшыся ў кутку з шабляй у руках, раскрыўшы рот, храпе Юзаф. Пустая пляшка паміж босых ног. Вадзімір адстаўляе свечку, рыхтуе вяроўку і прымерваецца, як паліць свянцонай вадой. Палкоўнік раптоўна расплюшчвае вочы. Вадзімір Даўгалевіч хапае бутэльку за рыльца і б'е Юзафа Рака па галаве. Гасне свечка, чуецца роў палкоўніка, перакульваецца мэбля.

АГАТА РАК *(лямантуе)*: Ратунку! Зося! Пане Бруна! Гвалт! Забіваюць! Ратуйце! Ойча Казіміру!
ЮЗАФ РАК: Я табе дам па шафах лазіць! *(Скручвае Вадзіміра Даўгалевіча вяроўкаю.)* Ды сціхні ты, дурніца!

Сцэна 39

Спачывальня. Тыя ж. На лямант Агаты Рак з'яўляецца Бруна Чык, за ім Зося, Адам Шышдудар, Разалля Рак, ксёндз, Ёсель Цэслер.

ЮЗАФ РАК: Вось, скруціў прывіда. Хацеў мяне забіць. Сяджу я, пільную ў шафе, а ён мяне бутэлькай па галаве. Ну, я яго, натуральна, і скруціў.
ЗОСЯ: А Божачка!
РАЗАЛЛЯ РАК: Юзаф зноў сеў на каня.
АДАМ ШЫШДУДАР: Вы ўжо вярнуліся?
Юзаф Рак бярэцца за шаблю.
БРУНА ЧЫК: Пане палкоўніку, гэта не прывід, гэта Вадзімір.
ЮЗАФ РАК: А на халеру бутэлькай па галаве?
БРУНА ЧЫК: Ён думаў, што вы — прывід.
ЮЗАФ РАК: Хіба я падобны?
БРУНА ЧЫК: Вы ж бачылі самога сябе ў шафе. *(Развязвае Вадзіміра Даўгалевіча.)* Казаў я табе — кладзіся спаць.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Усё як мінулым разам. Чую — нехта ў шафе сядзіць. Адчыняю — прывід. Вы ж, пане палкоўніку, з'ехалі, чаго вам у шафе сядзець. Бяру бутэльку са свянцонай вадой і думаю: вось дам зараз чорту па рагах.
ЮЗАФ РАК: А дзе ж прывід?
КСЁНДЗ: Я ўпэўніўся, у доме сапраўды пасяліўся Д'ябал. Мушу тэрмінова выехаць да біскупа.
БРУНА ЧЫК: Так, хто б ён ні быў, але я ведаю сродак, як пазбавіцца ад яго. Пакіньце нас з ксяндзом на пару хвілін адных у спачывальні, і мы здзейснім абрад выгнання Д'ябла.
АДАМ ШЫШДУДАР: Няўжо, пане Чыку, вы за гэтыя дні ўверылі ў Бога?
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Ты ж ніколі не верыў.
АГАТА РАК: Вы лічыце, прывід і цяпер у пакоі?
БРУНА ЧЫК: Я ведаю, ён сярод нас. Спадзяюся, пан ксёндз пацвердзіць мае словы.
КСЁНДЗ: Калі ласка, панове, трэба хутчэй пакінуць пакой, мы мусім пачынаць.

ЮЗАФ РАК: Ды рабеце, што хочаце, толькі каб ніхто болей бутэлькамі па галаве не біў *(выходзіць)*.

Сцэна 40

Спачывальня. Бруна Чык і ксёндз.

КСЁНДЗ: Вы сапраўды паверылі ў прывіда?

БРУНА ЧЫК: Я бачыў цуд: вы з'явіліся ў спачывальні, хоць і не заходзілі ў яе.

КСЁНДЗ: Вы хочаце сказаць, я прайшоў скрозь сцяну?

БРУНА ЧЫК: Не, вы вылезлі з-пад ложку. На крык я прыбег першы і стаў у дзвярах. Паўз мяне вы не праходзілі. Шафа занятая, вольна толькі пад ложкам. Заўважце, я спецыяльна не кажу — у ложку.

КСЁНДЗ: Дык вы ўсё ведаеце?

БРУНА ЧЫК: Мне ўсё было ясна з першага дня. Аднак не ў маіх правілах выкрываць каханкаў. Я спадзяваўся: муж зловіць вас сам. Але калі ён няздатны нават на гэта, то няхай верыць — у яго доме быў прывід.

КСЁНДЗ: Чалавек слабы, і спакусы часам мацнейшыя за яго.

БРУНА ЧЫК: Для мяне такія паводзіны больш зразумелыя, чым цэлібат. Вось вам аркуш, а чырвоны атрамант прывіда я прыхапіў у вашым пакоі.

КСЁНДЗ: Што пісаць?

БРУНА ЧЫК: Прывід ператварыўся ў святога духа і больш ніколі не з'явіцца ў спачывальні. Дадайце: з'яўленне прывіда — пакаранне палкоўніку за сквапнасць, хай дасць Разаллі добры пасаг.

КСЁНДЗ: Прывід раней не пісаў такіх доўгіх цыдулак.

БРУНА ЧЫК: Нічога, гэта развітальная.

Сцэна 41

Віленская кватэра Бруна Чыка. Бруна Чык і Вадзімір Даўгалевіч разбіраюць пошту. Бруна праз павелічальнае шкло разглядае кляймо на талерцы.

БРУНА ЧЫК: Баварцы пачалі дамешваць свінец у парцаляну. У тым, што нямецкі посуд не б'ецца, адчуваецца нешта дурное.

ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Мілітарызацыя дайшла да талерак.

БРУНА ЧЫК: А я лічу, пачалася з іх. Усе войны пачыналіся з-за пустых талерак.

ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Пані Твардоўская піша, што муж

вярнуўся сам, але просіць заняцца іншай справай, у яе ў доме завялася нячыстая сіла, якая крадзе наліўкі ды чыніць іншую дробную шкоду.
БРУНА ЧЫК: Скора пан Твардоўскі зноў уцячэ ад жонкі.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Ліст з Гайцюнішкаў ад Адама і Разаллі. Запрашаюць нас на вяселле. Вянчае іх пробашч Казімір. Дзякуюць за ўсё табе і прывіду. Пішуць, што пасля перажытага пані Агата зрабілася вельмі набожнай і два разы на тыдзень ездзіць да касцёла. Чым пан палкоўнік вельмі ўсцешаны.
БРУНА ЧЫК: Цяпер ахмістрыні айца Казіміра будзе здавацца, што ў плябаніі завёўся жаночы прывід.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Дарэчы, ты мне дагэтуль не растлумачыў, адкуль у шафе ўзяўся скрываўлены труп і куды ён падзеўся?
БРУНА ЧЫК: Я думаў, ты ведаеш. Сітуацыя класічная. Муж раней на дзень вяртаецца дадому. А ў жонкі палюбоўнік — ксёндз Казімір. Святы айцец хаваецца ў шафу, а на выпадак, калі яго ўсё ж знойдзе муж, прыкідваецца трупам.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: А сабаку навошта зарэзалі?
БРУНА ЧЫК: Каб не замінаў кахацца. Палкоўнік жа яго выдрэсіраваў не толькі кабінет ахоўваць, а і цнатлівасць жонкі.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Я б не здагадаўся надзець чужы парадны мундзір і выпэцкаць твар сабачай крывёю.
БРУНА ЧЫК: Ты б сядзеў голым у шафе. І адкуль у яго растуць рогі, здагадаўся б нават палкоўнік.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Што ж ты іх адразу не раскрыў?
БРУНА ЧЫК: Я чакаў, калі хто з каханкаў паспрабуе вынесці сабаку з дому. Але ты паводзіў сябе звышактыўна, і няведама было, з-за якой парцьеры вывалішся наступным разам.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Мог бы і мне сказаць.
БРУНА ЧЫК: Я шкадаваў тваёй веры ў прывідаў.
ВАДЗІМІР ДАЎГАЛЕВІЧ: Што адкажам Адаму і Разаллі? Мы едзем на вяселле ў Гайцюнішкі?
БРУНА ЧЫК: Я — не. Маёнткі з прывідамі мяне больш не цікавяць.
Піцунда. 12 жніўня 1992 году

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 29-08-2000
[image]

[image]

A R C H E

A d a m H l o b u s № 5 (10) – 2000

[image]

[image]

[illegible] 2000

[image] [image] [image]

Уладзімер Караткевіч
Альбомная лірыка

Геніяльнае наследаванне Адаму Глобусу

Начны — у пражэктарах — стадыён
Рыкаў
І неба бароў кулакамі
Кучаравых і лысых галоў.
26 сакавіка 1982 г.
20 гадзін 48 хвілін 39 секунд

* * *

Кару з дрэва
Жару.
1982

* * *

Пішу табе ў альбом:
Удар у сценку лбом,
І ад такога болю
Ўспомніш мяне паняволі.
1982

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 5 (10) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **29-08-2000**
[image]

Галіна Булыка
Стары Менск

Адаму Глобусу

1. Траецкае прадмесце
Прыступкі. Кавярня маленькая.
Утульны і мяккі вітраж.
Прасценкі, засланыя ценямі.
Над каваю дыму віраж.
Да кубачка чорнае кавы
Я цукру кавалак нясу,
…Салодзіць смак часу гаркавы
Адноўленай вечнасці сум.

2. Касцёл
Двор без шуму, без твараў, без дрэў
Двор, што вокнамі ў вокны глядзеў,
Межы-гмахі да хмараў прасцёр
І схаваў у шэрым змроку касцёл.
Паўразбураны і паўжывы,
Ён глядзеў у завулак крывы
З-за каменнасці цьмянай дамоў.
Я хадзіла тут столькі разоў.
І не ведала, што за сцяной
Век семнаццаты гранню жывой

Заблішчыць.
Хараства адкрыццё.
Узыходзіць у неба касцёл.

3. Верхні Горад
Паўзе па бруку цішыня
І разбіваецца аб крокі.
Кладзецца снег на плед шырокі,
Каб крылы зноў вясной узняць.
А з вуліц шум ледзь чутны йдзе,
Такі нязвычны і далёкі,
Па верхнім горадзе,
Дзе вокны,
Нібыта вочы тых людзей,
Што тут жылі.
Цябе сустрэне
Цвік рэха, убіты ў цішыню,
І водблеск даўняга агню,
І век чужы паўзмрочным ценем.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]

№ 5 (10) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **29-08-2000**
[image]

[image]

A R C H E

[image]

A d a m H l o b u s

№ 5 (10) – 2000

[image]

Пачатак Навіны Форум Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]

[image]

[image]

[image]

» да Зьместу «

[image] [image] [image]

Леанід Дранько-Майсюк Альбомная лірыка

---

* * *

Адаму Глобусу

Панчошкі, паяскі, сукенкі
Скідалі сціплыя студэнткі,
І сціпласць гэтае натуры,
І пачуццёвыя віхуры
Адам, наследуючы Мунку,
Пісаў у стылі пацалунку.
25.12.1984

* * *

Адаму Глобусу

Будзённы пакіну пакой,
Да гонкага неба збяруся —
Да медных балот і да хвой,
Што толькі ў маёй Беларусі.
Дзень добры, апчолены сад,
Як вольна табе пры дарозе!
Твой сумна-святочны пагляд
Сугучны стральцоўскай прозе.
Цябе праміну, адплыву
І страчу прысутнасць явы,
І раптам убачу царкву,

І голас пачую ласкавы:
— Ідзі, брат заходні, сюды…
Расчыніцца светлая брама…
Свой дух адмяжуй ад бяды
Іконамі рускага храма…
І голас пачнецца другі,
Пад сонцам касцёл запануе,
Зірну на яго з-пад рукі
І словы другія пачую:
— Ідзі, брат усходні, да нас…
І думкі кантычкай здаволі,
І самы свой лепшы час
Ты стрэнеш на нашым полі…
Ды вось яно зноў: стагі,
Балоты, зязюля кукуе…
Ні першы і ні другі —
Ніякі ўжо голас не чую.
Іду сабе, як ішоў,
Да гонкага неба, і плачу…
І ў цемры палескіх лясоў
Свой храм беларускі бачу.
06.11.1981

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 5 (10) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **29-08-2000**
[image]

Камасутра

Палкі мужчына

Уводзіны

Камасутру, павучаньне аб каханьні, дзьве тысячы год таму на туманных берагах Гангу ў Бэнарэсе склаў мудрэц Ватсяяна, споўніўшы так частку сваіх рэлігійных абавязкаў. Напісаны ў санскрыце арыгінал налічвае дзьве тысячы дзьвесьце пяцьдзясят вершаў (васьміскладовых чатырохрадкоўяў). Па сутнасьці, *Сутра* — гэта збор афарызмаў, які найкарацейшым чынам выяўляе прынцыпы рэчаў. У вуснай традыцыі, што пераважала ў ранейшыя часы, *Сутра* забясьпечвала найпрасьцейшы спосаб захаваньня ведаў. Усё ж зь цягам часу ўзьнікла неабходнасьць гэты згустак ідэяў разьвіць у камэнтарох (як у выпадку *Джаямангалы*, Яшадаравага камэнтару X ст. н.э.), на якія абапіраліся пазьнейшыя аўтары, каб дадаць сваім дасьледзінам формы і глыбіні.

Камасутра да сёньня застаецца адной з найвялікшых сусьветных кніг, клясычным падручнікам каханьня і падсумаваньнем багатай традыцыі індыйскай эротыкі. Да сучаснага сьвету С*утра* зьвяртаецца зь весткаю, што „кожны чалавек мае права на шчасьце і сэксуальную раўнавартасьць“. Будучы адной з найранейшых спробаў дэфініяваць здаровую натуральнасьць дачыненьняў паміж мужчынам і жанчынай, *Камасутра* з абяззбройвальнай шчырасьцю ды адкрытасьцю і бязь сьледу сораму дасьледуе аптымальны спосаб паводзінаў пры пошуку партнэркі і мноства шляхоў дасягненьня

сэксуальнага задавальненьня такім чынам, каб вашая жонка і каханка былі ашчасьліўленыя.
У *Камасутры* ня трэба бачыць кнігу выключна пра славутыя „шэсьцьдзесят чатыры позы“, — гэткая этыкетка была перадузята налепленая на гэты твор праз колькасьць апісаных у ім любоўных пазыцыяў. Ватсяяна ўсьведамляў складанасьць свайго заданьня, і таму напісаў: „Гэтая кніга не павінна ўжывацца адно як сродак дзеля спатолі нашых прагненьняў. Чалавек, знаёмы з асноўнымі прынцыпамі навукі аб каханьні, дбае пра сваю бездакорнасьць (*дхарма*), здароўе (*артха*) і цялеснае задавальненьне (*кама*), а таксама шануе звычаі іншых людзей, і таму ён, безумоўна, здольны апанаваць свае пачуцьці. Карацей кажучы, мудры й дасьведчаны чалавек, які рупіцца пра свае *дхарму*, *артху* і *каму* ў такой ступені, каб ня стацца рабом сваіх жарсьцяў, дасягне посьпеху ўва ўсім, за што б ён ні ўзяўся“.
Кама, індуісцкі бог каханьня, увасабляе сабой ня толькі сэксуальную асалоду, а ўсе ўцехі зь пяці пачуцьцяў: са слыху, зроку, нюху, дотыку й смаку. Усякая рэч, датычная да пачуцьцяў, можа прынесьці чалавеку неабмежаванае шчасьце. Таму шэсьць разьдзелаў з усіх сямёх зьвязана з паводзінамі чалавека ў супольнасьці.
Таемная тэхніка палавога акту або цялесны экстаз ніколі не павінны адасабляцца ад душэўных перажыванняў. Таму мэта гэтае кнігі — зьвярнуць вашую пільную ўвагу на ўцехі, якія вас акаляюць, бо вашае жыцьцё працякае на незвычайна багатай магчымасьцямі плянэце.

Віды каханьня
Паводле *Камасутры* можна адрозьніць сем відаў каханьня:
• Калі вы даўно ўжо кахаеце сваю абраньніцу, замірыліся зь ёй пасьля сваркі або хтосьці з вас пасьля доўгай адсутнасьці вярнуўся дадому, гэта называецца *„каханьне зь любасьці“*. Тады вы можаце ўзаемна цешыцца гэтулькі і гэтак, як вам ласка.
• Калі адзін з вас закахаецца сьпярша, а другі пазьней, тады міласьць, што з гэтага паўстане, называецца *„каханьнем даданым“*.
• Калі вы сустракаецеся толькі дзеля спатолі свае сэксуальнае прагі або дзеля магчымасьці скарыстаць усе шэсьцьдзесят чатыры спосабы палавога кантакту, тады вашы любошчы

называюцца *„штучным каханьнем“*. У такім разе не забудзьцеся скарыстаць усе спосабы й сродкі, што прыводзяцца ў *Камасутры*.

• Калі ад пачатку і да самага канца дачыненьняў з адной жанчынай вы няспынна думаеце аб іншай, якую сапраўды кахаеце, ваша любоў мае назоў *„каханьня перанесенага“*.

• *Камасутра* пазірае звысоку на дачыненьні мужчыны з жанчынай, якая мае значна ніжэйшае за яго грамадзкае становішча і інтэлектуальнае разьвіцьцё (напрыклад, з ваданоскай або служанкай) і паймяноўвае іхную сувязь *„каханьнем эўнуа“*. Калі ўсё ж вы апынецеся ў такой сытуацыі, памятайце, што вам ня варта цалаваць гэтую жанчыну і залішне да яе датыкацца.

• Любоўная сувязь куртызанкі зь вяскоўцам і гарадзкога чалавека зь сялянкай або дзікункай называецца *„каханьнем ілжывым“*.

• Любоўнае ж дачыненьне каханкаў, якіх адно да аднаго неадольна цягнула, і якія злучыліся, каб спатоліць сваю жарсьць, называецца *„каханьнем спантанным“*.

Любоўныя сваркі

Сваркі паміж каханкамі абнаўляюць каханьне, бо любоўная сутычка пікантна прыпраўляе іхныя дачыненьні. Цалкам надзейны спосаб распаліць у жанчыне гнеў — гэта назваць яе імем вашай былой каханкі пад час палавога акту, або нават пры яго кульмінацыі. Калі вы зьвернецеся да гэтага сродку, будзьце асьцярожныя, бо можна чакаць, што жанчына вырыне зь сябе лавіну абразаў або ператворыцца ў ашалелую фурыю. Тады яна можа растаптаць вашыя кветкі або сарваць зь сябе ўсе падораныя вамі аздобы.

У такой сытуацыі будзьце да яе ласкавы, і калі яна ў прыпадку качаецца па падлозе, паспрабуйце яе падняць і пакласьці ў ложак. Будзьце, аднак, падрыхтаваныя да таго, што пры падыманьні з падлогі яна можа ўпіцца пазногцямі вам у твар або выдраць у вас пасму валасоў, а пры пераносе ў ложак можа пачаць біцца нагамі.

Калі ж яна ўрэшце сядзе перад дзьвярыма й пачне хліпаць, падыдзеце да яе з супакойлівымі словамі й жэстамі, але майце на ўвазе, што спачатку яна вас мусіць адпрэчыць. Паступова, аднак, яна паддасца, скурчыцца ў вас у абдоймах і будзе

ахвочая кахацца ізноў.
Жонкі ў такіх выпадках зазвычай у абурэньні сыходзяць у іншы пакой і замыкаюцца. Але не панікуйце: раней ці пазьней яны вяртаюцца і пачынаюць сварку зноў ад пачатку!
Аднак калі ўгневаная жанчына вас пакіне і сыдзе дадому, гэта нагода біць трывогу. Тады не марудзьце ні хвіліны і паспрабуйце яе ўлагодзіць пры пасярэдніцтве сваіх пасланцоў, дзеля чаго можна скарыстацца паслугамі сьвецкага чалавека, сямейнага сябра або блазна. Празь нейкі час жанчына вернецца і зноў зойме сваё месца ў вашым ложку.
Добра засвоіўшы палажэньні *Камасутры*, вы заўжды зможаце атрымаць ад жанчыны ўсё, што толькі прыйдзе вам да галавы. Ніводны мужчына ня можа спадзявацца на шанаваньне ў грамадзе іншых мужчынаў, калі ён не валодае мастацтвам каханьня, пра якое трактуе *Камасутра*. І напраўду, хіба можна знайсьці лепшы спосаб, каб выказаць сваю любоў да іншага чалавека?

Любоўныя абдоймы
Аўтары старажытных твораў аб эротыцы кажуць, што абазнаны ў справах каханьня мужчына мае добра валодаць шасьцюдзесяцьцю чатырма спосабамі сэксуальнае сувязі і яшчэ шасьцюдзесяцьцю чатырма мастацтвамі й навукамі жыцьця. Багбраўевы вучні цьвердзяць, што гэтая сума паводле васьмі любоўных дзеяньняў падзяляецца на восем пададдзелаў: абдоймы, пацалункі, драпаньне пазногцямі, любоўныя ўкусы і ўдары, любоўныя выкрыкі, любоўныя пазыцыі, жанчына ў актыўнай ролі і аральны сэкс.

Спосабы абдыманьня
На самым агульным узроўні мы адрозьніваем чатыры тыпы абдоймаў, а менавіта датычныя, налягаючыя, цяручыя і прыціскаючыя. На ступень іхнай палкасьці паказвае ўжо іх назва.
• Калі вы пад нейкаю маркай наблізіцеся да жанчыны і зьлёгку датыкнецеся да ейнага цела або яна з вамі сыдзецца ў бязьлюдным месцы і колькі разоў вас зачэпіць рукой, гэта *„абдоймы датычныя“*.
• Калі жанчына, якая з вамі ў зацішку бавіць час, нахіліцца, нібы падымаючы нешта, што толькі што ўпусьціла, і пры гэтым

наляжа на вас грудзьмі, гэта *„абдоймы налягаючыя“*. Калі вам хопіць спрыту, можаце яе ў гэты момант крадком палашчыць. Перш чым пераходзіць да беспасярэднага кантакту, да якога належаць трэці й чацьвёрты тыпы абдоймаў, трэба стаць каханкамі.

• Калі вы ідзеце поруч упоцемках ці праз густа залюднены рынак або, урэшце, наадварот паўзь месцы зусім бязьлюдныя і цярэцеся сваімі целамі адно аб аднога, вядзецца пра *„абдоймы цяручыя“*.

• Калі адзін каханак прыціскае другога да сьцяны або да слупа, ды з такой жарсьцю, нібы хоча пераняць дыханьне, або пэўна ахоплівае другога вакол рукамі, гэта *„абдоймы прыціскаючыя“*.

Відавочна, што апошнія два тыпы абдоймаў могуць выкарыстоўваць толькі партнэры, якія ўжо добра знаюцца. Дасьведчаныя каханкі таксама могуць паспрабаваць чатыры спосабы абдоймаў пры палавым кантакце, а менавіта спосаб перавітай ліяны, лазаньня на дрэва, спосаб канапель і рысу ды малака й вады. З гэтых чатырох першыя два тыпы абдоймаў робяцца стоячы.

• Калі жанчына на вас вісіць так, як абвіваецца ліяна вакол камля, нецярпліва прыцягваючы вашую галаву ў надзеі, што вы ёй падорыце палкі пацалунак, і паглядаючы на вас зь любоўю ў вачох, гэта *„абдоймы перавітай ліяны“*.

• Калі жанчына адной нагой стаіць у вас на ступні, а другой абапіраецца на ваша сьцягно і абхоплівае вас, як камель, ціха агукаючы, нібы выпрошваючы пацалунак, гэта абдоймы, называныя *„лазаньне на дрэва“*.

Наступныя два віды абдоймаў маюць адбывацца толькі ў зручным ложку, бо часта без папярэджаньня пераходзяць у палавы акт.

• Калі каханкі разам ляжаць у ложку зь пераплеценымі рукамі й цяруцца адно аб другога ўсім целам, тымчасам як іхныя рукі знаходзяць на целе другога ўсё новыя і новыя чульлівыя месцы, а іхныя вусны імкнуцца злучыцца ў пацалунку, гэта *„абдоймы канапель і рысу“*.

• Калі жанчына сядзіць у вас на каленях тварам у твар да вас і, абхопліваючы вас сьцёгнамі, націскае сваім падчарэўем на вашае ды нагамі цісьне вас да сябе, не зважаючы нават на боль, гэта называецца непарыўныя *„абдоймы малака й вады“*.

Суварнанабха дадае яшчэ чатыры тыпы абдоймаў, якія

падзяляе паводле частак цела, што пры гэтым задзейнічаныя, на абдоймы сьцёгнамі, падчарэўем, грудзьмі і ілбамі:
• Калі адзін каханак моцна сьціскае нагамі сьцягно другога і не хавае задавальненьня, якое яму гэта прыносіць, гэта *„абдоймы сьцёгнамі“*.
• Калі жанчына падымае сьцёгны і прыціскае сваё падчарэўе да мужчынскага, драпаючы партнэра пазногцямі, цалуючы яго і юрліва трасучы распушчанымі валасамі, гэта *„абдоймы падчарэўем“*.
• Калі жанчына абхоплівае мужчыну і прыціскаецца да яго грудзьмі, гэта *„абдоймы грудзьмі“*.
• Калі каханкі ўпіваюцца адно ў аднаго вачыма, цяруцца насамі, прасочваюць вуснамі лініі твараў партнэра і прыціскаюцца адно да аднаго ілбамі, гэта называецца *„абдоймы ілбамі“*; яны дазваляюць абаім каханкам дасягчы аднолькавага задавальненьня.
Старавечныя аўтары кажуць, што абдоймы прыводзяць у рух старадаўны мэханізм жарсьці, таму ў многіх людзей распаліць пажаду можа нават адна згадка пра іх. А як толькі жарсьць шугне, усякі забываецца на ўсе правілы, пра якія вучыць *Камасутра*.

Моц пацалункаў
Пацалункі, укусы і драпаньне пазногцямі ўтвараюць прэлюдыю палавога акту, бо павышаюць палкасьць каханкаў. Аднак *Камасутра* вучыць, што, як толькі вас ахопіць любоўны ўраган, усе падрыхтоўчыя крокі акупяцца.
Не хвалюйцеся, калі вы маеце правесьці ноч з цнатліваю дзеўчынай. Найперш супакойце і разьнявольце яе пацалункамі ды лёгкімі ўкусамі, а калі яна вам пачне адплочваць тым самым, прыступайце да любоўнай прэлюдыі, каб распаліць ейную жарсьць.

Звабліваць вуснаў
Дзе можна цалаваць? Амаль ува ўсе месцы! Калі хочаце зрабіць асаблівае ўражаньне, пакрыйце пацалункамі бровы, вочы, шчокі, шыю, грудзі, смочкі і вусны сваёй каханкі і не пакіньце без увагі нават нутро ейнага рота.
Калі ваша абраньніца яшчэ маладая, раім вам выпрабаваць тры тыпы лёгкіх пацалункаў, а менавіта пацалунак паветраны,

трапяткі і датычны:
• Калі дзяўчына сваімі вуснамі мільгом дакранецца да вашых, гэта *„пацалунак паветраны“*.
• Калі дзяўчына на ймгненьне забудзецца на сваю сарамлівасьць, заплюшчыць вочы, схопіць вашыя рукі і дазволіць вам лёгкім прыкусам ухапіць яе ніжнюю губу, гэта называецца *„пацалунак трапяткі“*.
• Калі ейны язык праз кароткія інтэрвалы пранікае ў ваш прагны рот, гэта называецца *„пацалунак датычны“*.
Апрача таго існуе яшчэ чатыры віды пацалункаў, якія падзяляюцца паводле вугла нахілу і ціску вуснаў:
• Калі вашыя вусны сустракаюцца ўпрост, гэта *„пацалунак роўны“*.
• Калі вашыя галовы зьлёгку нахілены, гэта *„пацалунак косы“*.
• Падняўшы і адкінуўшы назад галаву вашай каханкі, вы цалуеце яе *„пацалункам падымаючым“*.
• Калі ж вы яе цалуеце палка і зь нястрымнаю жарсьцю, ідзецца пра *„пацалунак уціснуты“*.
Часам называецца й пяты від пацалунку, пры якім вы мусіце ўзяць пальцамі ейныя вусны, пяшчотна іх пацалаваць, а потым пэўна сьціснуць сваімі вуснамі. Гэта называецца *„пацалунак пэўна ўціснуты“*.

Гульні з пацалункамі
Дзеля распальваньня жарсьці каханкаў старавечныя тэксты раяць розныя гульні з пацалункамі, якія здольныя расьцягнуць любоўную ўцеху на гадзіны.
Напрыклад, паспрачайцеся са сваёй каханкай, хто з вас раней схопіць ніжнюю губу другога, не скарыстоўваючы пры гэтым нічога, апрача сваіх вуснаў. Прайграўшы, жанчына мае ўдаваць, што яна зараз заплача, паскардзіцца, што яе падманулі, і ўрэшце яна папросіць згуляць яшчэ раз. Калі вы адмовіце, яна можа абсмоктваць ваш нос або шчыпаць вас за яго так доўга, пакуль вы не пагодзіцеся. Калі ж яна прайграе і ў другі раз, яна, прыкінуўшыся яшчэ больш засмучанай, чым раней, паспрабуе зьнянацку злавіць вашу губу і зьлёгку сьціснуць яе зубамі. Потым яна будзе скакаць ад радасьці й цешыцца са сваёй перамогі, тымчасам як бровы і вочы будуць кідаць вам выклік на новы турнір. Пры надзвычай высокай ступені ўзрушанасьці пры гэтай гульні вы можаце скарыстоўваць

таксама пазногці, зубы і пальцы.

• Калі вы цалуеце верхнюю губу сваёй каханай, тымчасам як яна ўсмоктвае вашую ніжнюю губу, гэта называецца *„пацалунак верхняй губы“*.

• Калі ж вы сваімі вуснамі ўцягваеце абедзьве яе губы, гэта *„пацалунак ахопны“*.

Пры абодвух згаданых пацалунках каханкі могуць дасьледаваць свае раты языкамі, што затым лёгка перарастае ў гульню, якую старавечныя аўтары называлі *„двубой языкоў“*. Падобныя бітвы могуць учыняцца таксама вуснамі і зубамі.

Таксама пацалункі можна разьдзяліць на чатыры тыпы, у якіх вусны, зубы і язык утвараюць адзінства. Паводле частак цела, для якіх яны прызначаны, мы адрозьніваем пацалункі лёгкія, мерныя, ціскаючыя і ўцягваючыя.

• *Лёгкі пацалунак* прызначаны смочкам і месцам, дзе канцавіны партнэркі сыходзяцца зь целам. Адначасова зь ім гэтыя месцы вы можаце далікатна пакусваць і гладзіць языком.

• *Мерны пацалунак* адведзены шчокам, грудзям, жывату і клубам — пульхным, мяккім і пругкім месцам, — таму тут вы можаце скарыстаць зубы бяз боязі, што прычыніце сваёй каханцы нейкі адчувальны боль.

• Пры *ціскаючым пацалунку* ваш язык дасьледуе каханчына цела, абводзіць ейныя грудзі і з задавальненьнем затрымоўваецца на ейным пупку.

• Пры *ўцягваючым пацалунку* вусны ахалоджваюць і загойваюць драпіны, што пакінулі на ейным целе вашы пазногці.

Калі жанчына цалуе вас сьпячага, каб абудзіць вашае жаданьне, гэта называецца *„распальваючы пацалунак“*.

Пацалунак, якім жанчына вас узнагародзіць, калі вашую ўвагу займае нешта іншае або калі вы зь ёй пасварыліся, мудра называецца *„пацалункам адцягваючым“*.

Калі вы прыйдзеце дадому позна ўночы і пяшчотна пацалуеце сваю сьпячую жонку, гэта *„пацалунак абуджаючы“*. Пры гэтым кажуць, што жанчына, пачуўшы, што вяртаецца ейны муж, можа ўдаваць сьпячую, каб пераканацца ў сапраўднасьці ягонага пачуцьця.

Калі вы хочаце выказаць каханьне жанчыне, зь якой зь нейкай прычыны ня можаце гаварыць, і пацалуеце ейнае адлюстраваньне ў вадзе ці ў люстэрку або ейны цень на сьцяне, тады гэта *„пацалунак на показ“*.

Калі ж тая самая прычына або зьбянтэжанасьць, якая ў прысутнасьці вашай абраньніцы зьвязвае вам рукі, замінае вам яе пацалаваць і вы заместа яе цалуеце дзіця, карціну або статую так, каб вашая каханка зразумела, што ў сапраўднасьці вы цалуеце яе, вядзецца пра *„пацалунак перанесены“*.
Нарэшце, калі да жанчыны, якую вы кахаеце, вы падыдзеце на людным відовішчы або начным сьвяце і спакойна пацалуеце ёй пальцы на руцэ, гэта *„пацалунак дэманстратыўны“*.
Памятайце, што мужчына, які сваё пачуцьцё не выяўляе, — яшчэ горшы, чым мужчына бессардэчны. Калі ж першы крок зробіць жанчына, адплочвайце ёй пяшчоту пяшчотай, пацалунак пацалункам, а ўкус укусам. Толькі тады любоўны агонь разгарыцца і запалае ясным полымем!

Любоўныя драпіны і ўкусы
Калі каханкамі завалодае неўтаймоўнае жаданьне, яны могуць умела выкарыстоўваць свае пазногці. Вынікі зьдзіўляюць. Пад пазногцямі спрытнай жанчыны і самы халодны партнэр адчуе, як у ім абуджаецца нечуваная ніколі дагэтуль жарсьць. Гульні з пазногцямі каханкі могуць сабе дазволіць, калі яны ў ложку разам упершыню, калі на наступны дзень адзін зь іх павінен выправіцца ў далёкі шлях або зь яго толькі вярнуўся, калі яны перад тым пасварыліся або калі жанчына крыху нападпітку.
Важна памятаць, што рабіць пазногцямі драпіны — наканаваньне палкіх натураў. Пазногці маюць быць гладкія, чыстыя і каротка падстрыжаныя, але асобы больш авантурныя могуць адгадаваць сабе доўгія пазногці і расьпілаваць іх на два ці тры кончыкі або загнуць накшталт папугайчынай дзюбы. У гульні з пазногцямі мы адрозьніваем восем спосабаў:
• Калі мужчына лёгка праводзіць пазногцямі па грудзях, шчоках або целе партнэркі так, што пасьля не застаецца сьлядоў і пры гэтым узьнікае гук, што нагадвае разрываньне ядвабу, гэта *„драпаньне гучнае“*. Найлепей яно прыдасца тады, калі вас жанчына папросіць пашкрабаць ёй сьпіну.
• Скрыўлены сьлед ад пазногця на грудзях або на шыі называецца *„паўмесяц“*.
• Калі ж скрыўленых драпінаў дзьве, і яны павернуты адна да адной, вядзецца пра *„поўню“*; аднак для гэтага спосабу драпаньня выбірайце толькі клубы, жывот і падпахі.
• Калі вы вядзеце вострым кончыкам пазногця празь нейкую

частку цела, узьнікае *„рыса“*.
• Калі драпіна паўтарае лініі грудзей або шыі, гэта *„тыгровы пазур“*.
• Калі вы ведзяце ўсімі пяццю пазногцямі праз грудзі так, каб смочка была пасярэдзіне, гэта *„паўлінавая нага“*, дасканалае выкананьне якой жанчыны вельмі цэняць.
• А паўтарыўшы такую самую фігуру (вядома, калі партнэрка настойвае) і на другой смочцы, вы зробіце *„заечы скок“*.
• Калі ж вы выведзеце на грудзях або клубах форму ліста, гэта называецца *„блакітны лётасавы ліст“*.
Перад расстаньнем таксама добры каханак ніколі не забудзе пакінуць на жаночым целе тры або нават болей драпінаў у якасьці „знакаў на памяць“.
Палымяныя каханкі могуць самі прыдумляць сабе „знакі“ для выяўленьня свайго каханьня, бо творчая фантазія закаханых ня мае ніякіх межаў. Перад гэтым, аднак, адна засьцярога: ня будзьце аж занадта творчыя на целе чужой жанчыны! Калі вы яе ўжо здабылі, мусіце быць асьцярожныя і далікатныя, таму адзнакі сваіх пазногцяў пакідайце толькі на тых месцах, дзе гэты напамін пра разам праведзены час можаце ўбачыць толькі вы і яна.

Укусы
Наконт укусаў цьвёрда запомніце адно залатое правіла: усякую частку цела партнэркі, якую можна пацалаваць, вы можаце і кусаць (за выключэньнем верхняй губы, языка і вачэй), аднак гэта патрабуе крыху больш практыкі. Укус таксама можна ажыцьцявіць васьмю асноўнымі спосабамі:
• *„Прыхаваны ўкус“* робіцца слабым ціскам зубоў, і ён выклікае толькі слабое пачырваненьне скуры. Найлепей ён прыдаецца да ніжняй губы.
• Калі зубамі вы сьцісьнеце скуру з абодвух бакоў так, што зьявіцца невялічкая прыпухласьць, гэта *„ўкус нарыўны“*.
• Дробны шчыпок двума зубамі, які пакідае толькі маленькую адмеціну на скуры, называецца *„кропка“*.
• *„Рад кропак“* узьнікае, калі ўсе зубы прыкусваюць вельмі блізка адзін ад аднога. Для гэтага выдатна прыдаюцца лоб і сьцёгны.
• Пра *„карал і самацьвет“* вядзецца тады, калі ўвадначас вы кусаеце і ўкушанае месца абсмоктваеце вуснамі. Такі ўкус

найлепей ужыць да шчок.
• Калі для ўкусу вы скарыстаецеся ўсімі зубамі, гэта *„ланцуг самацьветаў“*. Найлепш для яго прыдаюцца горла і пахі.
• *„Разарваны воблак“* — вынік нераўнамерна раскіданых сьлядоў ад зубоў, пакінутых часьцей за ўсё на грудзях.
• Толькі для вельмі палкіх каханкаў прызначаны *„грызок дзіка“*, які складаецца з густа пакладзеных доўгіх палосаў укусаў на грудзях або на плячох.
Таксама сьлядамі пазногцяў і зубоў вы можаце пазначыць розныя дэкаратыўныя прадметы або аздобы, якія носіць ваша каханая. Аднак трымайцеся меры, бо гэтым вы не даводзіце сваю моц, але даяце сьведчаньне свайго каханьня.

Любоўныя ўдары і выкрыкі
Сваркі каханкаў абнаўляюць каханьне, а сэксуальны кантакт мае характар сяброўскае сутычкі паміж мужчынскім і жаночым палавымі органамі. Любоўныя ўдары ўяўляюць сабой добрае паліва для полымя жарсьці. *Камасутра* налічвае чатыры асноўныя спосабы ўдараў: адкрытай даланёй, рубам далоні, сагнутымі пальцамі і сьцятым кулаком.
Найбольш прыдатныя месцы для біцьця — плечы, галава, сьпіна, клубы, тулава і ямка паміж грудзей. Ясна, што некаторыя ўдары — або нават усе — прычыняюць рознай ступені боль і выклікаюць розныя болевыя і экстатычныя выкрыкі. Таму можна адрозьніць восем відаў выгукаў, якімі вам жанчына паказвае, як далёка вы прасунуліся ў распальваньні ейнае жарсьці.
• Воклічам *„гім“* называюцца ўздыхі.
• *„Голасам грому“* абазначаецца хрыпеньне.
• *„Буркаваньне“* імітуе галуба.
• *„Хліпаньне“* вырываецца зь ейнага горла пад час аргазму.
• Вокліч *„сут“* абазначае сапеньне.
• Вокліч *„пат“* падобны да трэску бамбуку, які расшчапляецца.
• Вокліч *„плят“* нагадвае ўсплёск рыбкі ў вадзе.
• Выгукі кшталту *„Мама мая!“*, *„Яшчэ!“*, *„Годзе!“*, *„Пакінь мяне!“*, або нават *„Цудоўна!“* ці *„Хутчэй!“*.
Калі вы здатны каханак, трымайце такі рытм удараў, каб выкрыкі вашай каханкі ўвесь час нарасталі і пачашчаліся. Сваім крыкам жанчына таксама можа імітаваць галуба, зязюлю, туркаўку, папугая, пчалу, вераб’я, гусь, качку або перапёлку;

калі ж потым яна дасягне вяршыні задавальненьня, ейная глотка выбухне стогнамі й хліпамі.
Ніякага дакладна вызначанага парадку, у якім вы б мелі чаргаваць любоўныя ўдары, не існуе. Тым ня менш, калі каханка сядзіць у вас на каленях, вы можаце мерна біць яе кулаком у сьпіну, тымчасам як яна тое самае робіць з вашаю сьпінай. Калі вы зробіце ёй балюча, яна абрынецца на вас, паказваючы, што сапраўды ўгневалася. Пры сэксуальным кантакце можаце біць сваю каханку рубам рукі між грудзей. Аднак пачніце паволі і не прычыняйце ёй болю, пакуль яна сама таго не папросіць. Памятайце, што кожны ўдар мусіць суправаджацца выкрыкам нарастаючай задаволенасьці. Калі жанчына стамілася, лёгка біце яе сагнутымі пальцамі ў лоб. Усе ўдары прызначаюцца адно для большае асалоды і стымулююць любоўныя выкрыкі пад час палавога акту.
Калі вы адчуваеце, што набліжаецца кульмінацыя, паскарайце рытм удараў у грудзі, сьцёгны й клубы партнэркі. Тады плясканьне далоні па целе вашай каханкі зьмяшаецца са стогнам, які пры набліжэньні аргазму вырвецца з глыбі яе горла.
Але не забывайцеся на вядомую акалічнасьць, што мужчына й жанчына ў сваёй натуры дзьве вельмі адрозныя істоты. Мужчыны больш суровыя і вынаходлівыя, тымчасам як жанчыны больш далікатныя і сарамлівыя, хоць часам іх прыроджаная сарамлівасьць і страчваецца. Жанчына, якая распалена нейкай любоўнай пазыцыяй або адчувае ўсё большую ўзбуджанасьць, або, нарэшце, калі яна хоча прытрымвацца звычаяў таго краю, адкуль паходзіць, можа нанесьці мужчыну ўдар. Аднак не чакайце, што яна будзе рабіць гэта кожнага разу!
У асобных частках зямлі Ватсяяна сустрэў яшчэ чатыры папулярныя ўдары: *„клін“* у грудзі, *„нажніцы“* ў галаву, *„іголку“* ў шчокі і *„клешчы“* ў грудзі й клубы. Гэтыя ўдары палягаюць у розным палажэньні далоні, пальцаў і кулака, і *Камасутра* ўважае іх за вельмі балючыя і барбарскія, бо пасьля мілаваньня яны пакідаюць на целе жанчыны вельмі заўважныя сьляды. Таму старавечныя аўтары перасьцерагаюць, каб каханкі не пераносілі краёвыя звычаі ў іншыя часткі зямлі толькі таму, што гэта навінка, бо тое, што добра для адных, не канечне быць добра для іншых.

У якасьці застрашальнага прыкладу прывядзем тут некалькі выпадкаў, калі занадта палымяныя каханкі скалечылі або змардавалі да сьмерці жанчын, ужыўшы да іх вышэйзгаданыя гвалтоўныя прыёмы:

• Чолскі раджа забіў куртызанку Чытрасэну, калі пад час палавога акту абрынуўся на яе грудзі „клінам“.

• Кароль Шатакарні Шатавагана з Кунталы зьмярцьвіў каралеву Малаваяці залішне жорстка праведзенымі „нажніцамі“.

• Нарадэва, правадыр войска панду, які меў скалечаную руку, будучы ў сэксуальным узрушэньні, выбіў „іголкай“ вока маладой танцоўшчыцы.

Тым ня менш, некаторыя шаленцы не прытрымваюцца старавечных павучаньняў і, ахопленыя жарсьцю, прычыняюць жанчынам боль. І як жарабец, які апошнім напружаньнем сіл пераходзіць у кар’ер, ня бачачы пры гэтым глыбокіх ямінаў, выбоінаў ці слупоў, так і каханкі забываюцца на навакольны сьвет, калі іх ахоплівае вір асалоды, і часта нават самі не ўсьведамляюць, колькі ўсяго могуць нарабіць іх утрапёныя пазногці, зубы або пальцы.

Таму пільнуйцеся перад асьляпляльным узьдзеяньнем некантраляванае жарсьці і назаўжды ўсьвядомце, што вашая каханка не такая моцная і трывалая, як вы сабе ў сваёй жарсьці ўяўляеце: звычайна яна бывае слабейшай, і вашыя ўдары, укусы і драпіны для яе вельмі балючыя. Таму ўмелы каханак выкарыстоўвае іх у добрай меры, у прыдатным месцы і ў адпаведны час.

Спосабы сэксуальнага кантакту

Камасутра разьмяжоўвае мужчын паводле велічыні іхнага чэляса (*лінгаму*) на зайцоў, быкоў і жарабцоў, а жанчын — паводле аб’ёму іхнае похвы (*ёні*) — на газэляў, кабыл і сланіх. Раўнавартаснае злучэньне адбываецца пры кантакце зайца з газэляй, быка з кабылай і жарабца са сланіхай. Сярэднявечныя аўтары эратычных твораў падаюць і меркі палавога органу: для зайца й газэлі шэсьць пальцаў, для быка і кабылы дзевяць, а для жарабца і сланіхі дванаццаць.

Лінгам і *ёні* неаднолькавых памераў даюць далейшыя шэсьць варыянтаў для любоўнае бітвы: газэля з быком ці жарабцом, кабыла з зайцом ці жарабцом і сланіха з зайцом ці быком.

Лішне, мабыць, казаць, што лягчэй злучаюцца тыпы палавых органаў, якія суседнічаюць на вышэйпрыведзенай шкале (напрыклад, жарабец і кабыла або бык і газэля), тымчасам як найаддаленае злучэньне (напрыклад, сланіхі з зайцом або газэлі з жарабцом) непажаданае і лепей яго пазьбягаць.
Удалы кантакт вымагае таксама гармоніі тэмпэрамэнтаў, якія мы падзяляем на палкія, памяркоўныя і халодныя. *Халодныя* натуры адчуваюць адно слабое жаданьне; *памяркоўныя* натуры палчэйшыя за халодныя і іхная прага сярэдняй ступені; *палкія* ж натуры жарсьцю ажно палаюць і зь вялікай цяжкасьцю могуць утрымаць яе пад кантролем.
Паводле працягласьці палавога акту мы адрозьніваем тры тыпы каханкаў, а менавіта *павольны*, *сярэдні* і *хуткі*. Адсюль выводзіцца дзевяць спосабаў кантакту.
Камасутра падрабязна выкладае пра асноўныя адрозьненьні мужчыны й жанчыны. У адрозьненьне ад мужчынаў, жанчыны ня могуць эякуляваць і знаходзіць у любоўным кантакце фізычнае разьняволеньне. Іншыя аўтары цьвердзяць, што жанчына атрымлівае асалоду ад кантакту, які цягнецца доўга, і ніколі ад сувязі хуткаплыннай. Але калі б гэта было так — пярэчаць некаторыя вучоныя, — як растлумачыць, што ейная *ёні* выдзяляе вільгаць ад самага пачатку і да канца.
Уважлівае вывучэньне палавога акту паказвае, што ў той момант, калі мужчына ўваходзіць у сваю каханку, яна адчувае ўзрушэньне сярэдняе інтэнсіўнасьці. Ейная шчаснасьць нарастае не імкліва, але доўга й павольна, разьліваючыся па ўсім целе. Гэтаксама павольна потым раскоша адступае назад, калі жанчына хоча мілаваньне спыніць.
Ватсяяна кажа, што мужчыны — гэта аратыя, а жанчыны — ураблянае поле, хоць кульмінацыі насалоды дасягаюць абое. Старавечныя аўтары нямала шукалі, як дасягнуць гармоніі мэтаў мужчыны й жанчыны, бо адчувалі, што калі два чалавекі робяць адну справу ў адзін час, дык маюць дасягнуць шчаснасьці адначасова. І як пад час гону б'юцца галовамі два маркачы і аднолькава адчуваюць удар, так і мужчыны з жанчынамі маюць ад палавога кантакту аднолькавую спатолю.
Хоць зыходзячы з памераў палавых органаў, палкасьці і працягласьці палавога акту вылучаецца толькі дзевяць відаў кантакту, узаемазлучэньнем асобных складнікаў можна дасягнуць незьлічонае колькасьці камбінацыяў. Якая зь іх

найлепшая? Гэта залежыць ад вашай пажады і месца, дзе яна вамі апанавала.
Калі мужчына з жанчынай упершыню злучаюцца ў палавым акце, звычайна мужчына вельмі хутка дасягае аргазму, але неўзабаве робіцца здольны паўтарыць акт. У жанчыны гэта якраз наадварот: пры першай сувязі яе ўзрушэньне малое і шмат часу мінае, пакуль яна адчуе спатолю, але паступова ўзрушанасьць нарастае і аргазм прыходзіць хутчэй.
Паводле сілы цягі старавечныя аўтары адрозьнівалі наступныя чатыры віды ўцехі:
• *Уцеха са сталага выкананьня дзеяньняў*, заснаваных на звычцы. Сюды належаць прыхільнасьць да паляваньня, выпіўкі, рызыкі або асалоды.
• *Уцеха з уяваў*, заснаваных на гульні фантазіі; пры гэтым мужчына ўяўляе сабе пацалункі, абдоймы або аральны сэкс.
• *Уцеха з даверу*, які ўзьнікае з пачуцьця ўзаемнай сымпатыі дзьвюх асобаў.
• *Уцеха з навакольля*, якая нараджаецца з успрыманьня ўсімі пачуцьцямі. Гэты від уцехі паўсюль добра вядомы і ўяўляе сабой найвышэйшую форму любові, бо ўсе астатнія віды толькі спрыяюць нарастаньню асалоды, якая з гэтае ўцехі струменіць.

Аральны сэкс
За старажытных часоў мудрацы аральны сэкс папросту забаранялі, бо ўважалі яго за барбарскі, дзікунскі, негігіенічны і не адпаведны традыцыі. Ватсяяна адрозьніваў восем відаў аральнага сэксу, якія практыкавалі эўнухі і якія мы тут прывядзем з папраўкай на стасункі мужчыны й жанчыны.
• Калі жанчына, узяўшы *лінгам* у рукі, засоўвае яго паміж выпнутых вуснаў і абводзіць языком, гэта называецца *„лёгкае кальцаваньне“*.
• Калі жанчына, пэўна ўхапіўшы *лінгам* рукамі, як кветку, цалуе і пяшчотна пакусвае яго з бакоў, гэта *„кусаньне бакоў“*.
• Калі яна, узяўшы галоўку *лінгаму* ў вусны, сьціскае яго, цалуе і зьлёгку пацягвае за крайнюю плоць, тады яна робіць *„вонкавую цягу“*.
• Засунуўшы галоўку *лінгаму* глыбей у рот і сьціснуўшы ейнае цельца вуснамі, яна правядзе *„ўнутраную цягу“*.
• Калі яна трымае *лінгам* у руцэ і праводзіць па ўсёй яго даўжыні вуснамі, як калі б смактала сабе ніжнюю губу, тады

гэта *„цалаваньне“*.
• Калі да папярэдняга спосабу дадаць яшчэ пешчаньне *лінгаму* ад кораня і да самага кончыка рубцом языка, гэта называецца *„пацірaньне“*.
• Калі ўзрушэньне ў жанчыны пачынае выходзіць з-пад кантролю, яна ўцягвае *лінгам* глыбей у рот і моцна яго пры гэтым цалуе і смокча, нібы выядаючы плод манга, — гэта завецца *„выхлёбтваньне манга“*.
• Калі ж неўзабаве ўсе яе адчуваньні ўспыхваюць і ейнае ўзрушэньне дасьпявае да кульмінацыі, інтэнсіўнасьць смактаньня і ўцягваньня *лінгаму* нарастае, і яна ўжо бярэ яго ў рот увесь, прыводзячы да эякуляцыі. Гэта мянуецца *„праглынаньне сусьвету“*.
Камасутра адзначае, што падобным чынам узаемна дражняць сабе *ёні* некаторыя гарэмныя жанчыны, а часам тое самае жанчынам робяць і некаторыя мужчыны, бо *ёні* можна цалаваць гэтак сама, як і іншыя месцы.
Калі вы каля жанчыны ляжаце наадварот, то бок галавой насупраць ейнае *ёні* і *лінгамам* насупраць ейнага рота, можаце задавальняць адно аднаго адначасова. Гэта называецца *„мілаваньне на ўзор варонаў“*.

Пажадлівая жанчына
Уводзіны
„Ейны твар зьзяе, бы поўня ў цёмную ноч. Ейныя вочы вялікія, як вочы спалоханае газэлі. З грудзьмі пругкімі і звабліва выпнутымі крочыць яна з грацыяй лебедзі. Ейная ёні распускаецца, як сьвежая кветка лётасу…“ Хто б не пагадзіўся з гэтым Ватсяянавым лірычным апісаньнем жанчыны-газэлі? Пабачыць такую жанчыну ў бітве каханьня й пажады вы можаце таксама на старонках індыйскай літаратуры, напрыклад, у жывых малюнках Калідасавай *Шакунталы*; яе вы пазнаеце і ў пакінутай і ахопленай „несуцешнаю“ роспаччу Радсе, якая ў змроку чакае свайго каханка, тымчасам як па небе коціцца бялюткі месяц з тысячай зіхатлівых сланоў.
Ужо старажытны Ватсяяна ведаў, што любоўная схільнасьць жанчын не вылучаецца сталасьцю, а таму ён раіў мужчынам ня ставіць у залежнасьць ад апошняй сваё задавальненьне. Ягоны разьдзел, прысьвечаны магчымасьцям узаемнае злагады, уяўляе сабой жыцьцёвую мудрасьць дасьведчанага мужчыны,

які зразумеў чалавечую натуру і сваю веду скарыстаў у галіне любоўнае сувязі.
Патронка жаночае сэксуальнасьці — багіня Раці, якая пасьвячае жанчын у мастацтва каханьня, разьвівае іхныя пачуцьцёвыя ўмельствы і прыводзіць іх да нечаканых вяршыняў пажады і шчаснасьці. Ватсяяна, ня маючы ніякіх забаронаў, часта цьвердзіць, што жанчынам варта вывучаць *Камасутру*, нават калі мужчыны паўстаюць супраць гэтага. Аднак трэба памятаць, што *Камасутра*, чый аўтар так зьдзіўляльна адкрыты і вальнадумны, пісалася хутчэй для каханкаў, чым для мужоў. Гэта ўяўляе сабой адну са шматлікіх звабнасьцяў кнігі і ўвадначас прычыну таго, што ейны зьмест знаходзіць гэткі шырокі розгалас сярод сучасных чытачоў.

Роздум над *Камасутрай*
У старажытнай Індыі *Камасутра* была агульнапрынятым прадметам абавязковай адукацыі, і мужчыны мусілі вывучаць яе разам зь іншымі навукамі і ўмельствамі. Але мудрацы ніколі не маглі дайсьці да згоды ў тым, ці маюць тое самае рабіць і маладыя дзяўчаты, асабліва яшчэ не замужнія. Калі, аднак, муж быў ня супраць, за вывучэньне навукі аб асалодзе дзяўчына магла ўзяцца пасьля вясельля. Насуперак гэтаму многія вучоныя, спасылаючыся на тое, што жанчыны з навукамі ўвогуле знаёміцца не павінны, цьвердзілі, што й *Камасутру* ім дазваляць вывучаць ня варта.
Ватсяяна з гэтымі поглядамі не пагаджаўся: ён сьцьвярджаў, што ўсе жанчыны ўсё адно палажэньні *Камасутры* ведаюць інтуітыўна, і падкрэсьліваў, што дзякуючы любоўнай практыцы многія жанчыны дасягаюць у мастацтве каханьня дасканаласьці і майстэрства, нават не засвоіўшы перад гэтым нейкіх тэарэтычных ведаў. Гэтак сама і сьвятары часта не разумеюць дакладнага значэньня ўрачыстых гімнаў, якія яны сьпяваюць у храмах, і ўсё ж яны не перастаюць ушаноўваць багоў. Падобна ж вершнікі кіруюць коньмі або паганятыя сланамі, нават не пазнаёміўшыся з фармальнымі зьвесткамі навукі аб муштраваньні жывёлаў. І людзі выконваюць загады свайго ўладара, нават знаходзячыся ў самых аддаленых кутках ягонага гаспадарства, толькі таму, што гэта ўсеагульны звычай. І менавіта так шляхетныя паненкі і куртызанкі ўжо валодаюць багатымі ведамі старавечных трактатаў аб каханьні.

Таму, дзяўчаты, *Камасутру* вам варта ведаць прынамсі часткова, высноўвае Ватсяяна. Шэсьцьдзесят чатыры навукі засвойце самі, рэшты вас можа навучыць блізкая сяброўка. Дзеля таго, каб стаць вашай настаўніцай, найлепей падыходзяць:

- ужо замужняя дачка вашае нянькі;
- дзяўчына, якой вы бяз боязі можаце цалкам усё распавесьці;
- цётка, найлепей сястра вашае маці;
- дасьведчаная старая служэбка;
- жабрачка-манашка, якая раней жыла ў вашай сям'і;
- старэйшая сястра, да якой вы маеце поўны давер.

Разам з *Камасутрай* вы можаце паспрабаваць авалодаць і іншымі мастацтвамі, асабліва сьпевамі, ігрой на музычных інструмэнтах, пісьмом, маляваньнем і татуяваньнем.

Зьмясьціце ў чыста прыбранай нішы абразы сямейных бостваў і аздобце іх кветкамі ды рысавым зернем. Упрыгожце кветкамі ложак і канапу альбо выкладзіце імі пекны ўзор на падлозе.

Навучыцеся фарбаваць адзеньне, зьмяняць колер цела, пазногцяў і валасоў, а таксама ўпрыгожваць іх дэкаратыўнымі ўзорамі на розны манер.

Засвойце як мага лепш працы з інтэр'ерам: як запраўляць ложак, расьсьцілаць дываны, расстаўляць крэслы і да т.п.

Паспрабуйце таксама крыху зразумець сэнс гульні ў кубкі з вадой.

Навучыцеся складаць з кветак букеты і сплятаць зь іх гірлянды й вянкі. Не зашкодзіць і ўмець вязаць турбаны, каралі ды іншыя аздобы.

Добра пазнаёмцеся з усім, што зьвязана з акторскім мастацтвам і аздабленьнем сцэны.

Па-за вашай увагай хай не застануцца і тонкія жаночыя мастацтвы: выраб завушніц, прыгатаваньне парфумаў, густоўнае грымаваньне і апрананьне.

Хай знаўцы вам растлумачаць некаторыя карысныя прыёмы магіі і чараўніцтва.

Разьвіце як мага лепш свае кухарскія здольнасьці і добра навучыцеся гатаваць як напоі алькагольныя, так і шэрбэты, лімонную ваду, халодныя напоі ды сокі.

Добраму вядзеньню хатняе гаспадаркі дапамагае таксама абазнанасьць у цыраваньні, шыцьці й кравецтве. Аздобце сваё ўбраньне вышыўкамі папугаяў ці кветак і нашыйце на яго

стужак, кутасоў, гузікаў і да т. п.
Напрактыкуйцеся ў слоўных гульнях, у разгадваньні рэбусаў ды загадак і ў імітацыі розных гукаў жывёл і людзей. Калі вы хочаце спраўна й пераканаўча гаварыць, мусіце прысьвяціць крыху часу чытаньню. Не шкадуйце намогаў на авалоданьне скарагаворкамі, песьнямі і куплетамі, вывучыце іх напамяць.
Старанна вучыцеся абыходжаньню зь мечам, булавой, кіем і лукам са стрэламі, бо абараніць сябе вы зможаце толькі дзякуючы рэгулярным і цярплівым практыкаваньням.
Удасканальвайце сваю здольнасьць рабіць высновы, абгрунтоўваць і лягічна аргумэнтаваць.
Няблага было б ведаць хоць штосьці пра сталярства, архітэктуру і будаўніцтва ды разьбірацца ў срэбных і залатых манэтах, у каштоўнасьцях і самацьветах, у хіміі, мінэралёгіі, а таксама ў спосабах фарбаваньня рэдкіх камянёў, пэрлаў і бразготак.
Не зашкодзяць таксама веды пра шахты й кар'еры, тыпы глебы й садоўніцтва, а асабліва ж пра дрэвы й расьліны — як за імі даглядаць, як іх паліваць, апрацоўваць, ахоўваць і распазнаваць іх век.
Трэба, каб у вас было пэўнае ўяўленьне аб цёку вады ў аквэдуках, аб цыстэрнах і водных рэзэрвуарах. Не зашкодзяць і веды пра бойкі пеўняў, перапёлак ці бараноў і ўменьне вучыць папугаяў і шпакоў размаўляць.
Засвойце тайнапісы і шыфры або вынайдзіце ўласны. Важна таксама ведаць новыя спосабы маўленьня, каб спрытна зьмяняць пачаткі й канцы словаў так, як вам трэба. Бо ж вельмі міла, калі жанчына ўмее дадаваць да складоў лішнія гукі або прыдумляць розныя слоўныя гульні. Сваёй матчынай мовай вы маеце авалодаць у максымальна магчымай ступені, каб, напрыклад, змагчы дапоўніць няскончаную страфу або верш. Гэтае вельмі добрае практыкаваньне разам з выкарыстаньнем слоўніка (ім вы б мелі карыстацца дзеля пашырэньня свайго слоўнага запасу) выдатна вам дапаможа пры складаньні ўласных вершаў.
Да ліку сваіх умельстваў вам варта далучыць і тонкае мастацтва пераўвасабленьня, каб на сваё жаданьне зьмяняць выгляд людзей і рэчаў. Тады нават са звычайных прадметаў вы зможаце зрабіць выключныя (напрыклад, надаць воўне выгляд бавоўны) і наадварот.

Добра азнаёмцеся як з гульнёй у кубікі, так і з ужываньнем замоваў ды заклёнаў. Гэта вам дапаможа бязь цяжкасьцяў завалодаць маёмасьцю іншых.
Таксама трэба разьбірацца ў грамадзкіх звычаях, прыстойна сябе паводзіць і выказваць павагу й рэспэкт да старэйшых. Карацей кажучы, вучыцеся ўсяго, што на гэтым сьвеце трэба ўмець, і будзьце ўпэўнены, што вам гэта ў далейшым жыцьці вельмі добра прыдасца.
Калі вы навучыцеся ўсяго, што трэба ведаць, грамадзтва ахіне вас усебаковай павагай і нічога ня будзе стаяць на дарозе таму, каб вы ў коле вучоных мужчынаў сядзелі як роўная. Сваімі ведамі вы набудзеце таксама павагу ўладара і хвалу мудрых, і людзі заўжды будуць вас шанаваць і заўжды вам будуць ахвотныя памагчы.
Кажуць, што, калі прынцэса з каралеўскага роду добра авалодае вышэйзгаданымі ўмельствамі, на сьвеце ня знойдзецца ніводнай жанчыны, якая б магла зь ёй зраўнацца, і яна тады апынецца на першым месцы, нават калі б напачатку ўважалася толькі за адну з тысячы мужавых жонак.
Памятайце таксама пра тое, што вам усе гэтыя мастацтвы цудоўна прыдадуцца, калі вы зь нейкай прычыны патрапіце ў няласку свайго мужа. Ня трэба турбавацца: шэсьцьдзесят чатыры мастацтвы і ўмельствы вам дапамогуць і ў выпадку, калі вы апынецеся адна і без дапамогі ў чужой краіне. Нават жанчыны, якія валодаюць толькі нязначнаю часткай гэтых мастацтваў, вельмі прывабліваюць мужчынаў і дасягнуць посьпеху ўва ўсім, за што возьмуцца.

Тонкае мастацтва спакушаць

Добра вядома, што на некаторых жанчын паглядаюць нават мужчыны, якія сваю абраньніцу вельмі кахаюць. Іх спакусу, аднак, стрымлівае іхная мудрасьць і пачуцьцё гонару, таму часта яны адступаюць, нягледзячы на моц пачуцьцяў да пэўнай жанчыны, што іх адольваюць. Часам усё ж здараецца, што мужчына, нават прыклаўшы вялізнае намаганьне, каб апанаваць сваё парыванье, ня здолее ўтаймаваць свайго агню і неўзабаве да жанчыны вяртаецца, каб да яе заляцацца з падвойным імпэтам. Таксама здараецца — і няма таму ніякай іншай прычыны, — што, дасягнуўшы сваёй мэты, мужчына да жанчыны робіцца абыякавы.

Калі вам зразумелыя гэтыя ўнутраныя мужчынскія імпульсы, вы маеце ўсе іх падобныя дамаганьні адпрэчваць у наступных выпадках: калі кахаеце ўласнага мужа; калі хочаце мець законных дзяцей; калі мужчына больш, чым вас, любіць падарожжы; калі мужчына кахае яшчэ нейкую жанчыну; калі ён дужа балбатлівы і замнога гаворыць пра тое, пра што яму лепш маўчаць; калі мужчына аддадзены сваім сябрам больш, чым вам; калі вы адчуваеце, што ён няшчыры; калі вы саромеецеся, што мужчына занадта слаўнага роду, або калі вы дужа баіцёся ягонай магутнасьці; калі вы жанчына тыпу газэлі і мяркуеце, што мужчына занадта буяны і палкі, або калі ён занадта думае пра сваю выгаду; калі мужчына раней быў вашым сябрам; калі вы даведаецеся, што ён хамула і зусім не разьбіраецца ў сьвеце; калі вам агідная ягоная грубасьць або калі вы ня лічыце яго здольным спатоліць вашую прагу; калі вы належыце да жанчын-сланіх, а мужчына да слабых зайцоў; калі вы баіцёся, што празь ягоную жарсьць да вас яго чакаюць няшчасьці, або калі вы ў адчаі, бо лічыце, што яго праз сваю недасканаласьць не заслугоўваеце; калі вы баіцёся пагалоскі пра вашыя дачыненьні або гідзіцеся яго сівых валасоў і чэзлага выгляду; калі вы падазраяце, што з гэтым мужчынам дамовіўся ваш муж, каб спраўдзіць вашую вернасьць, або, нарэшце, калі ён ставіць свой гонар па-над усім астатнім.

Калі мужчына мае нейкія зь пералічаных заганаў, ня кідайцеся ў роспач, бо *Камасутра* ведае не адзін спосаб разьвязаньня. З вашай дапамогай ён можа зьмяніцца непазнавальна: калі жанчына прыкладзе намаганьне, сарамлівы мужчына імгненна можа стацца знаходлівым і адважным, а няўрымсьлівы — лагодным.

Якія ж мужчыны могуць спадзявацца ўкаранаваць свае адносіны да жанчынаў посьпехам? Старавечныя аўтары ўлучаюць сюды дасьведчаных каханкаў, умелых апавядальнікаў, сяброў зь дзяцінства, суседзяў, павернікаў, здольных прамоўцаў, мужчын красамоўных, нявіннага выгляду, добра ўбраных, велікадушных, паглядных, нядаўна жанатых, пажадлівых (гэта могуць быць і вашыя слугі), таварыскіх, вальнадумных, адважных, сьмелых, мудрэйшых і прыгажэйшых за мужа, дужых як бык і, нарэшце, мужчын, якія маюць свой стыль і жывуць па-панску.

Характар і пажада куртызанак

Ніводная жанчына не шукае каханка толькі дзеля сваёй выгады, а тым, для каго сэксуальнасьць уяўляе сабой крыніцу пракорму, *Камасутра* раіць утойваць сапраўдны матыў іх памкненьня і ўдаваць, што імі валодае пажада.

Мужчыны лёгка паддаюцца лісьлівасьці, і жанчыне няцяжка зрабіць, каб кожны каханак сыходзіў зь ейнае спальні з адчуваньнем, што ён у каханьні найвялікшы майстар у сьвеце. Ніколі не давайце мужчыну адчуць, што больш, чым яго, вы прагнеце ягоных грошай. Карацей кажучы, ён мусіць быць перакананы, што абуджае ў вас такое жаданьне, якога вы проста ня ў стане адолець.

Некаторыя практычныя рады

• Заўжды за сабой глядзіце і апранайцеся з густам.

• З-пад аховы свайго дому паглядайце на мужчын, што праходзяць па вуліцы, так, каб яны вас заўважылі.

• Пасябруйце зь людзьмі, што могуць дапамагчы вам прынадзіць мужчыну, якому вы падабаецеся; у цяжкія хвіліны яны будуць вашай апорай і абароняць вас ад адрынутых каханкаў.

• Таксама знайдзіце сабе сяброў сярод гарадзкой варты, праўнікаў, астролягаў, вучоных і сярод тых, хто пры ўладзе. Дапамагчы вам могуць і нізкага стану людзі, як, напрыклад, прадаўцы кветак, напояў і парфумы, ваданосы, цырульнікі, жабракі і іншыя, бо і яны могуць сваім удзелам паспрыяць у заваяваньні мужчынаў, якіх вы прагнеце.

Падбіраючы прыдатнага каханка, шукайце маладога мужчыну без забавязаньняў, які мае багата грошай і велікадушны характар. Юнакі, што якраз успадкавалі грошы і зьбіраюцца іх прамантачыць, таксама вельмі прыдатныя, і хай сьвет пра вас думае, што сабе хоча. Аглядайцеся і на аскетаў, якія таемна прагнуць жанчын, на старых знаёмых, якія ўжо ведаюць, пра што гаворка, на багатых астролягаў і на мужчынаў, якія маюць уплыў на ўладара.

Адрынайце тупіц. Добра прыглядайцеся і старанна сабе выбірайце мужчынаў важных і мудрых, здольных зразумець, што вакол іх дзеецца.

Сваёй сядзібай выберыце дом, далёкі ад дамоў усіх мужчынаў, якія вас адведваюць, і прапануйце яго як прытулак мастакам,

музыкам, паэтам і пісьменьнікам. А зь іх выберыце аднаго, ласкавага, шляхетнага і з добрымі манерамі. Так, добры каханак ніколі не балбоча лішняга, ня сварыцца і не разносіць плётак!

Калі вы ім завалодаеце, ён будзе надаваць вашым вечарынкам іскрынку. Вядома, ён павінен быць знаўцам *Камасутры*, пры гэтым быць добра складзеным, прывабным і галянтным.

Каго нельга браць пад увагу ў якасьці каханкаў? Найперш ні ў якім разе мужчын, заражаных інфэкцыйнымі хваробамі, аднак таксама не прыдатныя зласьліўцы і тыя, у каго пахне з рота і хто цяжка дыхае. За вярсту абыходзьце скнараў, бадзягаў, шпегаў і мужоў, якія кахаюць сваіх жонак.

Вялікая куртызанка:

- мае вельмі прыцягальнае цела і галасок, як у салоўкі;
- мае добрыя манеры і цудоўна разьбіраецца ў справах каханьня;
- цэніць характар больш, чым што-кольвек;
- захоўвае вернасьць сваім каханкам і выдаткоўвае сродкі на грамадзкія патрэбы;
- далікатна сябе паводзіць і любіць вучыцца новага;
- не бурчыць і ніколі не ўпадае ў гістэрыку;
- заўсёды добра апранаецца;
- дасканала разьбіраецца ў мастацтве *Камасутры* і заўжды ахвотна прысьвячае свайму каханку.

Жанчын, якім гэтых якасьцяў не стае, нельга аднесьці да добрых куртызанак.

Старавечныя мудрацы доўга намагаліся вызначыць тыя прычыны, што вядуць дзяўчыну да рамяства куртызанкі. Ці гэта каханьне? Ці прыроджаная неразборлівасьць у палавых зносінах? Страх? Прага помсты? Сумнеўная рэпутацыя? Або цяга да мужчынаў у ейнай натуры? І што жанчына шукае, калі паварочваецца да грамадзтва сьпінай, атрымліваючы тым хіба што крыху вядомасьці і нічога больш? На гэтыя пытаньні *Камасутра* дае тры адказы: да гэтага яе вядзе прага багацьця, патрэба ўнікнуць нэндзы і патрэба быць каханай.

Кожная дзяўчына павінна надзвычай дбайна ўзважыць прычыны, якія яе падахвочваюць стаць куртызанкай, бо, наважыўшыся аднойчы, назад яна ўжо вярнуцца ня зможа. Ці напраўду ёй так адчайна патрэбныя грошы? Запомніце: дзяўчына, стаўшыся наложніцай, мусіць цаніць грошы болей за

ўсё на сьвеце.

Пра лоўлю мужчын
Калі мужчына спрабуе зблізіцца з вамі, будзьце стрыманай, бо звычайна мужчыны пагарджаюць жанчынамі, якія лёгка ім дастаюцца. Таму найлепшая тактыка — спачатку паслаць да яго свайго блазна, сьпевака або пасланца, каб тыя высьветлілі, што ён задумаў у дачыненьні да вас. Калі ж гэта немагчыма, вышліце надзейнага віжа, каб той выведаў аб праўдзівых намерах мужчыны. Шчыры ён або не? Ці не цікавіцца яшчэ нейкімі іншымі дзяўчатамі? І, вядома: ці досыць мае грошай? Калі вы знойдзеце мужчыну сваёй мары, пашліце яму запрашэньне да сябе ў дом. Навучыце свайго пасланца намовіць яму, што ваш дом знакаміты сваімі бойкамі бараноў, пеўняў або перапёлак ці што ў вас ёсьць незвычайны шпак, які ўмее гаварыць, або, нарэшце, што ў вас ладзіцца імпрэза, у якой выступаюць выбітныя сьпевакі, музыкі й танцоры.
Калі абраны вамі мужчына прыйдзе, прывітайце яго нейкім падарункам, што абудзіць ягоную цікаўнасьць, і не забудзьце дадаць, што падарунак вы выбіралі самі. Затым пацяшайце яго вясёлымі гісторыямі, а калі ён сыдзе, пашліце яму дадому яшчэ падарункі зь вельмі гаваркой служкай. Пад маркай, што вам патрэбна ягоная рада ў гандлёвых справах, вы яго зможаце потым наведваць так часта, як захочаце.
Памятайце, што ў дачыненьні да яго вы заўсёды павінны паводзіць сябе вельмі міла, бо *Камасутра* кажа: „Калі ў ваш дом прыйдзе новы прыхільнік, асыпце яго мноствам пахкіх бэтэлёвых лістоў і гарэхаў, аздобце кветкамі і надухмяньце рэдкімі парфумамі й масьцямі. Зьдзіўляйце яго іскрыстай дасьціпнасьцю сваёй мовы і распальвайце ў ім агонь пажады“.

Жыцьцё куртызанак
Калі ж вы ўжо знайшлі сабе каханка, вам належыць праяўляць цноту, захоўваць яму вернасьць і рабіць усё, каб ён быў задаволены. Пацяшайце яго, як толькі можаце, і грайце закаханую, нават калі любові не адчуваеце. Аднак, заўсёды ўдаючы, што вам безь яго зусім не абысьціся, сябе зь ім ніколі сур’ёзна ня зьвязвайце!
Намоўце яму, што вашая маці — страшэнная жанчына, якая яго ненавідзіць, і адзіная рэч, якая яе цікавіць, гэта грошы. (Калі

неабходна, падшукайце нават для гэтай мэты старую кабету і напрактыкуйце зь ёй ейную ролю так, каб тая йграла яе пераканаўча.) Усяляк паказвайце яму сваю боязь, што маці можа вас зь ім разлучыць гвалтам. Удавайце зьбянтэжанасьць, страх і прыгнечанасьць, але нічога не кажыце, каб у яго склалася ўражаньне, што вы сваёй маці падпарадкоўваецеся. Калі спатканьне зь ім вам трэба адкласьці, скажыце, што вы хворая. Прыдумайце сабе нейкую хваробу (але не экзатычную і каб яна не адпуджвала), бо гэты стары выкрут прыдатны амаль заўжды.

Даручыце служцы зайсьці ў дом вашага каханка і прынесьці адтуль нейкія кветкі з учарашняй сустрэчы, сказаўшы, што вы хочаце мець пры сабе прыемны напамін пра хвілі, праведзеныя поруч зь ім. Гэта вельмі павысіць ягоную прагнасьць.

Калі ваш каханак ідзе з вамі ў ложак, не выхваляйцеся перад ім веданьнем любоўнага мастацтва. Абмяжуйцеся толькі тым, што робіць ён сам, і выказвайце крайняе зьдзіўленьне і захапленьне прыёмамі, якія ён выкарыстоўвае пры палавым акце.

Захоўвайце ягоныя таямніцы і адкрыйце яму ўласныя жаданьні й сакрэты. Ніколі яму не паказвайце, што вы злуяце. У ложку не пакідайце яго ні на ймгненьне, рабіце ўсё, пра што ён папросіць, і песьціце тыя часткі ягонага цела, дзе гэта прыносіць яму найбольшую асалоду. Цалуйце яго, калі ён засынае, а калі заглыбляецца ў свае думкі, напускайце на сябе заклапочаны выгляд. Захоўвайце раўнавагу паміж сарамлівасьцю і бессаромнасьцю. Калі ваш каханак ад вас сыходзіць, памахайце яму рукой з вакна. Удавайце, што вы ненавідзіце ягоных ворагаў і любіце тых, каго любіць ён. Захапляйцеся ўсім, што яму міла, і як найбліжэй падладжвайце свой настрой да ягонага. Часам рабіце выгляд, што вы страшэнна раўнуеце да ягонае жонкі, або ўдавайце дрэнны настрой, знайшоўшы сьляды пазногцяў і зубоў на ягоным целе, і вінавацьце яго ў тым, што іх пакінула ягоная жонка, хоць вы й пазнаяце ў іх сьляды сваёй жарсьці.

Калі ваш каханак заснуў, захварэў ці забыўся п'яны, не шуміце. Уважліва прыслухоўвайцеся, што ён гаворыць пра свае ўчынкі і посьпехі, а потым гэта яму перакажыце, нібыта вядзецца пра вашыя ўласныя меркаваньні. Напружана сачыце за ходам усіх гісторый, распавяданых ім, за выключэньнем тых, вядома, у якіх фігуруюць іншыя жанчыны. Ягоныя ўздыхі, пазяханьні й

чыхі заўжды суправаджайце належнымі словамі. Не хваліце ў ягонай прысутнасьці іншых мужчын і не крытыкуйце нікога з такімі самымі хібамі ды заганамі, як і ў яго.
Калі ж ён мусіць выправіцца ў дарогу або выехаць у выгнаньне, намоўце яму, што ваша найвялікшае жаданьне — быць разам зь ім, і не вагайцеся самі сказаць яму, што вы гатовыя ехаць зь ім. Прызнайцеся яму, што вашаму жыцьцю, якое дагэтуль ня мела ніякае мэты, ён нарэшце надаў сэнс. Калі ж яго напаткала вялікае шчасьце або ён завалодаў вялізным багацьцем, прапануйце яму штосьці ахвяраваць багам. Будзьце ўдзячнай. Прыклаўшы ягоную руку да свайго ілба ці грудзей, рабіце выгляд, што вам гэты дотык прычыняе невымерную ўцеху. Засынайце ў ягоных абдоймах і часта яму паўтарайце, што, калі злая доля адніме яго ў вас, вы ня зможаце болей жыць. Выкажыце палкае жаданьне стаць маці ягонага дзіцяці. Ягоныя таямніцы пакідайце сабе, а ягоныя грошы не размантачвайце. Паспрабуйце адгаварыць яго ад захаваньня шматлікіх постаў, а калі вам гэта ня ўдасца, пасьціце разам зь ім. Калі ён таго хоча, удзельнічайце разам зь ім у грамадзкіх справах і выказвайце радасьць ад карыстаньня ягонымі рэчамі. Усхваляйце ягоную сям'ю, ягоны характар, талент, дабрыню, касту, сяброў і ўзрост. Калі ён сьпявае, напружана яго слухайце, нават калі ён сьпявак абы-які. Адведвайце яго, нягледзячы на холад, сьпёку і дождж. Кажыце яму, што хацелі б застацца ягонай каханкай і пасьля сьмерці, а ў будучым жыцьці вы б з радасьцю сталі ягонаю жонкай. Нястомна падладжвайцеся да яго. Калі ён даведаецца, што вы былі яму нявернай, пашліце да яго служку з цыдулкай, напісаўшы, што ва ўсім вінаватая сквапнасьць вашае маці, якая і вымусіла вас да здрады. Калі гэта не ўлагодзіць ягонага гневу, ідзіце да яго самі. Плачце і галасіце над сваім журботным лёсам, які з вас зрабіў куртызанку. Праклінайце сваю сквапную маці (аднак ніколі не спрачайцеся зь ёй наконт грошай!), памятаючы пры гэтым, што менавіта яна паслала вас туды, дзе грошы цякуць ракой.

Калі каханка трэба пакінуць
Старавечныя аўтары ведалі, што рана ці позна ўсяму прыходзіць канец. Калі вы хочаце спраўдзіць, ці хутка скончацца вашыя дачыненьні, заўважце, ці не адпавядаюць сапраўднасьці наступныя моманты:

• Ваш каханак дае вам менш грошай, чым вы просіце, або адлічвае іх з дакладнасьцю да шэлега.
• Абяцае ўсё, але не дае нічога.
• Кажа адно, а робіць іншае.
• Адмаўляецца паклапаціцца аб тым, пра што вы яго просіце, парушае свае абяцаньні, а зь ягоных вуснаў гучыць найчасьцей „я забыўся“.
• Пачынае заводзіць размовы з вашымі слугамі, а вас перастае заўважаць.
• Праводзіць ночы ў чужым доме, спасылаючыся на тое, што затрымаўся ў сяброў па неадкладных справах.
• Таемна дамаўляецца са служанкай былое каханкі.
Калі вы заўважыце за вашым каханкам хоць адну (а пагатоў больш) з прыведзеных прыкметаў, надышоў час думаць пра расстаньне. Аднак ні ў якім разе не выказвайце гэтага свайго намеру. Рэшту часу скарыстайце на тое, каб выціснуць зь яго ўсё, што магчыма. Зайшоўшы зь ім у краму, абудзіце ў ім фанабэрыю і самахвальства, як сапраўдная прафэсіяналка, каб яму потым не засталося нічога іншага, як штосьці купіць вам. Калі неабходна, змоўцеся зь ліхвяром, каб той, калі ваш каханак будзе ў вас дома, прыйшоў адабраць у вас каштоўнасьці і іншую маёмасьць у якасьці кампэнсацыі за незаплочаныя даўгі.
І напрыканцы парада: калі ваш каханак багаты, будзьце ласкаваю зь ім нават пасьля расстаньня; аднак калі ён бедны, хутка забудзьцеся на яго.

Як каханка пазбавіцца
Камасутра кажа, што абавязак куртызанкі — спакушаць мужчын з высокага грамадзкага стану і заставацца зь імі так доўга, пакуль зь іх можна нешта мець. Калі ж потым здарыцца так, што ў каханка ўжо больш нічога няма, — час зь ім разысьціся. Пазбыцца яго без праблемаў вы зможаце, калі будзеце кіравацца наступнымі парадамі:
• Будзьце незвычайна ласкавай да людзей, якіх ён шалёна ненавідзіць.
• Прыкмячайце, што яго найбольш раздражняе й злуе, і як найчасьцей гэта рабіце.
• Калі ён прыходзіць, з агідай моршчыце вусны і расчаравана патупвайце нагой.

• Падрабязна выкладайце яму тое, чаго ён не разумее і што яго не цікавіць.
• Падрывайце ягоную самаўпэўненасьць і раньце ягоную пыху.
• Бывайце ў грамадзе мужчынаў, вышэй пастаўленых за яго, каб ён пачуваўся адрынутым.
• Пры розных нагодах давайце яму адчуць, што вы яго ігнаруеце.
• Калі ён хоча вас пацалаваць, адварочвайцеся, не дазваляйце яму датыкацца да вашае *ёні*; кажыце яму, што ягоныя пазногці і зубы вас непрыемна раняць.
• Палавой сувязі ад яго патрабуйце толькі тады, калі ён стомлены, а калі ён дасягне аргазму, ухмыляйцеся, выразна паказваючы, што сваімі здольнасьцямі ён вас ня ўразіў.
• Калі ж ён цягавіты і мае намер кахацца далей, ляжыце нерухома, як камень, удаючы, што ўсе ягоныя вымогі ўзрушыць вас марныя.
• Калі ён хоча кахацца з вамі ўдзень, пасьмейцеся зь яго.
• Сустракайце яго няветла, рабіце так, каб у вас ён пачуваўся няўтульна, прасіце яго аб тым, чаго ён вам даць ня можа, а ўрэшце рэшт загадайце сваім слугам выкінуць яго з вашага дому.

Куртызанка, якая зычыць сабе шчасьця, мусіць кіравацца толькі чатырма правіламі:
• Напачатку пра мужчыну трэба клапаціцца надзвычай уважліва.
• Потым змусіць яго да таго, каб ён адчайна ў вас закахаўся.
• Потым грунтоўна яго абабраць.
• І ўрэшце яго бязьлітасна адштурхнуць.

За кожнай куртызанкай, якая засвоіць гэтыя правілы, заўжды будзе ўвівацца мноства мужчын, і яна зможа добра ўзбагаціцца. Калі ж вам якраз не шанцуе, і ў вас пад рукой няма нікога, апрача вашага былога каханка, паспрабуйце яго заваяваць зноў, паслаўшы да яго вартага даверу пасярэдніка з адной з наступных гісторый:
• Што ён быў выкінуты толькі праз падкопы й варожасьць вашае маці.
• Што вы кахалі яго і тады, калі змушалі яго да расстаньня, але вы мусілі хаваць сваё пачуцьцё, каб ня ўпасьці ў няласку свае лютае маці.
• Што ваш цяперашні каханак — нікчэмнік, якога вы

ненавідзіце.
Даручыце сваёй вернай служцы перамовіць зь ім пра каханьне, якое паміж вамі было. Пры нагодзе абуджайце ў ім згадкі пра вашую любоў, пра спосабы, якімі ён вас цалаваў і кахаў. Дзякуючы гэтым хітрыкам, ён паступова да вас вернецца. Аднак наўперад трэба ўсё добра прадумаць, бо каханак, якога вы некалі пазбавілі большай часткі ягонага набытку, у другі раз не бывае звычайна ахвотны і здольны даць вам гэтаксама многа.
Калі вы трапіце ў такую сытуацыю, што трэба выбіраць паміж двума каханкамі, то бок паміж новым і старым, тады, паводле старавечных мудрацоў, вам варта даць перавагу старому, бо вы ўжо добра ведаеце ягоны характар, а ён, у сваю чаргу, лепей ведае, як вас пацешыць і задаволіць. Аднак, хоць гэтае правіла звычайна і дзейнічае, зь яго часта бываюць выняткі, бо мужчынскі нораў, які й без таго рэч своеасаблівая, праяўляецца ў розны час па-рознаму.
Да былога каханка можна вярнуцца таксама дзеля таго, каб гэтым зашкодзіць ягонай сувязі зь іншай жанчынай або мужчынам. Або такі падкоп можна ўчыніць, каб уразіць свайго новага каханка.
Памятайце, што мужчына, які шалёна ў вас закаханы, пры думцы, што вы сустракаецеся яшчэ зь некім, заўжды затрымціць: ён будзе баяцца, што вы яго кінеце, а таму ён ня будзе зважаць на вашыя заганы і выдаткуе на вас значную частку свайго набытку.
Заўжды ахінайце прыязнасьцю тых мужчын, якія да вас прыхільныя, і грэбуйце тымі, што пра вас забываюцца. Калі вы знайшлі ўжо сабе добрага каханка і жывяце разам зь ім, не прымайце заляцаньняў ад іншага пэрспэктыўнага шанавальніка. Калі ўсё ж ён вас да гэтага змусіць, прыміце яго і пачастуйце, але не на грошы вашага цяперашняга каханка.
Распальваньне старых вогнішчаў наноў можна толькі ўхваліць, калі вы ўпэўнены, што гэта прывядзе да шчасьця, каханьня й сяброўства.

Любоўныя позы

Калі вашая *ёні* вузкая, вы маеце даваць перавагу позам з шырока разьведзенымі нагамі, бо гэтым вы вельмі палегчыце доступ каханкаваму *лінгаму*. Калі ж наадварот, вашая *ёні* шырокая, тады, вядома, лепей вам прыдадуцца пазыцыі са

зьведзенымі сьцёгнамі, бо яны вашую *ёні* сьцягваюць і звужаюць.
Калі вашая *ёні* шырокая, а ягоны *лінгам* малы, вы мусіце накіраваць ягоную ўвагу на вашыя чульлівыя месцы на целе звонку. Вядома, найлепей, калі вашыя прылады каханьня адно да аднаго дасканала пасуюць: тады для спаталеньня сваёй пажады вы можаце рабіць усё, што хочаце, і ўсе асалоды любоўнае сувязі для вас адкрытыя.
Жанчынам-газэлям найбольшую раскошу прынясуць наступныя пазыцыі:
• Адкінуўшы голаў і ўзьняўшы клубы (у выпадку неабходнасьці пад іх можна падкласьці падушку або валік), вы апынецеся ў *„шырока адкрытай позе“*. Для лягчэйшага пранікненьня *лінгаму* раяць умошчваць яго сьлізкімі рэчывамі.
• Лежачы на сьпіне, падыміце й шырока разьвядзіце сьцёгны, — гэта *„пазяхаючая поза“*. *Ёні* пры ёй адкрытая і нахіленая, таму партнэр мусіць быць уважлівы, калі хоча ўвайсьці ў яе сваім *лінгамам*.
• *„Позай Індравай жонкі“* называецца пазыцыя, пры якой вы, узьняўшы ногі, прыцягнеце калені да грудзей так, каб вашыя пяткі казыталі пахі партнэра. Таксама яна прыдатная для каханкаў, чые палавыя органы дакладна адпавядаюць адно аднаму, але каб яе навучыцца, патрабуецца крыху практыкі.
Усім тром тыпам жанчынаў добра пасуе *„сьціснутая поза“*. Увойдзеце вы ў яе, сьціснуўшы сьцёгны. Існуюць два варыянты гэтай пазыцыі паводле займанага вамі становішча: седзячы і лежачы на правым баку.
Пачаўшы палавы акт у сьціснутай позе, а потым шчыльна абхапіўшы партнэра сваімі сьцёгнамі, вы зоймеце *„позу сьціскаючую“*. Калі ж вы яго абхопіце толькі адным сьцягном, гэта *„поза сплеценая“*.
Калі вы моцнымі скарачэньнямі сваёй *ёні* ўцягваеце *лінгам* углыб, гэта завецца *„позай кабылы“*. Навучыцца яе можна толькі сталымі практыкаваньнямі.
Суварнанабха дадае яшчэ наступныя позы:
• Калі вы падымеце ногі старчма ўгору, гэта *„вертыкальная пазыцыя“*.
• Узьняўшы сьцёгны і абапёршы іх аб партнэравы плечы, вы ўвойдзеце ў *„расшыраную позу“*.
• Калі вы сьцісьнеце ногі й прыцісьнеце іх да грудзей, гэта

будзе *„сьцятая поза“*.
• Калі вы падымеце адну нагу й пакладзеце яе на плячо партнэра, другую пакінуўшы выпрастанай, і цягам палавога акту абедзьве нагі чаргуеце, гэта мянуецца *„расшчэпліваньне бамбуку“*.
• Калі адну нагу вы закінеце за голаў, а другую пакінеце выпрастанай, гэта *„забіваньне цьвіка“*. Гэтай цяжкой пазыцыі можна навучыцца адно практыкай.
• Калі вы прыцягнеце да сябе ногі, прыцісьнеце пяткі да жывата і рукамі будзеце падцягваць да сябе партнэра, вы зоймеце *„позу краба“*.
• Падняўшы сьцёгны і скрыжаваўшы іх, вы ўтворыце *„спакаваную позу“*.
• Паклаўшы ступню левай нагі высока на правае сьцягно і гэтак сама зрабіўшы са ступнёй правай нагі, якую трэба зьмясьціць на левым сьцягне, вы зоймеце *„пазыцыю лётасу“*.
• Калі пры палавой сувязі каханак ляжыць на сьпіне, а вы сядзіце на ім і паварочваецеся вакол, не выпускаючы пры гэтым *лінгаму* са сваёй *ёні*, гэта называецца *„млын“*. У актыўнай ролі можа быць і мужчына. Аднак, каб напрактыкавацца ў гэтай складанай пазыцыі, спатрэбіцца немалы час.
Некаторыя абазнаныя людзі лічаць, што ўсе любоўныя позы — хай вядзецца пра пазыцыі сядзячыя, ляжачыя або стаячыя — найлепей выконваць у вадзе, аднак *Камасутра* палавую сувязь у вадзе ўважае за непрыдатную.

Позы стоячы
Калі вы хочаце са сваім партнэрам кахацца стоячы, у вашай дыспазыцыі дзьве асноўныя позы: падпёртая і падвешаная.
• Калі вы або ваш каханак абапрэцца аб сьцяну або слуп, гэта *„поза падпёртая“*.
• Калі ваш каханак, абапёршыся аб сьцяну, зробіць з рук сядзеньне, на якое вы сядзеце, абдымеце яго вакол шыі і сьцёгнамі абхопіце ягоны пас, а далей пяткамі будзеце адштурхоўвацца ад сьцяны, гэта *„поза падвешаная“*, якая прыносіць вельмі інтэнсіўную асалоду.

Позы ззаду
• Калі вы сагнецеся й станеце на карачкі, рукамі абапёршыся аб ложак або дыван, тымчасам як партнэр ззаду ўвойдзе ў вас,

як бык, і будзе палка песьціць ваш азадак, гэта *„поза каровы“*. Такім самым чынам можна бавіцца імітаваньнем спалукі іншых жывёлаў, напрыклад, сабак, казлоў ці аленяў. Натхняцца можна і шпаркасьцю аслоў або крыкамі марцовых катоў. Каханак таксама можа скакаць, як тыгра, выпрастацца, як слон, церціся, як кнораз, і кідацца на вас, як жарабец. З такіх яго штук ня сьмейцеся, бо, паводле *Камасутры*, назіраньне за любоўным жыцьцём жывёлаў можа чагосьці навучыць нават самага недасьведчанага каханка.

Адваротныя позы

Найпрыдатнейшы час, каб пераняць у мужчыны актыўную ролю, надыходзіць тады, калі вы заўважаеце, што ён стаміўся, нават не дасягнуўшы аргазму, або ён яго акурат дасягнуў, а вам хочацца кахацца далей. Калі ваш каханак адпачывае на сьпіне, бяз сораму на яго ўзьлезьце і не дазвольце ягонаму *лінгаму* высьлізнуць з вашае *ёні*. Яго вельмі ўзрушыць, калі кветкі з вашае галавы будуць падаць на ягоныя грудзі, а кончыкі вашых валасоў гарэзьліва казытаць ягонае цела. Калі ж вы схіліцеся яго пацалаваць, дакраніцеся да яго выпнутымі смочкамі, спачатку зьлёгку, але паступова налягайце на яго ўсё мацней, нібы жадаючы пратыкнуць яго імі. У раскошы трасіце сваёй галавой і калыхайце клубамі. Можаце партнэра таксама падрапаць, як котка, або пяшчотна пакусаць за шыю.
Карацей, рабіце ўсё, каб ваш каханак зашчыраваў, як уперад. З гэтай мэтай можаце жартам яму сказаць: „Бачыш, што ты заўжды са мной робіш!? А цяпер цябе згвалтую я!“ Аднак, як толькі вы дасягнеце аргазму, згадайце пра сваю сарамлівасьць, зьлезьце з партнэра і зноў вярніцеся да ролі пяшчотнай падатлівай жанчыны.
Калі вы граеце актыўную ролю, вы маеце ў сваім распараджэньні тры тыпы палавога кантакту: абцугі, ваўчок (або колца) і арэлі.

- Калі сваёй *ёні* вы сьцісьнеце *лінгам* ля самага кораня і будзеце ўцягваць яго ўсярэдзіну, нібы жадаючы выкруціць, гэта называецца *„абцугі“*.
- Калі, сеўшы на кукішкі зь *лінгамам* у *ёні*, вы кружыце клубамі вакол ягонага кораня, тымчасам як мужчына выгінаецца ў дугу і імкнецца вашую *ёні* цалкам запоўніць, гэта завецца *„ваўчок“* або *„колца“*.

• Калі, трымаючы *лінгам* у *ёні*, вы кружыце клубамі па ўсё большай акружнасьці або гушкаеце імі з боку ў бок, гэта называецца *„арэлі“*.
Па дасягненьні аргазму юрлівасьць спадае, як мора пад час адліву, і гэта прыдатны час для таго, каб безь перапыненьня кантакту пакласьці ваш лоб на ягоны. Тады агонь пажады хутка ўзьвіецца зноў.

Камасутра

кажа, што
галоўная
выгада палавой
сувязі з
партнэркай у
актыўнай ролі
палягае ў тым,
што зь яе
дапамогай
нават вельмі
сарамлівыя
жанчыны
могуць праявіць
сваё каханьне й
пажаду, а
таксама яна дае
магчымасьць
партнэру
даведацца, якія
спосабы
сэксуальнага
кантакту
сапраўды
падабаюцца
ягонай
каханцы. Аднак
такой сувязьзю
не павінны
карыстацца
жанчыны, якія
нядаўна

нарадзілі або
маюць
мэнструацыю.

У Граманары звычайная зьява, калі з адной жанчынай цешыцца адразу некалькі мужчынаў: адзін яе трымае, другі цалуе, трэці ў яе ўваходзіць, чацьвёрты песьціць ейныя грудзі і г.д., пакуль усе сваімі ролямі не перамяняюцца. Але такія оргіі звычайна ўласьцівы адно куртызанкам і прастытуткам. У рэдкіх выпадках здараецца наадварот: калі некалькі жанчынаў задавольваюць аднаго мужчыну. Найхутчэй да гэтага можа дайсьці ў гарэме, калі мужчына трапляе ў палон да спраглых жанчын.
У некаторых мясьцінах папулярны анальны сэкс паміж мужчынамі і жанчынамі, але старавечныя аўтары адпрэчваюць гэты тып сувязі.
Напрыканцы тым, хто ўрынаецца ў шматлікія любоўныя гульні, *Камасутра* нагадвае, што яны мусяць падладжваць свае сэксуальныя дзеяньні да ўласных поцягаў і густаў так, каб усіх палюбоўнікаў гэта вяло да сяброўства, каханьня і ўзаемапавагі.

Падрыхтаваў Сяргей Сматрычэнка

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 5 (10) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **29-08-2000**
[image]

Ева Вежнавец
Батлейка, катрынка

— супрацоўніца Беларускага Гельсынскага Камітэту. Аўтарка апавяданьня „Лялечка—балетніца—каралева—сіламніца“ (ARCHE-Кабеты, 1999) і эсэ „Herstory замест History“ („Наша Ніва“, 1999). Належыць да найімаладшага пакаленьня беларускіх літаратараў.

Вельмі маленькай стала мая краіна.

2 чэрвеня. Гарманішкі. Слыхавое акно.

— „У гандлі на вёсцы пытаньні эканомікі, фінансаў і прыбытку павінны адыходзіць на другі план. Галоўнае — накарміць людзей…“

— Бяжэце, Йванаўна, аўталаўка прыехала! І батоны прывезла!

— Ой, мой ты Колька, ногі не бягуць. Ох я ж я, няшчасная ды пакутна!

— Вось каб яны пяцьдзясят шостага памеру прывезлі, то й я б купіла!

— Пазьбіралі ўчора жука, а сёньня зноў напоўз. І дзе ён матачкі мае, бярэцца?

— Немцы ў вайну навезьлі. І зельле прывезьлі нямецкае, у зорачкі. Каб нам хлеб ня рос.

— Кажуць, дождж будзе з градам.

— І так усё павымярзала ды павысыхала.

— Па мне дык хай дагнівае!

— На каго людзі, на таго й Бог.

— Далі шэсьць мільёнаў, дык хоць задушыса.

— Ой давялі калхозьніка, ой давялі. Калхозьнік ужо й не чалавек. І хлеб глёўкі, і вада халодная.

— Волька, пачом мяшок камбікорму? Уюююй! Мае сьвінкі і

крапіўку добра ядуць! Замяшаеш з конскім гаўном...

— „Прэзыдэнт краіны зазначыў, што нельга непрадбачліва разбураць калгасы, як гэта зрабілі ў некаторых рэспубліках СНД. Нельга сьпісваць на калгасы неўраджаі, якія выкліканыя аб'ектыўнымі ўмовамі. Што датычыць дэфіцыту асобных тавараў, то гэта часовыя і цалкам вырашальныя цяжкасьці".

— Во палічы: кожны дзень сумку камбікорму цягне й цягне. Ужо дачцэ ўсю абстаноўку купіў. Напішу я на яго, дальбог, напішу! Усё саабшчу!
— Мамо, дык і бацька ж наш цягне.
— Вось цягне, называецца! Мяшэчак кукурузы ўкраў, дык і то гусяняты падохлі. Пратручаная была. А мо ведзьма гэта начаравала.
— А ў мяне, людцы мае, пазычыла летась мех мукі, дык і лапкамі накрыўся.
— Сама стала гладка, як леў, а мужык высах у цёску.
— Уй, чараўніца гэта! Яе родная цётка, Паліна з Цахвіна, была ведзьма, ніхто замуж ня браў, а тады Цагелька крывы…

— „Са свайго боку дзяржава робіць усё, каб жыцьцё грамадзян не пагаршалася, а наадварот, станавілася лепшым. Але і самі людзі павінныя закасаць рукавы і лепш працаваць. Не сакрэт, што хто-ніхто з калгасьнікаў ахвотней шчыруе за бутэлькай, чым на палетках… "

— Тамара, дзе наша сівое вядро? Адгон прывезьлі!
— Нясууу!!

— „Дзяржава не пакіне чалавека сам-насам зь бядой. Будзе нялёгка, але перазімуем…"

— Прыляцелі лебедзі на возера зімаваць, дык Жулаўскія іх паелі. Смачна, кажуць. Мяса як гусінае.

— „Толькі б не было ажыятажу, а прадуктаў павінна хапіць…"
— „Усунуць ногі ў старыя валёнкі было нядоўга. І вось Мар'я Васілеўна ўжо ў кароўніку. Рагуля ацялілася!!!
— Даеньне — гэта мастацтва. Ня ўсе ім валодаюць. Можа, таму

й меншае колькасьць малака?..“

— Куды ты, ваўкарэзіна ты!
— Чаго ты карову перыш? Разганіса ды ў слуп галавою!

— „Сьлізкі шлях курыных кумпячкоў. З-за чаго застрэліўся дырэктар птушкафэрмы?“

— А хто-то?
— То Тамарына дзеўка зяця прывезла. Багаты, на іх ліха.

— „Буслы чамусь вяртаюцца сюды. Напэўна, трэба неяк жыць і людзям…“

Мы з Генрыкам сядзім на гарышчы старога дому, чытаем, слухаем і пішам — кожны сваё. Генрык зноў усчынае адвечную спрэчку.

— Твой першы аповед гучаў, як катрынка. Усё было на месцы. Малая драўляная скрыначка, пыльная, са старадаўнімі мэлёдыямі, кардоннымі карцінкамі. Твая другая рэч была падобная да батлейкі. Многа сцэнак, якія можна было б згуляць дзьвюма-трыма лялькамі і адной прыручанай ласіцай. А ў тваёй трэцяй рэчы няма ні складу, ні ладу, гэта і ня дзёньнік, і не сюжэтны твор, і ня плынь сьвядомасьці. Яна ня мае формы й межаў. Гэта імправізацыя. Імправізацыя — зьява бясконцая. Яе практычна няма. Ты маеш права пісаць такія рэчы, але ня маеш права іх друкаваць.
— Для мяне такое пытаньне не стаіць. Я не ствараю шэдэўраў. Я не выкшталцоны майстра, а вар’ятка — хмель і зорачкі, матузком падлогу мыць. Мэтлухі п’есаў, сцэнароў, аповедаў, інтэрмэдыі, уводзіны, завязкі й разьвязкі. Эпілёгі й эпітафіі, эпіграфы й прысьвячэньні. Трактаты. Памфлеты й раманы. Мне было б нудна надаваць адную, строгую форму сваёй пісаніне. Мой прадзед патрапіў у вар’ятню з царкоўнапрыходзкае школы. Другі вывеў пад пахаю куранятка. Мая бабка-ардэнаноска закалола нямецкага афіцэра відэльцам з надпісам „Gott mit uns“. Мы ў сям’і ямо гэтым відэльцам ужо шмат год. Мая другая бабка пакутуе на рэлігійную манію. Чаго ты ад мяне хочаш? Якога складу й ладу?

— Я хачу, каб ты не графаманіла. Што хачу, тое й балбачу — галоўны прынцып графаманіі. Беларуская літаратура і без таго пакутуе на неахайнасьць. Прыйшоў час да ўсяго ставіцца прафэсійна.
— Што значыць прафэсійна? Завязка-кульмінацыя-разьвязка? Сюжэтная лінія? Бездакорная кампазыцыя? Гэта па тваёй частцы. Ты — апошні шарачковы паэта, падпісваешся ў газэтах „рабселькор Скарынка“. „Маці мазала мне цыпкі сырадоем“, „Бразнула клямка“. Учорашні дзень, заўчорашнія думкі. Нават у апавяданьні „Мурыны ў Менску“ ты расказваеш пра паездку на бульбу. Хаця гэта цалкам іншая і вельмі хвалюючая тэма — мурыны ў Менску.
— Калі ты чуеш сваю рацыю, чаму тады апраўдваешся й нападаеш? Ты сьпісалася за тры кароткія аповеды й шукаеш ратунку ў выпяндроне. Ня ты першая.
— Я не апраўдваюся, а папярэджваю, што ствараю хаос, і ахвотны можа налавіць у маім тэксьце чаго заўгодна. Літаратуразнаўцам і людзям з добрым густам лепей не чытаць.
— Добра, а хто тады твой чытач?
— Дваццаці-трыццацігодка, што ня любіць выходзіць з дому, а сядзіць ля акна з патэльняю семак і чытае-чытае-чытае… Можа быць, вось так:
„Я вырашыла больш нікуды не хадзіць. Гэта мая мара — ніколі не выходзіць з дому. Менск нагадвае казіны выган. Буду чакаць вялікае прыгоды. А пакуль сяду ля акна з патэльняю семак і „Літоўскаю гаспадыняй“.
„Як пафарбаваць хусьце ў колер дзікавага шчаціньня“.
„Яшчэ інакшы спосаб дагадзіць індыкам“.
Сяджу так ужо чатыры гадзіны. За акном дзень бледна-блакітнага колеру. Чмель рыецца ў кветках. Вераб’і хаваюцца ў ламачча. Пад вечар ударыць“.

10 чэрвеня. Гарманішкі—Менск.
Вяртаюся ў Менск бяз Генрыка. У яго адпачынак, і ён застаўся ў Гарманішках. Мне ніхто ня будзе дакучаць. Праца-дом-праца-дом. Адключу хатні тэлефон. А калі хто намерыцца падлавіць мяне на працы, то ўцяку праз акно.
„Электрапоезд адпраўляецца, з усімі прыпынкамі да станцыі Менск-Пасажырскі, просьба не сьмяціць і плаціць своечасова“. Затахкалі колы, пайшлі краявіды. Было цудоўна, пакуль не

зьявілася гэтая лярва ў джынсах, якая добра надакучыла. Зрэшты, я ніколі не размаўляю зь ёю ўслых, бо не хачу патрапіць у Навінкі на прыгарэлы рыс. Лярва села на блакітную седаўку і нахілілася наперад, як хвацкая журналістка, што бярэ інтэрвію.
— Як ты бавіла свой час безь мяне?
— Выключна ў марах і кніжках. Я і зараз — сама тут, а галава ў аблоках.
— У цябе адсутны выгляд.
— Хутка мая станцыя. Які сэнс пачынаць гаворку?
— Але ты любіш пагаварыць са мной. Табе ж сумна з рэальнымі пэрсанажамі, праўда? Яны патрабуюць сюжэту. Я нічога не патрабую.
— Мне ня сумна. У мяне ёсьць я. Я магу адмовіцца ад усяго, за што трэба плаціць.
— Ты ставіш сябе высока.
— Я прывыкла.
— Але ж гэта грэх.
— Чаму? Я стараюся слухаць і разумець іншых.
— Ты робіш гэта не для іх, а для ўласнага спакою.
— Інакш не бывае. Я ня Езус, на жаль.
— Але б хацела на месца Езуса?
— Я б ня вытрымала, адразу б сьпяклася.
— Дык чаму ты ставіш сябе так высока?
— Бо я не такая, як яны. Я не алькагаліца, я лепш адукаваная, ня веру палітыкам і жыву з адкрытымі вачмі.
— Ты-ы? З адкрытымі вачмі?! Ці ня ты хаваешся ад пакутаў, як птах стравус?
— Я адчуваю свой болевы парог.
— Ты шкадуеш сваіх нэрваў. Ты ня хочаш сербануць сапраўднага жыцьця.
— Ну й не хачу! Дай мне спакою. Я плыву па цячэньні. Калі мне трапляецца па дарозе жабрак ці сабака, я дапамагаю.
— Дапамагай, калі хочаш, але дапамагай на адчэпнае. І ня мысьлі па схеме „я — і чужыя“.
— Ты мне сьнішся. Ты мне проста сьнішся. І я абуджаюся. Я не хачу, каб на мяне наяжджалі. Ні Генрык, ні ты, маё сумленьне, лярва ў джынсах.
— „Канцавая станцыя. Поезд далей ня йдзе, просьба пакінуць вагоны“.

Першы менскі сон. Вакзальны.
Сьню, што я, біч Плоцік (тонкія акуляры, доўгі шалік, стрыжаная галава), сплю ў пачакальні на лаве. Трасуць за плячо. Прачынаюся. Перада мною стаяць два міліцыянты.
— Ідзі адсюль, бічара, — кажуць мянты.
І я іду.
Справа адбываецца ў Менску, тым ня менш я апынаюся не на брыдкім вакзале (плён начных жахаў архітэктара), а ў невядомым авіяпорце, дзе грае музыка. Я еду на рухомай лесьвіцы да купалу колеру электрык... З дынамікаў гучны голас кажа: „Прашу адзначыць, шаноўныя калегі, што перад вамі біч Плоцік, які ніколі ня быў шчасьлівы, усё жыцьцё тармазіў, як у гліцэрыне, і марыў пра мігдалы нябесныя. Таму ягоны рай — Гліцэрыюм, дзе ён будзе лётаць зь вечна задзёртай галавой і больш ніколі не ўпадзе.
Я вылятаю з эскалятара, як перабраная бульба — але ня ў кодаўб, а ў сіняе начное неба, дзе плаваюць рыбы, дзе пахіснуліся зорныя храмы. Я хапаю рыбу абераў — сіне-зялёны плаўкі жар! Я больш ніколі не апушчу галавы — зямлі няма.

21 чэрвеня. Псіхі.
Раніца. Я выглядаю ў акно. Ля майго дому цьвітуць ружы і язьмін. Суседзкі хлопчык бяжыць за мячыкам па пярэстай зямлі. З лужыны п'е сасьмяглая варона. Пабеленыя дзярвёлкі яблынь, як ножкі нованароджаных цялят. Пялёсткі язьміну на асфальце, як манэткі субтыльнага народу. Сёньня ў мяне спакойны дзень — ніводнай абавязковай сустрэчы. Нясьпешна плятуся на працу праз былыя Лютэранскія могілкі. Яны завуцца цяпер Парк Адпачынку. Такая назва — эўфэмізм могілкаў. Старыя дрэвы, старыя птушкі, старыя людзі. За могілкамі пачынаецца „жабрацкі праспэкт“ — вуліца Лібкнэхта. Тут у пяціпавярховых хрушчобах і паваенных бараках жывуць патомныя йеху. Яны зьбіраюць пляшкі, макулятуру, анучы. Ад іхнай жыцьцядзейнасьці ўтвараецца шмат пылу. Я зьдзьмухваю гэты пыл са стала й кавяркі. Гатую каву, сядаю за кампутар. Калі б наш Гельсынскі Камітэт здымаў офіс на праспэкце Машэрава ці ў Бранявым завулку, дзе ходзяць заможныя людзі, то і офіс быў бы спраўнейшы, і справы ішлі б лепей. А так часам здаецца, што ўся краіна ператварылася ў „Розачку“.

Сёньня ў Беларусі (неблагі назоў для праграмы навінаў) распростваецца гіганцкая спружына вар'яцтва. Фаза распростваньня. Я адчуваю яе стрымценьне і палёт. Знаёмая псыхіятрыца кажа, што палова тутэйшага насельніцтва пасьля 40 год „мае адхіленьні ў разумовай дзейнасьці". Дзеці растуць яшчэ горшыя. Шматвяковая бульбяная дыета. Вынішчэньне самых разумных. Расея, Чарнобыль, Камунізм. Не краіна, а д'яблавы пуп.
Сёньня ў прыймальню якраз цугам ідуць прадстаўнікі шалёнай паловы. Я рассаджваю іх па сталох, прашу напісаць заявы. Бо вусны расповед можа доўжыцца паўдня.

Псіх першы:
„Добры дзень!
Мне вельмі цяжка. Я сам зь вёскі, заўсёды хацеў вучыцца ў Маскве, чытаў кніжкі па 18 гадзін на суткі, паступіў. Вучыўся адначасна на чацьвертым курсе 2-га мэдычнага інстытуту і на першым курсе авіяцыйнай вучэльні імя Баўмана. Працаваў зноў па 18 гадзін на суткі і еў чорны хлеб з вадою, як Ламаносаў. Тады ж я вынайшаў экранаплян і падаў заяву ў інстытут патэнтна-тэхнічнай экспэртызы. Мне нічога не адказалі, аднак празь дзесяць год я даведаўся з прэсы, што мой экранаплян барозьніць марскія прасторы. Падаў я яшчэ тры заяўкі на вынаходніцтвы і патрапіў у псыхіятрычны шпіталь, прабыў там тры гады. Пасьля шпіталю я зразумеў, як уладкаваны рухавік на лятучых талерках. Паслаў схему лятучае талеркі ў аддзел вынаходзтваў Мінабароны СССР. Адтуль мне адказалі, што ведаюць пра сподкі ўсё і каб болей я не пісаў. Тады я даслаў ім маё дасьледаваньне нахільных падводных крылаў. Яны адказалі, што нахільныя крылы састарэлі. У амбасадах Аўстраліі і Германіі мяне не прынялі. Я зьвяртаўся да Пятра Капіцы, Аляксандры Пахмутавай і Яўгена Еўтушэнкі, да сьпікера Шушкевіча. Шушкевіч не пусьціў мяне на парог, сказаў, што з-за псіхаў ён і так ня сьпіць начамі.
Вось з-за таго, што са мной ніхто не хацеў размаўляць, я пры сваім патэнцыяле працаваў гэтулькі год цесьляром на заводзе. А КГБ між тым не драмаў. У ліфце і ў маім пакойчыку (я вартаўнік) пачалі прымяняць нэўратропныя газы. Летам мне зрабілі ўкол парасонам у тралейбусе. Ранка ня гоіцца і цяпер. Вакол мяне паміраюць людзі, якіх яны прымаюць за маіх

хаўрусьнікаў. Людзі гэтыя памерлі да 50 год, адчуваючы глыбокі псыхалягічны дыскамфорт. Відавочна, іх пакуты і раньняя сьмерць былі выкліканыя вялікай дозай нэўралептыку. Тых жа, хто не памёр, пасадзілі ў турму, сфальсыфікаваўшы справы. Янавец Люба быццам крала слоікі зь людзкіх лёхаў, Юрчык краў куры, а Панько Валодзю зламалі ў міліцыі нос, і ён прызнаўся, што езьдзіў капаць бульбу на начальніцкія дачы. Рудчыц Валянцін, Піменаў Ігар, Будзько былі зьнішчаныя сродкамі, якія выклікаюць неадольную цягу да алькаголю. Я быў у псіхушках Магілёўцы і Плоска 3 разы. Мне давалі галаперыдол. Я крычаў „а-а-а“ ад невыноснага дыскамфорту і яркага сьвятла.
З 1997 году мяне чатыры разы спрабавалі зьбіць вялікай чорнай машынай. Маё семя бяруць і робяць зь яго хворых дзяцей. Я раз налічыў на вуліцах за дзень 26 такіх дзяцей, пакалечаных і падобных да мяне. Прашу разабрацца, ці сапраўды мая былая жонка і яе цётка самі атруціліся газам, ці іх самагубства было падробленае. Калі я знайшоў цела маёй жонкі, яна была ўся ў сіняках, а падлога патаптаная брудным ботамі вялікага памеру“.

Псіх другі:
„Паважаныя супрацоўнікі міжнароднай арганізацыі „Гага“!
У мяне зьявіліся абгрунтаваныя сумневы, што Вы ў стане дапамагчы. Вы прапанавалі мне адведаць псыхіятра. У прынцыпе, я нічога супраць ня маю. Але што гэта дасьць? Я не належу да тых хворых, якія лічаць, што двойчы два сем. Я ж прасіў Вас узьдзейнічаць на супрацоўнікаў міліцыі. Міліцыянты лезуць у маё жытло, я не пасьпяваю зь імі змагацца! Я ніколі злодзеем ня быў, сыстэматычна ня піў і прыводаў ня меў. Выходзіць, галоўная прычына перасьледу — маё іншадумства, непадабенства, незвычайнасьць, неардынарнасьць. Колькі было ўсялякіх пасткаў у маёй кватэры, папсутых рэчаў! Яны прабіраюцца ў хату, калі я сплю ці сыходжу, усё псуюць і перастаўляюць, крадуць патрэбныя дробязі. Так працягваецца 30 год. За гэты час зьмянілася 12 участковых, і ўсе яны хмыліліся ў адказ на мае заявы ды круцілі пальцамі ля скроні. Гэта сьведчыць аб прынятых раз і назаўжды правілах гульні. Усё ператварылася ў жудасную сьпіраль. Я думаю, вы мусіце быць больш актыўнымі. Абараняйце нас ад душэўных траўмаў,

маральнага шантажу, зьдзекаў. Дзеці кідаюць у мяне недагрызкамі, а бацькі толькі сьмяюцца. Маім суседзям разам зь мянтамі два разы ўдавалася адправіць мяне ў Навінкі. І там я заўважыў, што са ста чалавек толькі пятнаццаць ці дзесяць сапраўды вар'яты, а з астатнімі можна размаўляць, як зь людзьмі на вуліцы. Як яны туды патрапілі? Большасьць ухілілася ад адказу, а астатнія сказалі, што самі, па ахвоце, падлячыцца прыехалі.
А гутарка з псыхіятрам нічога ня дасьць. Я не аддам добры прыродны дар — сваё Я. Мову, культуру, асаблівае мысьленьне. Таму й змагаюцца са мной улады — тыя самыя камунякі, што дапякалі яшчэ пры „Голасе Амэрыкі". Паселі там зьверху! Яны лічаць, што быць іншым чалавекам ненармальна. А я лічу, што гэта яны ня ў норме".

Псіх трэці:
„Хваля-бераг 13/27. Мяне завуць СЫКЛЯМОН. Лекар сказаў мне, што я ня маю права абскардзіць прымусовае лячэньне ў Сухумскай псіхушцы, бо я не ў Сухумі. Мне ня хочуць перагледзець дыягназ, нідзе не бяруць на працу. Ужо пяць год мінула, як я патрапіў у Беларусь. Як я ненавіджу гэту краіну! Я не магу жыць пад кіраваньнем гэтых кароў, сьвіней і сабак з партбілетамі ў кішэнях. Тут адно жратва і анучы, катэджы і машыны, бурты, кануры, буданы, абыякавыя, замбаваныя жывёлы. Я раней працаваў на заводзе рознарабочым. Цяпер завод стаіць. А гэты віцязь славянскі, барон цыганскі ўсё гаворыць, і гаворыць, і гаворыць, рэзнуць бы яго па горле, каб замаўчаў хоць на хвілінку, каб ляжаў спакойна, як Мікалуцкі вясной. На Новы год усё гундосіў: „Ні адін человек в нашем отечестве нікогда не будет чувствовать себя забытым, обделённым і адінокім". А я?!! І я яшчэ за яго галасаваў. І вы такія ж самыя жывёлы. Паведамце мне адрас маскоўскага Гельсынскага камітэту. Там Алена Бонэр, яна мне дапаможа. А вы вярніце мне мае матэрыялы, як прачытаеце. Бывайце. Трэба йсьці на крухмальны завод, я буду хадзіць там з кута ў кут, каб улады бачылі, што я жывы, каб заплацілі мне тыя 6 млн., зь якіх яшчэ вылічаць 500 тысяч падаткаў. Я ня ведаю, што рабіць з усім гэтым. Мяне, чалавека Эўропы, загналі ў калхоз".

Ноч.

Я сьню, што я жыву ў 30-я гады як піянэрважатая 2-й узорнай школы. Я віжую за дырэктарам і падгледзела, што ён атруціў школьны басэйн. Перастрэла яго і сказала, што ведаю пра ўсе ягоныя штукарствы. Я правакавала, каб ён забіў мяне. Я не хачу болей жыць у такім часе. Чым лезьці ў падпольле, і змагацца, і насіць касавароткі, я лепей памру і нараджуся дзе-небудзь у іншым месцы. Аднак ён адмовіўся мяне забіваць.
І вось я сяджу ў ваньне, парэзаўшы вены. Я гляджу на белую сьцяну маёй убогай лазенкі, якая адначасна — прасьціна кінаэкрану. За прасьціной шэрагі гледачоў. Яны глядзяць на маю сьмерць. Я сустракаюся вачыма з адным чалавекам. Мы бачым адзін аднаго па два бакі белае хусты. Бо і ён незадаволены сваім часам, неахвотнік і самагубца.

27 ліпеня. Мітынг і шэсьце.
Лета-цёплая рака. Залатое сонца абмывае дахі. Запаялі рана птахі і манахі. Зёл і міст. Глог і корнус. Ужо больш за месяц я нікуды не хаджу. На працу паслала ліст, што я ў адпачынку. Сяньня выйшла на акцыю, палохаю людзей белым тварам. „А дзе ты была?“ — „Сядзела ўдома“.
N. ідзе побач са мной у новым гарнітуры і салямандрах. Ён ніколі ня косіць пад беднага, нават на мітынгах. Я грукаю кломпамі па асфальце. За намі — бел-чырвона-белыя калюмны.
— Я знаю, што трэба зьяжджаць, — кажа N. — Аднак я ніколі ня зьеду. Мы павінны змагацца за суб’ектнасьць краю.
— Суб’ектнасьць, — кажу я, — глупота! Уяві сюжэт: нейкая цяжарная кабета патрапіла ў пекла за свае грахі. У яе нарадзілася там дзіця. Яно прывыкла да пекліва, смыленьня ў пятах, скрыгату зубоўнага ды дзікіх мордаў. Яно называе пекла Радзімай. І тут Бог за нявіннасьць ягоную расчыняе яму пекла ды кажа: ідзі, дзіця, у рай! А яно ў адказ: „Не пайду, бо ня кіну Айчыны ў пакутах. Мы, харошыя, пераменім пекла“. А між тым пекла стваралася не для перамяненьня. Пекла — месца, дзе Бог зьбірае злосных недатумкаў. І таму — ледзь прыадкрыліся дзьверы — уцякай адтуль!!!
(І я думала ўцякаць. Нават спрабавала два разы. Аднак мне не хапіла волі да выжываньня. Тамтэйшая рэчаіснасьць мяне адбракавала. А тут можна век пялёхкацца. Народ, сьвятая карова! Я навучылася жыць у тваім брудным хляве, ля твайго цёплага боку.)

Салодкая згадка пра Польшчу.
Я вартую вілу ў Тархоміне за невялікія грошы. Раз на тры дні вару курыцу: кладу яе ў рондаль, заліваю вадою, стаўлю на плітку й дзякую Эдзічку Лімонаву, які падаў мне такую ідэю. З-пад курыных членаў выплывае спачатку белы, а потым залацісты тлушч, заімгляе ваду, як туман. Калі курынае мяса пачынае адвальвацца ад касьцей, булён гатовы. Я стаўлю яго пад ложак, а курыцу нясу да пані Бэаты ў лядоўню. Па дарозе я так абгрызаю курыцу, што яна нагадвае шкілет археаптэрыкса. Першыя разы я ўкручвала археаптэрыкса ў паперу, каб не палохаць паню Бэату, а потым падумала: нашто? Як ня пусьціць паня птаха ў лядоўню, дык буду яго за дзень зьядаць, а два дні заядаць жоўтымі сьлівамі, што растуць пры дарозе. Я эканомлю, бо хачу падацца далей, у глыб Эўропы. Працаваць жа на спаржы ці моркве цяжка, капыты можна адкінуць. Тархомін мне памерці ня дасьць: палякі яго недаакультурылі. І тут сярод вілаў трапляюцца плянтацыі цыбулі, растуць дзікія сьлівы ды яблыні, нават кроп таўчэцца ля дарогі. Я жыву зьбіральніцтвам і кураедзтвам, цэлы дзень сяджу ў садочку пры віле і чытаю ксёнжкі гаспадара, што мне сувора забаронена. З-за гэтага мяне пазьней прапруць з працы. І я вярнуся ў Беларусь. Грошай хопіць на тры паходы па букіністыках, джынсы і драўляныя кломпы, якімі я цяпер грукаю па менскім асфальце, як лапухасты восьлік.

2 жніўня. Траўнік Віт.
Траўнік вярнуўся з Масквы. Мы гуляем зь ім у Батанічным Садзе. Траўнік не мяняецца. Ён заўжды як абкураны. Мае два адмысловыя позіркі: абыякавы — на людзей, і ўважлівы — на запыленыя туі ля сьцежкі. Чалавек — небясьпечны. Яленец заўжды харошы. На яленец і тую можна глядзець бясконца. Яны якраз для сумных аматараў Мунка, такіх, як насаты Траўнік.
Туя Заходняя Ўорэана.
Туя залацістая.
Туя Заходняя Гавея.
Туя Заходняя Гавея.
Тут Заходняя Гавея
ціхім шалам палымнее.
Замірае. Млее. Тлее

тут Заходняя Гавея.
Тут ніколі не пабачыш
у блакітным пекным лесе
у траве блішчастай нізкай
прыкрых згадак і забойстваў,
барацьбы за існаваньне
і астатняга ўсяго,
што пабачыш ў іншым лесе,
небясьпечным, занядбаным,
створаным не чалавекам,
а Айцом уладным — Богам.
Гэта Батанічны Сад.

Мы ідзём між ружаў. Ён кажа, што зьяжджае ў Маскву назаўжды.
— Мяне запрасілі ў азеляняльнікі. Паглядзела б ты на асабнякі новых расейцаў! Эдэмы. А тут мне няма чаго лавіць. На балоце ружы не растуць.
— Ты лезеш з дрыгвы ды ў полымя. Гэта ж Расея. Там і сад могуць высекчы, і садоўніка прыбіць, як пралетары зноў акрыяюць.
— Не. Нават Сталін любіў сады. Раскоша ёсьць Культурай. Культура ёсьць Раскошай. У нас ні таго, ні другога няма і ніколі ня будзе.
Дамаская ружа, белая ружа, бурбонская ружа, ружа Макранта. Глёрыя Дэі зь дзюбкаватым цэнтрам. Маленькая дзікая Арвэнсіс, вогненная Какліко на высокіх кустах. Палкоўнік Дазье з млявымі, друзлымі кветкамі. Найпяшчотнейшая, колеру летніх досьвіткаў, каралева Мэры. Цьвіце ў ліпені— жніўні, любіць сьвежыя навальніцы. Мадам Батэрфляй колеру вясковых вяршкоў. Бледная МакГрэды з залатым донцам і жылачкамі яркай жаўцізны.
Хай едзе.

Ноч. Сьмерць паэта.
Прачнуўшыся, я назвала яго Павал — Сьвяты Павал, Павал Птушнік альбо Павал Пятроўскі — вандроўны, ледзь пазначаны, аднак бессумнеўна ўлюбёны пэрсанаж самых адвязаных, самых паэтычных кніжак. А вось у сьне яго ніяк ня звалі. Яго зьбіраліся расстраляць. Ён адвярнуў брудныя

манжэты, каб выглядалі бялейшымі. Знакавы жэст, які вяртае годнасьць, страчаную ў астрозе. Усьміхнуўся. Ён думаў пра ўласную крохкасьць і пра тое, што ваякі заўжды забівалі паэтаў — гэта патрэбна для раўнавагі сусьвету. Думаў пра тое, што лёс паэта ўсё ж зайздросьнейшы за вайсковы, бо паэт пяройдзе ў іншае вымярэньне, а сьвет жаўнера заўжды плоскі. Ён думаў пра весялосьць і міласэрнасьць сусьвету, які ўсё дае і нічога не забірае. І гэтыя думкі трымцелі вакол яго, напружаныя, як стрэлы. Афіцэр, што камандаваў каразнам, нэрваваўся і марудзіў. Адзін з жаўнераў раптам упусьціў ружжо і адвярнуўся. Двое іншых стаялі.
Голас:
— Ну і што, яго не расстралялі?
Другі голас:
— Дзе б там! Справа адбывалася не ў зялёным лесе, дзе можна адпусьціць ахвяру, а ўва ўнутраным дворыку астрогу. Афіцэр дастаў з кабуры зброю, падышоў і стрэліў яму ў скроню. Пасьля ён угаварыў начальніка турмы не расстрэльваць таго жаўнера, што спалохаўся. Сказаў, што з такіх выходзяць самыя жорсткія служакі. Бо помняць пра свае сумневы.
Але гэтая байка хутчэй не трагічная. Яна пра тое, што душа Паўла можа ўсяліцца куды захоча, хоць бы і ў самага службістага служаку.

23 жніўня. Восень — ледзь значная просінь.
Адчуваю, пачалі малоць яе жаронцы. Халодны пылок асядае на жнівеньскіх ранках. Заскіглілі птушкі акрай гумна.
прысак пырскае іскрамі
іскрамі пырскае прысак
Восень-мосенж — медзь, волава і цынк. Я адчувала яе прыход ужо ў ліпені.
Цёплыя каштаны і ваўняныя кофты,
жоўтае лісьце і сонца,
празрыстыя воды й паветра, глыбокае неба і ціхія шолахі.
Ідзе восень.
У гэтым бараку я жыла цэлы год. А цяпер прыйшла на экскурсію. Калі б можна было зазірнуць у сваю будучыню, пабачыць яе ў малюнках без тлумачэньняў, то амаль заўсёды можна прыйсьці ў адчай. Напрыклад, сёньня, калі я стаю тут сярод крапівы ды жабрацкіх шмотак. На матузку сохнуць:

поліэтыленавыя пакеты (салафанавыя мяшэчкі, як кажа суседка), выцьвілы рушнік, замыты швэдар і некалькі пар панчохаў. Суседка пачала насіць ваўняныя панчохі — значыць, рашыла састарыцца тут. У вайну ў гэтым бараку месьціўся камісарыят і гестапа. Аўра адпаведная. Я так баялася, ідучы дамоў па вечарох, што ў мяне трэсьліся рукі. Я пакінула барак, аднак страх і стома так і засталіся. Стаю тут пад гукі халоднага дажджу, безнадзейнае восені, што ўжо не адкоціцца назад у лета. Толькі гэтая дурная зялёная крапіва ды вераб'іны гарох на штосьці спадзяюцца.

Лістапад. Ён жа пазьдзернік, рыень, грудзень.
Лунаюць падраныя сьцягі восені.
Сабака на брунатным лісьці. Цярусіць вецер воўнаю над комінам маім.
Кароза села на катрынку.
Хашкелэ, Хашкелэ,
Meine gute Tochterke…
Калі на падыходзе зіма, робіцца халодна.
Старыя паркі. Старыя дрэвы. Старыя гнёзды.
Ізноў хаджу на працу. Хаця з маім чалавеканенавісьніцтвам сядзець бы мне на гарышчы ў Гарманішках, а не працаваць у Менску зь людзьмі.

9 сьнежня.
Патрапіла і я на Прылукі ў арыштанцкі спэцразьмеркавальнік. Але ноччу мяне адтуль выкінулі.

Паступова зьяўляецца цьмянае сьвятло і высьвечвае драўляны насьціл, акенца, абкручанае калючым дротам, дзіўную пабудову — кран над унітазам. Рыпяць дзьверы, і ў камэру заходзіць міліцыянт і жанчына ў палітоне з аддзертым гузікам.

— Прымайце новенькую!
— Вы што, здурнелі?
— Куды нам! І так замест пяці нас тут дванаццаць, ляжым на баку, па камандзе паварочваемся.
— У нас адна камэра жаночая, дзе я вам набяруся.
— Як няма куды садзіць, выпусьціце мяне!

Ахоўнік, сьмеючыся, адыходзіць. Жанчына хапае сьметніцу, набірае вады з крану і вылівае пад дзьверы. Паперкі, друз, сьмецьце шугаюць у шчыліну пад дзьвярыма. 12 жанчын па камандзе паварочваюцца на левы бок, каб глянуць на сьмеласьць Трынаццатай арыштанткі. Тая гучна верашчыць, бо знае, што наб'юць. У камэру ўрываецца ахоўнік, хапае жанчыну за плячо й выкідвае ў калідор.

Зіхоткую вежу пабудавала няпраўда ў нашай краіне. І многія пруць туды вялікія й малыя каменьчыкі. А калі лясьнецца вежа, то кожны камень знойдзе свайго гаспадара — і не спудлуе!

Ноч. Сьмерць Цмока.
Яны былі толькі нязграбныя сяляне. Але яны ведалі, што павінны змагацца з усемагутным Цмокам. І пабралі яны вілы, сякеры — не было ў іх лепшай зброі — і пайшлі празь лес на пагібель. Ішлі некалькі тыдняў. І вось ужо радзее пушча, хутка пакажацца вялікі камень, на якім спачывае Цмок. А ў гэтага цмока ад даўгіх гадоў і каменнага ложка луска зрабілася непрабіўная. Нажы й сякеры тут не памогуць. Яны зразумелі, што прыйшлі памерці. І было так страшна перад бітваю, што вырашылі яны астатнюю ноч расьцягнуць, каб жыцьцё было даўжэйшае. Палеглі спаць, але і ў сьне не забывалі, што заўтра зьесьць іх ненавісны цмачыла. Але ў іхным сьне прыляцела птушка і прыплыла рыба, і сказалі яны: мы цень рыбы і цень птушкі, якіх зьеў Цмок. Мы хочам адпомсьціць. Залазьце ў нас, мы перанясем вас у чэрава Цмока, дзе цяпер жывем. І людзі з нажамі ды сякерамі залезьлі ў птушку й рыбу. Мройныя рыба й птушка занесьлі ворагаў у нутро Цмока, дзе не было лускі, а былі далікатныя вантробкі — лілёвыя, ружовыя ды фіялкавыя. Людзі пачалі рэзаць вантробы, і зялёная халодная кроў Цмока паднялася па яго даўгой шыі аж да горла. Разам зь ёй усплылі на волю людзі. Цмока раздаўблі і разьелі цэлыя хмары птушак і рыб. І цяпер пра яго нагадвае толькі вежавы кран ля Амкадору.

12 сьнежня. Зіма — упадзеньне птушак.

Ветрык павеўны
ветрык-гарэза
сойка-гарэхаўка

сойка-карэза
белая зімка
далёкі прасьцяг
быў вецер у хусьці
цяпер у касьцях.

„Цэлую нядзелю сьнег моцны і гвалтоўны ішоў, выпаў да паўголені, так жа і завіруха моцная была. Таго ж року і зіма была злая, сьнягі вялікія і сільныя былі маразы. Матухна, зязюлюхна, вутухна, панюхна, спадарыня, месяц, слоньца, зьвёздухна, дай крошку хлеба“.

Сон на Піліпаўку. Сьмерць каня.
Агонь хутка разгарнуў сваю харугву, спачатку з шэлестам, а тады з трэскам. Гараць мая хата і хлеў сярод лесу. Сялянская хата пад страхой з балотнага чароту. З зыркай глыбіні хлява чуваць іржаньне каня, я кідаюся ў агонь і выводжу яго за аброць. Ён высокі і прыгожы, мой конь. Ён вырываецца і бяжыць да небакраю, дзе ноч пераходзіць у сьвітанак. На барвяным тле зьяўляюцца чорныя постаці трох ваўкоў. І я разумею, што конь не пазьбег свайго лёсу.
Ваявода Воўчы Хвост. Зграі. Вясельлі. Коней рыхтуюць, вазочкі фарбуюць. На воўчыя зубы, на сьмертныя згубы. Воўк сваё возьме. Брат.
Задачка: Ішла настаўніца з Бутрымцоў у Жосьву. Сьцямнела. За ёю ішлі ваўкі. Яна дзерла вучнёўскія сшыткі і паліла. Калі папера скончылася, ваўкі яе разарвалі. Ці далёкі шлях ад Жосьвы да Бутрымцоў, калі ў настаўніцы было 27 сшыткаў па 12 старонак?
Зімою я знаходжуся ў прыступе чалавекабаязьні.
Так свабодна стала вакол мяне. Толькі вецер хвошча. Ніхто ня мае ўва мне патрэбы. N. і Траўнік зьехалі, Генрык ляжыць у лякарні зь язваю. Я адведвала яго. Кажа:
— Я неўзабаве памру.
— Адкуль ты ведаеш?
— Я сасьніў Сьмерць.
— Як?
— Быццам бы сяджу ў парку. Дрэва й шэры камень. Холадна, на мне паліто, лісьце падае строма, не кружляе. Бляндынка, прыгожая. Зь зьзяючымі вачмі, з усьмешкай. Вялікія блядыя

вусны, вузкі твар, вельмі прыгожая. Ідзе да мяне, і я ёй усьміхаюся. Падыходзіць, і я бачу, што яна цяжарная. Ня мной цяжарная. Я памру. А ён народзіцца.
Не такі ўжо фаталіст мой Генрык. І ён баіцца.

22 сьнежня. Зноў псіх.
Поўдзень. Я іду на працу. На могілках пазнала варону з майго сну. Тая зьдзекліва пакаркала мне ўсьлед. Прыходжу. Уключаю кампутар і кавaварку. Прыходзіць наведнік і піша заяву: „У міжнародную арганізацыю. Я нарадзіўся й жыву ў Беларусі, на падоле Эўропы, трачаным Расеяй. Зьвярніце ўвагу на створаную тут сыстэму, якая шкодна ўплывае на арганізм чалавека, выклікаючы абыякавасьць, страх, санлівасьць, слабасьць, няўпэўненасьць. Яна вельмі насычаная і ўнікальная. Выкарыстоўвае сьветлавыя, гукавыя сыгналы (як простыя, так і пучковыя). Нясе ў сабе нябачны эмацыйны ды інфармацыйны патэнцыял. Дзякуючы яе ўзьдзеяньню ўлады падтрымліваюць у нас паслушэнства, апатыю і смутак. Я сам патрапіў пад гэты экспэрымэнт, які ажыцьцяўляецца адмыслова падрыхтаванымі людзьмі. Па вечарох мне хочацца легчы й не прачнуцца, у сьне я часта бачу шар мэнтолавага колеру, а зь неба на мяне ліецца то бледнае, то яркае сьвятло. Я сьню сьмерць. Трэба спыніць гэтую машыну“.

2 чэрвеня. Гарманішкі.
— Як гэта ўсё жахліва, Генрык! Я адчуваю, што мы ў скрыначцы. У кожнага свая роля. Батлейка, катрынка, лялькі…
— Наадварот. Жахлівым было б сур’ёзнае жыцьцё. Жыцьцё, што мае абсалютную каштоўнасьць. Жыцьцё ад краю і да краю. Тады б нічога нам не заставалася, акрамя жыцьця.

На сцэне зьяўляецца кола сьвятла. Гэта запаліўся вісячы ліхтарык. Высьвечвае ганак з паддашкам, абвіты духмянымі квасолямі. Паступова робяцца чутныя: сьпевы цвыркуноў, пах матыёлы. Бачна, як гойсаюць ля ліхтарыка мятлушкі. Ля двух ганкавых слупоў сядзяць двое трыццацігадовых людзей. Жыцьцё ўжо крыху пакамечыла іх твары ў сваіх цяжкіх лапах. Люда сядзіць як скамянеўшы, Генрык ловіць рукою кузурку, што пралятае празь сьвятло.

Кола сьвятла пакідае Люду з Генрыкам у цемры і застывае сярод сцэны. Празь сьвятло брыдзе фіялетавая дама ў вялізным саламяным капелюшы і з саламяным парасонам. Пачынае казаць усё тым жа мацюшэнкава-бандарэнкавым голасам, але пад канец тырады голас робіцца і разумнейшы, і глыбейшы.

— А ці ведаеце вы, як гатуецца нямецкае віно ФрухтЯрЦайтэн? Бярэце першыя ягады суніцы — і заліваеце ромам, бярэце другія ягады маліны — і заліваеце ромам, бярэце трэція ягады чарніцы — і заліваеце ромам. Усе фрухты й ягады строга па чарговасьці зьяўленьня заліваеце ромам. На каляды працэджваеце і выпіваеце тое, што даў вам чарговы год.

(Сыходзіць у цемру, апусьціўшы голаў, валочачы за сабой парасон.)

2000

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 5 (10) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **29-08-2000**
[image]

Анатоль Прасаловіч Барысаўская рамантыка

— магістрант Менскага лінгвістычнага ўнівэрсытэту, перакладчык з гішпанскай і англійскай, празаік. Аўтар апавядальняў „Жудасны аўтатэіста“ (ARCHE Пачатак, 1999) і „Шрамы і мятро, або Don t Cean“ („Наша Ніва“, 1999). Належыць да наймалодшага пакаленьня беларускіх літаратараў.

Просім чытачоў нашага часопіса, маладзейшых за 18 гадоў, устрымацца ад чытаньня гэтага тэксту — ён утрымлівае зацяжкія для сьвядомасьці сьведчаньні.

Дзяцінства маё прайшло ў Барысаве на Казіным Розе, у прыватным сэктары, чыя загадкавая назва — сярод звычайных тэхасаў, каліфорніяў, чапаевак ды вакзалаў — быццам прадметам доўгіх мікрапатрыятычных спрэчак і нават боек. Гадоў у чатырнаццаць, калі жыцьцё на вуліцы вялося ўжо па раскладах“, я нейк пайшоў з казінскай братвой „рабіць на раён“. У безразборным, сутаргавым мардабоі нашыя перамаглі, ворагі з Агрэгатаў ганебна зьбеглі гародамі, але аднаго ўсё-такі зрабіць вышчаміла. Паставілі на калені і ўрачыста прымусілі прасіць прабачэньня ў Казінага Рога. Хлопец, занадта нават моцны, дуркаваты ці проста глухі, адно пасьпеў ляпнуць: „Прасьці меня, Казьліны Рог...“ Гераізм каштаваў яму дорага: распаленыя казінарожцы варсалі ягонае кволае цельца па сьнезе хвілін наццаць.

А ў ружовым дзяцінстве ўсё было інакшым. Слова „дурма“ сустракалася толькі ў кніжках па „Роднай літаратуры“, дзе Ленін зь Дзяржынскім вадзілі за нос тумкалаў-жандараў, перапраўляючы на волю розныя цыдулкі (якія, праўда, у падручніках не называліся „малявамі“), пішучы тым самым малаком на палях кніг, якія ім ніхто не перашкаджаў чытаць.

Ці як Ільліч хадзіў па Шушанскім ды балакаў з тамтэйшымі дзеткамі, а калі Канстанцінаўны не было побач — дык і з забайкальскімі мажнымі бабамі, мабыць. Во табе і Сібір. Сапраўды, гуляй — не хачу. Таму турмы не баяліся. Помню адно, што дужа страшыліся патрапіць у Аўган. Аднак кнігі Чаргінца чыталі запоем.

Нейк, седзячы на кухні ў рэдакцыі „Нашай Нівы“, я ўжыў жаргоннае слова „шняга“. Славамір Адамовіч — чалавек са стажам, які чуў два званкі, — пальнуў у мяне дробамі ды шротам абуранасьці на маладое пакаленьне: „Во, бляха, пайшла моладзь, размаўляюць, нібы зону прайшоўшы“. Але ў маім горадзе N, як і ў любым менскім спальніку, слова „шняга“ ўваходзіла ў лексыкон вулічных малалетак калі не з малаком маці, то з папругай п’янага бацькі. Мяне біла мама, і часьцей скакалкай, чым рэменем — далікатна і мэтадычна, таму блатныя слоўцы пацаноў зьведаў я мо гадоў у дванаццаць. Памятаю, у трэцяй клясе, пачуўшы ад свайго аднакашніка бруднае слова „вафліст“, ляпнуў яго на значна здаравейшага суседа-цёзку. Той аслупянеў: „Што, бля?“ Я паўтарыў. Толік, ясна, мне значэньня слова не патлумачыў, бо не дагнаў. Назаўтрае я ціхенька спытаўся пра „вафліста“ ўва Ўладзіка. Той адно таямніча і аўтарытэтна сказаў: „Вафлісты глытаюць вафлю“. Дах з майго прышчыка на шыі не сарвала толькі выпадкова: ніяк я ня мог уцяміць, чаму так зьневажаюцца людзі, якія глытаюць вафлі. Ашаломлены, не вытрымаў і спытаўся ў мамы, якая, як выявілася, вафлі заўсёды жавала і глытала спраўна і прылюдна, і ніхто яе за гэта ня ганьбіў. Маці жаргону ня ведала. Толькі гады праз тры, з базару братвы, я зразумеў, што вафлі бываюць ня толькі „Апельсиновые“.

Сярод веснавое гразі па калена ды асеньняга паху гарэлага лісьця, акрамя простых матаў, зьявіліся такія малазразумелыя мажорным дзеткам тэрміны, як „петушыць“, „апусьціць“, „выставіць хату“, „ксіва“... Пад маім родным горадам стаіць вялікая зона, і кажуць, што зэкі, „адкінуўшыся“, пераседжваюць свае тры месяцы „пад наглядам міліцыі“ ў нашым прыватным сэктары (у тым ліку), дзе можна што і ўчыніць, а табе — па фені, бо „мусары“ да нас носу не сувалі, адно „па цялегах“ ці пад канец месяца, для дабіваньня пляну. Памятаю, завітала да нас пад восень цёця Тома з Данецку, якраз пры канцы месяца. Мы прыехалі ноччу з вакзалу і рушылі з прыпынку дахаты. Я,

схапіўшы цётчыны торбы, спрытна пабег уперад. За паўсотню мэтраў ад мэты да мяне прыруліў міліцэйскі „казёл“, і нейкі голас з машыны гэкнуў: „Э, слыш, малы, што в сумке?“ Адкуль мне было ведаць, што там Цёцьтом прыцягнула са сваёй Хахляндыі? Мужныя рукі абаронцаў гонару й айчыны амаль ужо запхнулі мяне ўва „ўазік“, калі падбегла гаспадыня майна і адбіла мяне, сунуўшы ў тыя самыя рукі бляшанку кансэрваваных кальмараў.

Былыя зьняволеныя прыносілі з сабой ня толькі модныя слоўцы, але і сваю зэкаўскую рамантыку: пацаны зьбіраліся на лавах (а ўзімку хадзілі на суседні раён у брудныя, але цёплыя пад'езды) і — уперамежку з Цоем ды „Сэктарам Газа“ — аддана брынькалі на гітарах ды раўлі пад тры блатныя акорды „Голуби летят над нашей зоной“. Пад тую музыку многія пачыналі піць гадоў у дванаццаць, спалі пасьля пад тымі лаўкамі ці батарэяй у засцаным пад'езьдзе. Ні разу не нажрацца да добрага праблёву ў чатырнаццаць шчыра лічылася лахоўствам і няспынна высьмейвалася.

У восьмай клясе я ўпершыню прыйшоў на мясцовую дыскатэку: прычынай таму было моцнае каханьне (у яе было самае гінэкалягічнае прозьвішча ў сьвеце) і сварка з маці, якая выгнала мяне з хаты. Тады ж была першая цыгарэціна (ня ўцягу). Ніхто з пацаноў (за выняткам самых п'яных ці самых рэліктавых) у хуткіх танцах не скакаў: прыціснуўшыся да сьцяны, яны абменьваліся трапнымі рэплікамі наконт чыксаў, што як прашмонды вылянгаліся і сьвяцілі мясам перад пацанскімі цынічнымі вачыма. „Смага“ ці адэкалён у сарціры падштурхоўвалі братву да геройства, мне давялося пабачыць усяго: і як цыган Рома, у нечым кляўшыся, спрабаваў разьбіць на галаве батл „шампуні“, і як малады кавалер у натоўпе палянуў са свайго браўнінгу проста па-над галовамі тут сама на дыскатэцы, хочучы забіць свайго апанэнта, і як малады амонавец паласануў нажом па горле аднаму вясёламу казінцу, зноў жа ледзь не забіўшы з-за бабы, і як у маіх аднавяскоўцаў раптам абудзіўся антыкамунізм, як яны выкідалі з другога паверху „дзіскачу“ двух хлопцаў, што паначаплялі на сябе, для сьцёбу, стыбраныя ў бацькоў камсамольскія значкі. Бо нэграў, патлатых ці паўжыдкаў пад рукою не аказалася... Жаданьне кагосьці грохнуць узьнікала стыхійна, нібы з паветра, умомант апаноўваючы ўсіхныя зьвіліны. Завязку шукалі проста:

падсылалі якога малалетку (каб быў па пуза), той падыходзіў да абранай ахвяры і даваў ёй высьпятка, каб больш балела, каб была рэакцыя, каб быў хоць кухталь ці падсрачнік у адказ. Аднаго хлопца з Паўночнага выводзілі на вуліцу тры разы. І каталі па сьнезе нагамі, і давалі „бычкоў“ у пераносьсе, і проста адбівалі дыхалку. А ён, як ёлупень, усё вяртаўся і вяртаўся наверх, скрываўлены, напаўсагнёны, з парванай бруднымі ботамі скуранкай і разьдзёртым турэцкім швэдрам. Калі яго міма мяне павялі на вуліцу ў апошні раз, нехта ў „баявой калёне“ спытаўся: „А за што п...дзім хоць?“ „Рыла трахец крывое“ было адказам.

У найбліжэйшым да дыскатэкі пад'езьдзе пяціпавярхоўкі было закуцьце для сустрэчаў, якія часта ператвараліся ў звычайны групавы трах. Адна „бабішча“ з „караедні“ (ПТВ, дзе навучаюць на лесьнікоў), казалі, нават сваю маці вучыла майстэрству спаталяць мужчынскія капрызы. Некаторыя ж, маладзіцы-маладзіцы („мікрашчэлкі“, як сказаў бы хто, лянотна цвыркнуўшы дасьведчанай сьлінай праз зубы), перабіралі з алькаголем ці, як гэта модна ў падлеткавым веку, занадта касілі пад бухіх, і пасьля плаціліся сваёй цнатлівасьцю там жа, у зусім не рамантычных абставінах. І ўсе пасьля ўсё пра ўсіх ведалі ды тыкалі пальцам, перадаючы сябрам падрабязнасьці інтымнай сустрэчы зь вялікай доляй адсябеціны: мазкі да карціны чужое спалукі мелі афарбоўку, адпаведную шалёна-сумбурнаму лібіда таго ці таго апавядальніка.

Паскудзтва часам вылазіла ў дзікунства. Ніколі не забудуся таго, што зьведаў у сваёй роднай школе ў адзінаццатай клясе. А можа я проста пачаў паліць, і таму часьцей стаў заходзіць у прыбіральні, каб пакучкавацца, смалячы, з моладзьдзю. Нікатынавы галадняк ці брак грошай прымушалі нас тады, стоячы ў ачку, паліць адну клясычную „астрыну“ на чатырох у „цыганачку“. Хутчэй, брак грошай. На Казіным Розе дасюль яшчэ самым папулярным вітаньнем застаецца „Дай сігарэту!“. І як у ангельцаў на „How do you do?“ можна пачуць у адказ тое самае, са смачным беларускім Г: „Дай сігарэту!“ Але не пра тое гаворка. Калі я вучыўся ў адзінаццатай клясе, паеханая братва з маёй школы знайшла сабе „петушка“ з 6-ае клясы, які зь першай насіў мянушку Зашчак і якога з паўгоду — пакуль не даведалася маці і не перавезла дзіцё ў іншы раён вучыцца — пад жывёльны рогат і дурныя жартачкі „па кругу“ апускалі ў

прыбіральні, за рогам школы ці дзе ў хмызьзі на фізкультуры, а потым — як знак падзякі — кідалі яму бычок у засранае школьнае ачко. Ён хуценька так нахінаўся, бокам, і той недакурак дабіваў. І да бляску чысьціў — па камандзе „К наге!“ — на парозе школы рукавом свайго мамай вязанага швэдарчыка чаравікі ўсім школьным аўтарытэтам. А настаўнікі тым часам ішлі на працу і толькі сарамліва адварочваліся. Часам залятала блюзьнерская думка, што шаноўныя пэдагогі пра Зашчака ведалі ня толькі гэта. А дзевачкі са старэйшых клясаў шкадавалі хлопчыка, цынічна разважаючы, павесіцца ён, калі вырасьце, ці не. Такія ўжо былі расклады.
Нашая шпана выстаўляла хату за хатай, і іх не садзілі, бо аднаму зь іх было трынаццаць, а іншым — па дванаццаць, гвалцілі старэйшых дзевак, а тыя баяліся кінуць заяву, бо існавала верагоднасьць, што самі пайшлі б за „спакушэньне малалетніх“. Мой сябра Ляма, зь якім мы любілі калісьці на „прадлёнцы“ пабіцца ў шахматы, спачатку атрымаў год умоўна за так і не дапісаную фразу на апарняку „Мянты — казлы!“ (Ляма, па п’яні, рабіў дзьве гераічныя спробы), а пасьля сеў за крадзеж пары мэтраў скурзаму зь нейкага каапэратыву.
Той самы Ляма ў восьмай клясе начапіў сабе завушніцу — такая была мода — і аднойчы прыйшоў з разарванай мочкай: нейкаму зэкану такія „підарскія“ свавольствы не спадабаліся. Праз паўгоду Ляма, як і добрая палова з маіх знаёмых, набіў сабе масьць — „пяць кропак“ — і праз пару дзён ізноў нарваўся на нейкага падпітага „рамантыка“, які на Лямавым твары напісаў, што такую наколку носяць толькі тыя, хто сядзеў у „адзіночцы“. Яшчэ праз пару месяцаў Ляма, зноў-ткі паводле моды, загнаў сабе ў руку вазэлін, які і прывёў гаротніка — і не яго аднога — да хірурга: ад вазэліну мяса нарывае.
Балюча, што шмат зь іх, маіх колішніх сушкольнікаў, суседзяў, сураёньнікаў-казінцаў разумее, што СВАБОДА — ГЭТА РАЙ, а ня вырай, ужо за кратамі. І пішуць там простыя, шчырыя, наіўныя вершы. Пра волю, каханьне, вясну. І абяцаюць сабе больш ніколі. Я ім веру.
Бо СВАБОДА — ГЭТА РАЙ.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 29-08-2000
[image]

Сяргей Шыдлоўскі Партовы горад Экімань

— выкладчык гісторыі культуры ў Полацкім унівэрсытэце. Сталы аўтар „Нашай Нівы". Сярод надрукаванага ім за апошні год — эсэ „Горад мансардаў" пра Наваполацак. Належыць да найманодшага пакаленьня беларускіх літаратараў.

Свінтарь

Менавіта так, не зусім мілагучна, мы вымаўлялі гэтае слова — празь цьвёрдае „с“ і мяккае „р“ — на маскоўскі капыл, бо не засталося нікога, хто б растлумачыў нам ягоны сэнс, а ўсе незразумелыя словы мы ўважалі вучонымі і вымаўлялі іх, як і належыць вымаўляць чужынскую чаўпню — з пракудным пранонсам: „свінтарь“.

Цьвінтар быў гістарычным ядром Экімані — сярэднявечнага прадмесьця Полацку, якое пасьля вайны з маскалямі 1654—67 гадоў і пасьлейшага заняпаду гораду ператварылася фактычна ў самастойнае мястэчка, каб ужо за саветамі стаць саўгасам, ці камунай. Камунарскі жылы барак, у які спраўны экіманец не паставіў бы і казу сваёй цешчы, захоўваўся да апошняга часу як паглядны дапаможнік для ахвотнікаў славянафільскай абшчыннасьці. Частка Экімані, якая прылягала да Цьвінтару, сваю местачковую вартасьць захавала, — падцьвінтарныя жыхары працавалі ў Полацку, а не зараблялі трудавыя „палачкі“ на саўгасных палёх. Гэта і сталася пунктам далейшай варажнечы паміж падцьвінтарнымі экіманцамі і камунарамі, якіх менавалі яшчэ памылкова, — мусіць, па расьсеянасьці, — „калгасьнікамі“.

„Калгасьнікі“ ў абліччы савецкай уласьці прысьпелі папомсьціцца, збурыўшы экіманскую бажніцу, якая і дала

мястэчку імя, ды, зладкаваўшы на цьвінтарных кладах брацкую магілу дужбітаў за сьветлую прышласьць, — з зорачкай на гіпсавым стабуры. Ня шэнціла Цьвінтару і надалей. Празь яго цягнулі нітку вадаправоду — зь невядома каму тут патрэбнай хляраванай вадой. Вадаправод сыстэматычна псаваўся, яго рамантавалі, раскідваючы цьвінтарныя косткі і сярэднявечную кераміку па ўсім мястэчку. Падцьвінтарнікі пачуваліся як у аблозе, ад чаго іхная выспачка экіманскасьці рабілася яшчэ больш згуртаванай — вясельлі і хаўтуры ладзіліся з разьлікам да апошняга местачковага Ёсіпа, талакой калолі кабаноў, а на Купальле палілі вогнішчы на Цьвінтары і выстаўлялі ўздоўж вуліцы з тузін сталоў — бяседа доўжылася ўсю ноч, чаго ніколі не было ў „калхозьнікаў“. Крыўдна, зразумела. Гэтая крыўда на падцьвінтарных экіманцаў, якія яшчэ як на ліха мелі „польскія“ прозьвішчы, — азывалася ў дасужлівых байках аб вазмуціцельнай фанабэрыі і куркуляватасьці падцьвінтарнікаў. Хаваецца гэтая шпілька і ў іранічным „партовы горад Экімань“ — многія экіманцы мелі лодкі, бо сядзібы іхныя выходзілі на бераг Дзьвіны — акурат навідавоку Сафіі (як заведзена, існавалі чуткі аб лёхах, якія пад Дзьвіной нібыта нітуюць Сафійку зь Цьвінтаром).

Напрыканцы 80-х падцьвінтарную Экімань напаткаў лёс ейнай цёзкі — дзьвінскай выспы, якая зьнікла назаўжды пад рачнымі хвалямі. Толькі ў выпадку Цьвінтару гэта былі ня хвалі, а новы мост, пралеглы празь мястэчка. Ацалелы саўгас з камунарскім баракам, заціснуты ўшчытную з аднаго боку Наваполацкам, а з другога — Полацкам, — зазнае незабавам лёс Васілеўцаў, Падкасьцельцаў ды Плаксаў, зьніклых бяз знаку з сучасных мапаў Паўночнай Беларусі. Застаюцца людзі жывыя і нежывыя.

Ліза

Менавіта Ліза паказала музэйнікам месца, дзе ў Дзьвіне, ніжэй за Экімань, быў затоплены Барысаў камень — цяпер ён стаіць ля Сафійкі — апошняй вяхой на шляху вясельных картэжаў перад „рубіконам“ сямейнага жыцьця. Гэты факт, як і Лізіна адлюднасьць, ейныя дзіўныя апранахі, штодзённае корпаньне на сьметніках ды няздатнасьць старэць — нітаваліся ў адзін павучальны вобраз, амаль алегорыю, вартую пантэону местачковых цнотаў, дзе побач з постацьцю якойсьці пэнсійнай Кунегі яна б сымбалізавала сабой сакральную Бзікаватасьць. Зь

няўзоркімі вачамі за тоўстымі дыёптрыямі, у расшлэпках-чаравіках са сьметніку, з пульхнымі рукамі, што клеіліся да кожнай ламачыны — была Ліза як ніхто падрыхтаваная, каб перахаваць для музэйных „мэнэсаў“ таямніцу Барысавага каменя. Мела яна глумаватага братушку, што падпускаў на хаду галубоў ды клічнікі, — ён не адставаў ад яе ні на крок, падобны да палоннага эсэсаўца — гэткі ж здаравезны, рыхтык брылішча, і цалкам ёй паслухмяны. Мо ён і быў палонным эсэсаўцам, — бо ж ані слова па-наску ня ўмеў — немец немцам. Жыла Ліза пад самым Цьвінтаром — зь некарыснага гародчыка, які месьціўся на тэрыторыі колішніх ганчарных вытворчасьцяў старажытных экіманцаў — зямля тут была аж чырвоная ад керамічных аскепкаў. Ліза змагалася зь імі штодня, выносячы вёдры друзу на вуліцу — падсыпаць калдобіны. Маючы кепскі зрок, яна часам разам з чаропкамі выкідала сапраўдныя нумізматычныя пэрліны, чым карысталіся ахвотнікі, папаўняючы свае калекцыі — чаго там толькі не было — ад бурацінак з грошамі-чворкамі да дзенег з капейкамі.

Тося-мандавося

Прыбышы тут блага прыжываліся, але Тося паставіла рэкорд, ня вытрымаўшы і лецейка таварышаваньня з экіманкамі, якія, як на ліха, нічога ня чулі пра палітычную карэктнасьць. У першы ж тыдзень перабываньня Тосі ў Экімані ўсім сталася вядома, што „гэтая пасьлячына падмываецца кожны дзень“. Кампрамат быў агалошаны Тосінай кватэрнай гаспадыняй — Лагуніхай, аб якой пойдзецца ў нас пасьлей. Калі Тося выходзіла з тазам, каб выліць ягонае зьмесьціва пад плот, экіманкі пераглядаліся, а выказаўшыся па сушчастве, — хапаліся раптам і сарамліва адкышвалі ад сябе дзяцей, прыціхлых за пратраўленьнем дарослых трылюдаў. Мужчыны дык былі ня супраць пашкадаваць Тосю за ейную непрыспасобленую, але ўсё яшчэ вызываюшчую жаноцкасьць, адной з праяваў якой зьяўлялася ейная неабачлівая гаварлівасьць, — яна любіла, седзячы сярод местачковых баб у ружовым пэнюары, распавядаць аб сваім гераічным немаўляцтве, праведзеным з бацькам-камісарам у Туркестане. Мяркую, гэтыя кіношныя камісары-туркестаны абуджалі ў экіманках папраўдзе басмачы дух, адпрэчны цывілізацыі пэрманэнту ды пракладак. Яны яе не панаравілі — тут быў

вырак — напрыканцы лета яна адваліла. Мо вярнулася ў свой Туркестан.

Лагуніха

Лагуніха — ці ня самая высокая сярод сваіх таварышак — баламуціла самадыйна Экімань, ладзіла Купальле, ставіла „рагаткі“ вясельным паяздом, ваявала-лагодзілася і вызначала накірунак грамадзкай апініі. Яна не задавальнялася камэнтарамі з лаўкі, ствараючы гісторыі сама, лепячы конікаў ды кулі з падножнага матар’ялу, па той бок дабра і плоту мераючы сьмехам кожнага сустрэчнага. Перахілы ейных жартаў былі хібаю стылю, а не характару, — вось жа і сабакі Лагуніху любілі — узаемна. Яе праз тое лёгка можна пазнаць на фотаздымках — яна заўжды зь цюцькамі (ейнае слова). Дзяцей у яе не было, мела ружовы куст, які квітнеў увесну, падабала партвэйн, што атрымлівалася ў яе, як напісаў бы адзін літаратар, „правільна і жыцьцесьцьвярджальна“.

Зямлячка з Уралу

Міхайлаўна належала да таго пакаленьня экіманцаў, якіх ня трэба вучыць любіць свой край па фільме „Адважнае сэрца“ са знаным шатляндцам у галоўнай ролі. „Як у маскаля сьнег зімой пазычаць“ было зачынам і маральлю ці ня ўсіх ейных гавэндаў. Дваццацігадовае перабываньне сярод чалдонаў толькі ўмацавала ў ёй крывіцкі зацін, дадаўшы яму, што праўда, нейкую ўсходнюю „адпіленасьць“. Пасіянарнасьці гэнай было аж зацесна ў Экімані, — наладзіўшы на падворку самагонную вытворчасьць у буйных памерах, яна спаліла ўшчэнт свой дом разам зь пяцьцю суседзкімі сядзібамі, што сталася пачаткам капца падцьвінтарнай Экімані, — дамы тыя так і не адбудаваліся. Прыяжджалі таварышы з выканкаму і тлумачылі, што ў плянах тут мусіць будавацца хутка мост, таму пажар — аб’ектыўна зьява прагрэсіўная. Міхайлаўна любіла прагрэс — яна ўрочыла, што незабавам Полацак і Наваполацак зьнітуюцца ў адзін вялікі Наваполацак — у гэтым футурыстычным парадоксе яна ўся. І дзеці ейныя, як капаныя, — колькі жылі тутака — усё разводзіліся, судзіліся, рэзалі вены, зашморгваліся на гарышчы і хлабысталі шклянкамі воцат (мусіць, яблычны), напіваючыся ўдрэнг. Захаваліся ў экіманцаў ад Міхайлаўны бюсьцікі Маркса. Яна любіла дарыць на

Акцябарскія правадыроў, а на Вялікдзень — фарбаваныя яйцы і буськацца: „Хрыстос уваскрос!“ Сапраўды ўваскрос.

Западніца
Дом Смаленчыхі стаяў на Цьвінтары, у чым бачылі фундамэнтальную праяву ейнай западніцкай разваротлівасьці, — меркавалася, што па начох яна рые Цьвінтар і цягае адтуль золата. Вось жа і зубы ў яе былі залатыя. Як толькі яна падыходзіла да калодзежу — месца жаночых „сьпевак“ — эмацыйная гамана ўваходзіла ў рэчышча культурнага абмеркаваньня разьлікаў на ўраджай або ціку дыктара праграмы „Ўрэмя“. Ёй пакуль не давяралі — прыглядаліся. Вось ужо пяць год. Яна і сама трымала дыстанцыю, скалячыся залатымі зубамі. Было ў гэтым узаемным прыгляданьні нешта ад дэжавю — кожны пазнаваў адно ў адным собскія патэнцыі, гледзячы нібыта на белавік „работы над памылкамі“ ўласнай натуры. І сапраўды, хто зашкодзіў экіманцам паставіць побач дом ды таксама цягаць па начох золата.

Ведзьма Тонька
Усе здохлыя куры ў Экімані былі на ейным сумленьні. Крэйдавыя крыжыкі па-над дзьвярыма хлявоў не дапамагалі — куры з году ў год здыхалі, а Тонька хадзіла хоць бы хны сабе, нібыта гледзячы скрозь экіманскіх баб. Аб тым, што яна іх усё ж заўважала, сьведчыла шаволеньне ейных вуснаў. Хто знаходзіўся побач — далучаўся да такой ненармаванай аўтэнтыкі, што ўспадкоўваў назаўжды вялізную лінгвістычную веду, прыдатную для любой мужчынскай кампаніі. Бабы адплочвалі ёй менш вынаходліва, але шчыранька, разьвіваючы пераважна тэмы вядзьмарства ды курвельства з фашыстоўцамі. Палітыку яны прыклепвалі, верагодна, ужо не зусім давяраючы эфэктыўнасьці абвінавачваньняў у вядзьмарстве — гэтай крыху састарэлай жаночай тэхналёгіі абясшкоджваньня небясьпечных і больш удатлівых суперніц. Часам баб апаноўвала нейкая ўжо запраўдная параноя, разьвярэджаная грызотамі пляткарскага сумленьня, і тады яны пачыналі літаральна замятаць за сабою сьляды на вуліцы, асьцерагаючыся Тоньчынага суроку. Пра абмываньне твару дзіцячымі сікамі ды абярогі з шпілек няма чаго і казаць, — пры такіх жарсьцях справа бязь іх мела б проста трагічны вынік — вядзьмарскія чары несумненна

ператварылі б баб у жаб. Што да Тонькі, то яе гэта нібыта і не чырыкала, — сваю славу вядзьмаркі і жонажэркі яна несла з годнасьцяй вось ужо восьмы дзясятак гадоў.

Гарадзкая

Яна прыехала з Таліну — поўначы ўсяго, што я ведаў, — паўночней, як меркавалася, жылі адно белыя мядзьведзі. Геаграфічная недасьведчанасьць мая, выбачальная для вучня пятай клясы, была раўнавялікая захапленьню, што ўрочыла мне гэтая істота сваім нетутэйшым пахам, жартамі і развадкай. Загадкавасьць ейнага позірку я тлумачыў сабе адлюстраванымі ў іх фіёрдамі і выдмамі, а калі яна чырванела пад прылівамі гарачай чухонскай крыві — то быў морскі прыбой. Ваколіцы Полацку рассунуліся да спаконвечных межаў на Балтыку, ад якога Экімань адцінаў цяпер толькі найбліжэйшы лясок ды 8-10 гадзінаў сну, што разводзіў нас па дамох. Астатні час мы бавіліся разам, але я пазьбягаў зьвяртацца да яе па імені, — з тых жа, мусіць, гледжаньняў, чаму і старажытныя ўнікалі вымаўляць імёны сваіх божышчаў. Геапалітычны раман наш працягваўся да жніўня. Калі яна зьехала, пырхнуўшы марай на абсягі Балтаскандыі, Экімань страціла сваю самадастатковасьць, сьвет абрынуўся, але гэта быў сьвет местачковых стрэх і страхаў — трагедыі не адчувалася. Проста ваколіцы расхінуліся за бачны на даляглядзе лясок.

Чаго тут няма

Тут няма пахаваньняў. Экіманцы — людзі паджылыя — ці не штотыдня звозілі сваіх мерцьвякоў на клады, каля якіх месьціўся наш дом — не люблю таму духавыя аркестры ды цюлевыя гардзіны, над якімі вытырквaліся вострыя насы наўцоў. Няма тут увогуле ані сьмерці, ані страху перад ёй, што прыходзіў на зьмярканьні. Няма курыцы Хахлаткі, якая кеўкала як котка. Ані знаку тут ад выбітых роварных сьпіцаў, латвійскіх гумак ды кукурузных палачак з цытрынавай глязурай, як няма і Агашкі, Арсеньніхі, туняядца Бельскага, Шыкаў, Фрузкі, Зыбараў ды Іваніхі зь ейнымі кабачковымі аладкамі. Няма піратэхнічных досьледаў, якія калечылі не адно пакаленьне экіманцаў, уталентаваных ня толькі чуйнасьцю на езуіцкія скарбы, але і на тол. Няма тут дзядоў.

Дзяды
Дзядоў, як таковых, і не было. Раўналеткі экіманскіх бабулек згінулі на войнах, у гулагах ды за пошукамі лепшай долі. Аб дзядах тут згадвалі хіба толькі на Дзяды і Радуніцу. Гэта быў „лысагорскі“ сьвет неўтаймаванай з гадамі жаноцкасьці. Дзеці экіманскіх бабулек — нашыя бацькі — былі забаўленыя ў горадзе — на працы, вучобе, на першамайскіх шпацырах ды ў сацыялістычных спаборніцтвах, перадаручыўшы сваім маткам захоўваць местачковыя парадкі, узвычаеньні і сакрэты якіх былі перададзены празь іхныя галовы непасрэдна нам — унукам — відаць, як кампэнсацыя адсунутага ў школьнай праграме „Роднага карэньня“ — Гарэцкі ж напісаў гэтую працу, каб нашчадкам не вяртацца потым да местачковых матываў. Дзіўна, за гэты матыў яго найбольш і запомнілі.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]

№ 5 (10) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 29-08-2000
[image]

Ірына Тоўсцік
Сустрэча, якой не будзе

Гэта дэбютнае апавяданьне Ірыны Тоўсьцік. Журналістка, абітурыентка Менскага пэдагагічнага ўнівэрсытэту. Належыць да найменшага пакаленьня беларускіх літаратараў.

05.02.2000 г. Вечар.

Неверагодна, але праўда. Я раблю яму крок насустрач. Яму і жыццю. Калі я сёння прыйду да яго, майго каханага хлопчыка, стану жанчынай. Гучыць заманліва і па-даросламу. Але... ці гатова я быць дарослай, стаць жанчынай, ягонай жанчынай?! Наўрад ці. Усё ж быць ёю, мабыць, няпроста. Пэўне, трэба мець нейкі талент. А што я?! Нічога не ўмею, акрамя як пальмяна і страсна цалавацца ў вусны. І то не ў абы-якія, а толькі ў ягоныя, такія гарачыя і з пухлінкаю. Адчуваю, на мне, мабыць, нейкія кайданы хвалявання, бо сэрца шалёна скача ўнутры і перасыхаюць вусны. Неяк не па сабе. Да таго ж адна на бясконцым праспекце сярод машын, сярод процьмы машын і цемры, аздобленай святлом ад іх фараў і маленькіх зорачак у небе. А месяц ужо не выплыве, дзіўна. Зіма, навокал снег, а ў душы маёй вясна, цёпленька, як на бабулінай печцы. Ён думае, што я ўжо не прыйду. Мабыць, вельмі перажывае. Праўда, я запазнілася, ды гэта не істотна. Важна, ці адбудзецца тое сёння? Вельмі нервуюся і мне чамусьці страшна. Зусім нядаўна я стала паўналетняй, але гэта не змяніла нічога ў маім жыцці. А калі стану жанчынай, як буду пазіраць на свет, а свет, у сваю чаргу, на мяне? Уяўляеш, адразу столькі пытанняў да самой сябе. Але адказаць самой складана. Цікава, анёлы думаюць аб сэксе? Дурное пытанне. Хутчэй да каханага, ён чакае мяне, каб

зрабіць сваёй жанчынай. І ўсё ж хацелася б мне быць анёлам. Вось толькі крылы, думаю, будуць перашкаджаць.

06.02.2000 г. (Раніцай у машыне добразычліўца).
Апрытомнела толькі раніцай. Лёгкае паляпванне па маіх шчаках і расціранне маіх рук прывяло мяне ў сябе і трошкі сагрэла. Я застагнала, сказала, што ўсё баліць, папрасіла не чапаць мяне. Малады чалавек, які быў побач, мабыць, нічога не разумеў з майго мармытання. Мне здавалася, што я знаходжуся ўсё ў тым жа начным жаху, у руках грубасці і здзеклівай сілы. Я думала, паўналецце дасць мне волю выбару і збавіць ад назойлівай наіўнасці, якая перасследуе мяне з дзяцінства. Не ўлічыўшы таго, што распараджаецца ўсё ж маім лёсам жыццё, а не паўналецце, я вырашыла адразу адолець шлях да кахання, да прыняцця жаноцкасці ўлукаткі. Заўсёды абыходзіўшы тэму сэксу, бо не хацелася так хутка вешаць цяжкі жалезны замок на дзверы ў Дзяцінства, я берагла сваю нявіннасць, бы скарб. А яна, аказваецца, ацэньваецца ўсяго ў 100 баксаў з мноствам пераломаў і сінякоў на целе ды запаленнем лёгкіх. Ці справядліва гэта, калі хлопец, толькі галава якога важыць кілаграмаў 20, валачэ цябе без згоды ў машыну, бы танную гітару, на якой трое мацакоў збіраюцца іграць розныя пошласці, а пасля выкінуць?! Ён, мабыць, ніколі не задумваўся, што вакол яго людзі, а не лялькі, якім можна адламаць нагу альбо руку ці адарваць галаву, як у дзяцінстве. Калі для яго няма розніцы паміж лялькай і мной, дык чаму ж я, а не гумовая лялька, таксама мяккая навобмацак і, калі правільна карыстацца, вельмі падатлівая?
О, Божа! Я ўся ў крыві! Я баялася страціць нявіннасць, стаць жанчынай, а згубіла каханне і давер, згубіла прагу да жыцця, згубіла шчасце. Свет пакрыўся шалёнымі буйнымі кропкамі жуды. Ці варта далей жыць? Думаю, не. І анёл з мяне ўжо не атрымаецца. А я ж хацела проста жыць, кахаць і быць каханай. Я нават не ведаю тых, хто так бязлітасна вырваў самы апетытны кавалачак майго шчасця, бы кавалак шакаладу, які ўсё роўна растане ў руцэ або ў роце, ад яго застанецца толькі фанцік, што неўзабаве апынецца ў сметніцы. Мабыць, жыццё і ёсць вялікая сметніца, куды часам выпадкова трапляюць і добрыя рэчы. Але, на жаль ці на шчасце, час ад часу смецце спальваюць у сметніцы, застаецца попел, які рассейваецца па

зямлі, каб хоць трошкі ўгнаіць глебу... Гэта ўсё нейкі сон, страшны сон, па адзін бок ад якога вырай, па другі — катакомбы, у якіх пакуль яшчэ блукае, блукае мая душа...

Шпіталь.
— Я заўважыў яе на дарозе. Яна паміралa. У кішэнях 100 даляраў і пашпарт. Ёй усяго 18. Нядаўна споўнілася... Яна штосьці гаворыць.
— Ужо было позна, і мне прыйшла неблагая думка ўзяць таксоўку. Я падышла бліжэй да дарогі, каб злавіць яе. Мае думкі далёкія ад рэальнасці, ад шэрасці нашага жыцця. Я захоплена толькі сабой і ім як жанчынай і мужчынам, дакладней, нашымі стасункамі. Мне здавалася, усё будзе прыгожа, рамантычна, як у фільмах, як у казцы. Мой прынц чакае мяне... і я іду, хоць мне страшна і не трымаюць ногі, але я хачу быць менавіта тваёй...
— Ну што там яшчэ? Не нядзеля, а вэрхал нейкі. Пятая прастытутка за ноч?! Спачатку трахаюцца абы з кім, а пасля ратуй іх, блядзёў гэткіх. Як так, дык упіраюцца, а нейкаму ўблюдку за баксы — калі ласка. Грошы для іх даражэйшыя за жыццё! Усё, я не магу больш глядзець на кроў і зламаныя косці. Жудасць! Пакінем гэтую на заўтра для новай змены, а то мяне званітуе. Хадзем лепш піва пап'ем, мне трэба выпаліць пару цыгарэтаў на свежым паветры. А баксы... Вазьмі 50 сабе, хопіць з яе. Заробіць яшчэ.

05.02.2000 г. Вечар.
Хвалююся. Прыбіраюся ўжо даволі доўга. Як ніколі. Як жанчына. Ёпцель! Колькі ўжо ў мяне было гэтых дзяўчат, колькі няскончаных раманаў! Ды што з гэтага. Я адчуваю сябе хлопчыкам, недасведчаным, закаханым хлопчыкам. І ўсё праз яе, маю зайку. Я столькі гадоў яе чакаў. Чакаў яе паўналецця, яе згоды, спеласці. Прыемна, калі чакаеш чагосьці вялікага, прыемнага і цёплага. Каханая, прыходзь хутчэй, я сумую без цябе, я хачу цябе, зая...

06.02.2000г. Дзень.
Shit!!! Гэта праўда, праўда!.. Лёша, налі яшчэ гарэлкі! Вось блядства!!!
У гэтай вясельнай сукенцы яна павінна была стаяць побач са

мной ля алтара! Замест гэтага — у труне!.. Зая! Вяртайся, я без цябе не буду жыць. Зая, ты чуеш мяне, мілая?! Уставай, мы павінны ісці ў тэатр, вось квіткі. Што з табой зрабілі, мілая, адкажы мне! Маё жыццё без цябе — дрэнь, рушыцца ўвесь дом, дзе жыло маё сэрца. Як апошняя сволач я чакаў цябе дома, замест таго каб паехаць і забраць. Я не варты быў цябе, тваіх нявінных пацалункаў. Я не варты цябе! Не варты я свайго жыцця нікчэмнага... Божа! Падаруй і мне... смерць...

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 5 (10) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **29-08-2000**
[image]

Ганна Панамарэнка
Вершы

* * *

... мне сястрычка-гаспадынька
выдасьць пенькную піжамку
у чырвона-белы рубчык
будзе струй мой элегантны
... засыпяваю я куплеты
пра лысога бацьку-чорта
пра свае дурныя справы —
вельмі доўгія рукавы
... у Навінках сонца сьвеціць
я прыгожая гуляю
у чырвона-белым зьзяньні
ад жыцьця адпачываю
... гэй, калегі, падыходзьце
я вам шэрыя касьцюмы
расфарбую размалюю
... я вам фарбу прыхавала
мы ж цяпер ня проста дурні...

Ліпень 1999

Татку, татку, дай парады,
як схадзіць пасраць у грады,

і каб больш на пяць працэнтаў,
чым суседка цётка Генька.
Татка, татка, мы старалісь,
каля лазьні калупалісь,
адрабілі лісапету,
каб ты ехаў да суседа,
каб ты ехаў, татка-радца,
па суседзях пабірацца.
Не да Джона, не да Яна,
а да рускага Івана.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]

№ 5 (10) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **29-08-2000**
[image]

[image]

[image] [image] [image]

Баляслаў Грабінскі
Сакольшчына — Горадня — Вільня

Баляслаў Грабінскі (1899, Сакольшчына, Сакольшчына — 1991, Лонгвуд, ЗША) — адна з цэнтральных постацяў беларускага адраджэння ў Вільні ў 1930-я — першай палове 1940-х гадоў, старшыня партыі Беларуская Хрысьціянская дэмакратыя, старшыня Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Заходняй Беларусі. Ведамы ў Вільні доктар-дантыст, матэрыяльна дапамагаў беларускім арганізацыям, найперш Беларускаму Навуковаму Таварыству, дзе быў — разам з сябрамі сям'і Луцкевічаў, Пінаю і Ігнатоўскімі — адным з самых актыўных ахвяродаўцаў. Пасля ўтварэння ў 1942 г. Беларускай Цэнтральнай Рады быў прызначаны яе старшынёй, але ад гэтай пасады адмовіўся. Пасля вайны эмігрыраваў у ЗША, дзе працягваў мэдычную практыку, быў актыўны ў жыцьці дыяспары: сябра Рады БНР, сябра Беларускага Інстытуту Навукі і Мастацтва, сябра Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня. Друкаваўся ў спэцыялізаваным часапісе беларускіх мэдыкаў на чужыне „Мэдычная думка".

Сваё ўспаміны Баляслаў Грабінскі пісаў для людзей, якія правільна надобны да яго знага шляхі. Прыкладам, др.Вінаўт Тумаш, дырэктар Беларускага Інстытуту Навукі і Мастацтва (ВІНІМ), добра ведаў акалічнасьці вільнескага пэрыяду жыцьця Баляслава Грабінскага, бо сам ён чуўся у Вільнескім Універсытэце, быў сябрам тых жа арганізацыяў, да якіх належаў аўтар. Таму трэцяя частка ўспамінаў „Пакутны пэрыяд", прысьвечаная вільнескім падзеям часоў другое сусьветнае вайны, Пачатак Навіны Форум Пошук Аўтары Цалкам Іншае

адвастрэўскага ўзнаўлення, ці „Чаканай сустрэчы”, якія ты
ранейшымі фрагментамі. Гэта толькі лёгкай дзейнасьцяй, а дакладней
У лісьцёх да Тумаша ад 27 лютага 1989 г. ён пісаў: „Я
да кнігі работу. Ну, а я сяджу і грабіцца ў ідыёцкіх
Дзякуй вам (можа, непатрэбны клопат) свае ўспаміны з
просьбаю прачытаць і даць вашую апінію, ці варта кончыць.
Сакольшчына. * дзесяць гадоў таму й, напісаўшы крыху, пачаў
чытаць. Не спадабалася мне мая пісаніна, і падумаў: каму гэта
патрэбна, і так шмат чаго есьць да чытаньня. І перастаў, не
канчаючы успамінаў.

* Падзел тэксту на часткі й разьдзелы (апроч трэцяе часткі)
зь дазвольленымі публікатарамі.

Нам не вядома, як зрэагаваў др.В.Тумаш на дасланы матэрыял і
на прыкладзены да яго ліст. У кожным выпадку, вядаць, тэкст ні
тады, ні пазьней так і ня быў скончаны.
Адна з мэтаў маіх успамінаў — апісаць жыцьцё пайночнае
Сакольшчыны з часу, калі я жыў там, у маіх маладых гадох.
Хачу пакінуць сьведчаньне пра беларускасьць гэтае прасторы,
якая цяпер, падпайшы пад польскую акупацыю, шпаркім ходам
паланізуецца; асабліва тыя вакольлі, дзе выключна каталіцкае
насельніцтва. Зьмяняюцца не толькі мова й пераканаьні, але і
ўсе аспэкты жыцьця, як ў духоўнай, так і ў матэрыяльнай
культуры. <...>
Паўночная Сакольшчына <...> была падзеленая вузкою
палоскаю лесу на заходнюю ды ўсходнюю часткі. Лес — <...>
шматок вялікай Гарадзенскай пушчы — захаваў значэньне
падзяляльніка прасторы пушчы на заходнюю ды ўсходнюю
часткі, якія гістарычна разьвіваліся ў крыху адменных
абставінах. Відавочна, Горадня была цэнтрам для гэтых
прастораў, бо *запушчанамі* зваліся тыя, хто жыў на захад ад
пушчы, далей ад Горадні. Хаця ад пушчы засталося няшмат,
назоў Запушча пратрываў аж да пачатку XX стагодзьдзя, як і
назоў Шкацёў, які запушчане ўжывалі для тых, хто жыў на
ўсход ад пушчы. Лес быў дзяржаўнаю собскасьцяй, зваўся ў нас
Казённым. Быў ён абкапаны ровам з абодвух бакоў, што зрабілі
ў пачатку або ў палове [XIX] стагодзьдзя <...>.
Вузкі рукаў лесу <...> меў таксама ўплыў на экалёгію нашых
раёнаў: будучы адгалужаньнем <адгалінаваньнем>
Кнышынскае пушчы, якая спалучалася зь Белавескаю, і
падходзячы паўночным канцом пад Аўгустоўскую пушчу, [ён]
служыў натуральнаю дарогаю для зьверыны паміж гэтымі
пушчамі. Ад часу да часу можна было бачыць, як перабяжыць
алень або сарна, а дзеля таго што лес у гэтым адгалужаньні
быў амаль выключна дубовы, дзікі чародамі прыходзілі ўвосень
на жалуды, і часта бульбяное поле блізу лесу было парытае

зьдзейсьнены публікатарамі.
Ініцыятыва ўзнаўленьня „Чаканай сустрэчы” належыць
Сяргею Шупе, які ў 1988 г. пачаў перадрукоўваць
Ініцыятыва ўзнаўленьня „Чаканай сустрэчы” належыць
Сяргею Шупе, які ў 1988 г. пачаў перадрукоўваць
Ініцыятыва ўзнаўленьня „Чаканай сустрэчы” належыць
Сяргею Шупе, які ў 1988 г. пачаў перадрукоўваць
Ініцыятыва ўзнаўленьня „Чаканай сустрэчы” належыць
Сяргею Шупе, які ў 1988 г. пачаў перадрукоўваць
Ініцыятыва ўзнаўленьня „Чаканай сустрэчы” належыць
Сяргею Шупе, які ў 1988 г. пачаў перадрукоўваць

іхнымі лычамі.
Часта ў падлесных вёсках сьвіньня парасілася, прыводзячы парасят бурых з падоўжнімі пасачкамі, — довад, што пагукала зь дзіком. Паабапал лесу па-за равамі цягнуліся вузкія, каля паўвярсты шырынёю, палоскі зямлі, на якіх сядзелі каляністыя. Былі яны ляснымі службоўцамі або нашчадкамі стральцоў ці аб'езчыкаў. Далей, аддзеленыя ад лесу каляністымі, і на захад, і на ўсход ішлі падлесныя вёскі. Адной з гэтых вёсак на заходняй, запушчанскай старане была Ўрачыншчына. Вёска малая, [таму] не тварыла асобнага *сельскаго общества*. Належалі мы да *Яловскаго сельскаго общества* (Ялоўка была суседняю вёскаю, шмат большаю ад Урачыншчыны), дзе быў наш афіцыйны стараста, а наш стараста быў толькі для нашых ґмінскіх справаў і ня мог рэпрэзэнтаваць нас у воласьці.
Геаграфічнае становішча паўночна-заходніх беларускіх этнічных рубяжоў у Беласточчыне, Сакольшчыне й Аўгустоўшчыне спрыяла на працягу гісторыі частым палітычным зьменам і чужынецкім уплывам на шмат якія аспэкты жыцьця гэтых раёнаў. Пры прылучэньні Беласточчыны да Кароны[2] ў XVII стагодзьдзі ўплыў польскае мовы ўсіліўся асабліва там, дзе было каталіцкае насельніцтва. Гэты ж уплыў „польскай веры" адбываўся праз многія пакаленьні ў паўночна-заходняй Сакольшчыне і ў паўдзённа-ўсходняй Аўгустоўшчыне, [у выніку чаго] вытварылася дзьвюхмоўная людзьнасьць.

[2] Карона — пабытовая назва Каралеўства Польскага.
Блізкасьць прускае граніцы таксама мела ўплыў, асабліва на эканоміку гэтых раёнаў. Увосень прускія купцы куплялі ўпасеныя валы й добрыя жарабяты на мяса, што спрыяла гадоўлі коней. Мела мяжа й адмоўныя ўплывы. У другой палове [XIX] стагодзьдзя разьвінулася тут арганізаванае канакрадзтва, якое ператрывала, можа ў меншых памерах, аж да першае сусьветнае вайны. Крадзеныя коні пераводзілі праз Аўгустоўскую пушчу ў Прусію.
Квітнела таксама й кантрабанда. Начамі — не дарогамі, а межамі й граніцамі ў полі паміж вёсак — ішло некалькі чалавек, крадком адзін за другім, нагружаныя таварам. Першы праваднік добра ведаў дарогу й заводзіў у мястэчку да жыда, які трымаў кантакт з прускімі гандлярамі. Тавар быў розны. Шмат шмуглявалі <перавозілі кантрабандаю> тэкстыльных

матэрыялаў, экспэлер у бутэлечках — прускія „Tropfen“[3]. Пэўны час была папулярная пруская гарэлка „Акавіта“[4] ў малых дзераўляных бочачках.

[3] *Tropfen* (нямец.) — кроплі; трошкі, грамулечка.
[4] Відаць, скажонае *Aquavita* (ад лацін. *aqua vita* ’жывая вада’).
Гаворачы аб Прусіі… У самым паўночна-заходнім куце Сакольшчыны пры гасьцінцы стаялі векавыя клёны. Звалі іх *прускія клёны*. Я, будучы малым хлапцом, пытаўся ў бацькі, чаму іх так завуць. Бацька казаў мне, што некалькі вёсак Сухавольскае парафіі ў куце пад Штабінам калісьці былі цягам 15 ці 16 гадоў пад Прусіяй[5] і прускі ўрад загадаў садзіць клёны пры дарозе. <…>

[5] Гэтая частка Рэчы Паспалітай пасьля трэцяга падзелу (1795) сапраўды трапіла ў склад Прускай імпэрыі. Пасьля разгрому Прусіі Напалеонам у 1807 г. гэты абшар быў улучаны ў васальнае Францыі Варшаўскае герцагства, якое праіснавала да 1815 г.
Наколькі гэта частка этнічнае Беларусі была падатная на акупацыю, сьведчыць той факт, што пасьля нямецкае акупацыі ў першую сусьветную вайну нават нашыя паўночныя суседзі, летувісы, акупавалі паўночную Сакольшчыну на пару дзён. Летувіская акупацыя замянілася пасьля польскаю, якая — зь пярорвамі на бальшавіцкую <…> і нямецкую [акупацыі] ў другую сусьветную вайну — пратрывала аж да цяперашніх часоў.

Дзед Станкейч
Радзіўся я ў вёсцы Ўрачыншчына Раманаўскае воласьці Сакольскага павету Гарадзенскае губэрні. Гаспадаром хаты, дзе я радзіўся, быў бацька маёй маткі Мацей Станкевіч (вымаўлялася *Станкейч*). Мой бацька прыйшоў у прымічы з суседняе парафіі — зь вёскі Грымячкі.
Станкейч, паводле вусных паданьняў, прывандраваў з усходу да суседняе вёскі Пакосна пару пакаленьняў раней. Адтуль мой прадзед Тамаш прыйшоў у прымічы да Сенькаўны[6] да Ўрачыншчыны. Відаць, быў ён даволі спрытны, бо разбагацеў у галодныя, мокрыя гады, калі людзі вясною зьбіралі й варылі крапіву, каб перажыць голад. Станкевіч сеяў авёс на трэці сноп

(даваў трэці сноп уласьніку зямлі) ня толькі на полі суседзяў у сваёй вёсцы, але й суседняй, якая была ў тым часе прыгоннаю.

[6] Тут і далей аўтар падае некалькі прыкладаў выкарыстаньня традыцыйнага намінаваньня жанчын паводле імёнаў бацькі й мужа: з фармантам -аўна (Сенькаўна — дачка Сенькі, Аўдулёўна — дачка Аўдуля), з фармантам -анка (-енка) (Буйноўшчанка — дачка Буйноўскага, Крыштопенка — дачка Крыштопа).

Яго адзіны сын, г.зн. мой дзед, меў незвычайны характар. Дзякуючы яму, я пайшоў у школу, будучы толькі адным хлапцом у бацькі. Тут мушу крыху спыніцца на асобе майго дзеда Мацея Станкевіча, каб паказаць, якіх непаспалітых людзей можна было спаткаць на беларускай вёсцы. Сам у школе ніколі не вучыўшыся, ён меў незвычайную прагу да навукі й пашану да — у яго разуменьні — *вучаных* людзей. Ён добра мог чытаць па-польску (выпісваў польскую газэту для сялянаў) і крыху слабей па-расейску, пісаць нядрэнна па-польску й расьпісацца па-расейску (што называлася *граматны*). Дзед быў жанаты тры разы. Першая жонка была Буйноўшчанка з калёніі <выселкаў> каля Кударэўшчыны. Яна памерла пры першых пародах, і навародак таксама памёр. Ад другое жонкі, Аўдулёўны зь Ляшчанаў, дзед меў дзьве дачкі й аднаго сына, які, быўшы малым хлапцом, памёр пад час эпідэміі воспы. Аўдулёўна таксама памерла скора па трэцім дзіцяці, і дзед ажаніўся трэці раз — узяў Крыштопенку зь Ясяноўкі. Гэта [яна], бабка Разалька, была з намі, як мы гадаваліся.

Дзед — відавочна, хацеўшы скампэнсаваць сваё невуцтва, а ня маючы свайго сына, каб паслаць у школу, — меў мяне, унука, першага па лініі да шкаленьня, бо ж толькі хлапцоў пасылалі тады ў школу. <…> Калі ў вёсцы паказваўся хто-небудзь адзеты па-мястоваму, ён стараўся запрасіць на пачастунак. І ня мела розьніцы, ці то быў ксёндз, ці каморнік, ці аб'езчык, ці нават „цыцылісты“[7] зь Беластоку, ставіў самавар, даваў на стол што меў найлепшае: копчаную ялаўцом шынку ці кілбасу, сыр, мёд, канфітуры. Апрача таго, хата Мацея Станкевіча была месцам начлегу ўсім, хто меў патрэбу пераначаваць у вёсцы. Жабрушчы дзед, жыд — гандляр збожжам ці жывёлаю, жыдоўка з кашом, што купляе яйкі й прадае іголкі, ґузікі ды цукеркі, а зімою — сям'я цыганоў, — усе ведалі, што начлег пэўны.

Некаторыя зь іх былі заўсёдашнімі начлежнікамі шмат гадоў. Жыдоўку з Дубровы, Фэйґу, мы, дзеці, называлі цёткаю. Яна, як прыйдзе нанач, памагае матцы варыць вячэру (рабіла смачную зацерку), а як матка занятая, а каторае з нас, дзяцей, перад сном мовіла пацер і ня ўмела добра, то яна памагала пераказаць пацер.

[7] Скажонае ад *сацыяліст*, параўн. з *сыцылістам* з апавяданьня Якуба Коласа „Соцкі падвёў“.
Для нас, дзяцей, кожнае спатканьне з начлежнікамі заўсёды было цікавым і павучальным, хоць часам магло быць і шкодным. Жабрак-начлежнік на прозьвішча Мужыла — эпілептык — дастаў вечарам прыпадку. На мяне прыпадак не зрабіў вялікага ўражаньня (я меў 3—4 гады), але мая на два гады старэйшая сястра, вельмі ўражлівая, дастала пярэпалаху й доўгі час мела нэрвовыя напады: вечарам упоцемку й стоўп ад варот быў для яе Мужылам.
Таксама мой дзед меў звычай пазычаць грошы суседзям з ваколіцы. Пазычаў на вэксалі й ня браў працэнтаў. Звычайна даўжнік, вяртаючы грошы, прыходзіў з бутэлькаю гарэлкі, і рабіўся пачастунак. Быў дзед вельмі даверлівы й любіў дапамагаць бліжняму, ён казаў: „Лепш памагчы чалавеку ў бядзе, чымся трымаць грошы ў куфры“. Былі такія, што выкарыстоўвалі ягоную даверлівасьць, падпісвалі вэксаль, а грошай не аддавалі: „Станкейч у суд не падасьць“. Па сьмерці дзеда некалькі вэксаляў ляжала ў куфры, бацька трымаў іх аж да часу, калі ў першую сусьветную вайну рубель сышоў на нішто й вэксалі згубілі вартасьць. Другі мой дзед, Грабінскі з Грымячкаў, быў больш практычны. Ён трымаў грошы ў банку на працэнты (казённыя банкі плацілі тады 3%[8]).

[8] За савецкіх часоў такі ж працэнт налічвалі на тэрміновым унёску ў *Сберегательн*'ым *банк*'у. — *Зацем аўтара. (Рэд.)*.
Калі я быў у веку чатырох гадоў, дзед Станкевіч зарганізаваў у нашай хаце школу: знайшоў настаўніка з чатырохкляснаю адукацыяй (называўся Жданук), які мог падрыхтаваць вучняў да так званага *аптакбрскага экзамэну*. Вучыў ён расейскае й лацінскае моваў, а пару дзяўчат — польскае мовы. Група вучняў складалася з двох сястрэнцаў <пляменьнікаў> дзеда, чые бацькі былі ў Амэрыцы, хлапцоў з суседніх калёняў

(Жыўны, Банюшкі, Тройгі ды інш.) і з далейшых вёсак, якія кватараваліся ў нас. Школа, ясная рэч, была нелегальная й вучні праінфармаваныя, як паводзіцца, калі б паказаўся паліцэйскі. З гэнае групы моладзі двох сталі пасьля фармацыстымі <фармацэўтамі>, двох — ксяндзамі, а Нікодым Сулік з Каменны — польскім генэралам, камандзерам „крэсовай“[9] дывізіі пад Монтэ-Касіна[10]. З усяго гэтага відаць, што за чалавек быў Мацей Станкевіч — да касьцей чэсны й наіўны ды, на жаль, перакананы паляк. Палянізацыя ўсёй час вялася праз каталіцкі касьцёл. Калі дзед захварэў і некалькі месяцаў перад сьмерцяй моцна цярпеў, а бацькі пыталіся, ці не завезьці яго да доктара, ён не згаджаўся й казаў: „Доктар ня дасьць мне другога жыцьця — Бог даў жыцьцё, Бог забірае“. Дзякуючы дзедавай даверлівасьці, па ягонай сьмерці наша сям’я мела вялікія цяжкасьці <...>.

[9] Крэсовы — тут: складзены з заходніх беларусаў і ўкраінцаў.
[10] Мясьціна ў Італіі, дзе пад час II сусьветнае вайны, у траўні 1944 г., адбыліся самыя крывавыя баі на Італійскім фронце; у іх асабліва вызначыўся 2-і польскі корпус, у якім было шмат заходніх беларусаў, вывезеных бальшавікамі на ўсход СССР.

Бацькі

Бацька мой, Франак, быў уроджаным прыроднікам. Хаця ніколі ён не наведваў школы, але меў асаблівы талент назіральніка й чула ўспрымаў праявы натуры. Ведаў ён, як назваць кожнае зельле, кожную найдрабнейшую кветачку. Знаў ён таксама й птушыны сьвет: ведаў, як бакас, летучы з выраю, бэчаў; дзе было над Баброю гняздо чаплі; як паводзіліся жураўлі на балотах; як улажыць барану на таполі для буславага гнязда, і любіў часта гаварыць пра птушак. Быў ён уражлівай на прыгожасьць натураю. Часта ўспамінаў, якія прыгожыя былі ў Грымячках, дзе ён радзіўся й правёў маладосьць, заходы сонца над белямі <паплавамі>, залітымі ў вясьняную пару вадою да гарызонту. Нам, дзецям, ён падбіраў ведамую сабе мэлёдыю да вершаў Канапніцкай і часта дарабляў пару пунктаў <куплетаў> у ламанай польскай мове, каб сьпяваць. Сам меў добры голас ды музычную памяць і любіў сьпяваць. Ад найменшых гадоў я любіў быць з бацькам і, як толькі была магчымасьць, ісьці зь ім у поле; ведама, і ён таксама любіў

мець мяне пры сабе як першага хлапца.
Аднойчы я меў прыемнасьць пачуць думку стараннае асобы пра майго бацьку. Вучачыся ў польскай гімназіі, жыў я ў інтэрнаце. Гаспадыняю інтэрнату была ўдава па доктару, старэйшая інтэлігентная жанчына, былая прыяцелька Арэшкавай[11]. Спаткала яна майго бацьку, як ён прывёз прадукты на харчаваньне. Ня ведаю, як доўга яна гаварыла з бацькам, толькі пасьля пыталася ў мяне, ці бацька хадзіў у якую школу. Калі я адказаў, што не, яна ўразілася:
— *Zadziwiająco jak dużo wrodzonej inteligencji ma twój ojciec*[12].

[11] Арэшкава — маецца на ўвазе Э.Ажэшка (па-польску *Orzeszkowa*). Аўтар ужывае больш абгрунтаваную, чымся прынятая сёньня ў беларускай практыцы, форму.
[12] Твой бацька надзіва разумны чалавек (*польск.*).
Фізычна мой бацька належаў больш да скандынаўскага тыпу, чым да славянскага. Быў ён вышэй сярэдняга росту зь сьветлымі валасамі й блакітнымі вачыма, скуру меў белую, не шаравую, як тыповыя сяляне, але без рабаценьня.
Маці мая была малога росту зь цямнейшымі валасамі, належала да тыпу, які антрапалёгі называюць другім сьветлым тыпам Эўропы: сярэдні рост, прысадзісты, белае валосьсе ў дзяцей, якое пасьля цямнее, вочы блакітныя, але з дамешкаю бурага колеру, белая з шараватым адценьнем скура, грубое пераносьсе й відныя скулы. Мела маці жывейшы тэмпэрамэнт ад бацькі, але абое выказвалі шмат любові да дзяцей.
<…> Зрадзіла маці ўсіх дзяцей дзесяцёра, але выгадавалася нас толькі пяць. Я быў трэцім па дзьвёх старэйшых сёстрах. Па мне двох хлапцоў і адна дзяўчына памерлі ў маленстве, а наступныя дзьве дзяўчыны выгадаваліся. Пасьля іх дзяўчына памерла малою й апошні хлапец памёр у пятым годзе жыцьця пад час пошасьці крываўкі ў першую сусьветную вайну. Такім чынам, я астаўся толькі адным хлапцом з чатырма сёстрамі ў жывых.

Вёска Ўрачыншчына
Назоў Урачыншчына, як і назовы шмат якіх суседніх вёсак і калёніяў, зьвязаны з тапаніміяй пушчы. У пушчы былі ўрочышчы (урочыскі), багны, пакосныя прагаліны, дубіны, грабіны, альшыны, ляшчыны й г.д. Адсюль і назовы Багнэ,

Ольша, Пакосна, Ляшчане; [прыкладам] калёнія паміж лесам і маёю вёскаю [звалася] Ўрочыска Пакосна.
Пры спасобнасьці <нагодзе> падаю назовы месцаў і часткаў урачыншчынскага поля й назовы некаторых вёсак паўночнае часткі запушчанскае прасторы, каб паказаць, што, за малымі выняткамі, тапанімія ёсьць беларуская. Вось у нашым полі: Загуменьне, Дубіна, Капусьнік, Альшына, Ручай, Смугі, Ручаіна, Грышкавыя Лугі, Багно, Багонан, Восімкі, Дзявяткі. А вось вёскі: Ялоўка, Капцёўка, Аконы, Спадароўка, Грымячкі, Астровак, Падастровак, Лецкі, Ольша, Багны, Гараднянка й г.д. Маю вёску й мы, і нашыя суседзі называлі Ўрачыншчына, але калі гаварылі пра жыхароў вёскі, то найчасьцей ***у*** зьнікала й вымаўлялася *рачыншчане*. Дзеля таго што праз стагодзьдзі чужынцы запісвалі і ў дакумэнтах, і на картах назовы вёсак, [гэтыя назовы] часта былі перакручаныя, сталася гэта з назовам і мае вёскі. Расейцы пісалі *Врачинщина*, а палякі зрабілі *Wroczynszczyzna*, і такім чынам прападае прыгожае ***ў****рочышча* й назоў траціць сваё значаньне.
Урачыншчына была малою вёсачкаю — 17 хатаў, каля 120 жывых душ. Вуліца бегла з паўдня на поўнач і дзеля таго, што гароды былі шырокія, амаль усе хаты былі па адным, усходнім баку. Усе хаты стаялі канцом <тарцом> да вуліцы й былі крытыя саломаю, як і ўсе гаспадарскія будынкі. Першая ў нашай вёсцы хата, пастаўленая ўздоўж вуліцы й пакрытая дахоўкаю, была скончаная якраз перад першаю сусьветнаю вайною.
Паўдзённы канец вуліцы выходзіў на выган, які <...> зваўся ў запушчан выпустам. Паўночны канец вуліцы быў зачынены брукам і варотамі. *Брукам* называлі складзены з камянёў мур <...> сярэдняй вышыні 1,25 м з шырокаю, каля 2 м, падставаю й вузейшы ўгары. Брукі мелі падвойную мэту: адгарадзіць што-небудзь і сабраць з поля каменьні, каб лягчэй было ўпраўляць <абрабляць глебу>. Іх стаўлялі ўсюды, дзе патрэбнае было гароджаньне. Брукамі былі абгароджаныя гароды, выпуст і некаторыя межы; пры вуліцы былі брукі высокія, амаль у рост чалавека, прыгожа мураваныя. Будаваньне бруку вымагала шмат часу й працы, але матэрыял быў дармовы, а загарод — вечны й вельмі эфэктыўны. Прыкладам, конь, змушаны скакаць праз загарод, — ці таму, што брук быў шырокі, ці таму, што ня бачыў, што ёсьць за брукам, — каб пераскочыць, выбіраў плот

ці пералаз нават вышэйшы ад бруку. (Пералаз — пярорва ў бруку для праезду возам, загароджаны дошкамі.)

Крушні

Гаворачы пра брукі, [заўважу, што] <…> адной зь вялікіх невыгодаў земляроба ў маёй вёсцы было мноства камянёў. Урачыншчына й суседняя вёска <…> Багны былі пакараныя натураю <прыродаю> ў гэтым сэнсе больш ад іншых вёсак нашага рэгіёну. Камяні скандынаўскага граніту памераў ад валоскага гарэха да колькітонных валуноў засявалі ўсё поле. Вялікія, якіх немагчыма было парушыць зь месца, тырчэлі зь зямлі, кругом іх трэба было гараць, баранаваць, а на дарозе — аб'язджаць. Меншыя ад кулака не былі шкоднымі, ніхто не зьвяртаў на іх увагі, яны перасыпаліся сахою ці плугам разам з ральлёю, але камень велічыні з кулак, засохшы ў суглінку, выкідаў плуг з баразны, і каб не пакінуць цальніка <цаліны>, аратай мусіў адцягнуць коні ўзад. Саха не была такою ўражліваю <уразьліваю> на каменьне, і таму ўрачыншчане гаралі валамі аж да першае сусьветнае вайны, калі немцы забралі валоў на мяса. Найгоршыя, аднак, былі камяні большых памераў, так званыя *патайнікі*, пакрытыя зямлёю, якіх плуг або саха маглі зачапіць, але не маглі парушыць. Коні звычайна станавіліся, зрэдку ўрывалі пастронак, ламалі ворчык або адгіналі дышаль ад плуга; валы, аднак, не былі такімі чулымі й звычайна ламалі саху. Кожны гаспадар меў запасныя сохі, выцесаныя з дубовага або бярозавага камялька.

Як ужо было сказана, камень ужывалі на загароды, на падмуроўкі пад будынкі, масьцілі падворак, але на гэтыя патрэбы ішла толькі невялікая доля каменьня — каб падчысьціць поле, зьбіралі камяні ў крушні. Прыгожа абмураваная ў квадрат або ў круг куча камянёў — 40—50 вазоў матэрыялу — стаяла найчасьцей пры мяжы палоскі ці надаўка <надзела>. Крушняў была такая колькасьць, што, глянуўшы на поле з вышэйшага месца, можна было бачыць іх некалькі дзясяткаў — да сотні.

Аднойчы, у пачатку першае сусьветнае вайны, данскія казакі затрымаліся на пастой у нашай вёсцы ды ўзялі мяне ў падводы прывезьці сена коням з суседняе вёскі. Двох казакоў ехалі перада мною, сьпяваючы *„заунывную казачую песню“*. Выехаўшы зь вёскі на ўзгорак, яны пабачылі мноства крушняў,

затрымаліся й пытаюцца:
— Хозяин, что это за постройки?
Калі я выясьніў ім, што гэта кучы каменьня, яны адказалі, што першы раз бачаць штось такое й думалі, што гэта, можа, *военные укрепления*. Урачыншчане так зжыліся з каменьнем, што ўтварылі пераробку на велікодную песьню з камюшчыкам <каменьчыкам>:

Дзе ляжыць камюшчык,
Там жыта карушчык <коўшык>,
Альлелюя, хвальмы ж Бога,
Альлелюя.
<...>
Два ўзвышшы — найвышэйшы пункт нашага рэгіёну — зваліся *Крамяныя горы*. Дзеля таго што ўсе хадзілі босымі, кожны адчуваў прысутнасьць камянёў на пальцах ног. Амаль штодзённая падзея — абабітыя пальцы на нагах. А як хто абабіты, балючы, часта з інфэкцыяй палец ізноў трэпне аб камень, то казалі, што *апарадзіў* палец.

Вуліца мае вёскі — не як вёсак, што былі пры публічных дарогах — служыла вылучна жыхаром вёскі. Яна была шырокая. Як ужо было сказана, амаль усе хаты й гаспадарчыя забудаваньні [стаялі] па адзін бок, а па другі ішоў брук. Толькі частка вуліцы служыла дарогаю для вазоў і скаціны, а бок каля бруку ўжываўся на склад і абробку дрэва. Часта можна было бачыць на вуліцы трачоў <пільнікаў>, што пілавалі дошкі або цясалі <часалі> бярвёны на будынак, і заўсёды ляжалі там калоды. Калоды на вуліцы былі сталым зьявішчам да той ступені, што часта стараста, заказваючы на сход <зьбіраючы сход>, падаваў месца: „На калодах каля Кірэйчыка“. <...>
Вуліца яшчэ ўжывалася на табачныя гародчыкі. Да першае сусьветнае вайны не было забароны гадаваць сваю табаку. Вось тыя, хто меў курцоў у хаце, загароджвалі вясною пры адной старане вуліцы гародчык і садзілі табаку — звычайна махорку зь цёмна-зелёным касматым лісьцём, але апошнія гады перад вайною сталі папулярныя *мультан* або *турэцкая* зь сьвятлейшым, гладкім лісьцём.
Гарадзенская тытунёвая фабрыка Шарашэўскага выраблялa ў тым часе папяросы й табаку. Табака ў пачках мела назовы

махорка, *карашкі* й *маніс*. Вяскоўцы стараліся вырабляць сваю [табаку] падобна да купчае <куплёнае>. Карашкі й махорку было даволі лёгка спрэпараваць, але маніс вымагаў большага захаду. Пасьля фэрмэнтацыі зрэзвалі вострым нажом або брытваю жылкі з задняе паверхні найлепшых лісткоў мультану, каб быў аднолькавае таўшчыні, як папера, тады спырсквалі вадою зь мёдам і клалі на пахучае сена сушыць. Трэба было пілнаваць, каб лісьцё не перасохла й не пачало крышыцца. Яшчэ крыху вогкія лісткі скручваліся, і іх кроілі на тонкія „макаронкі“. Табачка была жоўценькая, пахучая, як маніс. Пад час першае сусьветнае вайны я пачаў курыць і сам прэпараваў табаку. Рабіў гэта з адным равесьнікам у вёсцы, бацька якога курыў, бо ў маёй хаце ані дзед, ані бацька не курылі.
Перад хатамі пры вуліцы былі гародчыкі з кветкамі, а пры гародчыках на вуліцы стаялі лаўкі або ізноў калоды, дзе ў пагодны нядзельны ці сьвяточны вечар вяскоўцы праводзілі пару таварыскіх гадзінаў.
<…>

Мова
Запушчане, каб параўнаць шкацёўскую гаворку з запушчанскаю, даюць такі прыклад: *А ў сенцах на млінцы стаіць вада ў вядзерцы, вазьмі пітунец і нажалопкайса*. У запушчан гэты сказ будзе [гучаць так]: *У сенях на жорнах стаіць вада ў вядру, вазьмі кубак і напійся*. <…> Калі мужчына што-небудзь рабіў у сенях, яму можна было заставацца ў шапцы, бо там не было сьвятых абразоў. У памешканьнях, дзе віселі сьвятыя абразы, як на хаце або ў каморы, быў звычай ня мець шапкі на галаве, і як хто-небудзь заставаўся пэўны час з шапкаю на галаве, яму казалі: „Цо ты, як жыд, у шапцы“.
Слова *год* не існавала ў запушчан: год называўся *рокам*. <…> Сакольшчына й Беласточчына як часткі Гарадзенскае губэрні паводле адміністрацыйнага расейскага падзелу належалі да *Северо-Западного края*, дзе ўжываўся юліянскі каляндар і новы год быў дванаццаць дзён пазьней, чымся ў Сувальшчыне (Аўгустоўскі павет) і Ломжыншчыне, якія <…> мелі грыгарыянскі каляндар. Гэты факт выяўляўся ў прымаўцы: *На новы рок прыбыло дня на барані скок* (юліянскі новы год).
Слова *хата* ўжывалася ў значаньні ‘будынак, дзе жывуць людзі’ (прыкладам, „*Усе хаты ў вёсцы крытыя саломаю*“); у значаньні

‘дом, сям’я’ (*Вярнуўся дахаты па доўжшым* <даўжэйшым> *часе ў войску*) і ў значаньні ‘першы, парадны пакой у хаце’. Як гаварылася пра будынак, у месным склоне ставіўся прыменьнік <прыназоўнік> ***у*** (*У хаці цяплей, чымся на дварэ*), тады *хата* як ’пакой’ у месным склоне мела прыменьнік ***на*** (*Паставілі кросна на хаці, бо ў каморы было б зацесно*).
(На хаце паміж вокнамі ў шчытовай і фронтавай сьценах у куце вісела некалькі сьвятых абразоў і крыж, шмат у каго ў куце быў малы стол, і на ім стаяў крыж з падстаўкаю, там жа стаяла ў ліхтарыку грамнічная сьвечка, якую запальвалі пры ўміраючых і пад час сільных грымотаў з маланкамі, бо верылі, што яна бароніць будынкі ад маланкаў. Кут гэты быў месцам, дзе зьвярталіся ў малітвах у паадзіночку ці цэлаю сям’ёю.)
<…>

Валапасы
Як ужо было сказана, валы былі папулярнымі ў запушчан. На гэта складаліся дзьве прычыны. Па-першае, вол у гаспадарцы быў эканамічнейшы работнік за каня. Ён не патрабаваў корму з аўсом, выпасаўся на траве. Па-другое, вол прыносіў гаспадару грашовы даход. Вясною куплялі ў Сухаволі пару худых — прыгнаных здалёк, бо аж з Валыні, — валоў, гаралі [імі] цэлае лета, а ўвосені на Міхала[13] ў Сухаволі прадавалі прускім купцом, зарабляючы каля дваццаці рублёў на штуцы. Але каб быць прададзеным на мяса за добрыя грошы, вол ня мог быць худы, а мусіў быць выпасены, і таму валам патрабавалася асабліва стараннае пасеньне. Гэта вытварыла спэцыяльную прафэсію валапасаў. Дзеля таго што я асабіста празь некалькі гадоў пас валы, затрымаюся на гэтым крыху даўжэй, каб апісаць больш дэтальна.

[13] Дзень сьв.Міхала прыпадае на 29 верасьня.
Валы ня пасьвіліся разам з быдлам усяе вёскі, якое пас наняты пастух. Яны павінныя былі быць напасенымі кожны дзень на работу й выпасеныя на продаж увосені. Дзеля таго кожная хата мела валапаса. Валапасамі былі амаль выняткава хлапцы ад васьма да шаснаццаці гадоў веку, але калі ў якойсь хаце не было хлапца ў гэтым веку, то за валамі йшоў старэйшы мужчына або дзяўчына. Дзяўчаты вельмі рэдка пасьвілі валы;

па-першае, дзяўчына баялася ўзяць валы на валавод і пайсьці зь імі паміж збожжа, каб пасьвіць на мяжы ці на граніцы або спутаць вала, калі зойдзе патрэба; па-другое, часам было вельмі прыкра або зусім немагчыма быць дзяўчыне з групаю хлапцоў, дзе некаторыя зь іх захоўваліся вельмі непрыстойна. Першаю й найважнейшаю задачаю валапаса было навучыцца, як найлепш напасьвіць валы, дзе трымаць іх на валаводзе, дзе спутаць, а дзе пасьвіць свабоднымі. Урачыншчына як падлесная [вёска] купляла білеты на пасеньне валоў у казённым лесе, так што з малымі выняткамі ўся група валапасаў заўсёды была разам. Прабываньне разам некалькі гадзін раніцаю й некалькі гадзін папаўдні кожны дзень спрыяла разьвіцьцю арганізаванага грамадзкага жыцьця групы хлапцоў. Быў там заўсёды адзін старэйшы, дужшы, з моцным характарам, які старшаваў і якога трэба было слухаць.

Валапасы мелі выраблену традыцыю, і падлетак, уваходзячы ў групу як малодшы сябра, адбываў свайго роду „навіцыят“[14]: калі старэйшыя гулялі ў якую-небудзь гульню, ён пераймаў валы ад шкоды, фактычна заставаўся пастухом за старэйшых. Дзеля таго што я пачаў пасеньне валоў, ня скончыўшы шасьці гадоў, мой навіцыят быў доўгі, і калі некалькі гадоў пазьней, пры ўступленьні ў гімназію, *новичкам* давалі „*обновку*“, мне яна не была неспадзеўкаю. Валапасы мелі кары за непаслухмянасьць або непадпарадкаваньне рэгулам <правілам>. Адна з такіх караў была „*рашотка*“ (*рашоткаю* звалася вязьніца пры воласьці). У валапасаў рашоткаю быў невялікі далок <ямка>, у які клалі засуджанага, накрывалі сьвітаю й накачвалі кругом на сьвіту вялікіх камянёў. Малы хлапец ня мог адтуль выбрацца й ляжаў пару гадзін, аж старэйшыя зьлітуюцца.

[14] Навіцыят — выпрабавальны, падрыхтоўчы тэрмін для будучага манаха.

Па-за грамадзкаю школаю валапасы былі для падлетка прафэсійнаю школаю. Ён вучыўся там, як вязаць вузлы, віць пугу й вяроўкі, плесьці пляцёнку з жытняе саломы й шыць капялюш, рабіць дудку зь вярбы й ялаўцовы пішчык да дудкі — як у клярнэта; таксама вучыўся пекчы на полі бульбу й гарох, распазнаваць добрыя й благія грыбы й бэткі <грыбы>; там разьвіваў фізычную спраўнасьць і спаборнасьць, гуляючы ўва

ўсякія гульні; там жа вучыўся курыць табаку. Былі валапасы таксама літаратурнаю школаю: там хлапцы вучыліся песьняў і прыказак, нават такіх, якіх ані ўдома не вучылі, ані ў ніякіх кантычках ня знойдзеш.

Вяртаючыся да валапасаў. Гадзіньнікам для ўсіх быў свой уласны цень, мераны крокамі. Пачынаючы ад дзесяці, да кожнае колькасьці быў рымаваны сказ. Памятаю толькі апошнія тры: *Пяць — гаршке кіпяць*, *штэры* <чатыры> *— у самуй меры*, *тры — дадому пры* — і валапас гнаў валы дамоў.

Як хлапцы, любілі мы спаборнічаць: ішлі навыперадкі — хто скарэй можа бегчы, дужаліся, бароліся, як валы, прыставіўшы лоб да лоба, або як бараны, стукаючыся лабамі з разгону. Асабліва цікавае спаборніцтва было тады, калі валапасы з суседняе вёскі спаткаліся з нашымі. Памятаю адзін выпадак, калі мы спаткаліся зь ялаўчанскімі хлапцамі й пастанавілі выставіць па адным з кожнае групы, каб бароліся, як бараны. Мы ведалі, што наймацнейшыя лабы ў нашай групе маюць Точкі, і выставілі Точкавага Яську. Ялаўчане выставілі Гарасюка. Калі яны стукнуліся лабамі з разгону, Гарасюкоў перавярнуўся й ляжыць непрытомны. Мы перапалохаліся, скарэй па ваду да блізкае лужыны, дый няма чым прынесьці. На шчасьце, па некалькіх хвілінах хлапец ачуняў і ўстаў, толькі крыху крывавіла з расьцятае скуры на лобе. Сталася гэта таму, што Гарасюк улажыў пад шапку малы плоскі камень, які ад удару лопнуў і вострым краёчкам скалечыў скуру; думаў перахітрыць, але не ўдалося.

З гульняў найбольш папулярнаю была „пасеньне сьвінкі“. Гэта быў свайго роду ґольф. Кіі для „пасеньня“ сьвінкі былі падобныя да кіёў для ґольфу з булаўкамі на канцы для смагчэйшага <спрытнейшага> ўдару. Сама „сьвінка“ — шарыкавы <падобны да шару> камень 6—8 см у дыямэтры. Гульня палягала на тым, што пастух павінен загнаць „сьвінку“ ў „двор“ — далок памеру міскі. Кругом двара ў адлегласьці 1,5—2 м былі „ямкі“ для кожнага гульца за выняткам пастуха, які быў вылесаваны <абраны празь лёсаваньне> на пачатку гульні. „Пастух“ жане <гоніць> „сьвінку“ ў „двор“, а ўсе іншыя не пускаюць, адбіваючы назад. Але калі хто-небудзь, адбіваючы „сьвінку“, выме свой кій зь ямкі, а „пастух“ пасьпее ўткнуць свой кій у ягоную ямку, ён [сам] стане „пастухом“. Другая магчымасьць „пастуху“ здабыць ямку — калі „сьвінка“

ўскочыць у „двор“ і ўсе мусяць зьмяніць ямкі, ён можа ўткнуць свой кій у каторую зь іх. Кожны гулец трымае ўсьцяж кій у сваёй ямцы, але калі заходзіць патрэба адысьці, гулец мусіць асьведчыць: „Мая ямка *залепянка*“, і тады гэтая ямка ўважаецца за няісную.
Іншыя гульні, як „качаньне круга“, у якую можна было гуляць толькі ўздоўж дарогі, „дзерце садла“ <сала>, у якой дзерлі дзярно рукамі, не былі папулярнымі.
Пры валапасах падлеткі вучыліся й курыць табаку. Табаку прыносілі з сабою хлапцы, якіх бацькі курылі й мелі табаку свае гадоўлі. Не было яе даволі для ўсіх, і паперы да скручваньня не было, таму выдумалі т.зв. „*землянку* курыць“. Рабіўся далок у зямлі, убіваўся калок каля 3—4 см у дыямэтры, укосна з бакоў уводзілася 6—8 саломінак так, каб канец саломінкі быў каля дна далка, у далок ладавалася табака; як было замала, дакладалі сухога моху, [зьнятага] з камянёў; хлопцы клаліся кожны пры сваёй саломінцы й „закурвалі зямлянку“. Табака ў сырой зямлі, часта з мохам, давала вельмі труючы <атрутны> дым. Як такі пачынаючы курэц смактануў некалькі разоў, то за якіх 10—15 хвілін бляднеў і пачынаў рыгаць. Памятаю, нават па пару гадзінах, як вяртаўся дамоў, мая маці пазнавала й пыталася:
— Чаму ты такі зялёны? Мусі, ты курыў.
Цяжкасьці, якія засталіся ў памяці з часу пасеньня валоў, гэта было раньняе ўставаньне — перад усходам сонца, калі я быў у веку 6—7 гадоў. Або ўвосені, калі пачыналіся прымаразкі й на траве быў шэрань, надта ж непрыемны холад у ногі (валапасы заўсёды былі босыя). Прысядзеш, бывала, падлажыўшы палу ад кажушка пад ногі, каб пагрэцца, але як валы адыдуць, мусіш ісьці па мёрзлай траве за імі. Іншым сродкам пагрэць ногі была валовая мача. Як убачыш, дзе вол, стоячы, насыць, бяжыш скоранька й грэеш ногі.
Шмат засталося з тых часоў і прыемных успамінаў. Пачуцьцё, што ўжо ў малых гадох робішся патрэбным сям’і й нясеш пэўную адказнасьць, — дае самазадаволеньне, як і сяброўства ў групе, [што] мае традыцыю й рэгулы, якія часам былі цяжкія, але давалі зразуменьне грамадзкага жыцьця. На Сёмуху валапасы ўбіралі валоў зялёнымі вянкамі й галузкамі <галінкамі>, вешаючы іх на шыю й рогі, каб увагнаць у вёску ўдэкараваны на зялёна статак валоў.

Мелі валапасы й свайго сьвятога патрона, ня памятаю, хто гэта быў — сьв.Рох ці які іншы. Ягоны дзень валапасы абыходзілі <адзначалі>, пекучы яечню на полі.
Увосені, як гарох на полі сьпеў і можна ўжо было капаць бульбу, пяклі ў вогнішчах гарох або бульбу, і кожны прызнаваў, што печанае на полі смачнейшае, чымся ў хаце.
Быў звычай, што на сьв.Міхала, вярнуўшыся дахаты па праданых у Сухаволі валох, бацька даваў валапасу сярэбранага рубля.
У першую сусьветную вайну, калі заходняя частка Беларусі была пад нямецкаю акупацыяй, немцы забралі ўсе валы на мяса, і па вайне ўжо да сохаў запушчане не вярнуліся, сталі араць толькі плугамі й коньмі.

Кундзейчы
Наш найбліжэйшы сусед Кундзейч (Кундзевіч) меў пяцёра дзяцей. <...> Двое найстарэйшых, Марыся й Вінцук, мелі на тварах *люпус вульгарыс*[15], і, колькі памятаю, Марыся зусім ня мела носа, толькі падвойная дзіра на плоскім твары з грузолкамі <скуламі> і струпкамі. Яе мова была з насавою вымоваю — [яна] *гунгліла*, як мы казалі. Марыся была вельмі добраю папрадухаю, і яе кужаль быў хіба найпрыгажэйшы ў вёсцы. Належала яна да так званага *Трэцяга закону* (тэрцыярак)[16], часта хадзіла да касьцёла й арганізоўвала ўсякія малітвы ў вёсцы.

[15] Lupus vulgaris — лацінская назва хваробы ваўчанкі.
[16] Тэрцыяркі — сьвецкія законьніцы (манашкі) — адрозьніваюцца ад законьніц тым, што не жывуць у кляштары й не прымаюць шлюбаў (абятніцаў).
Вінцук меў толькі часткова ад'едзены нос і таксама характэрныя зьмены на твары. Быў ён адменны характарам ад сястры, ня дбаў пра малітву, а любіў парнаграфічныя песенькі й выказы. Дзеля таго што ў яго хаце не было малодшых хлапцоў, Вінцук пас з намі валы, і мы вучыліся ад яго ўрачыншчанскае пахабшчыны. Цяжка сказаць, ці ён навучыўся ўсяго гэтага дзе-небудзь, ці тварыў сам, трэба думаць, што прынамся ча́сткава ён сам складаў гэтую паэзію, маючы асаблівыя здольнасьці, бо ж гэтага нідзе больш ня чулася. Падам тут некалькі прыкладаў Вінцуковае паэзіі, якія я

запамятаў[17].

А ў відлах <лазьняку> пас быдло —
Абачыў страшыдло:
Кавалак кажуха
Прышыты да бруха.
* * *

Чырым, чырым па балоці,
Старым бабам хуй на плоці,
Маладзіцам жарабячы,
А дзяўчатам — хуй сабачы.
* * *

Сідар, Сідар-макацёр
На дарозі бабу цёр:
Цо паверне — баба перне,
Цо пацісьне — баба дрысьне.
* * *

Ішлі дзяўке па зарэчу,
Знайшлі кустку[18] чалавечу.
Ядна кажа: рэжмо, рэжмо,
Друга кажа: ежмо, ежмо,
Трэця кажа: ні псуймо,
Адна другой усуньмо.
Або дажыначная:

Дажалі жыто, выгналі зайца,
А ў нашаго пана сівыя яйца.
Дажалі жыто, выгналі дразда,
А ў нашай пані сівая пізда.

[17] Большасьць гэтых куплетаў у розных варыяцыях былі занатаваныя М.Фэдэроўскім у ягонай фундамэнтальнай этнаграфічнай працы „Беларускі народ“ (Michał Federowski. Lud Białoruski. Pieśnie frywolne i taneczne. Uzupełnienie do tomu VI. Warszawa, 1960).
[18] Кусткаю запушчане звалі пэніс (*зацем аўтара*).
Вінцук заўсёды меў што сказаць. Прыкладам: хлапец сшывае капялюш, а Вінцук падыходзіць і кажа: „Капалюш, капалюш, я

насраў, ты ні руш“.
Гаворачы пра сям’ю Кундзейчаў, мушу сказаць, што стары Кундзейч, бацька Вінцука, меў таксама цікавы характар. Аднойчы ён муштраваў каня й накруціў павадок на вялікі палец левае рукі. Конь гвалтоўна шарпнуў <тузануўся> і сарваў скуру з пальца. Убачыўшы, што засталіся толькі косьці, нядоўга думаючы, ён палажыў [руку] на калодку й адсёк сякераю два чалонкі <фалянгі>. Пасьля заўсёды прыціскаў табаку ў люльцы абрубкам вялікага пальца. Гаворачы, ён часта паўтараў *быб*, таму ў вёсцы яго празывалі Быб.
<…>

Сьвяты
Дзень новага году быў у запушчан звычайным сьвяточным днём, не было ніякіх адмысловых звычаёвых абходзінаў <сьвяткаваньняў> ані на Сыльвэстра[19], ані на новы год.

[19] Дзень сьв.Сыльвэстра прыпадае на 31 сьнежня.
Па новым годзе наступаў доўгі пэрыяд мужчынам — малаценьня збожжа, а бабам — прадзеньня пакуля, лёну й воўны.
<…>
Гэтак пры зімовай рабоце — мужчын у гумне, а жанчын пры кудзелях — прыходзяць запусты. Два дні ў запусны пэрыяд былі асаблівымі, гэта запусны аўторак і чацьвер, перад запустамі званы ў нас *клусты чвартак* <тлусты чацьвер>. У гэтыя дні нават бедныя дамы, якія часта ня мелі мяса месяцамі, стараліся, каб уся сям’я мела па куску мяса, бо ж у Папяльцовую сераду[20] прыйдзецца загавець на сем тыдняў і пасьціць бязь мяса й без малака. Запушчане пасьцілі вельмі строга, нават малым дзецям не давалі ў посьце [нічога] з малаком, хіба даставалі дзецям за нейкую аплату дыспэнсію[21] ад сьвятара.

[20] Папяльцовая серада (Папелец) — пачатак велікоднага посту.
[21] Дыспэнсія (ад лацін. *dispensare* ’разьмяркоўваць, рэгуляваць‘) — вызваленьне ад выкананьня пэўных рэлігійных абавязкаў. Пад канец посту прыходзіць прадвесьне. На вербніцу ўбіралі „вербы“. Запушчане ня мелі такіх прыгожых вербаў, якія былі ў Вільні. Да некалькіх галузак вярбы прывязвалі мятліцу зь

сітнікам і ўбіралі сухавейкамі. Дзеці сьцёбаліся вярбовымі галузкамі, прыгаворваючы: *За тыдзень Вялікдзень, ні я б'ю, вярба б'е*. Яны цешыліся, што прыходзіць Вялікдзень, найбольш радаснае сьвята ў цэлым годзе. Перш-наперш ужо ў Вялікую сераду[22] ўсю мэблю з хаты выносілі на двор, каб бяліць сьцены. На падлозе на хаце ды ў каморы сьцялілі салому, і ўся сям'я спала на падлозе аж да Краснае суботы[23], што давала дзецям вялікую пацеху. Столь і сьцены бялілі глінкаю. У Капцёўскім полі (якіх тры-чатыры вёрстаў ад Урачыншчыны) было месца, дзе капалі белую гліну. Замяшаная з вадою, глінка давала прыгожую белую фарбу. На столь глінка была вельмі добрая, але са сьцяны бралася да адзеньня, і дзеля таго некаторыя бялілі распушчанаю вапнаю й часам дадавалі сінькі, і тады сьцены былі лёгка-галубовыя.

[22] Вялікая серада — серада перадвелікоднага тыдня.
[23] Красная субота — пярэдадзень Вялікадня.
У Красную суботу выносілі салому з хаты, мылі падлогу й, як крыху падсохне, уносілі мэблю, якая была ўжо старанна вымытая дзень раней. Уся хата пахла сьвежасьцю на Вялікдзень. У Красную суботу гаспадыня пякла пірог з разынкамі ды іншае печыва на бляхах — т.зв. *мазуркі*, варыла яйкі ў цыбульнай лушпе, пасхі запушчане ня зналі. Апрача таго, у суботу прыносілі з касьцёла агонь, каб утрымліваць пасьля ў жары праз цэлы год. За маіх часоў агню з касьцёла ўжо не прыносілі.
У нашай хаце кожны год на Вялікдзень дзед варыў піва й ужо перад вербніцай заліваў рошчаны ячмень і хмель у ставеньцы <гліняным гаршэчку> варанаю вадою, каб фэрмэнтавала некалькі дзён і было гатовае перад Вялікаднем выцадзіць у бочачку й анталак <барылку>. Піва выходзіла дванаццаць вёдзер — дзесяцівядзёрная бочка й двухвядзёрны анталак. Маладое піва шпундавалася <закаркоўвалася> ў дубовых бочачках і чатыры-пяць дзён дасьпявала. Піва было духмянае, бо дзед не шкадаваў хмелю. Хмель быў свой, рос у садку каля плоту й віўся па тычкох. Увосені, як дасьпеў, нашым, дзіцячым, абавязкам было сабраць кунюты <парасткі>, злажыць у драўляны кадлубак і накрыць вечкам, каб ня выветраў. Півам частаваў дзед некаторых суседзяў, гасьцей, якіх мы мелі заўсёды на Вялікдзень, і сваёю сям'ёю пілі са два тыдні па

сьвятах.
Заўсёднымі гасьцьмі былі мазуры Граеўскія з Барглова каля прускае граніцы. Адна мая цётка, сястра бацькі, выйшла замуж за мазура. Яна трымала мяне да хросту <у часе хросту> і як хрышчоная, паводле звычаю ў запушчан, прывозіла мне *валачонна*[24]. Я асабліва чакаў на гэтых гасьцей, бо яны ў Барглове мелі ваду й гадавалі шмат гусей, таму валачонна было са дзьве пары вялікіх гусячых яёк, чаго мы ня мелі ва Ўрачыншчыне.

[24] *Валачонна* — гасьцінец (фарбаваныя яйкі), які дораць на Вялікдзень.
Другім гасьцём, якому мы, дзеці, былі радыя, быў наш прадзед Аўдуль. Хаця нашая бабка, а ягоная дачка, даўно памерла й дзед ажаніўся ізноў, прадзед не забываў пра сваіх праўнукаў і прывозіў кожнаму з нас прыгожа выраблены лыжкі з выразанымі літарамі або падстаўку пад кніжку ці сталочак з ініцыяламі каторага з нас, — такім чынам мы мелі цацкі, якіх па вёсках дзецям не куплялі. Прыяжджалі, таксама на Вялікдзень, трое малодшых братоў бацькі з Грымячак, адзін зь якіх быў жанаты зь сястрою мае маткі. Двое другіх часта памагалі пры работах у полі, і я вельмі любіў быць зь імі. Па многіх гадох спаткаў я абодвух у Чыкага й утрымліваў лучнасьць аж да іх сьмерці.
Вялікдзень на запушчанскай прасторы быў найбольш чаканым і найвясельшым сьвятам. На гэта складалася некалькі прычын. Адна, можа найбольш важная, што гэтае сьвята супадала з прыходам вясны. Селянін чакаў на вясну, асабліва той, якому не хапала пажыву жывёліне, і часта карова была так замораная, што ён мусіў раніцаю памагаць ёй устаць. Былі выпадкі, што ўжывалася салома са страхі, каб датрымаць жывёліну да вясны. Прычынаю чаканьня на Вялікдзень быў той факт, што са сьвятам канчаўся пост. Кожнаму хацелася разгавецца й зьесьці кусок каўбасы ці шынкі ды пачаць есьці з малаком і скаромныя стравы. Разгаўляліся т.зв. *сьвянцонкаю*, пасьвенчанаю [ежаю] ў адмысловай каробцы, куды ўкладалі хлеб, соль, яйкі, каўбасу, шынку, кусок пірага ды іншыя прадукты, якія гаспадыня ці гаспадар уважалі, што трэба пасьвянціць. Перш-наперш сям'я дзялілася сьвянцоным яйком, а тады кожны еў патрохі ўсяго сьвенчанага. Разгавеньне было на сьнеданьне, калі вярталіся з

касьцёла.
Уваскросная <велікодная> служба ў касьцеле адбывалася рана — перад усходам сонца, шмат хто ішоў у касьцёл у суботу вечарам на т.зв. *усюночную*. Па сьнеданьні гаспадар ідзе зь сьвянцонаю вадою, каб пакрапіць ёю ўсе будынкі. Вялікдзень сьвяткавалі тры дні, а ў суседняй, Сухавольскай парафіі сьвяткавалі й чацьверты дзень — ішлі на могілкі маліцца за памерлых.
Уночы зь першага на другі дзень Вялікадня хлопцы хадзілі пяяць велікодныя песьні пад вокнамі ў сваёй вёсцы ды ў дзьвюх-трох суседніх. Т.зв. *валачобнікі* пяялі велікодную песьню, віншавалі й жадалі, кажучы: *Дай, Божа, зорак прыждаці*. Гаспадыня звычайна давала валачобнікам пару або дзьве пары фарбаваных яёк. Я пад час першай сусьветнай вайны, будучы ўжо па трэцяй гімназіяльнай клясе сьведамым беларусам, даведаўся ад свае бабкі, што даўней валачобнікі пяялі для дзяўчат „Ценку <*тонкую*> канапельку“ — песеньку, якая апісвае прыгажосьць дзяўчыны, прыкладам:

Ценка канапелька
На канцу цянейша,
За Дунаем гаем
На канцу цянейша.
А наша Марыся
З усіх найпекнейша,
За Дунаем гаем
З усіх найпекнейша...
А тады аб яе вочках, косках, стройнасьці й г.д.
Калі я навучыў урачыншчанскіх валачобнікаў гэтае песенькі й мы пачалі пяяць [яе] пад вакном, дзе была Каміля, Разалька, Моніка й г.д., атрымалі надзвычайны вынік — гаспадыні давалі чатыры пары валачонна. Відавочна, гэтыя людзі „польскае веры“ любілі пачуць сваё роднае.
Дзеці цешыліся на Вялікдзень, што ўжо могуць гуляць на вуліцы, спатыкацца зь дзецьмі суседзяў і *зубіць* яйкі (ісьці на выбіткі) ды качаць яйкі з гары. На Вялікдзень звычайна стараста склікаў ґмінскі сход, каб палагодзіць справу найманьня пастухоў для быдла й авечак, бо найчасьцей па сьвяце пачыналася пасеньне.
(Ня скончана)

МАЯ АДУКАЦЫЯ

Дарэктар

Навучаньне дзяцей чытаць у паўночна-заходняй Сакольшчыне, як, наколькі ведаю, і па ўсёй Беларусі, адбывалася зімою нанятым вёскаю т.зв. *дарэктарам*. Дарэктар не абавязкава мусіў быць адукаваным, часта гэта быў пастух, які летам пасьвіў каровы або авечкі ў вёсцы, а зімою ня меў нічога да работы, гадзіўся вучыць дзяцей. Бацькі ўважалі за маральны абавязак навучыць так хлапцоў, як і дзяўчат чытаць малітоўнікі ў касьцёле. І дзеля таго, што ў каталіцкіх касьцёлах ужывалася польская мова, дарэктар мусіў ведаць лацінку й вучыў чытаць „на ксёнжках да набажэнства".

Польскае мовы дарэктар звычайна ня знаў, чытаў зь беларускаю вымоваю, прыкладам: *grzechów odpuszczenie* чытаў [як] *грэхаў адпушчэне* й да т.п. Ня знаў дарэктар знакаў прыпынку, ня ведаў, пашто між словамі ёсьць кропкі або коскі ці іншыя знакі, і калі *сту́дант* (так называліся вучні дарэктара) меў пераказаную бачыну і ў канцы бачыны пачыналася слова зь пераносьнікам на другую бачыну, ён звычайна канчаў чытаць на палове слова. Кожны студант меў сказку <указку> з курынага або гусячага пяра й вадзіў сказкаю па радку, які чытаў. Уперш дарэктар пераказваў бачыну студанту, водзячы сказкаю па чытаных словах; тады студант прачытваў шмат разоў і, калі чуў, што ўжо ўмее, казаў: „Пан дарэктар, чы магу здаць". Дарэктар пераслухаў і, як быў задаволены, пераказваў наступную бачыну. Усе дзеці чыталі голасна, і ў хаце ўвесь час быў гул.

„Школа" пераносілася з аднае хаты ў другую кожны тыдзень або два тыдні, залежна [ад таго], колькі дзяцей з хаты хадзіла да дарэктара. У маёй вёсачцы прыпадала — адзін тыдзень ад дзіцяці. Дарэктар у той хаце, дзе праходзіла навучаньне, меў харчы й месца на спаньне. Навучаньне гэтае было нелегальнае з пункту гледжаньня ўладаў, хаця ўлады ведалі пра яго існаваньне й характар і не перашкаджалі. Аднак нам, *студантам*, было сказана, што калі б у вёсцы паказаўся паліцыянт, мы павінны быць на вуліцы й гуляць у сьнежкі ці ў якую іншую гульню.

Я хадзіў да дарэктара дзьве зімы — 1905—1906 і 1906—1907

[гадоў]. Першую зіму вучыў пастух, які пасьвіў авечкі ў нашай вёсцы; другую — малодшы чалавек, які быў больш абазнаны з адукацыяю: ён меў расейскі задачнік і вучыў нас, перш хлапцоў, асноўнай арытмэтыкі й расьпісацца па-расейску, каб маглі пасьля звацца *граматнымі*. Ужо першую зіму я не вучыўся чытаць „на ксёнжцы да набажэнства“, а меў польскую чытанку, бо папярэдняе зімы навучыўся чытаць і пісаць літары, бавячыся зь дзьвюма старэйшымі сёстрамі ды пішучы пяском на падлозе абэцэду. І як дзед, прывёзшы лемантар, сказаў, што дасьць цукерку за кожны добра прачытаны радок абэцэды (дарэчы, ён часам казаў: „Радок купаў гною на полі, а ў ксёнжцы — верш“), я яму адчытаў адразу ўсе тры радкі й дастаў тры цукеркі.

Вучылішча ў Дуброве. Настаўнік Краўцэвіч

Увосені 1907 году дзед завёз мяне да Дубровы, дзе ўжо ад 1905 году існавала трохкляснае прыхадзкое вучылішча. Настаўнікам школы быў Чаквін. Дзеля таго што паехаў я ў школу па скончаным пасеньні валоў, аказалася, што было запозна й настаўнік не хацеў мяне прыняць, але калі дзед сказаў яму, што я вучыўся арытмэтыкі й магу ўжо расьпісацца, згадзіўся прыняць *в первое отделение* <у першую клясу>. Гэтак пачаўся мой першы трохгадовы школьны пэрыяд у Дуброве.

Дуброва ляжала сем вёрстаў ад нашае вёскі, і я ня мог хадзіць у школу з хаты, таму знайшлі мне кватэру ў Ясяноўцы пры сям'і Адама Крыштопіка. Сям'я маіх гаспадароў была малая: Адам, жонка Цанцуха й сынок Лявон, [на] якія тры гады малодшы ад мяне. Усе яны былі вельмі прыемныя да мяне. Брат Адама, Ян, быў ксяндзом і прабаршчаваў <служыў пробашчам> дзесь на малой парафіі на ўсходзе. Я хадзіў зь ясяноўскімі хлапцамі ў школу, як не было сьнегу — праз поле, а калі быў сьнег — вуліцаю празь Юрысдыку й Дуброву. У школе ўсё ішло мне лёгка, так што [я] быў адным з найлепшых вучняў.

На прадвесткі, два тыдні перад вербніцаю, захацелася мне пайсьці ў суботу дахаты, каб у нядзелю прывезьлі мяне назад у школу. Вечар быў цёплы, сьнегу на полі ўжо было мала, толькі вада ўва ўсіх барознах, раўкох і ручайкох. Ішоў я з вазаўлянскімі хлапцамі, пераскакваючы праз раўкі з вадою, і як разагрэўся, захацелася мне піць, ды напіўся з рову пры дарозе. Наступны дзень прывезьлі мяне да Дубровы назад на кватэру, і

я хадзіў цэлы тыдзень у школу, але ў наступную нядзелю вечарам пачуўся дрэнна й у панядзелак ляжаў у ложку з гарачкаю ды меў страшэнны боль галавы. Памятаю, прасіў цётку Цанцуху, каб рабіла халодныя кампрэсы на галаву. Маім хатнім наказалі <паведамілі> [пра гэта], і ў сераду дзед прыехаў забраць [мяне] дадому. Лекара ў Дуброве тады не было, але было двух фэльчараў, да аднаго зь іх дзед завёз мяне па дарозе. Фэльчар сказаў, што ў мяне тыфус, і даў бутэльку лякарства, якое мела выгляд разводненага малака. Перахварэў я вельмі цяжка, пралежаў тры тыдні ў ложку з высокаю [тэмпэратураю], з гарачкаю і ўжо па Вялікадні да школы на вясеньні пэрыяд вярнуцца ня мог.

Школа месьцілася пры Стоцкай вуліцы. Быў гэта спэцыяльны будынак зь вялікім пакоем, дзе ўсе тры аддзелы вучыў адзін настаўнік, і памешканьнем для настаўніка. У 1908—1909 [навучальным] годзе школа павялічылася, першы й трэці аддзелы засталіся ў будынку школы, а другому нанялі новы дом на Юрысдыцы. Настаўнік і кіраўнік школы з прошлага году выехаў (казалі, што высьвяціўся на папа), прыехаў новы, Евец, і дастаў другога маладога настаўніка, які вучыў нас у нанятым доме. Прозьвішча яго было Краўцэвіч; што цікава, ён быў сьведамым беларусам. У другім аддзеле мелі мы двух праваслаўных і звалі іх *рускімі*, калі ўсе іншыя каталікі былі *польскімі*. Аднойчы Краўцэвіч кажа нам:

— Вы ані *рускія*, ані *польскія*, а ўсе вы *беларусы*.

Гэта быў першы раз, калі я пачуў назоў *беларусы*. Быў я тады ў веку 9 гадоў і з кніжак ведаў пра Расею й пра Польшчу, але ніколі ня чуў пра Беларусь. Аднак жа застаўся мне ў памяці сказ настаўніка, і два гады пазьней я ўжо ўсьведаміўся, калі мой сваяк завёў мяне ў Горадні ў Гарадзенскі Гурток Беларускай Моладзі. Краўцэвіч быў у Дуброве толькі адзін год. Летам перад пачаткам заняткаў у наступным годзе прыехала паліцыя з Саколкі й забрала яго: як суседзі ў Юрысдыцы казалі, быў ён арыштаваны за належаньне да сацыялістаў. У тым часе я нічога ня ведаў пра сацыялізм, і мянушка *цыцылісты*, як вяскоўцы звалі іх, была ад'емнаю <адмоўнаю>, бо каталіцкі касьцёл пашыраў нэгатыўнае адношаньне да сацыялістычнага руху. Пасьля, калі я даведаўся аб існаваньні ў тым часе Беларускае Сацыялістычнае Грамады (БСГ) і Згуртаваньня Беларускіх Настаўнікаў, зразумеў, што Краўцэвіч быў сябрам

гэтых арганізацыяў. Што сталася зь ім па арышце, ня ведаю, ніколі больш аб ім ня чуў. На жаль, ня памятаю імя Краўцэвіча, бо ў школе быў звычай зьвяртацца да настаўніка *гаспадзін учыцель*, а не як пасьля ў гімназіі мы зьвярталіся *„па імені й отчестве“*.

Кушнер Штафінскі

Кватэру на другім і трэцім гадох майго дуброўскага школеньня я меў у Дуброве на Стоцкай вуліцы, напроці школы, у Штафінскага. Было нас там двух кватарантаў: я й Вбцё Буйноўскі, абодва ў той самай клясе, у тым самым веку й абодва малога росту.

Штафінскі выраблыў авечыя скуркі на кажухі, як звалі ў нас [такіх людзей] — кушнер. Малое прадпрыёмства, дзе пры ім працавалі двух работнікаў, давала яму добры даход. Быў ён высокага росту, пастаўны мужчына зь вялікаю раздвоенаю, патрыяршаю, барадою. Знала яго ўся Дуброўская парафія, бо кожную нядзелю й кожнае сьвята вёў ён працэсію ў касьцёле як маршалак зь вялікаю булаваю й праз адно рамя <плячо> на комжы[25] шырокаю, золатам шытаю стужкаю. Нам, малым, быў ён цікавым, бо расказваў, як, будучы ў расейскай арміі, удзельнічаў у вайне з Хівою й Бухарою, як здабывалі крэпасьць Геок-Тэпэ[26], дзе ён быў *знаменшчыкам*. Расказваў аб закасьпійскім клімаце, аб фаўне й флёры тамашняй <тамтэйшай>, меў вязку калюшак дзікабраза, якіх назьбіраў на пустынным пяску. Магчыма, гэта было першае зерне, кінутае ў маю псыхіку, каб палюбіць падарожнічаньне, бо ўжо тады хацелася мне самому пабачыць, што чуў у расказах.

[25] Комжа — касьцёльныя шаты, доўгія, з шырокімі рукавамі.

[26] Расейская акупацыя Сярэдняй Азіі адбывалася ў 1860—70-х гг. Хівінскае ханства й Бухарскі эмірат (цяпер ува Ўзбэкістане) страцілі незалежнасьць у 1873 г., туркмэнская цьвердзь Геок-Тэпэ была захопленая расейцамі ў 1881 г.

Меў Штафінскі адну благую звычку — любіў ён выпіць. Піў ён чарку водкі перад кожным абедам, але што два або тры тыдні ішоў з прыяцелямі ў карчму, прыходзіў п’яны дамоў і біў жонку. У гэтых выпадках мы, Болесь з Вацем, сядзелі ціханька недзе ў куточку, каб перачакаць буру. Штафінская была жанчына нізкага росту й шчуплая, мы звалі яе *цёцяю*, яна

апекавалася намі вельмі добра.
Мелі Штафінскія аднаго сына, на імя Зыгмунт, які быў у тым часе ў *высшэ-начальным* вучылішчы ў Саколцы, пасьля скончыў Віленскую Духоўную Сэмінарыю, але, будучы яшчэ маладым ксяндзом, расьпіўся й памёр у Вільні ў доме для зьняможаных ксяндзоў. Відавочна, ня быў ён добрым кандыдатам на сьвятара й пайшоў у сэмінарыю, каб дагадзіць бацьком. Памятую, адной вясны ён прыехаў з Саколкі на велікодныя канікулы, як мы яшчэ былі ў школе. Менш за вярсту ад хаты Штафінскага пры дарозе ў Стоцак быў дуброўскі магільнік. На магільніку рос лясок маладых соснаў. За магільнікам пры стачанскім полі было малое возерца. І вось Зыгмусю прыйшло ў галаву напілаваць бярвёнаў і зьвязаць плыт на возерцы. Забраў нас зь пілою й тапаром, і, пілнуючы, як нікога не было на дарозе, спусьцілі мы тры ці чатыры сасонкі, парэзалі на кускі па паўтара сажня й 12 бярвёнаў злажылі пад каменную сьцяну, якою быў абгароджаны магільнік. На жаль, як пайшлі мы на другі дзень па поўдні, каб вязаць плыт, бярвёнаў не знайшлі: нехта пабачыў і забраў.
Трэба думаць, што кс.З.Штафінскі цікавіўся беларускімі справамі, бо ў доме яго бацькоў быў беларускі каляндар з каторагась з дваццатых гадоў, у якім была мая фатаграфія; Штафінская сказала аб гэтым маім бацьком.
Трэцюю зіму нашае трэцяе „аддзяленьне“ было ў школьным будынку й настаўнікам быў Евец. У навуцы ніякіх цяжкасьцяў я ня меў, будучы адным з найлепшых вучняў. Вёў я сябе таксама добра, ніколі не стаяў у *вуглу* й ня быў караны, за выняткам адной „лапы“ на другім годзе, калі вясною на вялікай *пераменцы* мы, амаль уся кляса, гуляючы, пабеглі далёка на гару й ня чулі званка, каб вярнуцца ў час. Калі мы прыйшлі ў клясу з дваццаць хвілін па званку, Краўцэвіч[27] выдзеліў кожнаму цяжкою лінейкаю па далані — [даў] „лапы“.

[27] Тут памылка — павінен быць *Евец*.
На выпускныя экзамэны Евец запрасіў урадавага прадстаўніка — станавога прыстава. Той прыйшоў з торбаю цукеркаў, а настаўнік прыгатаваў кніжкі, каб *награждаць* добрых вучняў. Па маім экзамэне прыстаў сказаў:
— Маленький, но удаленький, — і даў мне прыгаршчы цукеркаў, а настаўнік, пахваліўшы, даў мне кніжку Гогаля

„Заколдованное место“.
Дзіўным трафам <чынам> арыгінал *Свидетельства* [аб сканчэньні вучылішча] ў мяне захаваўся, тады калі арыгінал мэдычнага дыплёму згарэў, і маю толькі копію.
Вясною 1910 году закончыўся мой першы этап адукацыі — з добрым вынікам.

Горадня. Францішканскі касьцёл
Другі этап мае адукацыі пачаўся летам 1910 году прыгатаваньнем да ўступных экзамэнаў у Гарадзенскую Гімназію. Пасьвіць валы я мог толькі часткова, бо кожны тыдзень хадзіў на пару дзён да Бітага Каменя да [нашага] сваяка Ляўковіча, які прыгатаўляў мяне да экзамэнаў. Біты Камень — малая падлесная вёска па ўсходняй старане лесу, каля шасьці вёрстаў на поўдзень ад Урачыншчыны. Там і жыў Ляўковіч, жанаты зь сестраніцаю <пляменьніцаю> майго дзеда Грабінскага. Найстарэйшы сын Гадэўко быў у Амэрыцы й прысылаў грошы, каб вучыць малодшых братоў. Янка Ляўковіч быў у тым часе скончыўшы шостую клясу гімназіі й прыгатаўляў свайго малодшага брата Вінцука й мяне да экзамэнаў.
Зайсьці ў Біты Камень забірала ў мяне каля паўтары гадзіны. Ішлося ўвесь час вялікім дубовым лесам, я добра спазнаў дарогу, вышукаў, дзе можна было сабраць баравікоў, і прыносіў у Біты Камень — або, ідучы назад, дадому — торбу прыгожых, з шэрымі галоўкамі баравікоў. У дубовым лесе баравікі мелі шэрыя, а ў сасновым бары рудыя шапачкі. Эх, любіў я хадзіць па лесе!
Заняткі ў гімназіі пачыналіся 15 жніўня, а ўступныя экзамэны былі некалькі дзён раней. Я паехаў у Горадню з сваяком першы раз цягніком. Прыехалі мы ў горад вечарам, і ўсё: цягнік, камяніцы, сьвятло ў лятарнях <ліхтарох> на вуліцы, рэклямы з каляровых электрычных лямпачак перад кінамі — рабіла на мяне незвычайнае ўражаньне, усё гэта бачыў я першы раз.
Уступны экзамэн я здаў, але дзеля таго што кандыдатаў было шмат — больш, чымся месцаў на прыняцьце, — і я як сялянскі сын ня меў ніякае пратэкцыі, запісалі мяне шостым кандыдатам. Такім чынам зіма 1910-га на 1911-ы для мяне прапала, бо першы кандыдат мог спадзявацца, што паміж васьмідзесяці вучняў першае клясы (былі два паралельныя

аддзелы па сорак вучняў) можа што-небудзь стацца й ён будзе мець месца, але ня шосты. Вярнуўшыся дамоў, я ізноў пасьвіў валы да позьняе восені, а зімой да дарэктара не пайшоў. Па калядах завезьлі мяне зь Вінцуком Ляўковічам да Горадні жыць зь Янкам і прыгатаўляцца да экзамэнаў.

На левым беразе Нёмана — на прадмесьці Горадні, Фартштаце, — стаяў Францішканскі касьцёл з кляштарам. Ордэн францішканскіх манахаў даўно ўжо пакінуў гэты кляштар, і ў пачатку ХХ стагодзьдзя пры касьцёле была парафія, але двухпавярховая будыніна кляштару — з цэлямі <кельлямі>, вялікаю сталоваю й кухняй — была ў добрым стане. Біскупская капітула Віленскае дыяцэзіі прысылала туды ксяндзоў за благое паводжаньне на пакуту. Пробашчам парафіі быў кс.Баярунец, летувіс, меў ён пры сабе чатырох братанкаў <пляменьнікаў> і ўзяў Янку Ляўковіча на рэпэтытара для іх. Трох хлопцаў Баярунцаў былі менш-больш у маім веку: двох у пачатковых клясах гімназіі й адзін у першай клясе рэальнага вучылішча, чацьверты сястрэнец ксяндза, гадоў шаснаццацёх, ня быў у школе, Янка вучыў яго ўдома: прыгатаўляў да якіхсь экзамэнаў. Янка меў за гэта сталаваньне й цэлю, у якой спаў. Прыехаўшы зь Вінцуком у Горадню, мы жылі зь Янкам у той самай цэлі. Францішканскі, як бальшыня кляштараў, быў збудаваны ў квадрат з кружганкам <нутраною галерэяй> у сярэдзіне. Адна сьцяна кружганка быў касьцёл, а тры — кляшторны будынак. У кляштары нанізе й наверсе ўздоўж нутраное сьцяны ішоў шырокі калідор з вокнамі на кружганак і дзьвярыма да цэляў. Усіх цэляў было каля дваццацёх. Са тры зь іх былі перароблены на памешканьне для пробашча, у іншых жылі гаспадыня са служанкаю, арганісты, братанкі ксяндза, мы зь Янкам Ляўковічам, у адной малой, пад сходамі, жыў жабрак, а большасьць пуставала: пакутных ксяндзоў было мала, на працягу чатырох гадоў, прыпамінаю, толькі двох, якія жылі там па некалькі месяцаў. Апрача цэляў, ксяндзоўскага памешканьня, сталовае й кухні, была вялікая кладоўка й лазьня.

Касьцёл з кляштарам, як і цэлы Фартштат, месьціліся на высокім беразе, за выняткам малой вулічкі, якая нанізе на поўнач ад [касьцёла] Францішканаў вяла ўздоўж Нёмана да фальварка Хлявінскага. Кляштар быў абведзены высокім мурам разам з садам, гаспадарчым будынкам і вялікім падворышчам.

Францішканы былі ўласьнікамі фальварку некалькі вёрстаў на захад ад Горадні пры Асавецкай шашы.
Фартштат у тым часе меў, за выняткам успомненай вулічкі нанізе, толькі адну вуліцу — нагарэ, раўналежную, ад Нёмана на поўдзень ад [касьцёла] Францішканаў з мастом над дарогаю з Асавецкае шашы на мост празь Нёман. Пры гэтай вуліцы стаяла сынагога <...>, дзераўляная, з асаблівай архітэктурай. Фартштат розьніўся ад гораду, быў падобны да малых мястэчкаў на Беларусі. Тады як у Горадні каталіцкая інтэлігенцыя гаварыла па-польску, праваслаўная — па-расейску, жыды — ламанаю расейскаю моваю, Фартштат гаварыў па-беларуску. Было там пару жыдоўскіх хатаў, дзе гаварылі па-жыдоўску й па-беларуску тож. Мы зь Вінцуком Ляўковічам, а пасьля я сам, сталаваліся ў адной хаце праз вуліцу ад кляштару, наша гаспадыня ня знала ані польскае, ані расейскае мовы, гаварыла толькі па-беларуску.
Чым для мяне быў цікавы пэрыяд, калі я й Вінцук жылі зь Янкам у Францішканскім касьцёле, — гэта маім нацыянальным усьведамленьнем. Янка, вучачыся тады ў сёмай гімназіяльнай клясе, быў ужо сьведамым беларусам, сябрам Гарадзенскага Гуртку Беларускай Моладзі, зарганізаваным у 1909 годзе кс.Францішкам Грынкевічам. Іграў Янка на скрыпцы й быў кіраўніком малога хору. Ён браў нас пяць з хорам беларускія песьні, на вечарынкі Гуртку, хаця мы не былі сябрамі. Я горача ўспрымаў усё роднае й цяпер зразумеў, *што* два гады таму сказаў нам у пачатковай школе настаўнік Краўцэвіч. Мне хацелася быць сябрам Гуртку, але я змог улучыцца толькі ў наступным годзе, калі ўжо стаўся гімназістам. У гэтым часе я ня толькі атрымаў нацыянальную сьведамасьць, але й замацаваў яе на цэлае жыцьцё.
Адзін эпізод з гэтага часу астаўся мне ў памяці. Янка часта хадзіў вечарам вучыцца да калегі <...> — Антонка Дохі, вяртаўся звычайна позна ўночы, але ўвайсьці ў кляштар ня мог, аж хто-небудзь адчыніць дзьверы знутры. Ад дзьвярэй з вуліцы ў муры [ён] меў ключ, тады ішоў у сад, куды выходзіла вакно нашай цэлі, і доўгаю жэрдзяю стукаў у вакно. Мы будзіліся й ішлі адчыніць дзьверы.
Перад Вербніцай 1911 году, у суботу, ён таксама пайшоў да калегі й, вярнуўшыся, стаў ламацца. Але на нас напаў якісь незвычайны сон. Нягледзячы на тое, як доўга й як голасна [ён]

ламаўся, нас не пабудзіў. І калі на сьвітанку амаль усе жыхары кляштару былі разбуджаныя й нехта памог яму прынесьці драбіну й блізка выламаць, адчыняючы, вакно, ён улез праз вакно й пабудзіў нас. Што найгоршае: нашыя з коньмі й вазамі як зь Бітага Каменя, так і з Урачыншчыны мелі знайсьці нас на Вербніцу ў Дуброве. Цягнік ішоў рана з Горадні ў Красны Сток, а адтуль тры вярсты пехатою да Дубровы. Пакуль нас разбудзілі, было ўжо позна, але мы, адзеўшыся ў пару хвілін, падаліся бягом на прыстанак Ласосна, які быў бліжэй ад Фартштату, чымся станцыя ў Горадні. На жаль, было запозна, цягнік ужо пайшоў.
Янка, доўга ня думаючы, пастанавіў ісьці пехатою па шпалах уздоўж жалезьніцы <чыгункі> да Ражанастоцкага прыстанку, а тады ў Дуброву. Янка быў высокім хлапцом і сягаў празь дзьве шпалы, Вінцук таксама вышэйшы ад мяне, я быў найменшы, мне гэтае пехатаваньне прыходзілася найцяжэй. Бязь сьнеданьня, несучы цяжкую сьвітку, я скора ўтаміўся й часта прасіў Янкі, каб адпачыць, але ён не згаджаўся, бо баяўся, што мы ня зможам захапіць сваіх у Дуброве, могуць выехаць дамоў па службе ў касьцёле, і тады дарога будзе яшчэ даўжэйшая. І так мы, [прайшоўшы] каля трыццаці вёрстаў па шпалах і тры ад прыстанку ў Дуброву, — я [быў] чуць жывы, — прыбылі пад час нешпараў <вячэрняе службы> і знайшлі сваіх з коньмі. Я шмат у сваім жыцьці хадзіў пехатой і любіў хадзіць, але заўсёды прыпамінаў падарожжа на Вербніцу, у дванаццатым годзе жыцьця.

Гімназія
Наступную восень я быў добра прыгатаваны да экзамэнаў і мяне прынялі ў *Второе параллельное отделение перваго класса*, альфабэтычны мой нумар быў 12. Гімназія мела *приготовительный класс*, зь якога вучні аўтаматычна пераходзілі ў *Первое параллельное отделение* й былі ўжо старымі гімназістамі з традыцыяй, а мы былі *новичками,* і нам давалі „*обновку*“.
Паміж сарака вучнямі мае клясы было шмат беларусаў, але праваслаўныя, як Абаровіч, Ботвіч, Кузьміцкі, уважалі сябе за расейцаў, а каталікі, як Андрушкевіч, Зьмейка, Шаціла, Гукала, — за палякаў. Я толькі адзін у клясе быў сьведамым беларусам, сябрам ГГБМ <Гарадзенскага Гуртка Беларускае Моладзі>.

Але Гурток быў падпольнаю арганізацыяй, і ніхто ня ведаў аб маёй беларускасьці. Мы мелі ў клясе чатырох жыдоў (у сярэдніх школах таго часу быў *numerus clausus* — у *Северо-Западн*'ым *Кра*'і жыдоў прымалі толькі 11%), адзін немец — Гольцман — і адзін татарын — Мухля. Вучоба давалася мне лёгка, з усіх прадметаў меў добрыя адзнакі, за выняткам расейскае мовы, над якою я шчыра працаваў, але настаўнік Іван Іванавіч *Остроумов* (паводле плётак у школе, ён зьмяніў прозьвішча з *Халуя* на *Остроумова*) не любіў палякаў, асабліва зь беларускім акцэнтам, і не даваў мне ў першай клясе больш, чымся „тройку".

Дырэктарам гімназіі быў *Глебов, действительный статский советник*, тугі характар, не гаварыў з вучнямі, хадзіў як палку глынуўшы, на парады надзяваў грамадзянскі ўніформ і шапку з доўгім хвастом уперад і ўзад, галюнамі абшытыя берагі й з бляшкай на левай скроні, як напалеонаўскі маршал.

Інспэктарам быў *Димитрий Иванович Очкин* — нізенькі, з вусікамі, вучыў геаграфіі. Кожная кляса мела спасярод настаўніцкага пэрсаналу кляснага настаўніка, які апекаваўся клясаю. Фізыкі вучыў татарын Якуб Суліманавіч (ня памятаю прозьвішча), ён часта паўтараў сказ: „*Ефу ты несчастие, в самом деле, черт знает что такое*". Цікавай пэрсонаю быў адзін *помощник классного наставника* Сілівонік — бяззубы стары, які ўжываў табаку.

Уніформ вучняў быў: рубашка-касаваротка й нагавіцы з чорнага сукна, ґузікі ў рубашцы — два на каўняры й тры ўздоўж разрэза, мэталёвыя, белыя; пояс з *пряжкою*, на ёй літары *Г.Г.* <Гродненская гимназия>. (У 1912 годзе гімназія атрымала новы назоў: *Гродненская гимназія имени графа Тормасова*[28] — у зьвязку са стагодзьдзем *Отечественной войны,* і тады ўвялі ў пэўнай камбінацыі ўсе пяць літараў і на *пряжку*, і ў герб на шапку.) Паліто з шэрага сіняватага сукна з хлясьцікам і двума вялікімі ґузікамі ззаду ды два рады ґузікаў наперадзе, а на каўняры цёмныя сінія ярлычкі з ґузікамі. Шапка (*фуражка*) з шэрага сукна, як і паліто, зь цёмнымі сінімі рубчыкамі і гербам наперадзе. Зімою яшчэ даходзіў башлык <род капюшона> цаглястага колеру. Вучні маглі мець [урачысты] ўніформ — ён вымагаўся, як хто хацеў ісьці на вечарыну, якіх звычайна было дзьве кожны год. Гэта быў сурдут зь цёмнага сіняга сукна, абціслы да пояса, зь дзевяццю

вялікімі ґузікамі наперадзе, стаячым каўняром, абшытым сярэбранаю стужкаю, з паламі да кален. Часта абсальвэнты <выпускнікі> прадавалі малодшым сурдут за некалькі рублёў.

[28] Аляксандар Тармасаў (1752—1819) — расейскі генэрал, браў удзел у задушэньні паўстаньня Касьцюшкі, вызначыўся ў французска-расейскай вайне 1812 году ў баёх пад Кобрынем.
Як ужо было ўспомнена, я жыў на Фартштаце й хадзіў у школу праз мост на Нёмане. Меў я кампанію да хаджэньня: заўсёды ішлі мы ўтрох — двох Баярунцаў і я, са школы часта прыходзілася ісьці ўпаядынку <самому>. Зімою, як Нёман замярзаў, ішлі мы праз раку па лёдзе, бо было бліжэй. Часам раніцаю бачылі мы дзівака, які прыходзіў у купальным касьцюме й футры да прорубкі на лёдзе, зьнімаў футра, ускакваў у ваду на пару хвілін, вылазіў, надзяваў футра й ішоў у горад: відавочна, жыў дзесь на Падзамчышчы.
Аднойчы ішлі мы са школы зь Юзікам Баярунцам праз мост, а быў сільны мароз зь ветрам. Абодва мы мелі башлыкі, але башлык зложаны пад аколышка шапкі, не надта закрывае вушы. Даходзячы да дзьвярэй кляштара, я ўбачыў, што вуха майго кампана ў верхняй частцы белае.
— Юзік, — кажу, — памарозіў вуха.
Ён глянуў на мяне й кажа:
— Тваё тож змарожана.
Мы ўбеглі ў кухню, і Марцэлька (так звалі гаспадыню, [яна была] летувіска й не вымаўляла літары *х*: у яе ***х****леб* быў ***к****леб*, а любіла часта паўтараць слова ***к****вароба*), пабачыўшы нашыя памерзлыя вушы, усклікнула:
— О кваробa, такі мруз <мароз>, памрозіла вам вушы.
Яна скора прынесла сьнегу, каб паволі адмарозіць, а пасьля аблажылі [вушы] гусячым тоўшчам <тлушчам>. Юзік змарозіў абодва, а я толькі левае. Мы хадзілі некалькі дзён са спухшымі вушыма, але ўсё выгаілася без камплікацыі.
Гарадзенская Гімназія была адной з найбагатшых школаў у Расейскай Імпэрыі. Месьцілася яна ў паддамініканскіх мурох <былым дамініканскім кляштары>, дзе перад тым была дамініканская школа. Расейскія ўлады, ліквідуючы старую вялікалітоўскую школу, перадалі ўсю маёмасьць, награмаджаную вякамі з дароў князёў і паноў, расейскай гімназіі. Апрача таго, людзі не перасталі запісваць дары на

гімназію. Я меў нагоду бачыць копію дакумэнта з 1905 году, якім Воўк, уласьнік камяніцы ў Горадні, дараваў гімназіі 5000 руб., зазначаючы, што з працэнтаў гімназія будзе давала стыпэндыі вучням каталіцкага веравызнаньня з добрымі адзнакамі. З падобных запісаў <ахвяраваньняў> сабралася сума, што працэнтаў было больш, чымся патрабавала пакрыцьцё стыпэндыяў усіх вучняў-каталікоў з добрымі адзнакамі. Калі вучань ня меў „троек“ на першым годзе й прасіў звольніць яго з аплаты за *правоучение*, яму давалі стыпэндыю ўжо на другім годзе ў велічыні школьнае аплаты — наколькі памятаю, 72 руб. Як надалей вучыўся добра, даставаў палавіну поўнае стыпэндыі — 90 руб., а ў старэйшых клясах поўную — 180 руб.

Дзеля таго што сялянскія сыны вучыліся добра, лепш за сыноў расейскіх чыноўнікаў і паноў (памешчыкаў), усе нашыя беларусы, сябры ГГБМ, мелі стыпэндыі. Я асабіста скончыў першую клясу з адной „тройкай“, але ўжо ў другой клясе ішоў на „чацьвёрках“ ды „пяцёрках“ і ў трэцяй клясе быў ужо звольнены з аплаты. Ведаю, што ўсе мае знаёмыя: Язэп Лявіцкі, Янка Ляўковіч, Адам Бычкоўскі, Антон Доха, Адольф Зянюк — усе мелі ў сёмай і восьмай клясах стыпэндыі 180 руб.

Як ужо было ўспомнена, грошай было больш, чымся школа патрабавала пакрыць стыпэндыі паводле запісаў. На паседжаньнях пэдагагічнае рады прасілі згоды ксяндза Халецкага абмінуць права <правіла> і даць стыпэндыі добрым бедным праваслаўным вучням. Відавочна, не ішлося тут аб яго згодзе, а больш аб тым, каб маўчаў, тым ня менш гэты факт умацоўваў пазыцыю кс.капэляна ў пэдагагічнай радзе. Апрача стыпэндыяў, гімназія мела грошы на ўтрыманьне спартовага парку, т.зв. трэку, для школы, купляла білеты вучням у тэатар і ў цырк і арганізоўвала паходы ў табэльныя дні[29]. Даступная вучням бібліятэка была таксама вялікая й багата абсталяваная. Але скарб, які гімназія атрымала па дамініканах, — старая бібліятэка зь вельмі вартаснымі тамамі рукапісаў і старых друкаў — яна была недаступная вучням.

[29] Табэльны дзень — у Расейскай Імпэрыі дзень, улучаны ў табэль аб сьвяточных і вольных днёх, выходны. Прыяжджаючы дамоў на сьвяточныя й летнія вакацыі, я стараўся памагаць бацьком у рабоце пры гаспадарцы; дзед ужо

ня жыў, і хаця бацька меў парабка, было яму даволі цяжка. Таму я ішоў зімою малаціць, а летам за сахою, касою й сярпом. Звычайна пару дзён усё балела ад непрывычнага высілку, але па некалькіх днях я ўжо быў добрым работнікам. Бацька, выслаўшы ў школу адзінага сына, мусіў чуць маю ўдзячнасьць. Вясною 1912 году Янка Ляўковіч, зь якім я жыў у кляштары Францішканаў, скончыў гімназію й параіў [кс.]Баярунцу ўзяць на рэпэтытара братанкам Адольфа Зенюка. Вярнуўшыся ў жніўні з вакацыяў, я ізноў зажыў у Францішканах, цяпер зь Зенюком, які быў у сёмай клясе.

Справа каталікоў-беларусаў

У тым часе, як я ўступіў у гімназію, школьныя ўлады ўсіх каталікоў уважалі за палякаў, і паводле царскага ўказу з 17 красавіка 1905 году мелі права вучыцца „Закона Божего“ ў польскай мове. Ужо ў наступным годзе сытуацыя зьмянілася, улады пачалі шукаць каталікоў-беларусаў.

Зараз жа на пачатку году, на першай лекцыі рэлігіі, кс.Халецкі сказаў нам, што школа дастала загад зь *Виленскаго учебнаго округа*, што беларусы ня могуць быць навучаныя „Закона Божего“ ў польскай мове й што школьныя ўлады маюць ужо прозьвішчы, каго ўважаюць за беларусаў, між імі было й маё прозьвішча. Дзеля таго што падручнікаў для каталіцкага веравызнаньня [ані] ў беларускай мове, ані ў расейскай не было, пэдагагічная рада дазволіла беларусам прысутнічаць на лекцыях у польскай мове, але не маглі быць пытанымі й не маглі адказваць па-польску. Капэлян сказаў таксама, што мы павінныя пісаць просьбы ў Міністэрства Асьветы, цьвердзячы, што нашыя бацькі гавораць удома па-польску. Мне атрымалася парадаксальная сытуацыя: сьведамы беларус мусіць пераконваць улады, што ён паляк.

Пытаўся я кс.Грынкевіча, што рабіць. Ён параіў паступаць згодна з плянам капэляна, каб ня даць нагоды на падозраньне, што належу да арганізацыі.

Дзе пачалася справа шуканьня каталікоў-беларусаў і чыя гэта была ініцыятыва, цяжка сказаць. Відаць, якісь русіфікатар — не ў Міністэрстве Асьветы, а ў Вільні, а можа нават у Горадні — пачаў справу, якая выглядала больш на спробу, чымся на добра абдуманае й сплянаванае дзеяньне. Перш-наперш на лісьце <у сьпісе> былі прозьвішчы вучняў толькі малодшых клясаў, як

бы старэйшых не хацелі чапаць. Расейскія ўлады добра ведалі, якою моваю карыстаецца ўся Гарадзеншчына, а на лісту было ўведзена толькі, здаецца, 26 прозьвішчаў з 360 вучняў дзевяцёх малодшых клясаў (*приготовительный* і падвойныя з 1-ае да 4-ае). Было, прыкладам, прозьвішча Карпея, які радзіўся ў Дэтройце (ЗША) і ня знаў беларускае мовы.
У адказ на нашыя прашэньні Міністэрства загадала дасьледаваць мову на месцы, паліцыя прыяжджала да Ўрачыншчыны ды пыталася старасты, але й па ўсім гэтым ня ведала, што рабіць, і даручыла справу гімназіяльным уладам. У гімназіі была створаная адмысловая камісія з дырэктара, інспэктара й трэцяга сябра, аднаго з настаўнікаў, і нас клікалі на пераслух. Мяне пыталіся, як мае бацькі гавораць з суседзямі, ці яны не разумеюць польскае мовы. Я адказаў, што ў маёй ваколіцы ўсе разумеюць польскую мову, бо мы жывем блізка мазураў і маем заўсёдныя зносіны зь імі. Дзеля таго што кс.Халецкі меў моцную пазыцыю ў школе, скончылася тым, што нам дазволілі вучыцца рэлігіі па-польску.

Як ужо было сказана раней, у другой клясе я меў толькі добрыя адзнакі. Я верыў, што 13 — мой шчасьлівы нумар. У першай клясе мой нумар быў 12, і я, як ні стараўся, скончыў з адной „тройкаю“, у трэцяй мой нумар быў 13, і я скончыў добра. Цэлае маё жыцьцё я любіў трынаццатку.
У трэцяй клясе я ізноў жыў у Францішканах з Адолькам Зенюком, які быў тады ў восьмай клясе. Я быў звольнены з аплаты ў школе, і выглядала, што на добрай дарозе дастаць <атрымаць> стыпэндыю, як усе старэйшыя беларусы.
На жаль, некалькі дзён перад тым, як [я] меў вярнуцца ў чацьвертую клясу, выбухнула першая сусьветная вайна, і я застаўся на чатыры гады на вёсцы пры земляробстве, безь вялікае надзеі, што калісь вярнуся ў школу. Яшчэ хачу ўспомніць адну дэталь з пэрыяду мае расейскае гімназіі. У Бэрнардынскім касьцёле кожнае нядзелі раніцою была служба для каталіцкае моладзі сярэдніх школаў. Там пяяў хор, да якога належаў шмат хто зь беларусаў. Я таксама належаў да гэтага хору, пяяў тады сапранам, як і ў школьным хоры. Пазьней у школьным польскім і студэнцкім хорах я пяяў басам.
Летам 1918 году я даведаўся, што *Polska Macierz Szkolna*[30] арганізуе гімназію ў Горадні. Доўга ня думаючы, падаўся ў

горад, дзе мяне паінфармавалі, што будзе толькі пяць малодшых клясаў і чаго школа вымагае да ўступных экзамэнаў. Пастанавіў я прыгатавацца да пятае клясы, да якой і быў прыняты па экзамэне ўвосені. Такім чынам, я пераскочыў чацьвертую клясу. Хаця надалей [я вучыўся] у сярэдняй школе, але па чатырох гадох пярорвы, у іншай школе і ў іншай мове, [таму] мушу ўважаць гэты пэрыяд за асобны, трэці этап мае адукацыі.

[30] *Polska Macierz Szkolna* — арганізацыя спрыяньня разьвіцьцю польскага школьніцтва.

Пэрыяд мае адукацыі, які я называю другім этапам, пакінуў сьлед на маім характары. Пераконаньні, якія былі ўпоеныя мне ў тым часе, як нацыянальнае ўсьведамленьне, засталіся непахіснымі на ўсё жыцьцё. Я не пайшоў па лініі найменшага апору <супраціву>, якая ў тым часе азначала — прызнацца палякам і ня мець ніякіх клопатаў, як і рабілі шмат хто зь беларусаў-каталікоў (двох суседзяў з мае вёскі).

Пад час другое сусьветнае вайны, калі людзі дзеля бясьпечнасьці прызнаваліся фольксдойчамі, каб выехаць з усходу да Нямеччыны, мне ніколі не прыйшло ў галаву зьмяняць нацыю. Бабка мае першае жонкі была фон Радэн. Энгельгарт[31], які быў зроднены з фон Радэн сям'ёю, уважаў маю жонку за далёкую радню. Едучы на ўсход або з усходу пад час вайны, [ён] заяжджаў да нас пераначаваць, некалькі разоў спрабаваў пераканаць мяне, што мы як фольксдойчы павінны выбрацца ў Нямеччыну. Я заўсёды адносіўся да гэтага нэгатыўна.

[31] Эўген фон Энгельгарт (Engelhardt) — ведамы нямецкі беларусіст.

Так што пэрыяд ад дзясятага да чатырнаццатага гадоў быў вельмі важны ў маім жыцьці з пункту гледжаньня маёй нацыянальнай сьведамасьці. Наступны этап мае адукацыі пачаўся ў дваццатым годзе жыцьця.

(Ня скончана)

Пакутны пэрыяд

Прыйшла вайна. Бальшавікі па пару месяцах арыштоўваюць Антона Луцкевіча[32]. Ён, відавочна, спадзяваўся гэтага й перад

тым даручыў мне як заступніку старшыні Беларускага Навуковага Таварыства ключы ад Музэю Івана Луцкевіча.

[32] Тут памылка: А.Луцкевіч быў арыштаваны ў верасьні 1939 году.

Пад час апошніх гадоў маіх студыяў мэдыцыны на Віленскім Унівэрсытэце студыяваў гісторыю Лех Борткевіч. Сымпатычны, высокі бляндын, спартсмэн (старшыня Акадэмічнага спартовага клюбу), адзін з трох ці чатырох братоў — уласьнікаў вялікага маёнтку на Браслаўшчыне. Зь Лешкам мы зналіся, бо я належаў да байдаркавай сэкцыі Акадэмічнага спартовага клюбу. Па студыях Борткевіч паехаў у Варшаву, але па двох гадох вярнуўся да Вільні.

Масква аддае Вільню летувісам. У некалькі тыдняў па прыходзе летувісаў званіў Юзаф Мацкевіч[33], пытаўся, калі буду мець час пагаварыць. Умовіліся на спатканьне ў мяне. Прыйшлі Ю.Мацкевіч з Л.Борткевічам. Гаварылі пра сытуацыю ў Вільні пры летувісах. Мацкевіч намякаў, што беларусы павінны заняць пазыцыю такую ж, як і палякі, ды супольна процістаўіцца экстраваганцыям летувісаў у адносінах да палякаў і беларусаў. Ня верылі мы, што гэтая сытуацыя можа пратрываць доўга, самыя летувісы пяялі: „*Vilnius musu — Kaunas Rusu*“[34], але трэба было думаць, што рабіць.

[33] Пазьней Юзаф Мацкевіч стаў ведамым польскім літаратарам, аўтарам бэстсэлераў пра злачынствы камунізму.

[34] „Вільня наша — Коўна расейскае“ (летув.). У верасьні 1939 г. летувіскі ўрад згадзіўся прыняць прапанову СССР: узамен за атрыманьне Вільні дазволіць стварыць савецкія базы на тэрыторыі Летувы.

Борткевіч запытаўся, ці можа ён наведаць Беларускі музэй, я згадзіўся, і мы спатыкаліся зь ім у музэі раз або два разы ў тыдні.

Што было мне цікава, Лешак, хоць у польскай мове, пачаў гаварыць як беларус. Казаў, што ў Варшаве ён пераканаўся, што палякі яму зусім чужыя, зразумеў, чаму літоўская шляхта так змагалася з польскаю ў гісторыі Рэчы Паспалітай.

Пераглядаючы архіў музэю, казаў:

— Я маю дыплём гісторыка зь Віленскага Ўнівэрсытэту, але гісторыі свайго краю, дзе сталіцаю была Вільня, зусім ня ведаю.

Я бачыў, што Лешак сапраўды шчыра цікавіўся гісторыяю Вялікага Княства Літоўскага.
Скора, аднак, перарваліся нашыя спатканьні й спакойныя гутаркі: бальшавікі вярнуліся ў Вільню і пачаўся жудасны час арыштаў. Я два тыдні не начаваў дома, аж „чорны воран“ перастаў курсаваць начамі па вуліцах Вільні. Як усё супакоілася, я вярнуўся да сваёй [лекарскай] практыкі.
Аднаго вечара паміж пацыентамі ўвайшоў малады хлапец і зараз пры дзьвярох сказаў, што хоча гаварыць з доктарам. Калі я падышоў да дзьвярэй, ён, як бы тоячыся, каб ніхто ня чуў, сказаў мне, што ён прысланы групай беларусаў у Варшаве (кс.Гадлеўскі, др.Шчорс ды іншыя) даведацца, якое палажэньне ў Вільні. Скончыўшы [прыём] пацыентаў, я пачаставаў яго гарбатаю, расказаў яму, як справа стаіць у Вільні. Ён паінфармаваў, якія магчымасьці для беларусаў у Варшаве й Лодзі, ды сказаў, што ідзе назад праз граніцу.
(Пасланец вярнуўся ў Варшаву, бо бальшавікі хацелі яго выкарыстаць як інфарматара ад групы беларусаў у Варшаве. Ня ведаю, ці ён адразу прызнаўся, ведаю толькі, што кс.Гадлеўскаму было ведама, як адбылася візыта пасланца да мяне, і чамусь у Варшаве сярод беларусаў было пераконаньне, што я не жыву. Як немцы пагналі бальшавікоў на ўсход, хлапец, пачуўшыся больш бясьпечным, упісаўся ў Краёвую Абарону Б.Рагулі, але, будучы ў лягеры ў Прусіі, калі бальшавіцкі фронт стаў набліжацца, яго нэрвы ня вытрымалі, і [ён] звар'яцеў, быў адпраўлены ў нямецкі шпіталь, дзе, падобна, памёр. Пры Гітлеру звар'яцелых не лячылі, а давалі ўколы, каб памерлі.)
Пару тыдняў пазьней, вечарам у нядзелю, як я ня меў пацыентаў, прыйшоў Борткевіч і спытаўся, можа я ведаю што-небудзь з захаду. Я адказаў, што ў мяне быў пасланец з Варшавы. На працягу наступных колькіх тыдняў Борткевіч прыходзіў да мяне пару разоў пагаварыць. Няўбаўкі <неўзабаве> пазваніў да мяне Мацкевіч, каб я прыняў яго як пацыента, але, прыйшоўшы, сказаў, што хоча перасьцерагчы мяне, каб быў асьцярожны з Борткевічам, бо ён працуе для бальшавікоў як *сексот* (секретный сотрудник):
— *Leszek*, — кажа, — *załamal się*[35].

[35] „Лешак зламаўся“ (польск.).
Братоў ягоных бальшавікі арыштавалі й вывезьлі, і ён,

ратуючыся, пайшоў на ўнівэрсытэт выкладаць ленінізм і як сексот рапартуе НКВД, што гавораць тыя, да каго яго пасылаюць. Я падзякаваў Мацкевічу за перасьцярогу й сказаў, што запозна, бо ўжо тры разы я спатыкаўся з Борткевічам і сказаў яму аб пасланцу з захаду.
Як пасьля я даведаўся, хлапца пры першым пераходзе на ўсход бальшавікі злавілі, білі яго ў пяты, аж ён прызнаўся, што беларусы з Варшавы пасылаюць яго да В.Пануцэвіча ў Горадні й да мяне ў Вільні на разьвед. Па пару тыднях, як ён ачуняў па пытках, паслалі яго да Пануцэвіча. Пануцэвіч адразу западазрэў, што прысылаюць хлапца бальшавікі, і заявіў у НКВД. Я быў зашмат даверлівы, таму стварылася сытуацыя, што бальшавікі маглі абвінаваціць мяне ў шпіянажы.
І тут пачаўся пакутны пэрыяд майго жыцьця. Сьледчы з НКВД клікаў мяне па тэлефоне кожныя 3—4 тыдні зьявіцца вечарам — кожны раз на іншы адрас: на Кальварыйскай, на Зьвярынцы, пры Лукішках, на Віленскай і г.д., дзе ён *исследовал* мяне па 4—6 гадзін, амаль цэлую ноч. Зрабіў мяне сексотам, даў падпісаць паперку, што буду шчыра працаваць для савецкай улады й нікому не скажу, што я сексот; у праціўным разе буду караны паводле параграфу, які гаворыць аб кары сьмерцю. На шчасьце, даручыў мне абрабляць толькі аднаго кс.А.Станкевіча, якому я адразу сказаў, хто мяне прысылае, і мы ўдвох апрацоўвалі мае рапарты.
Дайшло да таго, што я баяўся адказваць на тэлефон. Я пасівеў, высах, згорбіўся, калі хто з дактароў, калегаў, спаткаўшы [мяне] на вуліцы, пытаўся, што са мною, я звычайна казаў, што страўнік мучыць. Вечарам, ідучы на *исследование*, я разьвітваўся з жонкаю й дзецьмі, бо ня ведаў, ці вярнуся. Калі сьледчы вырашаў „*применить особое исследование*“, бралі сексота ў падвал пры Ахвярнай вуліцы, мучылі, каб прызнаўся, звычайна [той] прызнаваўся да ўсяго, чаго яны хацелі, і тады як вінаватага ліквідавалі. Дадому [ён] ужо не вяртаўся. Гінуў.
Мой сьледчы — *отвратительный тип* нізкага росту, рыжавы бляндын з выбітна кароткімі пальцамі на руках, каля трыццаці гадоў веку, малаінтэлігентны, але набіты камуністычнымі дактрынамі; ня памятаю ягонага прозьвішча, ведаю толькі, што канчалася на *-енко*. Трымаў ён мяне на допытах, якіх было дзевяць, пераважна ў напружаньні, рэдка толькі частаваў мяне гарбатаю й гаварыў пра штосьці нэўтральнае. Пераважна

дапытваўся пра *проходимца* з Варшавы, але я не прызнаваўся, што такі ў мяне быў, тады ён гразіў:
— *Придётся применить особое исследование*.
Я не прызнаваўся, бо др.Ст.Грынкевіч параіў:
— Не прызнавайся. Хлопцу, каторага паслалі да цябе, могуць ня верыць. Як удасца табе падкапаць давер да Борткевіча, яны ня будуць пэўныя твае віны.
Сьледчы часта пытаўся, каго я знаю. Калі я ўспамінаў паміж іншымі Борткевіча, ён як бы не зьвяртаў увагі, тады я пастанавіў быць больш агрэсіўным і кажу:
— Мы, беларуская інтэлігенцыя, пераважна дзеці сялян. Польскія абшарнікі (паны), бачачы пагрозу, што сяляне дастаюць адукацыю й пачынаюць дамагацца свайго права, стараюцца ўсімі спасабамі нішчыць нас. Гэта было пры буржуазнай Польшчы, а нават і цяпер.
Сьледчы пытаецца, пра каго я гавару, а я яму адказваю:
— Прыкладам, абшарнік Борткевіч.
Тут сьледчы схапянуўся, ня даў мне больш гаварыць.
— *Да разве Борткевич помещик?*
— *Крупный помещик*.
— *Да, они стараются в мутной воде рыбку ловить*, — кажа ўсхваляваны сьледчы, як бы хапаючы абедзьвюма рукамі перад сабою паветра.
Думаю, што гэты момант уратаваў маё жыцьцё. (Маё прызнаньне перад сьледчым не пашкодзіла Борткевічу, бо бальшавікі ня мелі даволі часу. Пры немцах яму было небясьпечна заставацца ў Вільні, і ён пераехаў у Браслаўшчыну ў свой маёнтак. На жаль, там было таксама небясьпечна. Адной ночы бальшавіцкія партызаны абрабавалі [яго] й як буржуя забілі.)
Пры наступных спатканьнях, якіх было яшчэ пару перад прыходам немцаў і ўцёкамі бальшавікоў зь Вільні, сьледчы не гразіў мне „*особым исследованием*“, чытаў мае рапарты аб кс.А.Станкевічу, шмат гаварыў аб ім, дапытваўся аб ягонай дзейнасьці ў прошлым. Я сказаў яму, што ў архіве Беларускага музэю, які быў перавезены бальшавікамі на Ахвярную вуліцу, ёсьць брашурка кс.А.Станкевіча, у якой можа знайсьці ягоныя палітычныя ідэі. Сьледчы знайшоў брашуру й перакладчыка, бо сам беларускае мовы не разумеў, і пры наступным спатканьні кажа:

— Удивительно, католический священник, и пишет, что помещичья земля должна быть разделена крестьянам без выкупа. Видимо, это очень интересный человек.
Ён так зацікавіўся ксяндзом Станкевічам, што паклікаў яго на спатканьне ў цукерні Штраля. Пасьля абодва расказалі мне аб спатканьні.
Апошнія дні перад атакаю немцаў я быў так нэрвова перачулены, чуў і быў пэўны, што пачнецца вайна. Тры дні перад вайною спаткаў на вуліцы знаёмую дантыстку Лютомскую й сказаў ёй, што будзе вайна, яна пасьля ня верыла, што я чуў нэрвамі, была пераканаиая аб маёй лучнасьці з палітычнымі коламі, дзе мяне паінфармавалі. Жонку зь дзецьмі я адправіў да яе сваякоў на правінцыю, бо спадзяваўся <прадбачыў>, што ў Вільні будуць баі. Як пачалася вайна, я пачуў адпружаньне нэрваў, ведаў, што агент НКВД ужо больш ня будзе клікаць на дапросы. Я быў старшынёю Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Вільні ад 20 жніўня 1942 году да выхаду немцаў зь Вільні. Думалася, што пры нямецкай акупацыі будзе лепш. Але з 16 на 17 верасьня 1943 году я быў арыштаваны летувісамі й пасланы ў канцлягер Правянішкі, бо наш Камітэт быў ім соляю ў воку. Шчасьце, што не папаў у дзясятак [тых], каго раніцаю 17 верасьня расстралялі на Панарах[36].

[36] Панары (летув. *Panarai*) — паўднёва-заходняе прадмесьце Вільні, цяпер у межах гораду. Падрабязьней пра гэты эпізод мы знаходзім у кнізе Язэпа Малецкага „Пад знакам Пагоні“ (Таронта, 1976):
„Камітэту давялося ратаваць жыцьцё ведамых беларускіх дзеячоў др.Грабінскага і др.Грынкевіча. Было гэтак: адзін заўзяты жмудзкі камэндант паліцыі хапаў віленчукоў з вуліцы, дапытваў, зьбіваў да паўсьмерці. Рабіў ён гэта на сваю руку, каб падмацаваць жмудзкія ўплывы ў Вільні, і за гэта яго ў белы дзень застрэлілі на вуліцы Міцкевіча. Азьвярэлыя Лятувісы, на сваю руку таксама, схапілі 12 выдатнейшых віленскіх грамадзян, а між імі старшыню міжнароднага Чырвонага Крыжа прафэсара К.Пэльчара, адваката Энгельса, інжынэра Станкевіча, прафэсара Вільчынскага, зь беларусаў жа дактароў Грабінскага ды Грынкевіча.
З арыштаваных палавіну Лятувісы расстралялі ў ямах на

Панарах, дзе яны забівалі й Жыдоў. Другую ж палову вывезьлі ў лес на цяжкую працу. Там др.Грабінскі з праф.Вільчынскім спушчалі з пня тоўстыя сосны <...>.
Мы злажылі зразу ў гэбітскамісара гораду востры пратэст супроць самаволі Лятувісаў. У хуткім часе др.Грабінскі й др.Грынкевіч былі звольненыя“ (с.87).
Гэты цяжкі пэрыяд майго жыцьця пакінуў на мне сьлед. Хаця фізычна я быў страшэнна змучаны, — да той ступені, што мой вонкавы выгляд зьмяніўся й, як ужо было ўспомнена, знаёмыя пыталіся, што са мною, аднак я скора направіўся.
Псыхалягічны сьлед застаўся на мне стала. Можа таму, што трывала гэта некалькі месяцаў. Жыцьцё пад тэрорам з думкаю, што могуць мяне ўзяць на пыткі, насоўвала думку аб самагубстве, і толькі дзеля малых дзяцей я не рашыўся на такі крок. Часта, ідучы па вуліцы, убачыўшы стоража, які замятаў тратуар, я зайздросьціў яму, што [ён] мае спакойнае жыцьцё. Мая амбіцыя моцна панізілася. Я неахвотна згадзіўся ўзяць на сябе абавязкі старшыні Беларускага Камітэту пры немцах, і трэба [было стацца] выпадку, што летувісы арыштавалі мяне як старшыню Камітэту. Мушу, аднак, прызнаць: як летувісы везьлі [нас] на Панары ды ўсе мы былі пераконаныя, што вязуць на расстрэл, людзі пачалі спавядацца (у нашым траку <грузавіку> быў каталіцкі сьвятар).
Я асабіста ня чуўся так стэрарызаваным, як на дапросах сьледчага НКВД. Быў верасеньскі дробны дождж, шэрае поле, на кустох па дарозе шэрае лісьцё, і я думаў: няма чаго шкадаваць гэтага жыцьця, толькі сумна было, што малыя дзеці застануцца бяз сродкаў, бо жонка не прыгатаваная да самастойнага жыцьця. Можа й таму ня чуўся я так дрэнна, што падарожжа да [таго] моманту, як мы мінулі ўезд, да поля расстрэлаў, трывала не даўжэй як адну гадзіну.
Факт арыштаваньня летувісамі не павысіў мае амбіцыі, каб пнуцца да ганаровых тытулаў, наадварот, я пераканаўся, што трэба ад іх ухіляцца. Пасьля доўжшага часу пагрозы сьмерці чалавек чуецца, як бы жыў дарованым жыцьцём, усё асяродзьдзе робіцца менш важным, яго ахвота й энтузіязм да змаганьня ў жыцьці паніжаецца. Гэтак сталася са мною. Я разумею, што гэта ад'емныя рысы характару, і стараюся не паддавацца. На жаль, не заўсёды мне ўдаецца.

Публікацыя Ілоны Ўрбановіч-Саўкі й Зьмітра Саўкі

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 5 (10) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **29-08-2000**
[image]

Зьміцер Лапцёнак
Нататкі пра менскіх падлеткаў

Менскае выхаваньне

Расказваў мой брат. Летам сядзеў ён, рыхтаваўся да экзамэну. І тут са двара пачуўся танюсенькі дзіцячы голас:

— Ба-бу-ля! Ба-бу-ля!

І так пранізьліва, што за душу кранае. І раз за разам. Малое ўсё кліча ды кліча. Усе думкі павыкідала. Брат зачыніў вокны, хаця і было вельмі сьпякотна. Не дапамагае. Відаць, тая бабуля таксама за зачыненымі вокнамі жыве. Тады брат паставіў *Scooter*.

— Ба-бу-ля! Ба-бу-ля!

Урубіў *Nirvana*. Дарма. Пайшоў схаваўся ў туалет. Плаксівы галасочак усё просіць і просіць.

— Ба-бу-ля! Ба-бу-ля!

Праз дваццаць хвілін мой брат „зламаўся“, пабег на балькон, каб накрычаць на гэтага румзу. Але тутака акурат малое змоўкла. Брат паглядзеў на двор і ўбачыў: бабуля з трэцяга паверху спускае ўніз на нітачцы нейкую цацку, а малое стаіць унізе і пляскае ў далоні.

Менскі нацы(яналі)зм

Перад нашым домам — невялікая, неарганізаваная стаянка

машын. Нехта збоку ад стаянкі насыпаў купу друзу — мо хацелі дарогу паасфальтаваць, дзіркі пазалепліваць, але, як звычайна, дачакалі восеньскіх дажджоў. Гуляў я неяк са сваім малым на двары. Малы ў калысцы, сьпіць. Я ARCHE чытаю і адною рукою калыску пагойдваю. Тут лямант чуецца. Бачу — трое хлапчукоў гэтымі камянюкамі шпуляюцца. Адзін стаіць акурат на той крушні і бароніцца ад двух, якія праводзяць вызваленчую апэрацыю супраць захопніка, грунтуючыся на тым, што орган, на якім сядзяць, у яго чорнага колеру. Малыя змагары шпурлялі каменьне і з кожным каменем дасылалі такія словы, якія нат я не ўжываю і нават ня ведаю.
Малы „захопнік“ (сапраўды трохі смуглявы) моўчкі браў з крушні жменю і чаргою пасыпаў ува ўсе бакі. Тымчасам праходзіў яшчэ адзін хлопчык, даволі добра апрануты. Убачыўшы бойку, ён у адным сказе паўтарыў усе тыя словы, якія я толькі пачуў ад малых. У прыблізным перакладзе на літаратурную мову гэта было: „Што вы робіце!? Тут жа ж машына майго бацькі!“. Яму адказалі, што „дык ... гэты ... чорны ...“ Ён, зразумела, стаў дапамагаць суайчыньнікам. Пасьля да іх далучыліся яшчэ колькі „вызваліцеляў“.
Дарослыя калі-нікалі папракалі гэтых хлапчукоў: „Спыніце гэты лямант!“ ці „Глядзіце: пападзеце ў машыну — ногі-рукі паабломваю!“. Але бачу, падыходзіць да іх стары дзядок. „Мужыкі, — кажа, — вы вельмі добра кідаецеся. Але хто з вас найлепшы?“ Паставіў нейкае палена на амаль рассыпаную крушню і кажа: „Давайце па адным шпурляйце ў палена“. Малыя пачалі закідваць раскіданыя каменьчыкі назад. Ужо лічаць, „я трапіў 5 з 8“, „а я лепш, нават 7 з 9“. Зноў наблізілася пагроза сваркі. Тады дзядок кажа: „Вы ўсе добра кідаеце. Але ж кожны паасобку вельмі слаба. Ці можаце вы перакуліць палена?“ Сапраўды, адным каменем — немагчыма. „Паспрабуйце ўсе разам!“ Вось такім спаборніцтвам было спынена этнічнае ганеньне, а раскіданыя камяні сабраны ў кучу.

Менскае сяброўства

Ёсьць у менскім мэтро асаблівая станцыя, „Першамайская“, выдатная тым, што дзьверы там адчыняюцца з правага боку. На „Нямізе“ зайшла групка вясёлых падлеткаў, праціснуліся да правага боку і пачалі аб нечым прыколвацца. На

„Кастрычніцкай“ народу паменшала. І вось пад’ехалі да правабокай. Дзьверы адчыніліся, і хлапцы, шуткуючы, пачалі выштурхоўваць адзін аднога з вагону. Апошні, якога выпіхнулі, убіўся ў вагон адначасова з закрыцьцём дзьвярэй. Але — бяда! Край паліто застаўся знадворку. Ён цягне — патроху выцягнуў. Толькі кішэню ня можа. Нешта (мо запалкі ці цыгарэты) не дае ўцягнуць паліто ўнутро. Сябры яго аж паляглі ад сьмеху. Яны весяляцца, а той хлапчук усё хмурнее. Ну, вось і апошняя станцыя, „Просьба пакінуць вагоны“, зноў намаганьні адчапіцца ад халерных дзьвераў. Але дарэмна. Дзьверы зачыняюцца, цягнік з хлапчуком едзе ў цемру, а яго сябры, узрушаныя і задаволеныя, спакойна йдуць на выхад. „Сам прападай, а таварыша выручай“, ці „Прападай ты сам“.

Менскія гульні

Расказваў былы супрацоўнік. Ішоў раз мужык са сваёю жонкаю. Мужык такі асілак, як кажуць, два на два, боксам ці барацьбой нейкай займаецца. Было ўжо позна, поначы, зіма. Ідуць яны, насустрач трое хлапчукоў. Усё па схеме. „Мужык, дай закурыць!“ Мужык дужы такі, здаравідла, ён і чатырох дарослых не збаяўся б. А тут — малалеткі, да пупа ледзь дастаюць. Ён дастае запальнічку, працягвае. Далейшае адбываецца за тры сэкунды. Раз. Адзін хлопчык хапае мужыка за руку й ламае яму вялікі палец. Другі б’е яму паміж ног. Трэці штурхае гэтае ўжо безабароннае цела ўбок. Два. Мужык з рыкам валіцца ў сьнег. Хлапчукі хапаюць сумачку ў кабеты, шапку і запальнічку ў мужыка. Тры. Вуліца пустая. Стаіць ашарашаная цётка. Ды ў сьнезе корчыцца волат, плачучы ад крыўды, што яго „зрабілі“ нейкія недаросткі.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 5 (10) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **29-08-2000**
[image]

Васьмінаццаць месяцаў у пекле

Аляксей Шыдлоўскі, будучы студэнтам факультэту журналістыкі БДУ, быў арыштаваны за антыпрэзыдэнцкага і незалежніцкага зьместу графіці, якімі ён зь сябрамі размаляваў свой родны горад Стоўпцы. Разам зь ім быў арыштаваны ягоны таварыш, чатадовы вучань адной зь менскіх школаў Вадзім Лабковіч. Яшчэ адна таварышка, Аліна Бельская, здолела ўнікнуць арышту, праз Маскву ўцёкшы ў Фінляндыю, дзе

Прыкмета пачоўнага часопіса, Тамаш адчуваў на 18 годоў, і трыўдзеяў кіпаўся кайфаваць жыцьцё перадоўсім — дзяўчыны. Аляксей Шыдлоўскага й Лабковіча

Аляксей Шыдлоўскі, 2 кастрычніка 1997 году ў Стоўпцах мяркуецца, Аліна Бельская, Лабковіча

Пасьля ўцёкаў Аліны Бельскай і Аляксея Шыдлоўскага ў Стоўпцах

Аляксей быў

Ягоны таварыш Вадзім Лабковіч

Аляксей Шыдлоўскі

Аляксей Шыдлоўскі

Аляксей Шыдлоўскі

Канстытуцыі), я ўсё ж быў вельмі ўражаны ўбоствам камэры ў Стаўпецкім ізалятары. Два мэтры ўшыркі, тры ўдаўжкі, двое двух'ярусных „нараў“ і шчэ адны „нары“ ў куце. Вольнай прасторы амаль не заставалася. Недзе высока пад стольлю — акенца, ды краты на ім такія частыя, што сонечнае сьвятло амаль не прабівалася. Дзьве суседнія камэры былі перапоўненыя, але мяне сьпярша трымалі аднаго. Толькі назаўтра да мяне падкінулі гаваркога мужчынку, які аж занадта цікавіўся абставінамі маёй справы. Нутром пачуў тут нешта падазронае. Пасьля даведаўся, што такіх называюць „падсадною качкаю“. З гэтага выпадку я вывеў сабе першае правіла паводзінаў за кратамі: „Ніколі ні з кім не размаўляй пра сваю справу, пакуль ідзе сьледзтва“.
Па законе сьледчы павінен правесьці першы допыт не пазьней як праз 24 гадзіны пасьля затрыманьня. Але ў сьледчага Яськевіча нечакана зьявілася праблема: усе адвакаты ў радыюсе 50 км ад Стоўпцаў на той час адмовіліся абараняць мяне, і калі б да 17-й 26 жніўня сьледчы не знайшоў мне абароны, ён быў бы змушаны мяне адпусьціць. І тады ён пайшоў на хітрасьць: паскардзіўся мне на баязьлівасьць адвакатаў і сказаў, што я мушу напісаць паперу аб тым, што згодны ўзяць абаронцу адно з моманту прад'яўленьня абвінавачаньня. Я па сваёй недасьведчанасьці гэтую паперу напісаў, тым самым пазбавіўшы сябе волі. Адсюль вывеў я потым другое правіла паводзінаў за кратамі: „Без свайго абаронцы не адказвай на пытаньні сьледчых і нічога не падпісвай“.

Назаўтра каля трэцяй дня я быў дастаўлены на допыт у мясцовы аддзел КДБ. Там увесь час торкалі пад нос канфіскаванымі ў мяне ўлёткамі і пагражалі, што калі „ня здам астатніх“, „раскруцяць“ маю справу „на поўную катушку“. Я катэгарычна адмовіўся даваць паказаньні, і тады мяне прывялі ў вялікую залю, дзе сядзеў невядомы мне палкоўнік з МУС. Яго цікавіла толькі адно: надпісы былі зробленыя з хуліганскіх памкненьняў альбо палітычных прычынаў? Пачуўшы, што з палітычных, ён пайшоў да выхаду і ўжо ў дзьвярах павярнуўся й прамовіў: „Незайздросны ў цябе лёс, хлопча...“
Таго самага дня на пляцформе стаўпецкага вакзала арыштавалі й кінулі ў суседнюю камэру майго сябра Вадзіма Лабковіча. Да

таго ж, за гэтыя два дні ў Стаўпецкім раёне правялі колькі ператрусаў і дзясяткі допытаў мясцовых „апазыцыянэраў“. Стаўпецкая міліцыя на чале з начальнікам РАУС Лісаўцом даўно не атрымлівала такога заданьня. Гэтая справа зь першага дня, са словаў сьледчага і начальніка РАУС, была ўзятая на кантроль генпракурорам Бажэлкам і самім прэзыдэнтам Лукашэнкам, у прыёмную да якога ім даводзілася вазіць усе заведзеныя на нас з Вадзімам паперы.

Між тым заканчваўся трэці дзень майго сядзеньня, надыходзіў час уступаць у справу пракурору — выпісваць мне арышт на два месяцы. Я напісаў хадайніцтва аб вызваленьні пад падпіску аб нявыезьдзе.

Сьледчы ж рыхтаваў мне іншую пастку-выпрабаваньне. Пасадзіўшы мяне ў сваю ўласную машыну, без кайданкоў, без суправаджэньня ён з гадзіну езьдзіў па горадзе і дзе-нідзе выходзіў з аўтамабіля, нібыта ў краму. Я заставаўся ў „Фордзе“ адзін. З ключамі ад машыны, з адчыненымі дзьверкамі. Відавочна, разьлік рабіўся на тое, што я зьбягу, гэтым самым прызнаўшы сваю віну. Упэўніўшыся, што рабіць гэтага я не зьбіраюся, Яськевіч адвёз мяне назад, і намесьнік пракурора Мядзьведзь уручыла мне паперу аб арышце, колькі разоў пры гэтым назваўшы фашыстоўцам і выказаўшы думку аб мэтазгоднасьці аднаўленьня газавых камэраў для такіх, як я. Папера аб арышце ўтрымлівала інфармацыю, што я парушыў артыкулы 2012 („злоснае хуліганства“) і 1862 („зьнявага сымбаляў“), але была цікавая ня гэтым, а тым, што першым пунктам абвінавачаньня ішлі словы: „Зьняважаны гонар і годнасьць першага прэзыдэнта рэспублікі Беларусь...“

На дзясяты дзень у прысутнасьці майго першага абаронцы, менскага адваката дэмакратычных пераканаьняў Арсеня Скаруліса, мне прад’явілі афіцыйнае абвінавачаньне: словы пра гонар і годнасьць прэзыдэнта зьніклі. Паводле закону цяпер мяне мусілі адправіць у сьледчы ізалятар Жодзіна, але міліцыянты вырашылі павыпрабоўваць мае нэрвы шчэ і не замаўлялі на мяне „этап“. Урэшце мае нэрвы здалі, і на 12-ты дзень адседкі, 6 верасьня, я абвясьціў сухую галадоўку. Праз гадзіну да мяне далучыўся Вадзім Лабковіч. Мы патрабавалі неадкладнага вызваленьня й спыненьня крымінальнай справы. Міліцыянты ж падсадзілі ў камэру правакатара, які ўвесь час атрымліваў перадачы й прапаноўваў пачаставацца. О, якая

была спакуса!
10 верасьня, на 16-ты дзень адседкі й чацьверты галадоўкі, мы з Вадзімам даведаліся, што заўтра нас адпраўляюць этапам у сьледчы ізалятар УЖ 15/138 у Жодзіна. Тады Вадзім спыніў галадоўку, я ж вырашыў працягваць яе да канца.

У кіпцюрох „Чорнага Бусла“
11 верасьня пад вечар нас з Лабковічам пасадзілі ў „аўтазак“. На выгляд ён нагадвае хлебавоз. Унутры падзелены на аддзелы, у найбольшым зь якіх сядзяць двох узброеных міліцыянтаў, астатнія аддзелы называюцца: „лодка“ (разьлічаны на дваіх), „стакан“ (іх два, разьлічаныя на аднаго вязьня кожны), „агульны“ (разьлічаны на 8 чалавек). Вось жа, максымальная колькасьць зэкаў пад час перавозкі мусіла быць ня большай за 12 чалавек. Калі ж мы з Лабковічам зайшлі ў гэтую „таксоўку“, там ужо было больш за два дзясяткі вязьняў. Задуха, смурод, цесната і гайданка, ад якой увесь час б’ешся галавою аб жалезную столь. Недзе на сярэдзіне шляху Вадзіма пачало ванітаваць. Я ж па-ранейшаму галадаваў, і таму ванітаваць мне проста не было чым, хіба што страўнікавым сокам. Ехалі ня менш ад 4 гадзін і калі праехалі турэмную браму, здавалася, што найцяжэйшае — ззаду, ды найжахлівейшае чакала наперадзе.
Ахоўнікі Жодзінскага ізалятару, высадзіўшы з „аўтазаку“, прымусілі ўсіх нас бегчы па калідоры да „прыймовага пакою“, што зрабіць пасьля такой паездкі было няпроста. Многія падалі й адразу ж атрымлівалі ўдары нагою пад скабы.
Ужо ў пакоі, які ўвесь быў абкладзены кафлянаю пліткаю (пасьля я зразумеў, што гэта — каб лягчэй змываць кроў), нас выстраілі ўздоўж сьцяны і загадалі не паварочвацца. Цікаўнасьць перамагла, і я азірнуўся. Праз імгненьне два цяжкія ўдары па сьпіне і нагах кінулі мяне на падлогу, і пачуўся амаль што рык: “Я ж табе загадаў не паварочвацца!“ Я падняўся і, хістаючыся ад зьнясіленьня (усё ж пяты дзень галадоўкі), тыкнуўся лобам у сьцяну. А за сьпінаю, відаць, зьявіўся начальнік зьмены, бо ўся ахова перайшла з „ты“ на „вы“. Тым самым рыкам нам афіцыйна паведамілі: „Вы прыбылі ў Жодзінскі цэнтрал „Чорны Бусел“. Тут вы — ня людзі, і мы зробім усё, каб вы адчулі гэтае. Без каманды — не паварочваць нават галавы, рухацца толькі бягом з закладзенымі за сьпіну

рукамі, трымаць адлегласьць два мэтры адзін ад аднаго. Калі да вас зьвяртаюцца — адказваць цалкам ФІО (прозьвішча, імя, імя па бацьку — па-расійску), дату нараджэньня, бацькоў, жанок, артыкулы, па якіх утрымліваецеся пад вартай. Папярэджваю — за запінку будзем біць, за размовы міжсобку — будзем біць. Калі хто надумае спрачацца, жывым да камэры ня дойдзе! Пачалі!..“

І тут пачаўся прыём. Начальнік зьмены называў прозьвішча, а вязень, якога выклікалі, — выходзіў і казаў пра сябе. Ад хваляваньня амаль усе зьбіваліся, і іх жорстка білі. Калі дайшла чарга да Вадзіма Лабковіча, начальнік зьмены паведаміў:

— Увага! Сёньня на этапе — бэнээфаўцы, аматары ірваць сьцягі. Пастаўцеся да іх з усёй увагай, калі ласка!

Далей я пачуў, як Вадзіма колькі разоў ударылі (чуваць было, як ён упаў), за што яго адразу ж „перацягнулі“ яшчэ раз гумавым дручком.

Мяне выклікалі сярод апошніх. Перш як назваць свае даныя, я паведаміў, што на галадоўцы. Міліцыянт счырванеў і двойчы ўдарыў мяне ў грудзі. Я ўтрымаўся на нагах і паспрабаваў быў без запінкі назваць свае даныя, але на артыкулах крымінальнага кодэксу мяне замкнула. З усіх бакоў пасыпаліся ўдары кулакамі, так што я ўпаў і стукнуўся лобам аб падлогу.

— Дык што, сьцягі любіш? Ану, хлопцы, намалюйце яму на сьпіне сьцяг!

Міліцыянты выстраіліся ланцугом па абодва бакі калідору, па якім мне трэба было прабегчы, і дасталі дручкі. Я штосілы ірвануўся і прабег наперад, каб уцячы ад гумавых палак. Але мне загадалі вярнуцца і зноў прайсьці па тым самым маршруце — цяпер павольна, крокам. Пасьля гэтай „вандроўкі“ на сьпіне сапраўды ўтварыўся бел-чырвона-белы сьцяг, які назаўтра зьмяніў чырвоную паласу на сіне-чорную. Ледзь „даклыпаўшы“ да „адстойніка“ (дзе вязьняў трымаюць да сарціроўкі па камэрах), я ў зьнясіленьні зваліўся на рукі зэкаў, якія давай мяне пляскаць па шчоках, бо я быў на мяжы непрытомнасьці. Уваччу было чорна, і калі зараз мяне выклікалі на аналіз крыві, я ішоў рыхтык навобмацак, ня бачачы нічога перад сабою. Каля мэдкабінэту я абапёрся рукамі аб сьцяну, за што адразу атрымаў колькі ўдараў па нырках, і гэта было апошняе, што я памятаў. Будучыя сукамэрнікі казалі, што я мехам зваліўся на

падлогу, і, нягледзячы на ўдары ботамі, ужо не падымаўся. Выбеглі дактары і пад рукі зацягнулі мяне ў кабінэт, паклалі на ложак, крычучы: “Пульс не прамацваецца! Ціск падае! Калеце хутчэй!“
Пасьля доктар мне сказаў, што ў мяне спынілася сэрца. Недзе толькі праз гадзіну я апрытомнеў. Чалавек у белым халаце сказаў мне: „Шыдлоўскі, я пра вас чытаў, выходзьце неадкладна з галадоўкі, іначай праз тыдзень вас тут пахаваюць“, — адвярнуўся і быў пайшоў, ды агледзеўшыся, што побач нікога няма, дадаў: „6 верасьня быў зьезд Маладога Фронту! Пра вас памятаюць! Трымайцеся!“
Больш я гэтага доктара ня бачыў, але дагэтуль удзячны яму за тыя колькі словаў падтрымкі — ветлыя словы пачуў ад яго ўпершыню ад пачатку сядзеньня.
Пасьля да 4-й гадзіны раніцы мне калолі нешта ў вену, давалі нюхаць нашатыр і білі па шчоках. Пасьля прыйшоў начальнік мэдчасткі і спытаўся, ці буду я працягваць галадоўку. Пачуўшы: „Не“, — загадаў: „Усё, у больніцу яго“.
У мяне шчэ зьнялі адбіткі пальцаў, сфатаграфавалі, а потым пад рукі павялі ў камэру шпіталю.
Жодзінскі ізалятар мае адметную гісторыю. Яго адчынілі ў 1993 годзе як паказальную рэжымную ўстанову. Прататыпам стаўся вядомы расейскі сьледчы ізалятар „Белы лебедзь“ у горадзе Салікамску, пра які дагэтуль ходзяць легенды. „Чорны Бусел“ знаходзіцца ў правінцыі, і большасьць праверак яго абмінае. Таму і дзеецца ў ім поўны міліцэйскі „беспрадзел“ — шмат вязьняў выходзяць адсюль зьнявечанымі. бывалі тут і „выпадковыя“ сьмерці. Пэўна ж, нас з Лабковічам зусім не выпадкова кінулі менавіта ў „Чорны Бусел“...
У „хату“ мяне завялі а 6-й раніцы. Адчыніўшы цяжкія жалезныя дзьверы, ахоўнік упіхнуў мяне ў памяшканьне і ляснуў за сьпінай засаўкаю. Адразу ж устаў з нараў адзін зь вязьняў і, убачыўшы, што я дрэнна пачуваюся, прапанаваў прысесьці. Потым распытаў, хто я, за што сяджу і чаму паклалі ў шпіталь. Пачуўшы мой аповед, вельмі зьдзівіўся, бо, аказваецца, днямі чытаў пра мяне ў „Советской Белоруссии“ (гэта адзіная газэта, якую дазволена чытаць у Жодзінскім СІЗА).
Зранку, калі ў камэры запалілі сьвятло, я агледзеўся. Пасьля стаўпецкага ізалятару гэтая „хата“ падалася мне нават вельмі ўтульнай. Каля шасьцёх мэтраў удаўжкі і чатыры ўшыркі, трое

двух'ярусных нараў каля сьценаў, прыбіральня, стол і дзьве лавы пасярэдзіне, невялічкая шафа, прыбітая да сьцяны… А сёмай далі сьнедаць.

Усім у турэмным шпіталі выдаецца дыетычнае харчаваньне, якое ўключае ў сябе сьняданак — 200 грамаў малака, палова гатаванага яйка й падвоеная пайка рысавай кашы (прыблізна 6 поўных лыжак). У абед звычайна даюць бульбяны суп на першую і куцьцю на другую (усяго па 8—10 лыжак). І на вячэру часьцей за ўсё — падабенства юшкі, ад якой усе адмаўляюцца. Яшчэ на дзень выдаюць 250 грамаў чорнага і 400 грамаў белага хлеба, 40 грамаў цукру. Тройчы пасьля прыёму ежы наліваюць кіпень, які ахова называе „чаем". Лыжкі ды міскі выдаюць адно на час харчаваньня і адразу ж забіраюць.

Расклад дня ў СІЗА такі: пад'ём а 6-й гадзіне, сьняданак а 7-й, праверка з 8-й да 8.20, абед а 13-й, вячэра а 18-й, праверка з 20.20 да 20.40. Астатні час — амаль вольны, але вязьняў гэта зусім ня цешыць. Заняцца тут няма чым. Спаць удзень нельга, чытаць можна адно кнігі з турэмнай бібліятэкі. Іх раздаюць па камэрах раз на месяц. Усе яны пяцідзясятых гадоў, і пераважная бальшыня — пра шахтароў-стаханаўцаў ці пра БАМ. Лісты адпраўляць і атрымліваць нельга, з газэтаў ёсьць адно „Советская Белоруссия". Атрымаць тэлевізар ад родных — праўдзівая праблема. Да таго ж, пры першым парушэньні рэжыму яго забірае ахова.

Каб нечым заняць зэкаў, міліцыянты раз-пораз прымушаюць іх рабіць прыборкі ў „хаце", заліваючы падлогу халоднай вадою. Робіцца гэта так. Усіх вязьняў выганяюць на калідор і ставяць на „расьцяжку". „Расьцяжка" — гэта калі твае рукі ўпіраюцца ў сьцяну ў паўмэтры ад падлогі, а шырока расстаўленыя ногі — у падлогу. Такая пазыцыя цела вельмі стамляе, і зэкі часта падаюць. Тады іх ударамі ног прымушаюць заняць „зыходную". У гэты час адзін з ахоўнікаў адчыняе кран з халоднаю вадою і накіроўвае струмень на падлогу. Вада ліецца, пакуль не дасягне вышыні ганку. Тады зэкам загадваюць зьняць абутак і босымі нагамі на бэтоннай падлозе, на 7–8 сантымэтраў у ледзяной вадзе — стаяць у камэры. Натуральна, што ўсе ўласныя рэчы, якія захоўваюцца заўсёды пад нарамі, прамакаюць дазваньня. Пасьля ахоўнік загадвае ўзяць свае кубкі для гарбаты, чэрпаць імі ваду і бруд з падлогі і выліваць у прыбіральню. На гэтую „апэрацыю" даецца 20–30 хвілін, калі ж

не пасьпяваеш, „водная працэдура“ паўтараецца. Звычайна пасьля такіх „прыборак“ палова камэры хварэе.
Існуе яшчэ адзін спосаб выкарыстаньня аховаю вольнага часу зэкаў. У Жодзінскім СІЗА пры ўваходзе ў камэру міліцыянта, а гэта здараецца звычайна пад час праверак, трэба гучна, а галоўнае ўсім разам, сынхронна выкрыкнуць:
— Здрасьце, грамадзянін начальнік!
Бываюць выпадкі, што нехта выбіваецца з агульнага рытму, і тады ўсіх прымушаюць паўтарыць. Калі зноў „сынхрону“ не атрымліваецца, то ўсіх зэкаў выводзяць з „хаты“ на калідор і б’юць. Але здаралася і іншае. Аднойчы, ужо ўзімку, пасьля аднаго такога няўдалага „здрасьце“, ахоўнікі нічога не сказалі і моўчкі выйшлі. А праз паўгадзіны ў камэру зайшоў так званы *„рэзэрв“*, які складаецца з 3—4 ахоўнікаў у бронекамізэльках. З сабою яны ўзялі сабаку. Навошта, мы зразумелі толькі тады, калі адзін з ахоўнікаў апрануў сабаку на галаву сваю вайсковую шапку. Такім чынам, сабака выконваў ролю ахоўніка і, калі яго торгалі за повад, гучна брахаў, а мы павінны былі яму адказваць:
— Здрасьце, грамадзянін начальнік!
Так працягвалася хвілін трыццаць...
Але вернемся назад. 12 верасьня 1997 году я апынуўся ў камэры №120 Жодзінскага СІЗА. Назаўтра ў ёй зьявіўся малады хлопец, які сказаў, што хворы на страўнік. Ён адразу пачаў шукаць да мяне нейкія падыходы, сказаў, што чуў пра маю справу і, як „дасьведчаны зэк“, раіў мне па прыкладзе Анатоля Адамчука, які праходзіў па вядомай „справе Паўла Шарамета“, напісаць „пакаянную“ самому Аляксандру Рыгоравічу ці хоць бы ў „Советскую Белоруссию“. Нават абяцаў знайсьці мне асадку, паперу, капэрту й праз знаёмага ахоўніка адправіць „пакет“. Асноўнымі яго аргумэнтамі былі запалохваньні. Маўляў, цябе будуць зьбіваць, а ў „агульнай“ камэры, калі выпішашся з шпіталю, цябе „апусьцяць“. Праз тры дні ён зразумеў, што ягоныя жахі ня робяць на мяне патрэбнага ўражаньня і адчапіўся. На наступны дзень яго перавялі ў іншую камэру.
Падыходзіў да сканчэньня першы месяц нашага з Лабковічам зьняволеньня. 23 верасьня нам нечакана загадалі здаць бялізну, матрасы і рыхтавацца да этапу.
Выклік на этап маральна ўзбадзёрыў мяне. Як я зразумеў,

штосьці павінна вырашыцца. І, набраўшыся мужнасьці, яшчэ да выезду зь СІЗА абвясьціў паўторную сухую галадоўку.
Аднак мэта выкліку была простая. Па нашай справе быў прызначаны новы сьледчы з пракуратуры раёну Васіль Сьцяпанавіч Папін. Сьледчы — „важняк“ ці, інакш кажучы, па асабліва цяжкіх (важных) злачынствах.
Паведаміўшы яму, што знаходжуся на галадоўцы, я адмовіўся даваць паказаньні, пакуль ня буду выпушчаны пад падпіску аб нявыезьдзе. І пытаньне гэтае, як мне падалося, было ўжо амаль вырашанае, але раптам пачуўся тэлефонны званок зь Менску — і сьледчы зноў адправіў нас з Вадзімам у Жодзіна. Перад адпраўкаю я здолеў яшчэ раз сустрэцца з адвакатам Скарулісам і расказаў яму пра тое, як мяне зьбівалі ў Жодзіне. Ён засьведчыў гэта і напісаў скаргу пракурору па наглядзе за турмамі і сьледчымі ізалятарамі. Ён жа даў інфармацыю пра зьбіцьцё ў прэсу. У далейшым мне гэта вельмі дапамагло.
Адсюль вывеў я сабе яшчэ адно правіла: „Ня бойцеся скардзіцца! Горш вам ад таго ня стане!“
У Жодзіне я адразу абвясьціў начальніку зьмены пра тое, што не спыніў галадоўкі і перадаў пісьмовую заяву, якая гэта засьведчыла. Словы начальніка: „На этапе „бэнээфаўцы““, — гэтым разам адыгралі супрацьлеглую ролю. Ня білі нікога! Па сьведчаньні дазнанага зэка, такога не здаралася тут ужо больш за год. Гэта быў вынік таго, што ў прэсе зьявілася інфармацыя, як мяне зьбівалі.
Пасьля таго як усіх „раскідалі“ па камэрах, я зразумеў, што сапраўды нешта зноў ня так, бо пра мяне нават ня ўспомнілі. І толькі каля 10-й гадзіны раніцы 26-га верасьня ў камэру зайшоў міліцыянт і абвясьціў: „Галадоўка — найгрубейшае парушэньне рэжыму ўтрыманьня. Вы мусіце яе спыніць, інакш будзеце адпраўленыя ў карцар“.
Спыняць галадоўку, нягледзячы на дрэнны стан здароўя, я адмовіўся. Мяне адвялі ў карцар і сказалі: „У цябе ёсьць час падумаць...“.
Што такое карцар? Гэта зусім вузкая маленькая камэра-адзіночка з унітазам перад вочкам наглядчыка і маленькай тумбачкай для прыёму ежы. Таксама ёсьць адкідныя жалезныя нары, якімі можна карыстацца з 22-й да 6-й гадзіны. У астатні час яны прывязаныя да сьцяны. За ўвесь дзень зэк мае права прысесьці толькі тры разы: у часе сьняданьня, абеду і вячэры.

Праз сваю галадоўку я гэтым правам карыстацца ня мог. З той самай прычыны не магу апавесьці, чым кормяць у карцары, бо, зразумела, ежы мне не прыносілі. Увесь вольны час вязень павінен хадзіць па „хаце“ з анучаю ў руцэ і церці сьцены. Такога рэжыму мне хапіла на дзень і ноч. Пераначаваўшы ў карцары (дарэчы, акно ў ім увесь час было адчыненае — і тэмпэратура ў памяшканьні была амаль такой самай, што й на дварэ), пад час ранішняй праверкі я ня здолеў устаць „на зважай“ і страціў прытомнасьць. Далей — ізноў: рэанімацыя, уколы, шпітальная камэра.

Пасьля другой галадоўкі страўнік ужо адмаўляўся ўспрымаць ежу, і яшчэ два дні мяне вывяртала „дыетаю“ назад. І толькі дзякуючы ўколам глюкозы неяк падтрымліваўся агульны стан. Так, напалову лежачы, я пратрымаўся да 14 кастрычніка, калі мяне выпісалі з шпіталю ў агульную камэру. Але нават гэтая выпіска не абышлася без прыгодаў. Зранку мяне выклікаў начальнік мэдчасткі і засьведчыў на паперы, папярэдне агледзеўшы мяне, што пабояў няма. Але ж пасьля зьбіцьця прайшло больш за месяц! Потым мяне выклікаў пракурор па наглядзе, якому мой адвакат пісаў скаргу, у падрабязнасьцях распытаў пра зьбіваньне, і пад канец дадаў, што, маўляў, давесьці факт зьбіцьця наўрад ці атрымаецца, але нэрвы мы ім патрэплем. Скончылася ж усё „расьсьледаваньне“ да простага банальна. Начальніку зьмены, які аддаваў загад зьбіваць мяне, была вынесеная вымова, а мяне колькі разоў выклікаў апэратыўны работнік СІЗА і абяцаў зьмясьціць у добрую камэру, адно каб я больш не „падымаў шуму“.

Так я апынуўся ў камэры... для іншаземцаў. Двох расійцаў, украінец, віетнамец ды двох прыбалтаў — вось і ўвесь „кантынгент“. Асаблівасьць яго ў тым, што ніхто з маіх суседзяў, акрамя, натуральна, мяне, не атрымліваў перадачаў з волі, і тыя восем кіляграмаў, што дасылалі мне бацькі, зьнішчаліся за колькі гадзін. І хаця перад гэтым у агульнай суме я галадаваў амаль 10 дзён, цяпер, не на дыетнай пайцы, а на самай звычайнай, я насамсправе адчуў, што такое голад. Голад — гэта калі глядзіш на карычневую вышчарбленую сьцяну і табе здаецца, што гэта скарынка хлеба. Калі адразу пасьля вячэры пачынаеш думаць пра сьняданак, а нязграбна рассыпаныя кімсьці па стале крошкі хлеба выклікаюць жаданьне набіць морду таму, хто так марнуе прадукт. Калі

сьніш, што школьная настаўніца прапануе вучням ісьці ў сталоўку падмацавацца манкаю, і тутсама прачынаешся ад таго, што „баландзёры“ адчынілі „кармушку“, каб перадаць абед. Толькі паступова да голаду прызвычайваешся. Адбываецца гэта, мабыць, шляхам зьмяншэньня страўніка — пасьля выхаду на волю ты ня зможаш есьці столькі, колькі раней еў. на пачатку тэрміну я часта марыў пра тое, як прыйду дамоў, сяду за стол і пачну доўга-доўга есьці. А выйшаў на волю і адчуў, што зусім нічога не хачу есьці. Зусім!
З іншаземцамі сядзелася весела. Дапамагаў ім пісаць скаргі, гаварыў прынцыпова па-беларуску — яны ня ўсё разумелі. Цярпеў мянтоўскія высьпяткі на калідоры па вечарах і марыў, марыў, што вось-вось расчыніцца „кармушка“, і ахоўнік скажа: „Шыдлоўскі, зь вяшчамі!“ Але „кармушка“ не адчынялася. Пры канцы кастрычніка прыйшла новая адвакатка — Тацяна Станкевіч, таксама зь Менску. Калі размова наша доўжылася ўсяго пяць хвілін, дык на тое, каб абшукаць мяне перад пакоем абароньніцы (ці не перадам чаго!) і пасьля сустрэчы (ці чаго ня вынес!) міліцыянты трацілі па паўгадзіны. Для гэтага яны двойчы распраналі мяне дагала й абмацвалі кожны рубчык на маёй вопратцы.
28 кастрычніка, калі пайшоў трэці месяц зьняволеньня, сьледчы дазволіў маёй маці першае спатканьне са мною. і вось, пасьля доўгіх бэтонных калідораў, ахоўнік дазваляе выцягнуць з-за сьпіны рукі і падняць вочы. Мама! Мілая мая мама! Думкі імчаць, а сказаць нічога не магу: ад псыхічнай напругі да горла падкаціў камяк і застраг там, не даючы дарогі словам. Толькі б не заплакаць! Мама доўга апавядае пра хату, пра брата і бацьку, але гэта яшчэ больш наганяе на мяне тугу. Бачачы гэтае, яна пераходзіць да іншага і расказвае пра мітынг, пікеты і зборы подпісаў у маю падтрымку. Адразу зьяўляецца нейкі гонар за сябе і жаданьне змагацца далей.
Падтрымка на волі — гэта акурат тое, што трэба кожнаму, хто сядзіць „за палітыку“. Вельмі важна ведаць, што пра цябе памятаюць ня толькі родныя, але й сябры па змаганьні, што ладзяцца акцыі ў тваю падтрымку... Але гадзіна, адведзеная на сустрэчу, вельмі хутка скончылася. Тое, што насамрэч хацеў сказаць, прыйшло да галавы адно па дарозе ў камэру. Зрэшты, так заўсёды...
У сярэдзіне лістапада ў нашую камэру пасадзілі зэка, у якога

„паехаў дах“. Папаўся ён на тым, што залез у кандытарскі цэх і еў там тарты, аж пакуль не прыехала міліцыя. Зь ягоным зьяўленьнем у нас пачалі зьнікаць рэчы, і калі гэтага вязьня (дарэчы, ён быў расіец, з Санкт-Пецярбургу) злавілі за руку пад час крадзяжу, я ўпершыню ўбачыў „суд“ над зэкам, які праштрафіўся. Ягоны матрас кінулі на бэтонную падлогу, і адгэтуль ён спаў пад „барам“, невялічкаю шафаю на сьцяне. Да таго ж, каб больш не сьвярбела красьці, ягоную правую руку паклалі на „абшчак“ (так на „фені“ завецца стол) і жалезным кубкам, які мне перадалі з дому, доўга штосілы білі па пальцах, пакуль яны не апухлі ад пабояў. Яшчэ адно правіла: „У турме нічога чужога браць нельга!“ Прычым ня тое каб красьці, а нават проста браць пакарыстацца, хай нават на пяць хвілін.
25 лістапада, калі скончыліся тры месяцы майго зьняволеньня, ізноў прыходзіць Станкевічыха й кажа, што хутка маюць выклікаць на этап, каб „закрыць справу“: гэта значыць, перададуць яе ў суд. Пасьля гэтага, магчыма, я буду вызвалены пад падпіску аб нявыезьдзе. Чакаць выкліку давялося доўга. Толькі 10 сьнежня нас з В.Лабковічам загрузілі ў „аўтазак“ і павезьлі ў накірунку Стоўпцаў.
Як я даведаўся пасьля, гэта выпадкова супала з прабегам „Жодзіна–Менск–Стоўпцы“, які ладзіў Малады Фронт. праз пару гадзін пасьля таго, як мяне прывезьлі ў Стоўпцы, там зьявіліся маладафронтаўцы. У Стаўпецкім РАУСе пра гэтую акцыю ня ведалі нічога, і таму па трыывозе была ўзьнятая вайсковая частка і ўсе міліцэйскія патрулі. Яны баяліся, што ІЧУ будуць браць штурмам, і на ўсялякі выпадак узялі яго пад узмоцненую ахову.
Прыкладна ў той самы час да маіх бацькоў прыяжджаў Шарамет, які жадаў сустрэць мяне вызваленага, і нават прывёз падарунак на маё дзевятнаццацігодзьдзе — файны каляровы тэлевізар. Але... Справа ў сьледчага ня клеілася, і ён вырашыў правесьці вочную стаўку.
Вось жа, я з вока на вока застаўся з чалавекам, які фактычна пасадзіў мяне, — пажарнікам Валер’ем Ільюшыным. Я адразу ж зрабіў сустрэчны напад: паведаміў сьледчаму пра тое, як Ільюшын вымагаў у мяне грошы за сваё „маўчаньне“ і папрасіў узбудзіць супраць яго крымінальную справу. Для сьведкі гэта было шокам. Ён пачаў блытацца ў паказаньнях і скардзіцца на дрэнную памяць. Акцыя сьледчага з вочнаю стаўкай

правалілася. Зразумела, улады не дапусьцілі б, каб Ільюшына, які праявіў такую ласку да іх — здаў у міліцыю двух бээнэфаўцаў — судзілі. Ён даваў тыя паказаньні, якія былі патрэбныя сьледчаму…

Тут трэба абавязкова згадаць пра такую зьяву сьледчых ізалятараў, як „турэмная пошта“. Камэры ў СІЗА трымаюць між сабою сталую сувязь, нягледзячы на тое, што гэта катэгарычна забаронена турэмнай адміністрацыяй. Сувязь можа трымацца як праз „панараму“ (прыбіральню), так і праз „рэшку“ (акно камэры). Для гэтага вырабляецца „конь“ — доўгая, мэтраў на сем вяроўка з швэдру аднаго зь вязьняў. Гэткі ж „конь“ вырабляецца і ў суседняй камэры. Калі сувязь трымаецца праз „панараму“, дык да канцоў вяровак прывязваюцца „грузы“ з хлебнага мякішу, і гэты „конь“ звычайным спосабам змываецца ўва ўнітаз. Другі канец вяроўкі „сувязны“ трымае ў руках. У агульнай трубе ўнітазу „коні“ дзьвюх суседніх камэр зблытваюцца і ўтвараецца адзіная „дарога“. Тады да яе прывязваюцца запаяныя ў цэлафан запіскі (маляўкі) і робіцца сыгнал — тры ці два ўдары кулаком у сьцяну суседняй камэры. Пасьля сыгналу суседзі перацягваюць „каня“ да сябе і робяць зваротную працэдуру. Сувязь праз „рэшку“ — прыкладна тое самае, толькі „коні“ зблытваюцца ў паветры. Па турэмнай пошце перадаюцца ня толькі запіскі, але і запаяная ў цэлафан заварка гарбаты, цукеркі, нават сала і, вядома ж, цыгарэты. Гэта — турэмная салідарнасьць…

Так прайшоў Новы Год, надышло 15 студзеня, і нас з В.Лабковічам зноў павезьлі ў Стоўпцы. Сьледчы доўга глядзеў у падлогу, а пасьля сказаў, што закрывае справу й перадае яе ў суд. Яшчэ паскардзіўся, што вельмі хацеў адпусьціць нас хоць зараз пад падпіску, але, маўляў, гадзіну таму пачуўся тэлефонны званок зь Менску, і „адзін вялікі чалавек“ сказаў яму (цытую): „Я табе… (мат) адпушчу! Сам на іх месца сядзеш!“ Азнаямленьне з справай высьветліла пэўныя цікавыя рэчы. Па-першае, на нас з Вадзімам навесілі ўсе характарыстыкі злоснага хуліганства, якія толькі існавалі, каб ужо дакладна не праваліць абвінавачаньне. Па-другое, высунуты быў пазоў на шэсьць мільёнаў рублёў у цэнах лета 1997 году: дзяржава патрабавала вярнуць нанесеныя ёй нашымі „графіці“ страты. Відаць, акрамя таго, што за гэтыя грошы былі зафарбаваныя надпісы, яшчэ не адна сям’я начальнікаў пафарбавала й свае

хаты. Па-трэцяе, па абвінаваўчым заключэньні на судзе нам з В. Лабковічам трэ было адказваць за злачынства ажно па трох артыкулах крымінальнага кодэксу: 2012 (злоснае хуліганства); 2252 (пашкоджаньне помнікаў) і 186 (зьнявага сымболікі). Да суду заставаўся месяц.
Нас зноў адвезьлі ў Жодзіна, але папярэдзілі, што праз два тыдні будзе „этап“ у Менск, на „Валадарку“. У апошнія дні ў „Чорным Бусьле“ давялося шчэ раз пакаштаваць гумавых палак і пасядзець у камэры зь мінусавой тэмпэратурай. Адзін зь вязьняў па неасьцярожнасьці выбіў шкло локцем, і міліцыянты 8 дзён адмаўляліся зашкліць акно. Па вечарох, калі на вуліцы бралася на добры мароз, у камэры з роту валіла пара — класьціся спаць было проста страшна. Усе баяліся замерзнуць. Але мяне лёс выцягнуў з гэтага пекла. У ноч з 4 на 5 лютага мне загадалі сабраць рэчы і падрыхтавацца да этапу. Мяне чакаў „сталыпін“ на „Валадарку“.
Апошні раз праходзячы пад канвоем па Жодзінскім СІЗА, хацелася сьмяяцца. Я разумеў, што шмат дрэннага яшчэ наперадзе, але горш ужо ня будзе. Мой апошні „маналёг“, які я зафіксаваў алоўкам на драўлянай лаве камэры-адстойніка, быў такі: „Бывай, Жодзіна! Месца, у якім я правёў амаль 5 месяцаў. Месца, якое я ненавіджу і якое не забуду ніколі. Тут мяне білі і зьдзекаваліся як маглі, але толькі тут я змог зразумець, якая цудоўная рэч жыцьцё, калі яно ідзе на Волі“. Воля — зь вялікай літары. Навучыцца цаніць яе можна адно ў зьняволеньні, за кратамі.

Валадарка. Менск
Вось жа, пасадзілі мяне ў „сталыпін“. Што такое „сталыпін“? Гэта спэцыяльны вагон, які прычэпліваецца да ночных цягнікоў. Вагон цалкам мэталёвы, унутры падзелены на шэсьць камэр, зробленых замест купэ.
А 2-й ночы „аўтазак“ прывёз нас на жодзінскі вакзал і высадзіў на сьнег. Становішча, у якім я апынуўся, уразіла. Усе 50 вязьняў прыселі на кукішкі й паклалі рукі за галаву. Мароз быў ня меншы за 15 градусаў, і празь пяць хвілін такога сядзеньня стала невыносна халодна, здранцьвела цела. Празь дзесяць жаданьне ўстаць і разьмяць косьці стала невыносным. Стрымлівалі яго адно дзясятак аўтаматчыкаў па бакох і гучныя папярэджаньні: „Шаг влево, шаг вправо — попытка побега...“

Праз 30 хвілін пачало станавіцца млосна, цела хіліла ў сьнег, і толькі тады падышоў цягнік з прычэпленым да яго „сталыпіным“. Пяць хвілін — і ўсе загнаныя ў вагон. У суседнім адсеку камэры жанчыны гучна пяюць „таганку“ і просяць зэкаў-мужчын паказаць ім чэлес. Ахове гэта вельмі не падабаецца, і яна прымушае ўсіх суцішыцца, пагражаючы „дубіналам“.
Дарога да Менску пралятае хутка, і а палове чацвертай раніцы на станцыі Менск-Усходні мы зноў сядзім на сьнезе ў чаканьні „варанка“. Вязьняў састрыгаюць: каго ў Менскую зону, каго на „Валадарку“, каго ў „Навінкі“.
Нас з Лабковічам садзяць у адзін адсек. Праяжджаючы паўз цэнтральныя вуліцы, паўз праспэкт, мы разам уголас уздыхаем...
„Валадарка“ сустрэла абыякавасьцю, цішынёй. Па звычцы ўтаперыўшыся вачмі ў сьцяну й склаўшы рукі за сьпінай, я пачуў збоку паблажлівы сьмех і пытаньне:
— Наверное, из Жодино?
Абярнуўшыся, не паверыў вачом. Сусед справа, паклаўшы руку ў кішэню, спакойна размаўляў са мной — і на яго ня сыпаліся ўдары, як у Жодзіне.
— Ты отвыкай, тут режим другой...
І гэта адчувалася. За дзень, праведзены ў адстойніку да разьмеркаваньня па камэрах, шмат чаму давялося зьдзівіцца. На вечаровай праверцы, пры ўваходзе міліцыянта, я па звычцы ўскочыў і ўжо набраў паветра, каб паздароўкацца, калі заўважыў, што астатнія толькі пападымалі галовы, каб паказаць, што жывыя. Міліцыянт моўчкі падлічыў усіх і выйшаў.
Пасьля абеду мяне разьмеркавалі ў камэру №49. Тут я напоўніцу адчуў увесь кантраст Менскага СІЗА з Жодзінскім. Па-першае, на „Валадарцы“ захаваны з савецкіх часоў інстытут „смотрящего“ камэры, корпусу, СІЗА. Звычайна гэта тыя зэкі, якія жывуць „па паняцьцях“ і лічаць сябе лепшымі за астатніх. Яны кіруюць у камэры ўсімі працэсамі і ўвогуле, маюць уладу, большую за ўладу міліцыянтаў.
Са страшнага: тутака я ўпершыню ўбачыў працэс „апусканьня“. Адзін малады 18-гадовы хлопец у прыватнай гутарцы з „сматрашчым“ прызнаўся, што на свабодзе займаўся з жанчынай аральным сэксам. Яго адразу ж жорстка зьбілі і адпіхалі нагамі да прыбіральні, дзе ён сядзеў увесь час да

адпраўкі на зону. У яго абавязкі ўваходзіла мыцьцё прыбіральні. Лізу (такое было новае імя хлопца) штодзённа зьбівалі да страты прытомнасьці, а калі яму заходзіла перадача, дык палову ад яе забіралі „сматрашчыя“. Увогуле, сытуацыя ў камэры была невыноснай, увесь час некага зьбівалі, а „петухоў“ (апушчаных) праз тыдзень стала ўжо тры. Прычым адзін зь іх штовечар пад прымусам задавальняў сэксуальныя патрэбы „братвы“. У мяне з гэтаю „братвою“ адносіны ня склаліся з самага пачатку, бо па натуры сваёй я настроены супраць гвалту і крыміналу. Дык мяне ў 49-ай камэры не палюбілі за тое, што не хаваў свае гідасьці да ўсяго, што рабілася там, і хаця сам ні ў што ня ўлазіў, усё ж зрабіў вострую заточку, якую насіў у рукаве, каб, калі што, абараняцца. Але мяне ўсё ж крыху пабойваліся — і не чапалі. Дарэчы, хоць, можа, гэта не характарызуе агульны стан рэчаў, але двое з чатырох „наглядаючых“ былі расейцы, і тое, што я з БНФ, іх асабліва злавала. Хутка, відаць, тое, што робіцца ў камэры, усё ж дайшло да міліцыянтаў, і аднойчы ўвечары ўсіх (!!!) моцна зьбілі, і гэтых двух расейцаў перакінулі ў іншыя „хаты“, пасьля чаго ў нас усталявалася нармальная атмасфэра. Назаўтра, зьбіты, я адпачываў у абед на сваіх нарах, калі мяне выклікалі да адваката, якая паведаміла, што пазаўтра суд. Пасьля прысуду асуджаны „зэк“ перакідваецца ў іншую камэру. Таму я, ведаючы, што праз пару дзён мяне ў 49-ай дакладна ня будзе, па шчырасьці пагаварыў з адным барысаўскім забойцам, дарослым мужыком, які меў неафіцыйны аўтарытэт у камэры. Я выказаў думку, што ўсе гэтыя законы, якія пануюць на Валадарцы і якіх няма ў „Чорным Бусьле“, толькі ўскладняюць жыцьцё вязьням. Да прыкладу, каля траціны плошчы камэры знаходзіцца за так званым „парапэтам“. Над гэтым месцам трэба вешаць вопратку сохці, гатаваць сабе ежу, мыцца, чысьціць зубы. Увадначас усё, што за гэтым парапэтам упадзе на падлогу, — лічыцца „запарафіненым“ і выкідваецца. Бывала, што вяроўка, на якой сушылася вопратка — абрывалася, і тады ўсё, што там вісела, даводзілася кідаць у сьметніцу! Тое самае адбывалася з мылам ці ручніком, якія выпадкова падалі на падлогу. Той, каму я выказаў свае думкі, са мною цалкам пагадзіўся, але сказаў, што цяпер нічога зьмяніць нельга, павінен прайсьці яшчэ вельмі доўгі час, пакуль усё гэтае сьцяміць бальшыня…

18 лютага нас з Лабковічам павезьлі на суд. Уразіла ахова, 12 чалавек з сабакам, і тое, што на „аўтазаку“ нас везьлі толькі двох, бо ўсё астатняе месца займалі міліцыянты. Прыкладна а дзясятай раніцы нас этапавалі ў будынак Менскага абласнога суду й пасадзілі ў „стакан“. Праз пэўны час я заўважыў, што міліцыянты пачалі хвалявацца і ўвесь час раіцца зь некім па тэлефоне. Калі ўрэшце нас наважыліся весьці ў залю паседжаньняў, ужо здалёк я пачуў нейкі гул, які нарастаў і ўзмацняўся з кожным крокам. Калі ж урэшце дзьверы ў залю былі адчыненыя — у нас заняло дух. Канечне, мы чакалі ўвагі да сябе, але такога мы сабе ўявіць не маглі! Фота- і тэлекамэры, дыктафоны, а галоўнае — з добрую сотню чалавек у залі і значна больш — за яе дзьвярыма. Ад скандаваньня „Жыве Беларусь!“ хацелася плакаць, так кранала душу, так надавала яно моцы для далейшага змаганьня. Апісваць увесь судовы працэс сэнсу няма. Дадам толькі, што за ўсё жыцьцё гэтыя чатыры дні зрабілі на мяне найбольшае ўражаньне й дагэтуль застаюцца найярчэйшым успамінам.
Адразу пасьля прысуду, паводле якога я атрымаў 18 месяцаў калёніі ўзмоцненага рэжыму, мяне зноў этапавалі на „Валадарку“. Я застаўся адзін (Вадзім Лабковіч, на шчасьце, атрымаў умоўны тэрмін). Мяне перакінулі ў камэру для асуджаных № 21 — у сутарэньні сьледчага ізалятару. Гэта была камэра на 30 чалавек, у якой заўсёды было ня менш ад 50-ці. Сюды ніколі не трапляла дзённае сьвятло і сьвежае паветра. Паўзмрок, чорныя сьцены і пах гнільля — усё гэта стварала ў камэры такую атмасфэру, што многія вязьні паціху вар’яцелі. Праз тыдзень з-за авітамінозу й недахопу кісларoду маё цела, як і ў іншых сукамэрнікаў, пачало гнісьці. Гнісьці ў простым сэнсе слова. На целе, асабліва на нагах, зьяўляліся маленькія ранкі, якія не загойваліся, а з часам станавіліся большымі ды глыбейшымі: сантымэтар і болей углыбкі й ўшыркі. Адзіным паратункам былі вітаміны, але іх давалі толькі самым хворым — на ўсіх бракавала. Калі ранкамі-ямкамі пакрылася ўся мая правая нага, адміністрацыя СІЗА перавяла мяне з падвалу на чацьверты паверх у камэру №94.
Тут было больш сьвятла, паветра і праз краты відзён быў дах Чырвонага Касьцёлу, але было й значна больш людзей — пад 70 чалавек на 24 месцы… Пасьля пераводу сюды мяне аж да самага заканчэньня тэрміну больш ня білі.

21 красавіка адбыўся перагляд маёй справы ў Вярхоўным судзе. Прысуд быў пакінуты бязь зьменаў, а гэта значыла, што трэба было рыхтавацца да зоны. 13 траўня зранку мне загадалі зьбірацца з рэчамі на этап і пасьля праведзенай у „адстойніку“ ночы 14-га на „аўтазаку“ перавезьлі ў УЖ 15/1 — зону ўзмоцненага рэжыму ў Менску на вуліцы Кальварыйскай.
За кратамі пачыналася вясна. Калісьці ў Стоўпцах я любіў яшчэ даволі халадкімі і ветранымі красавіцкімі дзянькамі сачкаваць з заняткаў і хадзіць па вясновым горадзе… Гэтыя ўспаміны катавалі душу. Вясна, хоць і ў турме, абудзіла й мужчынскую прыроду: кароткімі начамі (у камэры было па 3 чалавекі на адны нары, і таму спалі па чарзе і роўна па восем гадзін) я сьніў дзяўчат: знаёмых і незнаёмых, брунэтак і бляндынак…
Я заўважыў, што амаль усе маюць сукамэрнікі файна падрыхтаваныя да будучых гадоў зоны. Поўныя „кешары“ гарбаты, цыгарэтаў, мыла, туалетнай паперы і г.д. Каб не адставаць ад народу, я арганізаваў сабе пару нелегальных перадачаў з такімі рэчамі і склаў іх у „паходную сумку“, пра што ў будучым не пашкадаваў. Поўны „кешар“ гарбаты і цыгарэтаў у зоне — прыкладна тое самае, што на волі кейс з далярамі. Найбольш цэняцца тут цыгарэты *LM* ды індыйская ліставая гарбата.

У Чырвонай зоне

УЖ 15/1 — зона „чырвоная“. Гэта азначае, што ў ёй усталяваныя зусім адрозныя законы, чым у іншых зонах. Тут, як і ў Жодзінскім СІЗА, уся ўлада ў руках адміністрацыі. У зоне няма блатных, затое процьма „стукачоў“. У „чырвоную“ зону прывозяць былых міліцыянтаў, якія зьдзейсьнілі злачынства, і яны адбываюць тут пакараньне. Увадначас гэтая зона — паказальная. Тут крыху лепшыя санітарныя ўмовы ды якасьць ежы, бо сюды накіроўваюць усе праверкі — ад раённай санстанцыі да назіральнай групы АБСЭ. Чаму ж мяне накіравалі ў гэтую зону? Адказ просты — тут я быў пад поўным кантролем адміністрацыі, бо адразу колькі зэкаў, што працавалі на апэратыўную частку, наглядалі за мною. З гэтай самай прычыны ў УЖ 15/1 знаходзіцца Ўладзімер Кудзінаў. І я быў амаль упэўнены, што менавіта сюды будзе накіраваны Андрэй Клімаў.
Вядома, адразу я ня ведаў усяго гэтага, і першы шок мяне

напаткаў ужо ў „каранціне“ („каранцін“ — асобны барак, у якім зэкі тыдзень знаходзяцца да разьмеркаваньня па атрадах). Калі адзін зь вязьняў абвясьціў, што ён будзе „блатаваць“ (то бок хоча займаць другую па значнасьці ступень зэкаўскай гіерархіі: першая — „злодзей у законе“), яго адразу ж зьмясьцілі ў штрафны ізалятар на 15 дзён. Як я даведаўся пазьней, там такіх трымаюць з паўгоду і, калі зэк не адмаўляецца ад свайго намеру, яму накідваюць 2—3 гады й адсылаюць у зону строгага рэжыму.

20 траўня мяне перавялі ў атрад № 21, дзе я быў да канца свайго тэрміну. Перад адпраўкай, яшчэ з каранціну, я накіраваў ліст у газэту „Народная Воля“, дзе пацьвердзіў, што я не зламаўся й гатовы да далейшага змаганьня. На дзіва, праз цэнзараў ліст прайшоў, і 28 траўня 1998 году быў надрукаваны на першай старонцы газэты, пасьля чаго ў мяне пачаліся сапраўдныя праблемы. За наступны дзень з добры дзясятак разоў мяне выклікалі на „выхаваўчыя работы“ апэратыўнік Віктар Гарбацэвіч і намесьнік начальніка па выхаваўчай частцы Юры Жогаль. „Гутаркі“ працягваліся і ў наступныя дні. З-за іх мне ня раз давялося прапусьціць абед і вячэру.

На „гутарках“ мне ўбівалі ў галаву адно — прэзыдэнт не такі дрэнны, апазыцыя — маньякі, а мяне, маўляў, выкарыстоўваюць у сваіх мэтах. Падобна, што яны й самі верылі ў тое, што казалі. Пасьля размоваў мяне, стомленага, адпускалі з апэрчасткі ў барак, каб заўтра з раніцы пачаць ізноў.

Зона — гэта горад у горадзе. Тут ёсьць лазьня, шпіталь, сталоўка, бібліятэка, школа, ПТВ і опэрчастка. На супрацьлеглым баку знаходзяцца баракі на 28 атрадаў. Самі гэтыя атрады падзеленыя на сэктары, па 3 ці 6 атрадаў, у кожным зь якіх па 100—120 чалавек. У кожнага сэктару ёсьць свая асфальтаваная пляцоўка для прагулянак, агароджаная мэталёваю сеткай. Выходзіць за межы гэтай пляцоўкі можна адно пад час наведваньняў сталоўкі, шпіталю ці бібліятэкі.

У маім сэктары было 3 атрады агульнай колькасьцю 320 чалавек, а пляцоўка займала плошчу каля 900 кв.м (20х45). На пляцоўцы месьцяцца лаўкі, два дрэвы й сьметніца, вакол якой павінны зьбірацца аматары папаліць. Баракі — тыповыя памяшканьні казармавага тыпу, набітыя людзьмі „пад завязку“. Трох’ярусныя нары, якія стаяць нават у „ленпакоях“,

разьмешчаныя настолькі шчыльна, што ступіць няма куды. У кожным бараку ёсьць тэлевізар, па якім зэкі звычайна глядзяць ці баевікі, ці канцэрты расейскай эстрады, адно зрэдку пераключаючы на навіны альбо футбол. Дзякуючы гэтаму за 9 месяцаў знаходжаньня ў зоне ад тэлевізару я проста адвык. Яшчэ ў бараках ёсьць прыбіральня на чатыры месцы (туды заўсёды стаяць чэргі) і мыйніца, якая ўвадначас і кухня, бо толькі там ёсьць разэткі, якімі можна карыстацца, гатуючы есьці. Вядома, там няма газплітаў, але да ўсяго звыклыя зэкі гатуюць з дапамогаю кіпяцільніка абсалютна ўсё: ад булёну да смажанага сала. Завяршае агульную карціну жылой зоны „пяты пост“, ці, кажучы па-зэкаўску — „петушатня“, месца, зь якога па рупары выклікаюць вязьняў на працу, на „выхаваўчыя работы“ ці на спатканьне з роднымі. Ёсьць у зоне і клюб, дзе па суботах і нядзелях паказваюць фільмы і раз на два-тры месяцы да нядаўняга часу выступалі беларускія эстрадныя артысты. апошнім часам яны перасталі наведваць зону, бо сапраўднай прычынай іх прыездаў была зусім не дабрачыннасьць, а тое, што да восені 98-га ў зоне сядзеў былы кіраўнік рэдакцыі музычных праграм Белдзяржтэлерадыё Бахціяр Бахціяраў, які і арганізоўваў гэтыя канцэрты.

Такая структура жылой зоны. Але існуе яшчэ і зона прамысловая, куды зэкаў выводзяць на працу. Там знаходзяцца разнастайныя цэхі: сталярны, цэх гарачых прэсаў, цэх па вырабе трунаў ды інш. І асобна, паміж жылой і працоўнай зонай, стаіць штрафны ізалятар — памяшканьне, у якое ня хоча трапляць ніхто.

Самому мне ў штрафным ізалятары пабыць, дзякуй богу, не давялося, але з аповедаў сядзельцаў можна зрабіць выснову, што гэта куды горш ад карцару ў СІЗА. Камэры там — пад зямлёю, і тэмпэратура ў іх ніколі не падымаецца вышэй за 10 градусаў цяпла ўлетку, а ўзімку — вышэй за вулічную. Адтуль ужо праз 15 содняў можна выйсьці невылечна хворым.

Першы месяц у зоне праляцеў вельмі хутка: усё ж пасьля СІЗА гэта — амаль як воля. Лісты з дому, ад сяброў, газэты дапамаглі крыху адключыцца ад рэчаіснасьці. Крыху супакоіліся й „выхавальнікі“. Але яны змаглі перахапіць мой ліст у „Нашу Ніву“ зь вершамі. Апэратыўнік, які перахапіў гэты ліст, напачатку нават забараніў мне пісаць лісты ўвогуле, акрамя як дадому. Ды дзе ж яму! Я напісаў скаргу ў

пракуратуру, і дзеяньні апэратыўніка былі кваліфікаваныя як незаконныя. Адміністрацыя, якую я вельмі раздражніў гэтаю скаргаю, накіравала ў пракуратуру мой ліст зь вершам „Зомбі“ — з просьбаю ўзбудзіць супраць мяне крымінальную справу па артыкуле 67 КК РБ „заклік да захопу ўлады“. але пракуратура, на шчасьце, абмежавалася папярэджаньнем. Наступны мой крок — колькі лістоў у незалежныя выданьні й хадайніцтва аб умоўна-датэрміновым вызваленьні, якое мне ўжо надышло па тэрміне. Паколькі я ня меў ніводнага парушэньня рэжыму, прычыны адмовіць мне ў ім не было. 30 ліпеня зранку мяне запрасілі прайсьці камісію на вызваленьне, але… З падачы начальніка атраду Жанеўскага, які, дарэчы, адразу пасьля гэтага сышоў працаваць у КДБ, мне адмаўляюць у вызваленьні з прычыны „недастатковай вывучанасьці“. Мяне гэтая адмова ўзрушыла: замест блізкае Волі трэ было вяртацца ў сваю камэру.

Можна яшчэ доўга апавядаць, як зьнікалі дзясяткамі лісты, накіраваныя мне, і мае, адпраўленыя сябрам (усяго „не дайшло“ каля 100 дасланых мне лістоў — ня ведаю, ці гэта рэкорд, ці ў каго з нашых палітвязьняў зьнікла й больш). Каб я не пісаў у газэты, мяне накіравалі на вельмі шкодную працу ў цэх — фаніраваць мэблю. Аманціт, ляк, апіякт — усё гэта вынішчала й вынішчае цяпер лёгкія вязьняў, якія працуюць у цэхах часам і ў дзьве зьмены, а атрымліваюць за гэта капейкі. Я зарабляў 100.000 рублёў у месяц — менш ад даляра, які каштаваў 180.000. Набыць на іх можна было толькі адзін пачак маргарыну ці, на выбар, пару пачкаў цыгарэт. Працаваць за такія грошы й псаваць сабе здароўе сэнсу ня мела, таму я ўсяляк прагульваў працу. Дзякуй богу, быў чалавек, які пісаў даведкі аб маім дрэнным стане здароўя, і я мог легальна днямі знаходзіцца ў бараку й пісаць вершы, лісты знаёмым і ў газэты, чытаць…

Выратаваньнем для мяне было й чытаньне. Акрамя турэмнай, існуе яшчэ й „зэкаўская бібліятэка“. У кожнага вязьня ёсьць дзьве-тры добрыя кнігі. Людзі вызваляюцца й пакідаюць іх сябрам — так у атрадах назапашваецца даволі высакаякасная чытанка. Дастаеўскі й Велер, Ясенін і Купала…

Пасьля адмовы ў датэрміновым вызваленьні чакаць мне больш не было чаго. І я пачаў пісаць. Вершы, артыкулы, апавяданьні. Спачатку адміністрацыя спрабавала перашкодзіць мне,

пагражала ізалятарам і перасылкай у іншую зону, але пасьля махнула рукой. Я іх пераўпарціў.
Пачалі заводзіцца знаёмыя. Людзі з розных атрадаў, розных куткоў зоны падтрымлівалі мяне. Мы зьбіраліся разам і апавядалі адзін аднаму апошнія зьвесткі. Хтосьці нешта чуў з вуснаў дасьведчаных асобаў, у кагосьці ў бараку прымалася радыё „Свабода“, я ж забясьпечваў усіх незалежнай прэсай. Гэтыя сустрэчы ў зэкаўскай школе пад покрывам ночы нагадвалі карціну аднаго вядомага савецкага мастака „Ваеннапалонныя слухаюць Маскву“, дзе каля дзясятку савецкіх салдат у фашыстоўскім канцлягеры, прыклаўшы вуха да самаробнага радыё, слухаюць левітанаўскія паведамленьні. Дні цягнуліся… З наступленьнем восені настрой стаў часта псавацца, апаноўвала нязносная туга. Ці то гэта брала сваё халоднае дажджлівае надвор’е, ці тое, што ўжо нічога не чакаеш. Акрамя як дня вызваленьня…
Прайшла восень, надышоў Новы год. Напярэдадні я адсьвяткаваў 20-цігодзьдзе, атрымаўшы з тры дзясяткі віншавальных паштовак, і, як высьветлілася пазьней, яшчэ з два дзясяткі не атрымаўшы, бо яны „згубіліся“ на шляху ад цэнзарскай да бараку. На Новы год адміністрацыя дазволіла пасьвяткаваць да 2-й гадзіны ночы, чаму ўсе нечувана радаваліся, елі самаробныя тарты й палілі назапашаны *LM*. Да вызваленьня заставалася 57 дзён.
Новы начальнік атрада, лейтэнант Мамонаў, даў мне палёгку, пераклаўшы з 3-га на 2-гі ярус, і нават быў хацеў дазволіць мне дадатковую перадачу. Добры такі быў атраднік, увесь час прасіў у мяне газэт пачытаць, хаця па дарозе дадому мінаў зь дзясятак шапікаў „Белсаюздруку“. Мамонаў увесь час марыў аб тым, што раптам нехта яму патэлефануе й запросіць на працу з заробкам у 200 даляраў, але ў канцы кожнага месяца зноў і зноў пералічваў тыя сорак, што яму плацілі ў турме. Рэдкі чалавек у турэмнай адміністрацыі — такі, што відавочна не жадаў мне зла.
21 студзеня выйшоў закон аб амністыі пэўных катэгорыяў грамадзян. Дзякуючы яму я мог выйсьці на Волю раней на тыдзень ці некалькі дзён, але, ведаючы аб тым, якую сустрэчу мне рыхтуе Малады Фронт, я напісаў заяву аб адмове ад амністыі ў трох асобніках і перадаў іх кіраўніцтву калёніі. Усё ішло, як і меркавалася. 17 лютага вывесілі сьпісы тых, каму

трэ было зьявіцца на камісію па амніставаньні, і, зразумела, мяне там не было. Але 18-га, а 12-й дня ў барак прыйшоў міліцыянт, які паведаміў мне, што яму загадана канваяваць мяне на камісію па амніставаньні. Мае адмовы й папярэджаньні аб незаконнасьці дзеяньняў не падзейнічалі, і я быў заведзены ў актавую залю УЖ 15/1. Як я даведаўся, камісія ўжо скончылася, але ўсе засталіся спэцыяльна для таго, каб амніставаць мяне. Нягледзячы на пратэсты, мне зачыталі пункт дзявяты закону аб амністыі й сказалі, што яна ўжытая да мяне. Пасьля мяне ўгаворвалі расьпісацца за тое, што я згодзен з амініставаньнем, але я ў адказ напісаў скаргу ў пракуратуру Менску…

Апошнія дні ішлі вельмі марудна. Вызваліць маглі ў любы дзень, але, як мне апавёў начальнік атрада, ля брамы турмы мяне чакала група падтрымкі з Маладога Фронту, а адміністрацыі было загадана гэтую сустрэчу сарваць. Вось жа, я назіраў, хто ж пераможа ў гэтым супрацьстаяньні, МФ ці УЖ 15/1, сам пры гэтым ня маючы ніякай магчымасьці паўзьдзейнічаць ні на што. На жаль, больш дасьведчаныя турэмнікі перамаглі маладафронтаўцаў сваімі бруднымі мэтадамі. Прыкладна а 12-й гадзіне 23 лютага да тых, што мяне чакалі, выйшаў адзін з супрацоўнікаў адміністрацыі і паведаміў, што сёньня нікога вызваляць ня будуць. Пачуўшы ў адказ, што стаяць усё адно будуць, ён з хлусьлівым шкадаваньнем прамовіў: „Детки, вы хоть покушать сходите, стоите тут под дождём…“. І калі хлопцы зь дзяўчатамі й напраўду пайшлі пад’есьці, мне загадалі за пяць хвілін сабраць усе рэчы й вымятацца з турмы.

Я марудзіў як мог, але, нягледзечы на гэта, у хвіліну майго выхаду пляцоўка перад турмою была пустая. Тут трэба дадаць, што перад самым выхадам мяне добра абшукалі, забраўшы некаторыя турэмныя рэчы, мой турэмны фотаздымак і копію скаргі на намесьніка начальніка турмы. Усё тое, што я плянаваў перадаць журналістам. Але галоўнага яны не знайшлі. Тры мае турэмныя сшыткі чакалі мяне ўжо на Волі. А там — усё: вершы, успаміны, храналёгія…

Вось жа, я выйшаў за браму й нікога ня ўбачыў, але раптам недзе збоку я пачуў крык: „Лёша!“, азірнуўся і ўбачыў маму. Толькі яна стаяла і чакала мяне безадыходна. А 12.45 23 лютага я скінуў турэмную вопратку й стаўся вольным

чалавекам. Так скончылася гісторыя майго „графіці“. Усё было не дарма. Я ні аб чым не шкадую, і зьявіся ў мяне такая магчымасьць — нічога ня стаў бы мяняць.
А пасьля быў фэст, наладжаны ўва Ўправе БНФ, інтэрвію, сустрэчы.
У РУУСе мне ўстанавілі нагляд на 1 год, які я мусіў паводзіць сябе ўзорна, інакш — *Back to the Prison*. Мяне адлічылі з БДУ й пагналі з БДУшнага інтэрнату. Аднак сьвет поўны добрымі людзьмі, і цяпер я маю, дзе жыць, маю працу і з восені зноў пачынаю вучыцца.

Праз год пасьля…
…Прайшоў год з дня, як я выйшаў на Свабоду. Навокал не зьмянілася абсалютна нічога. Ну, хіба што якая драбяза. Толькі больш шэрымі сталіся навакольныя фарбы, твары пэнсіянэраў ды батоны ў крамах і які ўжо год нефарбаваная падлога ў кватэры. Беларусь як быццам сьціраецца пакрысе: колеры, лепшыя людзі, краіна…
Я і цяпер, як 11 месяцаў таму, ня бачу іншага выйсьця з сытуацыі, акрамя як змаганьне да скону. Змаганьне якім заўгодна чынам і якімі заўгодна сродкамі: із зброяй ці без, на вулічных акцыях ці праз прэсу. Рана ці позна перамога прыйдзе.
„Ты вельмі зьмяніўся“, — зьлятала з вуснаў шмат каго пасьля сустрэчы ды размоваў са мною — ужо іншым, „пасьлятурэмным“. Сапраўды, турма значна мяняе людзей. І чым больш працяглы час ТАМ, за плотам, тым больш шанцаў зьмяніцца значна.
Але, што цікава, турма адно ўзмацняе тыя якасьці, якія ў чалавека былі. Калі ты быў моцны духам — будзеш як камень. Калі ж быў сьлімаком, дык і за кратамі прыйдзецца табе цяжка, а гэта прыгняце, прыб'е, закамплексуе цябе шчэ больш, і станешся ты горшым ад ранейшага.
Многія выходзяць, як ні дзіўна, значна дужэйшыя й фізычна. Вольнага часу дастаткова, і яны кампэнсуюць гэта заняткамі бодыбілдынгам, за доўгія гады нарошчваючы сабе вялізныя цягліцы.
Але найгалоўнейшае ўсё ж — выйсьці адтуль чалавекам незламаным. „Ты зьмяніўся“ — мне кажуць тыя, хто ведае, што я сядзеў. Але яны ніколі не казалі, што па мне бачна, што я —

зэк. Я ня вынес з сабою ані гэтага жаргону (я яго, натуральна, ведаю, але ж ніколі не карыстаюся), ані нейкіх звычак. Адзінае, што як ні імкнуўся я выжыць турму з сваіх сноў — ня здолеў. Мая дзяўчына скардзіцца, што я сярод ночы ўскокваю ў халодным поце. Так, я зноў быў там. Перажыўшы й асэнсаваўшы ўсё, я тым больш паважаю людзей, што выйшлі на волю незламанымі й здолелі пачаць жыццё нанова.
Я выйшаў на Свабоду год таму. Усяго. А здаецца, прайшла цэлая вечнасьць. Тут ён, час, ляціць не спыняючыся, а за кратамі дзень раз-пораз здаваўся даўжэйшым за ўсё раней пражытае.
Год пасьля… Як я не хацеў бы зноў трапіць за краты ні на месяц, ні на дзень, ні на ноч! Але, ведучы перадтурэмны лад жыцьця, — не гарантую сабе гэтага. Ды й ніхто ня можа гарантаваць.
Памятаю, як увосені 1998-га, за 3 месяцы да вызваленьня, чакаў сьнегу. Я чакаў яго, паглядаючы ў акно, чакаў пры кожным выхадзе на прагулянку. Я, здаецца, не чакаў так лістоў з дому, як гэтага сьнегу. Я ведаў, што калі буду выходзіць, навокал будзе сьнег, і таму ён атаясамліваўся ў мяне з Свабодаю. Зрэшты, аднойчы я прачнуўся і ўбачыў, што сьнег усё ж выпаў. Была пятая раніцы, астатнія вязьні шчэ спалі. Я хуценька апрануўся й высьлізнуў у прагуляначны сэктар, баючыся спазьніцца, выйсьці ня першым. Там напраўду была зіма. Напружанае паветра й разьбітая крышталёвая цішыня… Я адчуваў сябе свабодным на хвілінку, на паўхвілінкі, але раптам прыйшло адчуваньне, што хутка будзе пад'ём і шэрая зэкаўская маса выпаўзе на двор і патопча гэты белы, чысты, свабодны сьнег. Па белым сьнезе — бруднымі ботамі… Я ведаў — трэба рабіць тое, што лічым патрэбным. Зіма — гэта толькі тры месяцы, а жыцьцё — проста гады, зьвязаныя ўспамінамі. Галоўнае — ведаць, дзеля чаго… Па сьнезе… Ботамі…
Пасьля я чакаў Свабоды. Сны блыталіся з рэчаіснасьцю. Рэчаіснасьць забівала адным позіркам. Але я ўжо прайшоў праз гэтае. Проста я ў Беларусі. І яна пакуль жыве. І я ня маю права здацца, ня маю права сысьці.
Стоўпцы—Менск.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 29-08-2000
[image]